БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР У СУЧАСНЫХ ЗАПІСАХ

Традыцыйныя жанры
Мінская вобласць





АД УКЛАДАЛЬНІКА

Першапачатковыя звесткі аб звычаях, фальклоры плямёнаў, якія насялялі тэрыторыю сучаснай Міншчыны, мы знаходзім у старажытных летапісах, мясцовых хроніках, шматлікіх інвентарах, запісах замежных і рускіх паслоў і вандроўнікаў[1]. Але найбольш шматлікія яны ў летапісе «Аповесць мінулых гадоў», паэме «Слова пра паход Ігаравы» і былінах.

Першае непасрэднае сведчанне пра шлюбныя звычаі канца XVI ст. змешчана ў кнізе Я. Ласіцкага, які быў настаўнікам сыноў мінскага кашталяна Я. Глябовіча (радавы маёнтак апошняга знаходзіўся ў Заслаўі)[2]. Больш падрабязнае апісанне ўсіх этапаў вясельнага абраду з тэкстам вясельных песень у аўтарскім перакладзе дадзена І. Шыдлоўскім[3].

Гістарычныя, статыстычныя і гаспадарчыя звесткі, апісанні адзення, сямейных і каляндарных абрадаў, звычаяў, вераванняў і шмат фальклорных тэкстаў з паўночна-заходняй Міншчыны змешчаны ў працы Я. Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета»[4].

У сярэдзіне XIX ст. беларускія губерні даследаваліся афіцэрамі Генеральнага штаба царскай арміі. Том, дзе знаходзяцца самыя разнастайныя звесткі аб Міншчыне, быў падрыхтаваны палкоўнікам І. Зялінскім[5].

Апісанні Каляды, Купалля, Дзядоў, вясельных абрадаў, гульняў, танцаў, «Жаніцьбы Цярэшкі», прыказкі, прымаўкі, легенды і паданні з паўночна-заходніх паветаў Міншчыны апублікаваны А. Кіркорам[6].

---

[1] *Грыцкевіч В., Мальдзіс А.* Шляхі вялі праз Беларусь. Мн., 1980.

[2] *Lasicki J.* De Russorum Moskowitarum et Tartarorum religiona, sa rificiis, nuptiarum, funerum ritu... Spirae, 1582.

[3] [*Szydłowski I.*] Obrzędy weselne ludu wiejskiego w gubernii Mińskiej, w powiecie Borysowskim, w parafii Hajenskiej: Obserwowane w latach 1800, z niektórymi piosnkami i ich zwyczajna nota // Tygodnik Wileński. 1819. N 130. S. 1—18; N 132. S. 81—104 (абяцаныя ноты былі надрукаваны пазней).

[4] *Tyszkiewicz E.* Opisanie powiatu Borysowskiego. Wilno, 1847.

[5] *Зелинский И.* Минская губерния. СПб., 1864.

[6] *Киркор А.* Этнографический взгляд на Виленскую губернию // Этнографический сборник. СПб., 1858. Вып. 3.

У 60—70-я гады XIX ст. шмат матэрыялаў аб цэнтральнай Беларусі друкавалася ў перыядычных выданнях[7].

Найбольш значныя працы па песеннаму фальклору Міншчыны створаны ў другой палове мінулага стагоддзя М. Дзмітрыевым і М. Янчуком[8]. У дадатку да працы апошняга «Па Мінскай губерні» змешчана 158 песень, у тым ліку 39 з нотамі, што з'яўляецца побач з аналагічнымі публікацыямі З. Радчанкі і П. Шэйна пачаткам беларускай мелаграфіі.

Два цікавыя сведчанні аб шырока распаўсюджаным на Міншчыне абрадзе радзін, які захаваўся так добра толькі ў беларусаў, апублікаваны ў 1889 і 1891 гг.[9]

Не менш цікавыя і стогадовыя сведчанні аб святкаванні Купалы на Міншчыне 1891 і 1892 гг.[10] Першае зроблена П. Бывалькевічам у Слуцкім павеце, а ў другім даецца апісанне Купалля ў в. Крапужын Мінскага павета. Апошняе ілюструецца тэкстамі купальскіх песень.

Абрадавыя і пазаабрадавыя песні (радзінныя, вясельныя, жніўныя, сіроцкія, калыханкі, любоўныя, жартоўныя і бяседныя), запісаныя ў Барысаўскім павеце, змясціў у сваім зборніку 1904 г. Я. Ляцкі[11]. Апісанне беларускага памінальнага абраду «дзяды» з Міншчыны апублікавала ў 1912 г. І. Савіцкая[12], а нататкі аб батлейцы — І. Жыскар[13]; годам раней казкі, легенды і песні са сваіх запісаў надрукавалі А. Радзяловскі, А. Скітко і І. Белановіч[14].

У савецкі час матэрыялы з цэнтральнай Беларусі дастаткова шырока былі прадстаўлены ў нешматлікіх публікацыях, аднак асобных сур'ёзных

---

[7] *А. С.* О народных песнях Минской губернии // Виленский вестник. 1864. № 131; *Ён жа.* О народных песнях Минской губернии // Вестник Западной России. 1865. № 7; *Ш-вичь.* Свадебные обычаи и обряды простонародья в Борисовском уезде // Минск. губ. ведомости. 1865. № 22—29, 35—37, 39, 40—44; *Руберовский Н.* Свадебные обряды крестьян Минского уезда // Виленский вестник. 1868. № 8; 1869. № 31; *Валюкович П.* Обряды погребения в Игуменском уезде // Минск. губ. ведомости. 1867. № 12; *Булгаковский Д.* Белорусские песни, собранные в Борисовском уезде // Минск. губ. ведомости. 1868. № 23; *Васильева А. Я.* Легенды и поверья в Минской губ. // Минск. губ. ведомости. 1879. № 9—11 і інш.

[8] Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края М. А. Дмитриева. Вильна, 1869; *Янчук Н. А.* По Минской губернии: Заметки из поездки в 1886 г. // Известия ОЛЕАЭ. Т. 61: Труды этнограф. отд. М., 1889. Кн. 9. Вып. 1.

[9] [Карэспандэнцыя з Міншчыны аб радзінах.] *Jelski A.* // Kraj. Petersburg. 1892. N 13; *H. K.* Chrzciny u ludu białoruskiego w pow. Mińskim // Wisła. 1897. T. 11.

[10] *Бывалькевич П.* Иван Купала: В деревне Углах Слуцкого уезда Минской губ. // Этнографическое обозрение. 1891. № 4; *H. K.* Obhód Kupały u ludu białoruskiego we wsi Krapużyn w pow. Mińskim, zapisany w czerwcu 1891 r. // Wisła. 1892. T. 6.

[11] *Ляцкий Е.* Материалы по белорусской словесности и языку // ИОРЯС. 1904. Т. 9.

[12] *Sawicka I.* Zwyczaje dziadówe w Minszczyznie // Ziemia, 1912. K. 3. N 47.

[13] *Zyskar J.* Kolejdowanie i szopka w Mińszczyznie // Ziemia. 1913. K. 4 N 10.

[14] Сказки, легенды и песни / Зап. в Минск. и Вилен. губ. А. И. Родзяловским, А. К. Скитко и Иваном Белановичем // Минская старина. Мн., 1911.

прац па Міншчыне амаль не было. Выключэннем тут могуць быць працы па Случчыне А. Сержпутоўскага і Ю. Лістапада[15].

Пачатак сістэматычнаму збору фальклору Міншчыны, як і ўсёй на - роднай творчасці беларусаў, прыпадае на канец 50-х гадоў; асабліва інтэнсіўна збіральніцкая дзейнасць праводзілася студэнтамі Белдзяржуніверсітэта. Вынікам гэтай працы сталі зборнікі «Песні сямі вёсак: Традыцыйная лірыка Міншчыны» (1973), «Песні народных свят і абрадаў» (1974), «Лірычныя песні» (1976), «Лірыка беларускага вяселля» (1979), «Народныя казкі — байкі, апавяданні і мудраслоўі» (1983), падрыхтаваныя да выдання Н. Гілевічам.

Найбольш поўна лепшыя запісы цэнтральнай Беларусі прадстаўлены ў 40-томным зводзе «Беларуская народная творчасць», выданне якога ў 1970 г. пачалі фалькларысты Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Рэспублікі Беларусь. Можна сцвярджаць, што запісы з Міншчыны займаюць вядучае месца сярод іншых рэгіёнаў і адрозніваюцца ў зводзе найбольшай разнастайнасцю.

Міншчына займае асаблівае геаграфічнае, дакладней — этнагеаграфічнае, месца знаходжання: на яе тэрыторыі вылучаюцца розныя этнакультурныя зоны альбо рэгіёны. На поўначы гэта Паазер'е, на ўсходзе — зона басейна Беразіны (гэтыя дзве зоны шчыльна змыкаюцца паміж сабой з пункту гледжання фальклорных традыцый), на поўдні — Палессе, на паўднёвым захадзе — Панямонне; свае асаблівасці мае таксама фальклор заходняй, асабліва паўночназаходняй, Міншчыны. Такім чынам, Міншчына не ўяўляе сабой нейкі замкнёны культурны рэгіён (так званы «Цэнтральны этнаграфічны рэгіён»), а ўбірае ў сябе розныя этнакультурныя традыцыі, месцамі — у іх скрыжаванні і ўзаемапранікненні.

Такая адметнасць заснавана на назіраннях у галіне жанравага і стылявога складу фальклору Міншчыны. Абапіраючыся на абрадавы песенны фальклор, можна зазначыць адсутнасць таго ці іншага жанру (такіх няшмат) у адной частцы вобласці і шчыльную карту распаўсюджання яго ж у іншай частцы (напрыклад, восеньскія песні). Пры раўнаважнай распаўсюджанасці песень аднаго жанру выяўляюцца межы розных тыпаў і стыляў, альбо дыялектаў, на тэрыторыі Міншчыны (маюцца на ўвазе перш за ўсё абрадавыя песні). У выніку Міншчына ўбірае самыя розныя з'явы народнага мастацтва ва ўсім багацці і разнастайнасці мясцовых традыцый.

Вельмі насычаныя ў даным зборніку і раздзелы, дзе змешчаны паза-абрадавы фальклор: «Балады», «Сямейна-бытавыя песні», а таксама празаічныя жанры. Увогуле, сучасны стан гэтых жанраў на Міншчыне даволі добры. Аднак трэба звярнуць увагу на наяўнасць у зборніку няскончаных, няпоўных песенных тэкстаў. Але яны, на наш погляд, варты публікацыі з-за сваёй мастацкай каштоўнасці — паэтычнай ці музычнай; гэта варыянты (фрагменты) твораў з вядомымі сюжэтамі, ідэйным зместам, ад якіх нам, збіральнікам фальклору, цяжка адмовіцца пры ўкладанні зборніка (назавём хаця адну толькі баладу пра пару галубоў «У саду, саду пад яблынькаю»).

---

[15] *Сержпутоўскі А.* Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета. Л., 1926; *Лістапад Ю.* Слуцкае вяселле // Беларусь. 1990. № 108—110.

Аб натацыі песень. Па-першае, амаль ва ўсіх напевах адсутнічае музычны памер і такціроўка ў адпаведнасці з ім: замест таго напеў «тактуецца» адпаведна са строем паэтычнага радка, паўрадка — як гэта прынята ў сучаснай фальклярыстыцы. Па-другое, у многіх песнях прадстаўлены меладычныя варыянты напеву, дзеля чаго вылучаны асноўныя дзве ці тры страфы песні. Пры натацыі адной страфы адзначаны варыянты асобных гукаў пад альбо па-над асобнай нотай.

Некаторыя з твораў пададзены цалкам, у разгорнутым меладычным варыянце — у выпадку імправізаванага выканання, калі немагчыма адсекчы ніводнага гуку. Сярод такіх узораў — калыханкі, пахавальныя галашэнні.

Міншчына, як і ўся Беларусь, багатая на фальклорныя творы розных «узростаў», г. зн. розных гісторыка-стылявых пластоў: тут найстаражытнейшыя каляндарныя і сямейна-абрадавыя песні, больш познія па паходжанню песні сямейна-бытавога зместу, балады; нарэшце, ёсць і творы параўнальна позняга часу — апошніх двух стагоддзяў — такія можна адзначыць сярод сацыяльна-бытавых: казацкіх, чумацкіх, салдацкіх, жартоўных. Розныя па ўзросту ўзоры танцавальных і карагодных песень.

Спадзяёмся, што сабраны і адабраны намі матэрыял прынясе радасць усім прыхільнікам беларускага фальклору і будзе карыстацца попытам сярод удзельнікаў фальклорных калектываў, кампазітараў і паэтаў Беларусі і за яе межамі.

Наш зборнік — вынік больш чым 30-цігадовай працы студэнтаў, выкладчыкаў, фальклярыстаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта і Мінскага педагагічнага інстытута па збіранню, сістэматызацыі і даследаванню народнай творчасці Міншчыны — з'яўляецца першым асобным выданнем усіх відаў традыцыйнага фальклору цэнтральнай Беларусі ў сучасных запісах.

Зборнік працягвае серыю «Беларускі фальклор у сучасных запісах», у якой раней выйшлі тры кніжкі, прысвечаныя Брэсцкай і Гомельскай абласцям[16].

Беларусы — адзіныя са славян, хто захаваў прымеркаванасць паэтычнага календара да гадавога круга і сонца і адпаведных клопатаў земляроба аб ураджаі. Менавіта гэта прадыктавала неабходнасць пачаць каляндарную паэзію з вясны.

Уступныя артыкулы і адпаведныя раздзелы ў зборніку падрыхтавалі:
Веснавыя песні — М. Антропаў
Купальскія і пятроўскія песні — Р. Кавалёва
Жніўныя песні — Г. Кутырова
Восеньскія песні — М. Антропаў
Калядкі і шчадроўкі — Р. Кавалёва, Т. Валодзіна, В. Сухая
Паэзія радзін — У. Касько
Вясельны абрад і песні — В. Астрэйка
Пахавальныя галашэнні — А. Ліцвіновіч

---

[16] Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыцыйныя жанры. Брэсцкая вобласць / Укл. В. А. Захарава. Мн., 1973; Беларуская народная творчасць савецкага часу / Укл. В. А. Захарава. Мн., 1978; Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / Укл. В. А. Захарава, Р. М. Кавалёва, В. Д. Ліцвінка. Мн., 1989.

Замовы — А. Ліцвіновіч
Прыказкі, прымаўкі, выслоўі — Л. Сяргун
Загадкі — В. Трайкоўская
Казкі — І. Крук
Паданні, легенды, былічкі, анекдоты — Г. Паўловіч
Балады — У. Раговіч
Любоўныя песні — Р. Яраслаўцава
Сямейна-бытавыя песні — В. Каладзінскі
Сіроцкія песні — Л. Марушкевіч
Жартоўныя песні — У. Васілевіч
Карагодныя, гульнёвыя і танцавальныя песні — А. Шырына
Сацыяльна-бытавыя песні — В. Ліцвінка
Прыпеўкі — М. Харчанка
Дзіцячы фальклор — М. Шаўлоўская
Змест-паказальнік — Л. Сысова, П. Юцкевіч.

Аўтары імкнуліся захаваць характэрныя дыялектныя асаблівасці гаворак Міншчыны, хоць у асобных выпадках дапускалася рэдагаванне яўных памылак запісаў або выканаўцаў фальклору.

Мелаграфія ў зборніку, за выключэннем асобна пазначаных запісаў, зроблена Г. Р. Кутыровай. Прыпевы, пазначаныя зорачкай, спяваюцца пасля кожнага радка.

Аўтарскі калектыў выказвае шчырую падзяку фалькларыстам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Рэспублікі Беларусь, работнікам культуры за падтрымку ў падрыхтоўцы гэтага зборніка і дапамогу ў арганізацыі і правядзенні студэнцкай вучэбнай практыкі па фальклору.

Самы сардэчны дзякуй і нізкі паклон тым сотням жывых і адышоўшых спевакоў, казачнікаў, таленавітых беларусаў, з чыіх вуснаў запісаны матэрыялы гэтай кнігі, якія з'яўляюцца сапраўднымі стваральнікамі гэтага зборніка.

АБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ

ВЕСНАВЫЯ ПЕСНІ

Традыцыйная веснавая паэзія Міншчыны прадстаўляе сабой даволі цікавую з'яву, якая не ў поўнай ступені адпавядае вызначэнню «рэгіянальная». Звязана гэта, безумоўна, з тым, што межы Мінскай вобласці крыху шырэй, асабліва на поўначы, поўдні і паўночным захадзе, чым межы цэнтральна-беларускага гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна паводле карты рэгіёнаў XIX — пачатку XX ст., складзенай В. С. Цітовым (Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 152). Менавіта таму так уражвае жанравая разнастайнасць веснавога цыкла Міншчыны, дзе да цяперашняга часу фіксуюцца песні масленічныя і вяснянкі, валачобныя і прымыкаючыя да іх па часе выканання паставыя, юраўскія, траецкія, унікальныя для цэнтральнай Беларусі куставыя і русальныя, лепшыя прыклады якіх ніжэй падаюцца ў падборцы. Як лёгка заўважыць, усе яны так ці інакш звязаны з народным веснавым календаром, і хаця прымеркаванасць пераважнай большасці веснавых песень з'яўляецца фармальна хрысціянска-праваслаўнай, іх першапачатковая народная змястоўная напоўненасць, якая яскрава адлюстроўваецца ў песенных сюжэтах, — відавочная і натуральная.

Бясспрэчна, сувязь абрадавых песень з адпаведнымі абрадамі зараз уяўляецца выканаўцамі больш-менш абстрактна, аднак яна існуе, аб чым сведчыць упэўненасць спевакоў у аднясенні твора да пэўнай жанравай разнавіднасці. Мінскі веснавы цыкл адкрываецца масленіцай. Песні, якія ўвайшлі сюды, запісаны пераважна ў вёсках на ўсход ад Мінска, а адна з іх, з вядомым баладным сюжэтам, — у Мядзельскім раёне («Калышыця, малойцы, калышыця»; па сведчанню выканаўцаў — «гушкальная на масляніцу»). Цікавай «веснавой» прыкметай масленічных песень з'яўляецца ўпамінанне ў тэксце «паставіцы» (гл. звычайны зачын: «Ў нас сягоння масленіца, Вылеціла з лесу паставіца»).

Традыцыйнымі сюжэтамі прадстаўлены вяснянкі: «Вол бушуя, вясну чуя», «загуканне» «Плыла вутка ракой, ракой», «Да й ўжэ вясна красна». Трэба адзначыць, што цяпер у народнай самасвядомасці вяснянкі не абавязкова прымяркоўваюцца да фактычнага пачатку вясны ці да пэўных свят менавіта ў гэты перыяд, пацвярджэннем чаму можа быць аднесенасць першай з названых

песень, запісанай у в. Кармазы Старадарожскага раёна, якую «спяваюць на Юр'я». Працоўнай прыкметай гэтага часу быў цыкл ткацкіх работ, асобныя іх элементы знайшлі адлюстраванне ў песнях «Вясна красна», «Да й ужэ весна красна».

Вартыя ўвагі тры балады, якія выканаўцы дакладна вызначылі як п а с т а в ы я песні, што спяваліся падчас Вялікага посту. Характэрна, што яны зафіксаваны на невялічкай тэрыторыі паміж Слуцкам і Любанню і, відаць, з'яўляюцца своеасаблівай жанравай прыкметай гэтага этнакультурнага арэала.

Найбольш буйная група сярод веснавых песень Міншчыны, якую даследчыкі звычайна вылучаюць асобна,— в а л а ч о б н ы я. Гэта, безумоўна, адзін з найбольш уласцівых данаму рэгіёну жанраў песеннай творчасці, аб чым, дарэчы, сведчыць і том «Валачобныя песні» (Мн., 1980) з серыі «Беларуская народная творчасць», дзе ледзь не трэцяя частка змешчаных тэкстаў пазначана як мінскія. Іншы раз выканаўцы гавораць аб гэтых песнях як аб велікодных, г. зн. прымеркаваных да Вялікадня або да велікоднай ночы, калі валачобнікі рухаліся з абходам. Адметная рыса валачобных песень — упамінанне ў іх Ісуса Хрыста (звычайна ў рэфрэнах) і найбольш шанаваных у народзе святых: Юр'я, Мікалая, Пятра, Іллі, радзей Божай маці. Аднак развіццё сюжэтаў дазваляе з упэўненасцю гаварыць аб пазнейшым уключэнні хрысціянскіх элементаў у значна больш архаічную фактуру, таму што святыя выступаюць у якасці самых звычайных сялян-земляробаў (параўн., напрыклад, у песні «Во, ці ў дому, ў дому панхазяін?»: «Во ідзе Пятро, падае сярпок, Во святоя Ілля... Дажала жыта харашусянька»). Сярод пададзеных у падборцы павінна выклікаць цікавасць песня «Дзень добры таму, да хто ў гэтым даму» — своеасаблівы народны каляндар, у якім, здаецца, не выпушчана ніводнае больш-менш значнае ў народным календары свята.

Адно з самых любімых у народзе свят — веснавы Юрай, з якім суадносіліся ў памяці людзей абрады жывёлагадоўчага (першы выган скаціны ў поле) і земляробчага (звычайна абходы палеткаў) цыклаў. Ю р а ў с к і я песні ў значнай ступені адлюстравалі іх (гл., напрыклад, «А ты, Юр'я, Мікола»). Характэрнай паэтычнай рысай песень, якія выконваліся падчас Юр'я, з'яўляецца выключна старажытны матыў ключоў: імі Юрай «адмыкае» зямлю, каб «выпусціць» траву, расу.

Толькі ў Любанскім і Старадарожскім раёнах запісаны т р а е ц к і я песні. Распаўсюджаныя «траецкія» рэаліі і дзеянні, такія як «кумленне» дзяўчат, віццё вянкоў і пусканне іх па вадзе, ваджэнне карагодаў (танкоў), яскрава адбіліся ў сюжэтах песень («Ой була Тройца, не бувала», «Кумушкі да галубушкі»). Некаторыя песні — «А на вясну красну», «Ой, ябланка наша» — выканаўцы прымяркоўваюць да Тройцы (Сёмухі).

Цалкам незвычайнай трэба лічыць фіксацыю ў Любанскім і Стаўбцоўскім раёнах дзвюх к у с т а в ы х песень: «Ой, зацвіла ў гародзе ружа» і «Ой, Тройца, Тройца, прасвятая Багародзіца», бо асноўны арэал іх жывога бытавання — мерыдыянальны пінска-ровенскі. Маючы на ўвазе, згодна з даследаваннямі апошняга часу, дастаткова шырокае, хаця і спарадычнае распаўсюджанне абрадавага тэрміна «куст», можна выказаць меркаванне аб такога ж роду былой распаўсюджа-



Івянецкія хлебаробы і майстры (майстар А. Пупко). Фота Я. Казюлі.

насці (не выключана, што і ў межах міграцыі песень ці іх сюжэтаў) куставых песень, звычайна звязаных з сёмушнымі (траецкімі) абрадавымі дзеяннямі, у прыватнасці з рытуальным выкліканнем дажджу.

Заканчваецца «вясна» традыцыйнага народнага календара русальным тыднем, на якім спяваліся р у с а л ь н ы я песні. Менавіта гэты тыдзень быў адным з замацаваных у народнай свядомасці як «небяспечны», бо ўстойліва звязваўся з разгулам нячыстай сілы, якая перш за ўсё прымала вобраз дэманічнай русалкі. Вельмі істотным у русальных песнях з'яўляецца матыў «праводзін русалкі», «штоб русалачка па жыту не хадзіла Да нашага жыцейка не ламіла».

Аб наступным, адным з найважнейшых на працягу года свяце (Купалле) нагадвае песня «Русалачка, купалачка».

1. Ў нас сягоння масленіца, масленіца...



Ў нас сягоння масленіца, масленіца,
Вылеціла з лесу ластавіца, ластавіца.

Садзіціся, мальцы, на коні, на коні,
Даганяці масленіцу у полі, у полі!

2. На святую масляніцу...



На святую масляніцу
Да вылятала ластавіца.

Да вылятала ластавіца
С чорнага мора на поле.

С чорнага мора на поле,
Сядайце, малойцы, на коней.

Сядайце, малойцы, на коней,
Да улавіце ластавіцу!

Да улавіце ластавіцу,
Да будзем гуляць масляніцу!

3. Каля горада вада йшла...



Каля горада вада йшла, вада йшла,
А ў горад вада лінула, лінула.
Там маладая ўтанула, ўтанула,
Назад хустачкай махнула, махнула.
Паслала паслы да татулькі, да татулькі.
Татулька кажа: «Ня ўспею, ня ўспею,
Варыцца піва бяз хмелю, бяз хмелю».
Паслала паслы да мамулькі, да мамулькі.
Мамулька кажа: «Ня ўспею, ня ўспею,
Стаяць красенцы бяз утку, бяз утку».
Каля горада вада йшла, вада йшла,
А ў горад вада лінула, лінула.
Там маладая ўтанула, ўтанула,
Назад хустачкай махнула, махнула,
Паслала паслы да мілога, да мілога.
Міленькі кажа: «Я ўспею, я ўспею,
Я ўсю работку пакіну, пакіну,
Сваю мілую абрадую, абрадую».

4. Яблань мая, яблань мая садавая!



Яблань мая, яблань мая садавая!
Дакуль табе, дакуль табе ў межах стаяць?
— Стаю гадок, стаю гадок, стаю другі,
На трэці год, на трэці год у сады пайду,
У сады пайду — цвісці буду.
Цвісці буду, цвісці буду белым цветам.
Яблыкі будуць, яблыкі будуць садовыя,
Шчапаць будуць, шчапаць будуць маладыя.

5. У гародзе, ў гародзе бяроза...



У гародзе, ў гародзе бяроза,
Веццейка дадолу.

Вінават, вінават Толічак —
Не едзе дадому.

Ужо ж яго, ўжо ж яго дзевачка
Мёд-віно папіла.

Мёд-віно, мёд-віно папіла,
Кубачкі пабіла.

Кубачкі, кубачкі пабіла,
На Дунай пусціла.

Не жаль мне, не жаль мне мёд-віна —
Я і сам нараблю.

Залатых, залатых кубачкаў
Я сам жа не зраблю.

* * *

6. А ехаў, а ехаў Толічак...

А ехаў, а ехаў Толічак,
Быстраю ракою.

Сарваў ён, сарваў ён красачку
Праваю рукою.

Каб мая, каб мая красачка
У руках не звяла.

Каб мая, каб мая дзевачка
З другім не стаяла.

Я ж гэту, я ж гэту красачку
У вадзе размачу.

Я сваю, я сваю дзевачку
І з другім разлучу.

7. Яблан мая, яблан мая садавая!



Яблан мая, яблан мая садавая!
Дакуль табе, дакуль табе ў межах стаяць?
— Стаю гадок, стаю гадок, стаю другі,
На трэці год, на трэці год ў сады пайду.
Цвісці буду, цвісці буду яблан-цветам,
Яблакі будуць, яблакі будуць садавыя,
Садавыя, садавыя, салодкія.
Будуць шчапаць, будуць шчапаць маладыя,
Маладыя, маладыя, харошыя.
Дзеткі будуць, дзеткі будуць драбненькія,
Служкі будуць, служкі будуць вярненькія.

8. На гарэ бабы сядзелі, сядзелі...



На гарэ бабы сядзелі, сядзелі,
Кулаком зямлю прабілі, прабілі,
Пра нявестак судзілі, судзілі:
Адна нявестка шэльма была, шэльма была,
Запаліла свечку, ў клець пайшла, ў клець пайшла.

9. На вуліцы дзеўкі гулялі, гулялі...



На вуліцы дзеўкі гулялі, гулялі,
Аб мяне, маладую, гукалі, гукалі,
А што ў мяне, маладой, муж ліхі, муж ліхі,
На вуліцу гуляць не пусціў, не пусціў.
А хоць пусціў — позненька, позненька,
Усе дзевачкі — розненька, розненька.
Дамоў ісці баюся, баюся,
Дзевератаньку кланюся, кланюся:
— Дзевератанька — муж'я брат, муж'я брат,
Давядзі мяне дадому, дадому.
Памыю кашульку дадолу, дадолу,
Дам я табе хусту шалкову, шалкову.

10. Стаяла, стаяла бяроза — вецейка дадолу...



Стаяла, стаяла бяроза — вецейка дадолу,
Зінават, вінават Алежка — не едзе дадому.

...ж яго жоначка сына радзіла,
...ына радзіла, у мора бросіла.

11. І варота скрыпяць...



І варота скрыпяць,
І марозы чуюць.

І вінават Ванёчка,
Што кажушкі нету.

— І нашто мне кажушка?
Ў мяне ёсць Анёчка!

Іна сама спацея
І мяне нагрэя.

12. Калышыця, малойцы, калышыця...



Калышыця, малойцы, калышыця, калышыця!
На мяне, маладую, не глядзіця, не глядзіця:
Да я ўжо, маладая, заручона, заручона,
Я ад таткі, ад мамкі адлучона, адлучона.
Праважала маці дочку, праважала, праважала.
А дзе мамка з дачушкай пастаяла, пастаяла,
А там вырасла яблынка садавая, садавая.
А дзе мамка з дачушкай пасядзела, пасядзела,
Там вырасла рута-мята і лялея, і лялея.
А дзе мамка з дачушкай рассталася, рассталася
А там быстрая рэчачка разлілася, разлілася.

13. Каля студні карыта...



Каля студні карыта
Поўна вады наліта.

Поўна вады наліта,
Пчолкі ножкі мачалі.

Пчолкі ножкі мачалі,
Дзеўкі ваду выпілі.

Каля студні карыта
Поўна вады наліта.

Кошкі ножкі мачалі,
Хлопцы ваду выпілі.

14. Ў нас сягоння масленіца...



Ў нас сягоння масленіца,
Выляцела ластавіца.

І выляцела ластавіца
З чорнага лесу на поля.

З чорнага лесу на поля,
Садзіцеся, малойцы, на коня.

Садзіцеся, малойцы, на коня
Да спаймайця ластавіцу.

Да спаймайця ластавіцу,
Папытайцеся ў ластавіцы.

Папытайцеся ў ластавіцы,
Што ў Кіявя дзелаецца.

Ой, дзевіца, дзевіца,
Дзевяць малойцаў жэніцца.

Дзевяць малойцаў жэніцца,
Дзесятая панна замуж ідзе.

Дзесятая панна замуж ідзе,
Дзевяць карчоў згарэла.

Дзевяць карчоў згарэла,
Дзесятая — школачка.

Дзесятая — школачка,
Й усім жыдам шкодачка.

15. Вясна красна...



Вясна красна,
Да чужыя малодкі ткуць кросна,

Ткуць кросна,
Я, маладзенька, ні прала,

Ні прала,
Пад лёд кудзелькі пускала,

Пускала,
Да ідуць людзі — дзівяцца,

Дзівяцца —
Чые ета кудзелькі беляцца,

Беляцца,
Ці не тае дзевачкі-гультайкі,

Гультайкі,
Да штодзень хадзіла ў пагулянкі,

Пагулянкі,
Да крупы, сало насіла,

Насіла,
Да ўсіх малойцаў маніла,

Маніла,
Аднаго хлопчыка зманіла.

16. Да й ужэ весна красна...



Да й ужэ весна красна,
Да чужые жоначкі ткуць кросна.

Адна мая жонка гультайка,
Што хадзіла к людзям у пастаянкі.

Што хадзіла к людзям у пастаянкі,
Падпірала людзям да лаўкі.

Падпірала людзям лаўкі
Да казала людзям казкі:

— Паплевеце, кудзелькі, валакенцам,
Прыплывеце, кудзелькі, палаценцам.

А ўсе людзі будуць дзівіцца:
Да чые то палаценцы беляцца?

Эта тае жонкі-гультайкі,
Што хадзіла к людзям у пастаянкі.

17. Верба кудравая...



Верба кудравая**,
Ня стой над ракою,
Ня клонься са мною!

Ў мяне чужа маці,
Адна спацькі кладзецца,
Рана пабуджаець.

** Кожны радок паўтараецца.

18. Вол бушуя, вясну чуя...





Вол бушуя, вясну чуя,
Воран крача, сыра хоча,
сыра хоча.

Воран крача, сыра хоча,
Дзеўка плача, замуж хоча,
замуж хоча.

Не бушуй, волік, пойдзеш у поля,
Пойдзеш у поля, наарэшсы,
наарэшсы.

Не плач, дзеўка, пойдзеш замуж,
Пойдзеш замуж, нажывешса,
нажывешса.



«Жавараначкі, прыляціце» (майстар з Барысаўшчыны М. Ржэуцкі).

19. Плыла вутка ракой, ракой...



Плыла вутка ракой, ракой**,
Вела дзетак з сабой, з сабой.
— Сядзьця, дзеткі, пасядзіця,
А я злітаю к татку ў госці.
Таткі дома не бачыла,
Сваіх дзетак патраціла.

** Кожны радок паўтараецца.

20. Цераз пень, цераз пень, цераз калоду...



Цераз пень, цераз пень, цераз калоду**
Скакалі хлопчыкі з маста на воду.
— Бадай вы, хлопчыкі, патапіліся,—
Чаму вы ўвосень не жаніліся!
— Бадай вы, дзевачкі, вялікі раслі,—
Як мы вас сваталі — вы за нас ня йшлі!

** Кожны радок паўтараецца.

21. А ў гародчыку на прасотнічку...



А ў гародчыку на прасотнічку,
Вясна красна на ўвесь свет!*
Там сядзела пташак многа.
А дзе браўся шэры салавейка,
Усіх пташак паразганяў,
Адну зязюлю ён спадабаў.
Яна ў яго прасілася,
Прасілася, малілася.
— Хоць прасіся, ні прасіся,
А я цябе ня выпушчу,
А выпушчу — дык зазначу:
Тваё пер'я пакудлачу,
Ты да пташак не прыстаніш,
З варанамі ў раду сядзеш.

А ў Колі на падвор'і,
Там сядзела дзевак многа,
Дзевак многа — тры радочкі,
Пелі песню ў галасочкі.
А дзе браўся малады Андрушка,
Усіх дзевак паразганяў,
Адну Манечку ён спадабаў,
Яна ў яго прасілася.
— Хоць прасіся, ні прасіся,
А я цябе ня выпушчу.
А выпушчу — дык зазначу:
Русы косы раскудлачу,
Ты да дзевак не прыстаніш,
Ты ж да мяне ў раду сядзеш.

22. Цераз рэчачку гібка кладачка...



Цераз рэчачку гібка кладачка,
Ой, рана, рана, гібка кладачка**.
Да тудой ішла сістра й братачка.
Братка перайшоў, сістра ўтонула,
Сістра ўтонула, ўсё прамовіла:
— Не бяры, братка, й у рацэ вады,
Не лаві, братка, й у рацэ рыбы:
У рацэ вада — то мае слёзкі,
Й у рацэ рыба — то мае дзеткі,
Акунёчкі — мае сыночкі,
А шчучачкі — то дачушачкі.

** Прыпеў «Ой рана, рана» і другая палова кожнага радка паўтараюцца.

23. Паедзем, мілы, і к татку ў госці...



— Паедзем, мілы, і к татку ў госці,
Ой, рана, рана, і к татку ў госці!**
— Я каня не дам, сам не паеду.
— Прападай, мілы, з вараным канём!
Я к свайму татку пехатой зайду.
Я й пяхотаю, я й с ахотаю.
Я іду полем, я й другім іду,
А на трэццяя й саступаючы,
Я і с татачкам сустракаючы:
— Дзень добры, татка!— А здароў, дзіця!
Ці добра, дзіця, у чужых людзях?
— Ці добра й татка, каню ў дарозя?
Каню ў дарозя й у цяжкім возя?
Так і мне, й татка, й у чужых людзях:
У канец стала настаялася,
Каждаму піці й надавалася.

** Прыпеў «Ой рана, рана» і другая палова кожнага радка паўтараюцца.

24. Была ў мамкі адна дачка...



Была ў мамкі адна дачка,
Адна дачка, работніцка.

Была зіма — дачка жыла,
Прышла вясна — дачка ўмерла.

Прышла вясна — дачка ўмерла,
Прышла лета — дачкі нету.

Пашла мамка на магілу:
— Зяцю, зяцю, земляніну,

Узяў дачку — не пытаўся,
І мне, мамцы, не кланяўся.

Дзіця маё маладоя,
Дзе падаркі падзяваці?

Ці дарожкі высцілаці,
Ці дубочкі абвязаці?

— Мамка мая родная,
Што дубочак — то сваточак.

Што дубочак — то сваточак,
Бярозачкі — то дружачкі.

25. Была ў мамкі адна дачка...



Была ў мамкі адна дачка**
Да звалася Ганулячка.

Яна яе шкадавала,
Прыйшлі ў сваты — не аддавала,

Прышлі ў сваты — не аддавала,
Прышла зямля — сама ўзяла.

— Ой, зяцю мой, земляніну,
Узяў дачку — не пытаўся.

Дзіця маё маладое,
Дзе падаркі падзяваці:

Ці дубочкі пааб'язваці,
Ці дарожкі паўсцілаці?

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

26. Было ў мамкі дзевяць сынкоў...



Было ў мамкі дзевяць сынкоў**,
Дзевяць сынкоў, адна дачка.

Сынкі ўраслі — ў разбой пашлі,
Дачка ўрасла — замуж пашла.

Да за купчыка халастога,
Двараніна маладога.

Паехалі купцаваці,
Сталі ў лесе начаваці.

Прышлі да іх разбойнічкі,
Ўзялі купца да й забілі.

А на купцовую сказалі:
— Ты, купцова, адкуль родам?

— Бо я роду вялікаго,
Таткі й мамкі багатаго.

Было ў мамкі дзевяць сынкоў,
Дзевяць сынкоў, адна я.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца

27. Ішоў Госпад лесам-борам...



Ішоў Госпад лесам-борам,
Сустрэў дзеўку ў цёмным леся**.

Сустрэў дзеўку ў цёмным леся,
Эта ж дзеўка воду неся.

— Ох, ты, дзеўка, падай вады —
Богу ручкі-ножкі памыць.

Дзеўка Бога не й узнала,
Богу брудна адказала:

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

— Мая ж вада нячыстая:
Дрэвам-лісцям западала.

— Ох, ты дзеўка-нечысцёха,
Ў цябе й вада нячыстая.

Дзевяць сынкоў спарадзіла,
Ніводнага ня хрысціла.

Ніводнага ня хрысціла,
Ўсе ў Дунаі патапіла.

Тады дзеўка Бога ўзнала,
Богу ў ножкі, ў ручкі пала.

— Ох ты, дзеўка, не ўлякайся,
Йдзі да ксёндза, спавядайся.

28. У нядзельку па абедзя...



У нядзельку па абедзя
Хадзіў Госпад па ўсём свеця**.

Хадзіў Госпад лесам-борам,
Стрэў дзяўчыну — нясе воду.

— Пастой, дзеўка, пастой, красна,
Дай вады мне напіцца.

— Мая вада нячыстая,
З дрэва лісця намяло.

— Ой, ты, дзеўка, не скрывайся,
Йдзі да ксёндза, спавядайся,

Йдзі да ксёндза спавядайся,
Сваім грахом прызнавайся.

Пашла дзеўка да цэркаўкі,
Самі дзверы адчыніліс,

Самі прэстолы засцілаліс,
Самі свечы зажыгаліс.

Сама пеўча заспявала,
Стала дзеўка спавядацца,

Стала дзеўка спавядацца,
Стала цела распадацца.

Дзевяць сынкоў падбяжалі,
Матчына цела падабралі.

** Апошняя палова другога радка паўтараецца.

29. Весна красна наставала...



Весна красна наставала**,
Сестра ж брата ў госці звала:
— Прыедзь, прыедзь, братка, ка мне,
Прыедзь, прыедзь, родны ка мне!
Майго ж мужа дома нема.
А мой жа муж у баёчку,
Ён б'ецца дзень і ўсю ночку.

** Кожны радок, акрамя трэцяга і чацвёртага, паўтараецца.

30. Да на Вялікдзень, да на першы дзень...



Да на Вялікдзень, да на першы дзень,
Хрыстос васкрэс на ўвесь свет!**
Да збіраліся ўсякія малойцы.
А які малойцы?— маладыя хлопцы.
— А куды мы пойдзем, мае мілы брацья?
— Ой, пойдзем мы к слаўнаму пану,
К слаўнаму пану, да пад яго браму,
Да пад яго браму, пад акошачка.
Да казалі, ў пана вялікая дзіва:
Ў панскім дварочку, як у вяночку,
Панскія дзеткі, як у гародзе кветкі,
Пасярод двара да стаіць вярба.
А на той вярбе залатоя крэсла,
Да на том крэсля да дзіван ляжыць,
На том дзіваня да сам Бог сядзіць,
У правай рэнке да свячу дзяржыць,
Да свячу дзяржыць да святкі лічыць.
— Юрай, Юрай, дзе так прыпазніўся?
— Да я ў таго пана па межам хадзіў.
Па межам хадзіў да жыта радзіў.
Нарадзіў грэчкі чатыры засечкі,
Аўса, ячменю — то не палажыці.
А с каласочка будзя жыта бочка,
А с каласінкі — чатыры асьмінкі.
Да казалі, у пана вялікая дзіва.
А якая дзіва?— што хата без печы.
Пазавеце ў хату, мы палядзім печы.
Дзеці хату мятуць, нас у хату пазавуць.
Памасці кладку, пазаві у хатку.
Пані пану міла, добра ўгадзіла.
Проша выщці да ў ганачак.
Проша вынесці нам падарачак:
Сем пар кілбас, да і будзя з нас,
Сыр бяленькі, кварта гарэлкі.
Ой, славян пан, да бывай здароў!
З мілаю жаною, з люба дзеткамі.

** Кожны радок і прыпеў паўтараюцца.

31. Ай, ішлі-пайшлі добры молайцы...





Ай, ішлі-пайшлі добры молайцы,
Хрыстос васкрэс, сын Божы!**
А ішлі яны, ўсе шаталіся,
Багатырскі двор усё пыталіся.
А па чым знаток багатырскі двор?—
На ім шуллейка ўсё дубовае,
Падваротніцы ўсе цесовыя,
Па двару ішлі — кладачкі клалі.
Дзень добры таму, хто ў гэтым даму!
А ці спіш-ляжыш, ці адпачываеш?
А калі спіш, дык Бог з табою,
А калі ня спіш — гукай са мною,
Гукай са мною, як муж з жаною.
Здзевайце, братцы, бабровы шапкі**,
Благадарыце гэтаму пану
За яго дары, за вялікія,
За яго сталы, за дубовыя,
За яго скацеркі, за рубчастыя.
А мы госцейкі ды не частыя,
Круглы гадочак — адзін разочак.

** З гэтага радка песня спяваецца на іншы напеў (гл. ноты).

32. А была ў бабкі курка-рабка...

А была ў бабкі курка-рабка,
Хрыстос васкрэс, сын Божы!*
Нанясла яечак поўны карабечак.
А ўсім дзеткам па яечачку,
Адной сіраце ды ня выйшлося.
На табе, сірата, хоць курачку,
Сірата не бярэ і з двара ня йдзе.
На табе, сірата, хоць гусачку,
Сірата не бярэ і з двара ня йдзе.
На табе, сірата, хоць каровачку,
Сірата не бярэ і з двара ня йдзе.
На табе, сірата, і мамачку,
Сірата ўзяла і з двара пайшла,
І падскакаючы, і заплакаючы.

33. А на моры гібка кладка...



А на моры гібка кладка,
Там хадзіла Божа матка.
Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс,
Хрыстос васкрэс!**

Ішла яна, хілялася,
Свайго сына пыталася.

Прайшла яна адно поля,
Прайшла яна і другоя.

На трэцяя ступаючы,
Свайго сынка пытаючы,

Напаткала трох ангелаў,
Трох ангелаў-храніцеляў.

— Вы, ангелы-храніцелі,
Сынка майго ці відзялі?

Адзін кажыць: «Я ня відзяў»,
Другій кажыць: «Я ні знаю».

Трэцій кажыць: «Я сам там быў,
Я сам там быў, яму служыў.

Твайго сына жыды ўзялі,
На хрэст святой распіналі.

На хрэст святой распіналі,
Ручкі, ножкі прыбівалі.

Ручкі, ножкі прыбівалі,
Кроў святую пралівалі.

На тым мейсцы царква стаіць,
А ў тэй царкве сам Бог сядзіць.

Сам Бог сядзіць, лісты пішыць,
Лісты пішыць, Пятро клічыць:

— Святы Пётра, падай ключы.
Падай ключы царкоўныя.

Падай ключы царкоўныя,
Вітай душы пякельныя».

** Паўтараецца пасля кожнай страфы.

34. Во, ці ў дому, ў дому пан-хазяін?



— Во, ці ў дому, ў дому пан-хазяін?
Хрыстос васкрэс на ўвесь свет!*
Во, ці ў дому, ў дому пані-гаспадынька?
— У новай святліцы прыбіраецца,
У Божую цэркаў сабіраецца.
У Божую цэркаў — Богу памаліцца,
Богу памаліцца, яшчэ пакланіцца
Ой, усім святам — Юр'ю, Міколу.
А Мікола Юр'ю да недаглядала.
К Казьму захадзіла, жнечак адпраўляла.
Пашла, жыта да выгорваючы,
Каб красавала, налівалася,
Слаўнага Пятра дажыдалася.
Во ідзе Пятро, падае сярпок,
Во святая Ілля, дзе дажджом мыла,
Умывалася, прыбіралася.
Вышла на поля да бялюсянька,
Дажала жыта харашусянька,
Да жыта дажала, ў снапы павязала.
— Слаўны гаспадару, адчыняй гумно!
Адчыняй гумно — вязе Ілля дабро!

35. На Вялікадня, да на первы дзень...

На Вялікадня, да на первы дзень,
Зялён явар, зялёны!*
Белыя малойцы сабіраліся:
— Пойдзем, братцы, мы дарогаю,
Мы дарогаю шырокаю.
Пойдзем, братцы, мы іграючы,
Іграючы і гуляючы,
Госпада Бога сустракаючы:
— Госпадзі Божа, укажы дарогу
К добраму сялу,
Ў Лысаю Гару,
К слаўнаму пану,
К пану Івану.
— А чым жа ён очэнь славён:
Ці сваім гумном,
Ці сваім дабром,
Ці сваёю мілаю жаною,
Ці сваімі дробнымі дзеткамі?
— А ён жа ў нас усім славён:
Ў яго ў гумне шатры ўюцца,
Ў яго ў двары з хлебам амбары,
Яго жана па двары ідзе,
Сваіх дзетак карагод вядзе.
Выйдзі, пан Іван, к нам на ганачак,
Просім вынясці нам падарачак:
Тры тысячы, ды ня лічачы,
А мы тыя тысячы самі пералічым,
Слаўнага Івана павялічым.

36. Чэраз канапельку чорная сцежка...





Чэраз канапельку чорная сцежка.
Вітам віном зялёным!*
Туды ішла красна паненка.
Туды ішла — віно несла.
Аттуль ішла — ваду несла.
Спаткалася з трыма панічамі.
— Куды ідзеш, а што нясеш?
Дай вады ўмыцца, а віна напіцца.
Загадаем сем загадак.
Калі адгадаеш — наша будзеш,
А не адгадаеш — пойдзеш ў чужы людзі.
А што расце бяз кораня?
А што бяжыць бяз повада?
А што гарыць бяз поламя?
А што чорна, ня чэрнючы?
А што бела, ня белючы?
А што блішчыць, не малюючы?
А што міла не гадуючы?
— Камень расце бяз кораня.
Вада бяжыць бяз повада.
Зара гарыць бяз поламя.
Чорны воран ня чэрнючы.
Лебедзь белы ня белючы.
Павук блішчыць не малюючы.
Дзеўка міла не гадуючы.

37. Лятала пава саду, па саду...



Лятала пава саду, па саду,
Хрыстос васкрэс, сын Божы!*
Раняла пер'е ў зелёну траву.
А там Ніначка кароў пасціла,
Кароў пасціла, пер'е збірала.
Пер'е збірала, ў падалок клала,
З падала брала, вяночак віла.
Завіўшы вяночак, пайшла ў таночак,
Пахілілася ды пахвалілася.
А ніхто не скопіць пярловы вянок,
Пярловы вянок, залаты вяршок.
Як узнілася шура ды бура,
Як падхапіла пярловы вянок,
Пярловы вянок, залаты вяршок.
А пайшла яна, ўсё пытаючы,
Ўсё пытаючы, усе шукаючы.
Спаткала яна ды трох молайцаў:
— Ах, вы молайцы, вы рыбалойцы,
А ці відзелі пярловы вянок,
Пярловы вянок, залаты вяршок?
Адзін кажаць: «Я й ня відзеў!»
Другі кажаць: «Я ня бачыў!»
Трэці кажаць: «Я ў руках дзяржаў,
Я ў руках дзяржаў, на мора пушчаў».
Аднаму я буду суседачка,
Другому я буду братовачка,
Трэцяму буду мілая жана.
Аднаму я дам залато кальцо,
Другому я дам шалковы платок,
Трэцяму дам я белую руку,
За белай рукой я сама пайду.

38. Дзень добры таму, да хто ў гэтым даму...





Дзень добры таму, да хто ў гэтым даму,
Хрыстос васкрэс, сын Божы!*
Да у новенькім, да ўсе й свянцоненькім!
Устань раненька да ўмыйся беленька,
Ўмыйся беленька, ўтрыся сухенька.
Адзень рубашку тонку, беленьку,
Адзень майтачкі суятовыя,
Суятовыя, трохрублёвыя.
Адзень боцікі шчэ й казловыя,
Шчэ й казловыя, сямірублёвыя.
Адзень шубачку семі сабалёў,
Семі сабалёў да на сто рублёў.
Адзень шапачку шчэ й бабровую,
Шчэ й бабровую, семірублёваю,
Гаспадарочак, слаўны паночак!
Адчыні вакно, палядзі ў гумно:
Што ў тваім вакне да за прыявачка,
За прыявачка да прыявілася:
Нова цэркаўка да станавілася.
Да ў той цэркаўцы прэстолы стаяць,
Да на тых прэстолах шчэ сваткі сідзяць.
От, пасрэдзі іх прэстолік стаіць.
Да на том прэстоле сам Гасподзь сядзіць.
Сам Гасподзь сядзіць, кніжэчку дзяржыць,
Кніжэчку дзяржыць, кнігу чытая,
Ўсех сваіх святкоў ён расстаўляя:
Катору святку напярод пайці,
Да катораму да ўсе й пазадзі.
Свято Раждзство да наперад пашло,
Наперад пашло да і з Васіллейкам
Святое Васілій — Новенькі гадок,
Новенькі гадок — праздраўляць будзім.
Святое Хрышчэніе — ажыдаць будзім.
Святое Хрышчэніе ваду крысціла,
Ваду крысціла, на свет пусціла.

Святые грамніцы воск сабіралі,
Воск сабіралі да свечы сукалі.
Свечы свяціўшы, да к Юр'ю паклалі.
Свята масленіца — загавейны дзень,
Загавейны дзень да на сем нядзель.
Святы Саракі — да сорак выраяў.
Благавешчыння каня гадуя,
Каня гадуя, саху гатуя.
Святая вярбніца вербу ламала,
Вербу ламала да ўсе й асвяшчала.
Ўсе й асвяціўшы, да к Юр'ю паклала:
І заворываць, да і запасываць.
Святая Пасха і с красным яйцом.
Краснае яйцо — на разгавення
Да малым дзеткам на уцяшэння.
Малыя дзеткі на вулку ідуць,
На улку ідуць да па яйку нясуць.
І с улкі ідуць, улыбаюцца,
Улыбаюцца, а размаўляюцца,
Во да іх атцы да ўсе й ўцешаюцца:
— Во святы Юрый, да ён заворываў,
Ён заворываў да і запасываў
Вараным канём, залатой сахой,
Залатой сахой с іконай святой,
С іконай святой, з грамнічнай свячой,
С вербавым дубцом, з беленькім яйцом,
З беленькім яйцом і з добрым слаўцом.
Свята Радуніца — абрадуй, Божа,
Абрадуй, Божа, першаю сяўбой.
Першая сяўба — да ячмень-шэсцярэнь.
Другая сяўба — да авёс залацісты.
Свято Ушэсце да яру сеіла.
Стары Мікалай, старэнькі дзядок
Да Бога пашоў да ключыкаў прасіць,
Ключыкаў прасіць зямлю атамкнуць
На траву-расу да на жыта-красу.
Свята Сёмуха да жыта красуя,
Святы Дзевятнік да май ўстаўляя,
Свята Дзесятуха ўсё й налівая,
Во святой Пётра да ўсе й зажыная.
Святая Ілья — да старая жняя.
Папашла ж яна да жыта зажынаць
С маленькім сынком, з беленькім сырком.
Што разок махнёт, то снапок нажнёт,
Во святы Спасок, вязі ў гумно снапок.
Свята Прэчыстая жыта сеіла,
Во другая ей да ўсе й памагала.
Свята Ўздзвіжэння да с поля здзвіжыла.
Святы Сіцыян да ляны пасцілаў,
Святы Бугаслаў да буракі капаў.

Святы Пакрава да зямлю пакрылі,
Зямліцу лістком да вадзіцу лядком.
Святые Дзяды да замарозілі.
Кузьма і Дзям'ян, да бярыце мяшкі,
Бярыце мяшкі да ідзіце на ток
Жыта малаціць, ў засекі насіць.
Гаспадарочак, да слаўны паночак!
Пакладзі кладку да пазаві ў хатку:
Кварту гарэлкі да пірог бяленькі.
К таму пірагу да міску тварагу.
Пачынальнічку да чырвоны злоты,
Чырвоны злоты да яму на боты.
Во падхватнічкам да па дзесятачку,
А механошу — мерку пшаніцы.
Мерку пшаніцы да на верх суніцы.
Во цяжка нясці — ня будзя клясці.
Хоць паваліцца, так не ўдарыцца.
Хрыстос васкрэс! Хрыстос васкрэс! Хрыстос васкрэс!

* * *

39. Ой рана, рана да сонца іграла...

Ой рана, рана да сонца іграла,
Хрыстос васкрэс, сын Божы!*
Да па той парэ да пава лятала.
Ляцела пава да серабрыстая,
Брасала пер'я да залацістая.
А тудой ішла да млада дзевачка,
Млада дзевачка, да млада Верачка.
Усё то пер'я да пазбірала,
Да пазбірала, ў пучок звязала,
Ў пучок звязала, вяночык звіла.
Вышла на улку да выхвалялася:
— Ніхто майго венчыка да не сарвёт —
Ні шура-бура, ні дробны дожджычак.
Як узнялася да шура-бура,
Сарвала венчык да пакаціла.
Пашла Верачка да ўсё шукаючы,
Ўсё шукаючы да ўсё гукаючы.
Да налучыла да трох хлопчыкаў.
— А вы, хлопчыкі да вы, малойчыкі,
Ці ня відзелі да майго венчыка?
Адзін тут кажа: «Я відзець-відзіў».
Другі тут кажа: «Я ў ручках дзержаў».
А трэцці кажа: «Я на галоўку клаў».
— Дарую таму, да хто відзець-відзіў,
Хто відзець-відзіў да шоўкавы платок.

Дарую таму, да хто ў ручках дзержаў,
Хто ў ручках дзержаў, да залато кальцо.
Дарую таму, хто на галоўку клаў,
Хто на галоўку клаў — я сама буду.

40. Добры вечар, пане гаспадару...[1]

Добры вечар, пані гаспадару,
Вясна красна на ўвесь свет!*
Ці спіш, ці ляжыш, ці на печы сядзіш?
Адчыні вакенца, паглядзі ў гуменца,
Паглядзі ў гуменца, што там дзеецца.
Ў тваім гумні да й стол стаіць,
За тым сталом сам Бог сядзіць,
А ля Бога тры святыя,
Шыкуюцца, рахуюцца,
Каторому ўперад стаці.
Уперад стала свято Юр'я,
А за ім жа — святы Мікола,
За Міколам — святы Ілля.
Стала Юр'е поле засяваці,
Стаў Мікола скот напасаці,
Стала Ілля жыта зажынаці,
Пашла й хазяйка ў поле жыта жаці
З залатым сярпочкам, з маленькім сыночкам.
Дзе раз выжне, там жменькі кладзе,
Дзе жменькі кладзе, там стаўкі ставя,
Дзе стаўкі ставя, там копы ліча,
Дзе копы ліча, там тарпы кладзя.
Адна тарпа аржаная,
А другая — ячменная,
А трэццяя — пшанічная.
А з аржанай — гарэлку гнаці,
А з ячменнай — піва варыці,
А з пшанічнай — пірог пячы.
Гарэлку гнаці — дачку аддаваці,
Піва варыці — сына жаніці:
Пірог пячы ўсім на закуску.

[1] Да напеву № 21.

41. Гаспадынька-бабка, павярніся крутка...





Гаспадынька-бабка, павярніся крутка,
Вясна красна на ўвесь свет!*
Масці кладку да й заві ў хатку.
Скавародку ў печ, па яечкі ў клець,
Кварту гарэлкі й сыр на талерку.
Кілбасы ў куточку вісяць на пруточку,
Прыстаўляй драбіну, лезь па саланіну.
Мы госцікі нібывалыя,
Нібывалыя, нідакучныя,
Мы вам часта ні дакучаім,
У гадочку ночку.

42. Гаспадынечка, як маліначка...



Гаспадынечка, як маліначка,
Вясна красна на ўвесь свет!*
Ўстань раненька, ўмыйся беленька,
Бяры ліхтарок, ідзі ў хлявок.
А ў тваім хляўцы прыява стала,
Прыява стала, заявілася:
Дваццаць каровак ацялілася,
А яшчэ дваццаць — назначылася.
— Вы, дачушачкі, мае служачкі,
Да й бярыця вы па даёначцы,
Падаіце вы па каровачцы.

43. Балачэнікі валачыліся...





Валачэнікі валачыліся**,
Хрыстос васкрэс на ўвесь свет!
Па самы пояс замачыліся.
А куды мы пойдзям, наша міла брацья?
Пойдзям жа мы да вулачкаю
К слаўнаму пану на падвор'яйка.
Пад акошачка маляваная.
Слаўны паня, палажы кладку.
Сорак яек — сорам даці,
Да пяці дзесяткаў можна пашукаці.

** Кожны радок паўтараецца.

44. А ты, Юр'я, Мікола...



А ты, Юр'я, Мікола,
Абыдзі жыта наўкола!
Юр'я кажа: караніста.
Мікола кажа: каласіста!
Разгуляўся Юр'яў конь,
Разбіў гарэх капытом.
Ідзіце, дзевачкі, тушыце,
Рэшытам ваду насіце.
Як у рэшаце вада ёсць,
Так у хлопчыкаў праўда ёсць.

45. Раз'юраўся Юр'яў конь...



Раз'юраўся Юр'яў конь
Да ляцеў з гары ды у дол.

Ляцеў з гары ды у дол
Да разбіў камень капытом.

Як у камене зярнё ёсць,
Так у хлопчыкаў праўда ёсць.

46. Юрай, падай ключы!



— Юрай, падай ключы!**
— Матка, каторыя?
— Сынку, земляныя.
Зямлю адмыкаці,
Расу выпускаці,
Траву паліваці.

* * *

— Юрай ніжанатый,
Стары барадаты,
Чаму ня жэнісся?
— Матка, дзевак нету,
Толька адна рожа,
Й та ў гародзя
Тынам абтынёна,
Садам абсаджона,
Вадой апушчона,
Жытам абсеяна.

Я тын паламаю,
А сад парубаю,
Ваду паспускаю,
Жыта на хлеб сажну,
Рожу к сабе вазьму.

* * *

Юрай, Божа пташка,
Ляці аж на неба,
Глядзі, што Бог робіць.
Сам Бог сына жэніць,
Усю радню спрасіў,
Толька на Йллю забыў.
Ілля задзівіла,
Тры хмары спусціла:
Адну лядавую,
Другу снежавую,
Трэццю дажджавую.

** Кожны радок паўтараецца.

47. Божа мой! О Юр'я, Юр'я, адамкні зямлю, Божа мой!



Божа мой! О Юр'я, Юр'я, адамкні зямлю, Божа мой!**
Адамкні зямлю, выпусці траву,
Ніхай трава павіваіцца!

** Прыпеў «Божа мой!» абрамляе кожны радок.

48. Калінушка... Калінушка-малінушка...





Калінушка... Калінушка-малінушка,
Ружовенькі цвет,

Харошая... Харошая кунпанія,
Дзе мой мілы п'ець.

Эй! Ён п'ець, ён п'ець, галубчык мой,
За мной, младой, шлець.

А я, млада... А я млада, младзюсенька,
Замешкалася.

За вуцямі.. За вуцямі, за гусямі,
За лебядзямі,

Эй, за дробнаю, за пташачкаю,
За жураўкаю.

Эй, а там, а там за рэчкаю
Слабодка стаіць.

Эх, а ў той.... А ў той жа слабодцы
Новыя двары.

Эй, а ў тых, а ў тых жа да дварах
Чатыры кумы.

Вы кумушкі... Вы кумушкі-галубушкі,
Падружкі мае,
Куміцеся... Куміцеся-любіцеся,
Любіце і мяне.

Як пойдзеце... Як пойдзеце ў вішнёвы сад,
Ўспомніце і мяне.

Як будзеце... Як будзеце кветкі збіраць,
Збярыце і мне.

Як будзеце... Як будзеце вянкі звіваць,
То звіця і мне.

Як будзеце... Як будзеце ў Дунай пускаць,
Пусціце і мой.

Усе вянкі... Усе вянкі ў плавок пайшлі,
А мой патануў.

Усе мужы... Усе мужы з вайны прыйшлі,
А мой не прыйшоў.

Усе мужы... Усе мужы жанатыя,
А мой халастой.

49. Кумушкі да галубушкі...



Кумушкі да галубушкі,
Падружкі мае!

Куміцеся да любіцеся,
Любіця і мяне.

Як будзяця краскі рваці,
То нарвіця вы мне.

Як будзяця да вянкі віці,
Савейця ж(а) вы мне.

Як будзяця да на воду пускаць,
Пусціця ж вы мой.

Усе вянкі паверх вады,
А мой затануў.

Усе дружкі з вайны прыйшлі,
А мой загінуў.

50. Ой, баравая зеўзюлячка...



Ой, баравая зеўзюлячка,
Не кукуй рано й у дуброве.

Не кукуй рано й у дуброве**,
Не будзі мене, й маладую.

Не будзі мене, й маладую,
Ў мене, маладой, дзіця малое.

Ў мене свекруха, не свая маці,
Не пакалыша майго дзіцяці.

Хоць пакалыша часіначку,
Пракліне маю радзіначку.

Як пакалыша і трэццюю,
Праклене й мене, старэйшую.

** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

51. Ой, ябланка наша...



— Ой, ябланка наша**,
Божа міл...(ы)!
Даколь ты стаяла?

— Ой, стаю я лета,
Божа міл!..
Стаю я другоя.

На трэцяе лета
Божа міл!..
Гольям апушчуса.

Гольям апушчуса,
Божа міл!..
Лістам абаўюса.

— Вой, Ганначка наша,
Божа міл!..
Даколь ты гуляла?

— Вой, гуляю лета,
Божа міл!..
Гуляю другоя.

На трэцяе лета,
Божа міл!..
Коскамі пушчуса.

Коскамі пушчуса,
Божа міл!..
Слёзкамі 'бальюса.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.



«Гуканне вясны» ў Мінску. Фота Я. Казюлі.

* * *

52. А на вясну красну...

А на вясну красну**,
Божа мілы!
Радзі, Божа, жыта.

Радзі, Божа, жыта,
Божа мілы!
Жыта і пшаніцу!

Жыта і пшаніцу,
Божа мілы!
Ўсякую пашніцу.

На полі капамі,
Божа мілы!
На гумне скірдамі.

На гумне скірдамі,
Божа мілы!
На таку малотам.

На таку малотам,
Божа мілы!
Ў млыне прымялістам.

Ў млыне прымялістам,
Божа мілы!
Ў дзяжы падыходам.

Ў дзяжы падыходам,
Божа мілы!
А ў печы прыпёкам.

А ў печы прыпёкам,
Божа мілы!
А на стале сыццю.

А на стале сыццю,
Божа мілы!
Із беленькім сырцам.

53. Ой, ў агародзе ж на холадзе...



Ой, ў агародзе ж на холадзе
Да стаяў калодзесь вады повен.

Да стаяў калодзесь вады повен,
Пашла мая й маці ж воду браці.

Вой, брала, брала ж не набрала,
Вой, стала, слёзкамі далівала.

54. Пахілястае дуб'е...



Пахілястае дуб'е**
Ды к гарам прылягае.

Ды к гарам прылягае
І з гарамі размаўляе.

Вінаваты мой таточко,
Што далеко заручона.

Ён сам не бывае
І пісем не прысылае.

Напішу пісёмко,
Ой, чатыры лісточкі.

Ой, чатыры лісточкі
І пятого трошкі.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

55. Ляцелі галубкі сівенькі...



Ляцелі галубкі сівенькі,
Шлі кавалеры маладзенькі.

Шлі кавалеры гукаючы,
Сабе паненак шукаючы.

Хорошэ село — Вяліке Село[1]:
У іх вулачкі шырокіе.

У іх вулачкі шырокіе,
У іх дзевачкі харошые.

Брыдкее село — Малое Село:
У іх вулачкі вузенькіе.

У іх вулачкі вузенькіе,
У іх дзевачкі брыценькіе.

[1] «Вялікае Село» і «Малое Село» — тут зн. суседнія вёскі Вялікія і Малыя Гарадзяцічы Любанскага раёна.

56. Ой, була тройца, не бувала...



Ой, була тройца, не бувала,—
Я й, маладая, не ўгадала.

Я й, маладая, не ўгадала**,
Вой, калі тройцу прагуляла.

Ой, мяне мамке не пушчала,
Ой, да ў каморку запірала.

А ў каморачцы да акенечко,
А там мне, маладой, ой, бедненечко.

А на вуліцы дымок, ой, да ідзе,
Там мой міленькі танок вядзе.

Там мой міленькі танок вядзе,
А ў левай ручцы ён вянок нясе.

** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

57. Зацвіла ў гародзе ружа...

Зацвіла ў гародзе ружа,
У нашым двары пані хароша,
Не пашкадуе нашаму кусту гроша.
Проша, пані, нашай куст падарыці,
А свой дом звесяліці.

58. Ой, тройца, тройца, прасвятая Багародзіца...

Ой, тройца, тройца, прасвятая Багародзіца,
Ды насеем жыта, ды няхай зародзіцца.
Ой, мы былі да й у велькім лесе
Ды ізвілі куста з шырокага клёну,
Ды ізвілі куста з шырокага клёну.
Ой, выйдзі ж, пане, ды з новага дому,
Ой, выйдзі ж, пане, ды з новага дому
Ды вынесі ж кусту да й хоць па залатому.
Няхай наша жыта ды й у полі буяе,
Ой, няхай куст наш ды й па свеце гуляе.

59. Прывяду русалачку да бору...

Прывяду русалачку да бору,
А сама вярнуса дадому,
Штоб русалачка па жыту не хадзіла
Да нашага жыцейка не ламіла.
Наша жыцейка тоненька,
А ў каласочку таўсцюсенька.

60. Русалачка, купалачка...

Русалачка, купалачка,
Дзе твая Наталачка?
На моры купалася,
На беражэчку сушылася,
На беражэчку сушылася
Та ўсё ў мамкі прасілася:
— Пусці, мамка, пагуляці,
Бо мне малайца не відаці.
Мамка дочку не пусціла
І ў каморачку да замкнула,
А ў каморцы акенечко,
А ў акенечцы відаенечко,
Дзе мой мілы пахаджае,
З нялюбаю размаўляе.

КУПАЛЬСКІЯ І ПЯТРОЎСКІЯ ПЕСНІ

Купальскія і пятроўскія песні складаюць на Міншчыне, як і на ўсёй Беларусі, своеасаблівы паэтычны комплекс. Яго ядро — багатыя ў жанравых і тэматычных адносінах купальскія песні, у якіх, здаецца, можна знайсці амаль усе класічныя купальскія вобразы і матывы. Пятроўскія песні прадстаўлены адзінкавымі запісамі. Сярод іх большую частку займаюць творы з тыповым сюжэтам: «касец скардзіцца на свой лёс». Пашыраны таксама агульны з купальскімі песнямі сюжэт «закаханы хлопец раніцай наведвае паненку, якая не выспалася ў пятроўскую ноч». Але калі Пятроўкі не больш як каляндарная дата, не адзначаная ні абрадамі, ні гульнямі моладзі, то Купалле на Міншчыне — з'ява жывая, шматколерная. Гэта свята адзначаецца з 6 на 7 ліпеня, усё часцей аднаўляецца і там, дзе пра яго забыліся, існуе ў розных відах: то гэта фестываль народных талентаў (як на Лагойшчыне, калі ля вогнішча збіраюцца разам спевакі з розных куткоў Беларусі і госці), то больш лакальная з'ява (як на Ракаўшчыне, калі на маляўнічы бераг Іслачы сыходзяцца жыхары навакольных вёсак), то звычайны купальскі агонь на ўзлеску ці ўскраіне вёсачкі. На Мядзельшчыне ў гэты час спальваюць траецкі май, маладыя бярозкі, якія захоўваліся каля хат ад Сёмухі да Купалля.

Вялікую групу купальскіх песень складаюць рытуальныя. Яны садзейнічаюць выкананню абраду, падказваюць, што і калі рабіць. Сугучныя перадсвяточнаму настрою песні-звароты да месяца ўзысці раненька, разлажыць купалейка, песні-заклікі да дзяўчат выхадзіць, купалёнку развадзіць, да хлопцаў — ірваць рамон. Рытуальныя купальскія песні ствараюць бінарныя групы па прынцыпу: заклік да дзеяння — выкананне. Напрыклад, песні, якія клічуць дзяўчат ісці ў лясок, рваць кветачкі, натуральна спалучаюцца з песнямі-апавяданнямі пра збіранне купальскіх зёлак, ягад, карэння.

Купальскія песні-дыялогі надзейна захавалі ў сістэме вобразаў рэшткі архаічнага пакланення старажытных славян жыватворнаму пачатку ў прыродзе, які атаясамлівалі з Купалай-маці і яе дачкою. «Купальнічка», «Купальніца», «Купалінка», «Купалічка», «Купалачка» — так на Міншчыне ласкава звяртаюцца да Купалы з тыповым пытаннем, дзе яе дачка. З тэкстаў вынікае, што ў гэтай роднаснай пары Купала, відаць, звязана з цемрай, а яе дачка — са святлом. Песня нездарма ўдакладняе зварот: «Купалінка, Купалінка, цёмная ночка, Цёмная ночка, дзе твая дочка?» Адказы, наадварот, падкрэсліваюць дзённую сутнасць дачкі, яе сувязь з усім, што расце, цвіце, буяе.

Лакальныя камбінацыі рыс самой Купалы досыць арыгінальныя, што яшчэ раз пацвярджаецца пры разглядзе песеннай спадчыны Міншчыны. Эвалюцыя вобраза Купалы пакінула красамоўныя адзнакі ў паэтычных дэталях песень. Іх тыповы матыў — пытанне пра начлег Купалы. У адных адказах Купалы прасочваецца яе найстаражытная функцыя апякункі росквіту прыроды: начавала «ў зялёным лузе», «у чыстым полі». У другіх — адносна новая, звязаная з земляробчымі клопатамі, уплывам на ўрадлівасць палёў, захаваннем ураджаю: начавала «сярод жыта», «у густым», «у ярым жыцечку». Купала найчасцей уяўляецца антрапаморфнай асобай, але запісана цікавая песня ў Вілейскім раёне, дзе яна выглядае нейкай зоаморфнай істотай: «Сядзіць Купалка на плоце, Яе галоўка ў злоце, Яе хвасточык у вадзе».

Усё, звязанае з Купалай і купальскімі звычаямі, купальскім гуляннем, песні вызначаюць адным словам — «дзіва». Дзівяцца людзі з Купалы, якая ідзе «ся-



«Хадзіў чыжык па вуліцы, клікаў дзевак на Купалле...» у Заслаўі. Фота Я. Казюлі.

лом... закрыла вочка крылом», «пяром», «сінім пяром», «шатром», «чабром» ці «раём». І хоць такія-сякія меркаванні наконт убрання Купалы вучонымі выказваліся, усе гэтыя дэталі маюць патрэбу, каб іх разглядалі ў сукупнасці. Мы адзначым агульнае: такая абарона сваіх вачэй характарызуе Купалу як незвычайную істоту, якая так рэдка наведвае людзей, што тыя пра яе ведаюць, але ў першы момант не пазнаюць. На пытанне: «Дзе дасюль была?»— яна адказвае: «За ракой была, за быстрай была». Згодна з міфалагічнымі ўяўленнямі славян, рака — мяжа паміж светам людзей і светам незвычайных істот, да якіх, зразумела, належыць і Купала. Яна з'яўляецца ў агні, глядзіць з купальскага вогнішча. Залатагаловая Купалка сядзіць або вісіць на плоце, просячы ў Бога пагоду «на гэту ночку вясёлу». Матыў вядомы ўсёй Міншчыне, але ў песнях з Пухавіцкага і Уздзенскага раёнаў падобная функцыя належыць не Купале, а сонейку. Узаемазамяняльнасць вобразаў падмацоўвае думку, што Купала — увасабленне сонца, таго нябачнага сонейка, якое нанач знікае з вачэй.

Матыў непазнавальнасці працягваецца ў дачыненні да такой атрыбутыкі свята, як «зелле-карэнне». Яго збіраюць ці капаюць дзяўчаты, але ні старыя людзі, ні бацькі, ні ўладары яго не пазнаюць. Толькі жанчынам (відаць, як былым ахоўнікам культу) вядома яго патаенная сутнасць. Чароўнае зелле ў іх адказах атаясамліваецца з самім Купаллем, каханнем, вяселлем. Не дзіўна, што любоўныя і сямейныя песні вельмі натуральныя для купальскай лірыкі. У нашых запісах яны складаюць асноўную частку. Іх спецыфіка вызначаецца перапляценнем бытавых і абрадавых матываў. Рытуальнае патрабаванне быць на Купаллі ўсім дзяўчатам дало, напрыклад, пачатак матыву — дзяўчына (нявехна, каралёва дачка, вайтоўна) просіць у бацькоў ці ў «свякраткі» дазволу пайсці на гулянне.



Купалле ў в. Краснай на Маладзечаншчыне. Фота Я. Казюлі.



«Купалінка, Купалінка, цёмная ночка...» Фота Я. Казюлі.



«Купалачка, дзе твая дачка?» Фота В. Харчанкі.

Але некаторыя сюжэтныя сітуацыі купальскіх песень зараз незразумелыя, яны, відаць, бяруць пачатак ад нейкіх даўно знікшых абрадавых дзеянняў. Ёсць заходнееўрапейскія абрады, у якіх чучалу адсякалі мячом галаву. У сувязі з гэтым выклікае цікавасць генезіс фантастычнага ў бытавых, але лагічнага ў абрадавых адносінах малюнка з купальскай песні: «Ой, там жа за дваром, Едуць малойцы ўсе радом, Вязуць малойца на кані, Яго галоўка на меці» (у варыянце з Маладзечанскага раёна — «на мячы»). Засмучонай маці гэты малойчык гаворыць, што палажыў галоўку за дзеўку.

Адметная рыса купальскага свята — панаванне жартоўных песень, пабудаваных на супрацьпастаўленні добрага дрэннаму, напрыклад, адной групы дзяўчат — другой, дзяўчат — хлопцам ці наадварот. Мэта апошніх не толькі бытавая — пакпіць з недарэчлівых хлопцаў, але і абрадавая — падштурхнуць іх да заляцанняў, сватання, вяселля, да той гармоніі адносін, якая выцякае з філасофіі аграрных свят.

Купальская ноч здаўна лічылася ноччу барацьбы чалавека з поганню, якая ўвасаблялася ў вобразе ведзьмы-змяі. У этычным і міфалагічным плане ведзьма-змяя — увасабленне сусветнага зла, з якім трэба змагацца перш-наперш агнём. Барацьбу з чараўніцай вядуць разам Купала і людзі. Песня заклінае: «Наша Купала цёмная ноч, Да паўпякай ведзьме вочы, Штоб бяда па свету не хадзіла, Штоб бяда людзей не глуміла». Заклінальны элемент спалучаецца з тлумачэннем, чаму трэба асляпіць змрочных істот: каб ведзьма «жыта-дабра не ламала», «каровак чужых не даіла», «расы не збірала... у печы не сушыла.. у жорнах не малола... дзяцей не карміла... вядзьмят не пладзіла».

Сярод ачышчальных абрадаў (купанне, абліванне вадой, пераскокванне цераз агонь) асаблівай паэтычнасцю вылучаецца абрад з в. Падневічы Валожынскага раёна: «На купалле дзяўчаты ідуць у пшаніцу і мыюцца каласкамі. Але мыюцца асцярожна, нямножка ў жменьку бяруць...».

Купалле — заўсёды свята душы для земляроба, які ў час летняга сонцастаяння, калі ўсё навокал так хораша расце, квітнее, спее, прыслухоўваецца да старажытнага пачуцця роднасці з навакольным светам, падказвае яму: «Калі на Купалу ноч ясная — будзе добры ўраджай, будзе ягада красная, будзе дабро разнае».

61. Ідзіця, людзі, дзівіцеся...



Ідзіця, людзі, дзівіцеся**,
Едзя Купалка жаніцiся.
Сам жа ён едзе на коніку,
Дзевачку вязе ў возіку.
Сам жа ён едзе, як жар гарыць,
Дзевачку вязе, як мак цвівіць.

** Кожны радок паўтараецца.

62. Ішла Купалка сялом, сялом

Ішла Купалка сялом, сялом**,
Закрыўшы вочы пяром, пяром.
Дзеўкі Купалку не спазналі,
Сінія пёры атарвалі.

63. Купала на Йвана!



Купала на Йвана!
Сёння Купала, заўтра Йван,
Купала на Йвана!
Ідзе, дзевачкі, гулянне нам.
Купалася дзве перапёлкі.

Дзве перапёлкі, дзве ятроўкі.
Братоўка залву на ноч прося:
— Хадзі, золва, ка мне на ноч.
У мяне палажок бялёвенькі,
Падушачкі пуховыя.

64. Сягоння Купалле на Яна...



Сягоння Купалле на Яна,
Дзевачкі зелле збіралі,

Дзевачкі зелле збіралі,
У старога дзеда пыталі:

— Што гэта, дзедка, за зелле —
Чорныя галоўкі насення?

А дзедка зелля не пазнаў
Ды да караля адаслаў.

Каралеўна зелле пазнала,
Яна дзевачкам сказала:

— Дзявочае умыванне,
Кавалерскае каханне.

65. А на Купалле, на Яна...



А на Купалле, на Яна
Дзевачка зелля купала.

Яна купала й плакала,
Дзе ж яго горачка брала.

Ой, кіну, кіну пярыну,
Сама паеду ў даліну.

Сама паеду ў даліну,
Дзе мяне людзі не знаюць.

Дзе мяне людзі не знаюць,
За дзевачку пашчытаюць.

66. Ой, у нядзельку на Яна...



Ой, у нядзельку на Яна
Іграла соненька, йграла!

Хлопчыкі зелле капалі,
Да яны яго ні зналі.

Да яны яго ні зналі,
У старога дзеда пыталі:

— Скажы, бацька, што за зелле —
На ім чорнае насенне?

— Нашто ж вы, дзеткі, капалі,
Калі вы яго не зналі?

Гэта дзявоцка красата,
Для хлопчыкаў сухата.

67. Дэ Купалка купалася...[1]

Дэ Купалка купалася,
На беражочку сушылася.

Прасіла ў Бога пагодачку
На гэту ночку вясёлаю.

Будуць музыкі іграці,
Будуць хлопчыкі гуляці.

Будуць дзевачкі варажыці,
Будуць вяночкі звіваці.

Будуць вяночкі звіваці,
Будуць на ваду пускаці:

А хто вяночак ізловіць,
Да той мяне замуж возьмець.

[1] Да напеву № 71.

68. Сягоння Купалья, заўтра Ян...



Сягоння Купалья, заўтра Ян,
Да будзя, хлопчыкі, ліха вам!

— Да якоя ліха ліхоя?
— Да пагоньця сучак у поля.

А іх жа немножка — дваццаць шэсць,
Да яны ўдаліся ў адну шэрсць.

Адна была сучка рабенька —
Гэта вам, хлопчыкі, паненка.

А другая сучка падласка —
Будзя, хлопчыкі, на мяска.

А трэцяя сучка-рабушка —
Гэта, хлопчыкі, вам падушка.

69. Сягоння ў нас Купальнічык, заўтра Ян...



Сягоння ў нас Купальнічык, заўтра Ян**,
Пагонім мы хлапцоў сваіх на папар.
Старэйшамі араць будзем папар свой,
Маладзейшамі баранаваць будзем папар свой.

** Кожны радок паўтараецца.

70. Ой, рано, рано на Яна...



Ой, рано, рано на Яна
Да стагнала зямліца і з Купала.

Да й звінела вулачка з музыкі,
Прасілася нявеста у свякраці:

— Пусці, пусці, свякрачка, пагуляці,
А ты маленькага да дзіцяці.

— Ідзі, ідзі, нявеста, ні баяўся,—
К маленькаму дзіцяці паспяшайся.

Пашла, пашла нявехна, ні дбала,
Да белага свету прагуляла.

Да ўзяла свякратка вострый меч,
Да й зняла нявестцы голаву з плеч.

— За то табе, нявестка, за тоя,
Што малога дзіцяці да ні дбала,

Што малога дзіцяці да ні дбала,
Да белага свету прагуляла.

71. Ой, дай жа, Божа, Пятра прыждаць...



Ой, дай жа, Божа, Пятра прыждаць,
Пойдам на вулку дзевак шукаць**,

** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

Вой, калі нойдам — пажэнімся,
Калі не нойдам — павесімся.

Надзяром лычак з крапіўніку,
Павесімся у батвінніку.

72. У агародзе гурдовіна...



У агародзе гурдовіна,
Стрэлася хлопцам Пятровіна.

Не так хлопчыкам, як дзевачкам,
Пайшлі хлопчыкі Пятра ждаці.

Пайшлі хлопчыкі Пятра ждаці,
А дзевачкі гурдой льну рваці.

Хлопчыкі Пятра не даждалі,
А дзевачкі льну не нарвалі.

73. Каліна! Ды за гарою, за даліною, каліна!



Каліна! Ды за гарою, за даліною,
каліна!**
Ды там дзевачкі лён палолі.
Ды там ехалі два двараніна,
Яны сказалі: «Бог у помач!»
Бяднейшая адказала,
Багатырачка прамаўчала.

Ехалі назад, бяднейшаю забралі,
Багатырачку аставілі.
Бяднейшая рада стала,
Багатырачка плакаць стала:
— Абрусы мае сырватовыя,
Ці ня горачкі ўкрываць буду,
Ці ня ёлачкі пакрываць буду.

** Прыпеў «Каліна!» абрамляе кожны радок.

74. Каліна! А ў цянёчку, ў халадочку, каліна!





Каліна! А ў цянёчку, ў халадочку.
каліна!**
Стаіць конік зазузданы,
Зазузданы, аседланы.
Толька сесці да й паехаць
За горачку па ўдовачку,
За рэчачку па дзевачку.
А ўдовачку лёгка браці,
Лёгка браці, цяжка жыці.
Пасцель сцеля — надуецца,
Спацькі ляжа — адвярнецца.
А дзевачку цяжка браці,
Цяжка браці, лёгка жыці.
Пасцель сцеля — ўсё смяецца,
Спацькі ляжа — прыхінецца.

** Прыпеў «Каліна!» абрамляе кожны радок.

* * *

75. Каліна! Во за гарою, за крамяною, каліна!

Каліна! Во за гарою, за крамяною, каліна!**
Зарасла рутачка ўся лебядою.
Пайдзём, дзевачкі, рутачку палоць!
А мне, молодзя, ні да рутачкі,
А ўзялі ж мяне цяжкі смутачкі.
Паехаў мілы вайну ваяваць,
Пакінуў мяне гора гараваць.
Пакуль мой мілы навоюецца,
Дак я, малада, нагаруюся.

76. Каліна, возерная зялёная, каліна!



Каліна, возерная зялёная, каліна!**
Свякроўка мая шалёная
Загадала мне ў нядзельку рабіць.
Ў нядзельку рабіць, адзежку жлукціць,
Адзежку жлукціць, на моры вяліць.
— Я ні татарка ў нядзелю рабіць,
Ў нядзельку рабіць, адзежку жлукціць.
Я ні качачка па моры плаваць.

** Прыпеў «Каліна» абрамляе кожны радок.

77. А хто у нас да дзевак лас...



А хто у нас да дзевак лас,
Да дзевак лас? Каліна!

Васілька ў нас да дзевак лас,
Да дзевак лас. Каліна!

Пашоў у лес, на ель узлез,
На ель узлез, Каліна!

Залез на елку — думаў, на дзеўку,
Думаў, на дзеўку. Каліна!

Ўзяўся за сукі — думаў, за рукі,
Думаў, за рукі. Каліна!

Ўзяўся за шышкі — думаў, за цыцкі,
Думаў, за цыцкі. Каліна!

Зваліўся з елкі — думаў, што з дзеўкі,
Думаў, што з дзеўкі. Каліна!

78. **Каліна! Ў чужой старане дажджы ідуць, каліна!**



Каліна! Ў чужой старане дажджы ідуць, каліна!**
Ў нашай старане не бываюць.
А йдзіця, людзі, дзівіціся,
Едзе Колячка жаніціся.
Чатыры кані ўрасцяж ідуць,
На пятым кані ён сам едзя,
На шостым кані Танячку вязе.
Ён сам едзя — як жар гарыць,
Танячку вязе — як мак цвіціць.

** Прыпеў «Каліна!» абрамляе кожны радок.

79. **Купалья! Каціўся туман па санажаці. Купалья!**



Купалья! Каціўся туман па санажаці. Купалья!**
Думаў малойчык дзевачку браці.
Купіў ён сярпок — ці ўмее жаці?
Узяла сярпок, нажала снапок.
Кінула сярпок павышэй сябе:
— Не жала ў мамкі, ня буду ў цябе.
Панавала ў мамкі, буду і ў цябе.

** Прыпеў «Купалья!» абрамляе кожны радок.

* * *

80. **Купалья! Да пайшлі мае да два брацяйкі. Купалья!**

Купалья! Да пайшлі мае да два брацяйкі. Купалья!**
Да пайшлі яны сена касіці,
За імі сястра снядання несла.
Тудой ехалі да два двараны,
Да два двараны, два маладыя.
З конікаў сселі, снядання з'елі.

Кінулі мае да два брацяйкі,
Кінулі косы праз тры пакосы:
— Каб тоя сена ды калом села,
Як наша сястра рыбачку з'ела!

81. Божа мой! На санажаці мядуначка, Божа мой!



Божа мой! На санажаці мядуначка, Божа мой!**
Там кукавала зязюлячка.
Кукавала, праўду казала:
— Тчыця, дзевачкі, падарачкі!
Тамкачыця, бела бяліця.
Бела бяліця, ў трубы каціця,
Ў трубы каціця, сватоў дарыця.

** Прыпеў «Божа мой!» абрамляе кожны радок.

82. Божа наш! На сенажаці мядуначка, Божа наш!



Божа наш! На сенажаці мядуначка, Божа наш!**
Там кукавала зязюлячка,
Там кукавала зязюлячка,
Там кукавала, праўду казала.
Пятрова ночка ды невялічка,
А хто ж у нас ня выспаўся?

** Прыпеў «Божа наш!» абрамляе кожны радок.

Наш Яначка ня выспаўся,
Да дзевачак ён ходзячы,
Гасцінчыкі ім носючы,
Гасцінчыкі-цукерачкі,
Да Манячкі-паненачкі.

83. Дзевачкі, не сядзіця, рана-рана...



Дзевачкі, не сядзіця, рана-рана**,
Вы йдзіця, паглядзіця:
Ці шуміць дубровачка,
Ці звініць дарожачка,
Ці расцвіў базовы цвет,
Ці едзя той, што завязаў свет?
Да шуміць дубровачка,
Да звініць дарожачка,
Да зацвіў базовы цвет,
Прыехаў той, што завязаў свет!

** Прыпеў «рана-рана» завяршае кожны радок.

84. Бор гарыць, дым курыць...



Бор гарыць, дым курыць,
Каму ж тое бор'я гасіць?

Хлопчыкам бор гасіць,
Рашотамі ваду насіць.

Як у рэшаці вада ёсць,
Так у хлопцаў праўда ёсць.

Бор гарыць, дым курыць,
Каму ж тое бор'я гасіць?

Дзевачкам бор'я гасіць,
Кубачкамі ваду насіць.

Як у кубачку вада ёсць,
Так у дзевачак праўда ёсць.

85. Ой, у полі дымна да пыльна...



Ой, у полі дымна да пыльна,
Да вязуць Ясеньку, ня відна.

Вязе яго конік-скачочык,
Йдзе за ім матачка, плачучы.

А мой сыночак Ясенька,
За што ж ты галоўку палажыў:

Ці за матачку, за старэньку,
Ці за сястрыцу родненьку?

— Ой, ні за матачку старэньку,
Ой, ні за сястрыцу родненьку,

Ой, ні за сястрыцу родненьку,
За сваю нявесту міленьку.

* * *

86. Ой, рабоя поле, рабоя...

Ой, рабоя поле, рабоя
Радзіла жыта густоя.

Да пайшла дзевачка жыта жаць,
Яна жала, жала — заснула,

Яна жыта жала — заснула,
Прыехаў міленькі — ня чула.

Ён махнуў хустачкай — ні дастаў,
Ён кінуў свой кнуцік — ні трапіў,

Ён кінуў свой кнуцік — ні трапіў,
Да й злез з коніка — заплакаў:

— Ці ня горка доля спаткала,
Што мая мілая заспала?

87. Да ехаў Іванька на кані...





Да ехаў Іванька на кані,
Палажыў галоўку на мечы.

Палажыў галоўку на мечы,
Да за ім мамачка, плачучы.

Да за ім мамачка, плачучы:
— Ой, сынку, сынку Іванко!

Ой, сынку, сынку Іванко,
Праз каго палажыў ты галоўку?

Праз каго палажыў ты галоўку?
— Палажыў галоўку праз дзеўку.

Палажыў галоўку праз дзеўку,
Праз яе ціхіе ўходы.

Праз яе ціхіе ўходы,
Праз яе нізкіе ўклоны.

Праз яе нізкіе ўклоны,
Што яна паціху пахадзіла.

Што яна паціху пахадзіла,
Нізенька галоўку кланіла.

88. Ой, бела, бела бярозка...



Ой, бела, бела бярозка,
Чаму на моры палягла?

Чаму на моры палягла,
Дзевачкам дарожку заняла?

Ішла дзевачка па полю,
Несла золата ў прыполе.

Несла золата ў прыполе,
Чыстая срэбра — ў рукаве.

І рассыпала па моры,
Клікала мамачку з каморы:

— Выйдзі, мамачка, з каморы,
Памажы золата пабраці.

Памажы золата пабраці,
Чыстая срэбра звязаці.

— Не магу, дачушка, не магу,
Ад жалі ручак не ўздыму.

Ад жалі ручак не ўздыму,
Што маладзеньку й аддаю.

Што маладзеньку й аддаю,
Да й у чужую старану.

Да й у чужую старану,
Чужому татачку, не свайму.

89. Ой, тонка, тонка сасонка...



Ой, тонка, тонка сасонка
У бары стаяла — шумела,
Ідучы дарожкай — звінела,
Прыйшла ў ваpоцейкі — стала,
Стаўшы, малойца пытала.
— А слаўны малойчык Іванка
У бары коніка сядлае,
Ён да сваёй цешчы ад'язджае,
Раннія абеды з'ядае.
— Я ранніх абедаў не мераў,
Толькі й сваю цешчу адведаў.

90. Ой, тонка, тонка сасонка...



Ой, тонка, тонка сасонка,
Ад таго тонка, што ў бару.

Ад таго тонка, што ў бару,
Служыў Колячка каралю.

Ён служыў, служыў сем лет,
А ўсё яму заплаты нет.

А заслужыў ён коніка,
Да коніка сядзельца.

А да сядзельца тры свячы,
Едзець Колячка з паўначы.

Застаў Марыначку не спячы,
На новым ганку седзячы.

На новым ганку седзячы,
Шаўком кашулю шыючы.

— Ой, шыю, шыю, штапую
Свайму мілому кашулю.

З белай кітайкі рукаўкі,
З белай паперкі каўнеркі.

91. Каліна! Чыя рута за ракою? Каліна!



Каліна! Чыя рута за ракою? Каліна!**
Соніна рута за ракою
Зарасла травой-лебядою.
— Чаму, Сонячка, не аполеш?
Чаму дзевачак не папросіш?
— Нашы дзевачкі не да рутачкі.
Нашы дзевачкі да гарэлачкі.
Нашы дзевачкі травы ня рвуць.
Нашы дзевачкі гарэлку п'юць.

** Прыпеў «Каліна!» абрамляе кожны радок.

92. Вой, над ракою каліна...





Вой, над ракою каліна,
Да пад калінаю дзяўчына.

Да русаю косу часала,
Да белае лічыка вымывала.

Да тудэю ішоў старэнькі,
Мыслі, не мыслі да дзеўкі.

Мыслі, не мыслі да дзеўкі —
Не твайго саду каліна.

Да не твайго саду каліна,
Да не твайго стану дзяўчына.

93. А баравая цяцера...



— А баравая цяцера**,
Чаго ты двору ляцела —
Ці ў бору жыру ня мела?
— А ў бору жыру даволі,
Боляй ня будзіць ніколі.

— А маладая Анютка,
Чаго ты замуж хацела —
Ці ў таткі гульбаў ня мела?
— А ў таткі гульбаў даволі,
Боляй ня будзіць ніколі.

** Кожны радок паўтараецца.

ЖНІЎНЫЯ ПЕСНІ

Жніўныя песні Міншчыны вылучаюцца вялікай разнастайнасцю паэтычных вобразаў, сюжэтна-тэматычных варыянтаў, бо ў вобласць уваходзяць часткі такіх буйных рэгіёнаў, як Паазер'е (поўнач Міншчыны), Панямонне (захад, паўднёвы захад), зона Беразіны (усход), Палессе (поўдзень). Сучасныя запісы жніўнага фальклору не менш адметныя па сваіх мастацкіх якасцях, чым запісы больш даўняга часу.

Каб карціна жніва Міншчыны была як мага больш поўнай, мы ўключылі ў зборнік як шырока распаўсюджаныя, так і менш вядомыя, арыгінальныя ўзоры

жніўных песень. Класікай беларускага фальклору з'яўляюцца, напрыклад, такія песні, як «А я ў полі жыта жала», «Да пайду я дарогаю», «Да ўжо сонца за бор, за бор», «А ўжо вечар вечарэя», дажынкавыя «Коціцца вянок з поля», «У нас сягоння дажыначкі», «У нас сягоння вайна была». Яны раўнамерна запісаны і на Міншчыне. Таму мы адабралі з іх тыя ўзоры, у якіх прыцягвае ўвагу арыгінальны паварот сюжэта («Ой, пайду дарогаю») альбо прыгажосць паэтычных словазлучэнняў (дажынкавая «Ой, зялён наш бор, зялён»). Асобную групу складаюць песні, прымеркаваныя да жніва напевам, а па зместу, здавалася б, далёкія ад класічнай жніўнай тэматыкі; ім уласцівы любоўна-жартоўныя, перадшлюбныя матывы («Мамка мая чарэшанька», «А я, млода, расту, расту», «На зялёненькум месця», «А ў лесе на верася»). Такія песні існуюць пераважна на захадзе і поўдні Міншчыны.

Асноўныя вобразы жніўных песень — жнейка, сонца і месяц, поле і постаць, вячэрняя зара, а таксама вобразы пана, прыганятага. У песнях «А што ў полі бялеецца?», «Чорна мая смародачка», «Лугавая перапёлка» жняя апяваецца самымі пяшчотнымі словамі; у зачынах выкарыстаны народныя метафары, эпітэты дзеля ўзвышэння вобразу сялянкі-жняі.

Спачуванне жнеям выказана ў песнях «Згубіла зара ключы», «Чыя гэта павалока?». Роздум аб горкай долі альбо яе прадчуванне паказаны ў песнях «Ой, саколе мой, саколе», «Бедна мая галовачка» і інш. Ёсць сярод жніўных сірочыя, удоўі, сатырычна-жартоўныя песні пра жняю-гультайку, адносіны паміж нявестай-жняёй і свякроўкай, г. зн. усе адценні сямейна-бытавых адносін, псіхалагічнага стану жаночай душы.

Як і ў паэтыцы, у музычнай стылістыцы жніва Міншчыны, дзякуючы спалучэнню ў ёй рознарэгіянальных традыцый, назіраюцца разнастайныя з'явы. Гэта і розная ступень меладычнай распетасці тыповага жніўнага напеву, і звязаная з гэтым разнастайнасць мелодыка-страфічных форм напеваў, і розная ў кожнай мясцовай альбо індывідуальнай традыцыі вядзення жніўнага спеву арнаментацыя асноўнай меладычнай формулы. Класічны ўзор калектыўнага спеву з характэрнай для цэнтральных раёнаў Беларусі жорсткай фактурнай пабудовай — песня «Наша жыта ўжо паспела».

Жніўныя песні Міншчыны — багатая частка агульнабеларускай жніўнай спадчыны, якая ўвабрала ў сябе ў рэгіянальных праяўленнях розныя гісторыка-стылявыя пласты народнага мастацкага мыслення.

94. Пара, маці, жыта жаці...



Пара, маці, жыта жаці**,
Пара сярпы раскладаці.

Нема серпа залатога,
Нема жанца маладога.

Быў бы сярпок залаценькі,
Пры нім жанец маладзенькі!

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

* * *

95. А што ў поле бялеецца?

А што ў поле бялеецца?**
Ці то лебедзь, ці лябёдушка?

Ці то лебедзь, ці лябёдушка?
Ці то молада малодушка?

* * *

96. Ой, саколе, мой саколе...

Ой, саколе, мой саколе**,
Пераляці маё поле!

Да пакажы майму татку,
Што работа не робіцца.

Што работа не робіцца,
Сенажацце не косіцца.

— Да не гаруй, маё дзіця,
Прышлю табе валоў пару.

Прышлю табе валоў пару,
Валы прыдуць адзін да два.

Да й работа паробіцца,
Сенажацце пакосіцца.

97. Чорна мая смародачка!





Чорна мая смародачка!**
— О, шчэ ж ба я чарней была,
Каб я ў лузе пастаяла,
Чорнай веткай памахала.

Красна мая ты дзевачка!
— Яшчэ ж бы я красней была,
Каб я ў мамкі пагуляла,
Русай касой памахала.

** Кожны радок паўтараецца.

98. Лугавая перапёлка...



Лугавая перапёлка,
Дзе ты зіму зімавала?

— Зімой была ў крыніцы,
А лецейкам — у пшаніцы.

Маладая малодачка,
Дзе ты зіму зімавала?

— Зімой была ў мамачкі,
А лецейкам — у свякроўкі.

Добра было ў мамачкі,
А йшчэ лепей у свякроўкі.

99. Паўднёвачкі ідуць, ідуць...





Паўднёвачкі ідуць, ідуць**,
Ужо палуднаваць хочуць.
Вы гудзіця, не гудзіця —
Палуднаваць не будзеця.
Чэрвяніцы ложка мала —

Няродная мамка клала.
Каб родная была жыва,
Яна б болей налажыла,
Палуднаваць павялела.

** Кожны радок паўтараецца.

100. Ой, пайду дарогаю...



Ой, пайду дарогаю,
Ой, пайду і шырокаю.

Пушчу голас дуброўкаю,
Эй, нехай голас галасу(е).

Нехай голас галасуе,
Нехай мая мамка чуе.

Нехай чуе, пачувае,
Па голасе пазнавае:

— Ці не мая дачушачка,
Умная, разумная?

Дасталася да свякроўкі —
Ні уму, ні розуму.

101. Ах, дамоў, дамоў пара...



Ах, дамоў, дамоў пара**,
Мне дамоў не хочацца.

Бо дома не мамачка,
Не скажа: «Дзіцятачка».

Не скажа: «Змарылася»,
А скажа: «Злянілася».

** Кожны радок паўтараецца.

102. Да за бор, сонца, за дуброўку...



Да за бор, сонца, за дуброўку,
Да за высокаю горку.

Будзім явар сеч-рубаці,
Будзім касцёл будаваці.

Да насушы нам явару,
Нам явару многа трэба.

Будзім касцёл будаваці,
Двое дзяток там вянчаці.

Малойчыка сам Бог радзіў,
А дзевачку яму судзіў.

* * *

103. Пара, жнейкі, дамоў, пара...

Пара, жнейкі, дамоў, пара,
Пагубляла ключы зара.

За ёй сонца ў пагон бегла:
— Аддай, аддай ключы, зара.

Пара зямлю адмыкаці,
Жнеяк дамоў адпраўляці.

Жнейкі жалі, нажаліся,
Ручкі бралі, набраліся.

Іх сярпочкі патупелі,
Жнейкі есці захацелі.

Жнейкі есці захацелі
Да ім ручкі забалелі.

104. Сакатала соўнейка...



Сакатала соўнейка**,
Да за лес заходзячы.

Плакала нявестачка,
Да пад дом падходзячы.

Зажурыўся свёкарка,
Што рана дамоў прышла,

Што рана дамоў прышла,
Не вячэраўшы знайшла.

— Не журыся, свёкарка,
Другі раз хітрэй буду.

Другі раз хітрэй буду,
Да хаткі пазней прыду.

Да хаткі пазней прыду,
Павячэраўшы знайду.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

* * *

105. Згубіла зара ключы...

Згубіла зара ключы,
Каля постаці йдучы.

За ёй месячык ішоў,
Ён тыя ключыкі знайшоў.

— Месячык-брацетка,
Аддай мне ключыкі!

Буду постаць замыкаці,
Дамоў жнеяк адпраўляці.

106. Чыя гэта павалока, эй!



Чыя гэта павалока, эй!
Яна доўга і шырока.

На ей жнейкі жыта жалі, эй!
А сярпочкі пагублялі.

Каторая сярпок знойдзя, эй!
Тая раней дамой пойдзя.

Каторай жа сярпа нету, эй!
Тая будзя до поўсвету.

107. На лузя касец косіць...



На лузя касец косіць**.
Ён прылёг ды галосіць:
— Ці мая каса тупа,
Ці мая жонка скупа.

Прынесла палудняваць:
Хлеба скарыначку,
Цыбулькі быліначку,
А сольцы — драбіначку.

** Кожны радок паўтараецца.

108. Я ў бару жыта жала...



Я ў бару жыта жала**,
Мне, маладой, бяда стала.
Стала свякроў на тын глядзець:
Ці скора нявестка жыта жнець?
Звалілася свякроў з тыну
Ў вялікую крапіву.
Не жаль мне свякроўкі,
А жаль мне крапіўкі.
Крапіўка — яда мая,
Свякроўка — журба мая.

** Кожны радок паўтараецца.

109. Я, молада, борам ішла...

Я, молада, борам ішла,
Ой, пад паяском сярпок несла.

На руках дзіцятачка,
Ой, спаткаў мяне мой татачка.

— Куды ідзеш, дачушачка,
Ой, чыё нясеш дзіцятачка?

— Суседняя, мой татачка,
Ой, суседняя, мой татачка.

— Маніш, маніш, дачушачка,
Маніш, маніш, дачушачка,

Яно ў цябе радзілася,
Яно ў цябе удалася.

Тваё лічка невялічка,
Ой, чырвоненька, як бруснічка.

110. Я сеіла руту-мяту...



Я сеіла руту-мяту:
— Расці, мая рута-мята,
Корыням глыбокая,
А лісцям шырокая.
Калі я дома буду,
Я цябе паліваць буду.
А калі замуж пайду,
Я цябе з карня вырву.

З карня вырву, пад плот кіну —
Нехай цябе валы збадуць.
Нехай цябе валы збадуць,
Валы збадуць, бушуючы.
Нехай цябе коні стопчуць,
Коні стопчуць, гарцуючы.
Нехай цябе дзеўкі стопчуць,
Дзеўкі стопчуць, танцуючы.

111. Й а на бару ягад многа...



Й а на бару ягад многа**,
Там хадзіла сірот двое.
Яны хадзілі й гаварылі:

— Набяром мы ягад многа,
Панясём іх на рыначак,
Прададзім мы ягадачкі,

** Кожны радок паўтараецца.

Купім сабе татку з мамкай.
А ўсе лаўкі абхадзілі,
Татку й з мамкай не купілі.

Усе лаўкі няроўныя,—
Татка з мамкай няродныя.

112. Мамка мая, чарэшанька...



Мамка мая, чарэшанька,
Гадуй мяне хорашанька.

Ад сыботы да сыботы
Не давай жа мне работы.

Я ў сыботу умыюся,
У нядзельку прыбяруся.

Да пайду я да касцёла,
Да стану я ля прыстола.

Стану Богу маліціся,
Стануць людзі дзівіціся:

— Чыё гэта дзіцятачка
Да хораша убрана?

Няхай людзі дзівуюцца,
Чым сіроты красуюцца.

113. Да за лесам, лесам-борам...





Да за лесам, лесам-борам**
Гаварыла дзеўка з Богам:

— Дай жа, Божа, мне мілога,
Да й мілога шчасліваго!

І свякратку багатаго,
Да і свякроўку рабочую.

Штоб я дзела не рабіла,
Бела-хораша хадзіла.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

114. Бедна мая галовачка...



Бедна мая галовачка,
Бедна мая...
Што чужая староначка,
Што чужая...
Ніхто мяне не жалея,
Ніхто мяне...
Ні татачка, ні мамачка,
Ні татачка...
Выпраўляюць мяне ўпрочкі,
Выпраўляюць...
Да наўпроці цёмнай ночкі,
Да наўпроці...

Даюць каня варанога,
Даюць каня...
Хурманочка маладога,
Хурманочка...
Вараны конь із'ездзіцца,
Вараны конь...
Хурманочак назад вернецца,
Хурманочак...
Я ж молада, не вярнуся,
Я ж молада...
На чужыне астануся,
На чужыне...

115. А я, млода, расту, расту...





А я млода, расту, расту**,
Пайду замую за старасту.

А стараста багат, багат,
Купіць сукно і кабат.

У кабаце жыта жаці,
А ў сукенцы пагуляці.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

116. На зялёненькум месця...



На зялёненькум месця**
Казачэнька каня пасе,

Казачэнька каня пасе,
Да й дзевачка воду нясе.

— Ты, дзевачка, да ягадка,
Напой каня варанога,

Напой каня варанога,
Казачэньку маладога.

— Вот дурны ж ты, казачэнька,
Што ж я табе за ягадка?

Да ці я ў леся расла,
Да ці я ў садзіку цвіла?

Парадзіла да мяне маці
Да ў цясовай караваці.

Пірагамі карміла,
Віном-мёдам паіла.

Ад пірагоў цела бела,
А ад мёдзіку румяна.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

117. А ў леся на верася...



А ў леся на верася
Малойчык каня пасе.

Малойчык каня пасе,
Дзевачка ваду нясе.

— Дзевачка-ягодачка,
Да напой каня майго.

Каня майго варанога,
Мяне, пана маладога.

— Што я твая за ягадка,
Што твая за спелая?

Ці я ў тваім бары расла,
Ці я ў тваём саду спела?

Расла я у татачкі,
Красавалася ў мамачкі.

Што вішанька у садочку,
Што пчолачка у мядочку.

118. Цераз гай зялёненькі...





Цераз гай зялёненькі,
Ой, ляцеў конь вараненькі.

А за ім у пагоня,
Ой, хлопчык маладзенькі.

Хустачкай махаючы,
Ой, на дзевачку міргаючы:

— Дзяўчына, й душа мая,
Ой, пераймі й каня майго.

— Рада б я пераймаці,
Да баюся тваёй маці.

119. Ў полі жыто палавее...



Ў полі жыто палавее,
Гультаёва душа млее.
За бор, сонца, за бор,
А пала раса й на дол.
Адна раса лядовая,
Другая мядовая,
Лядовая для свякроўкі,
Мядовая для матулькі.
Каб матулька спажывала,—
Яна ж мяне гадавала.
А свякроўка ўдавілася,—
Яна ж з мяне глумілася.
За бор, сонца, за бор,
А мне пара дамоў, дамоў.

120. А я жала, не ляжала...



А я жала, не ляжала**,
Тры снапочкі нажала.
Ня едзь, паня, па снапочкі,
Прывязі нам гарэлачкі.
Гарэлачкі нам бутэлячку,
А мы вянок на талерачку.

** Кожны радок паўтараецца.

121. Ай, ці поўна арэхава чаша?



Ай, ці поўна арэхава чаша?
Ай, ці поўна?
Ай, ці можна арэх раскусіці?
Ай, ці можна?
Ай, ці можна ядро паглядзеці?
Ай, ці можна?
Ай, ня можна арэх раскусіці,
Ай, ня можна.

Ай, ці поўна гумно пакладзёна?
Ай, ці поўна?
Ай, ці можна ці ўвайсці, ці ўехаць?
Ай, ці можна?
Ай, ня можна ні ўвайсці, ні ўехаць,
Ай, ня можна.
Толькі можна сокалу ўляцеці,
Толькі можна.
Сокалу ўляцеці, зярно паглядзеці,
Толькі можна.

122. Рада пірапёлка, рада...



Рада пірапёлка, рада**,
Што лета даждала.
Рада гаспадынька, рада,
Што ўсё жыта пажала.
Сягоння ў нас вайна была,
Усё поля зваявалі.
Усё поля зваявалі,
Усё жыта пажалі.
Сягоння ў нас дажыначкі,
Прынёс гаспадар гарэлачкі.
Гаспадынька-цяцерка,
Ці гатова вячэрка?
Ці вялікі гаршчок кашы,
Ці пад'ядуць жнейкі нашы?

** Кожны радок паўтараецца.

123. Наша жыта ўжо паспела...





Наша жыта ўжо паспела**,
Наша поля зазвінела.
Нашы жнейкі загудзелі,
Іх сярпочкі заблішчэлі.
Мы ўсё поля зваявалі
І ў снапочкі пастаўлялі,
Гаспадара прычакалі.
Гаспадынька стол накрыла,
Сваіх жнеяк ажыдая.
Мы ўсё поля зваявалі
І дажыначкі згулялі.

** Кожны радок паўтараецца.

124. Ой, зялён наш бор, зялён...



Ой, зялён наш бор, зялён
Над усемі барамі!

Ой, хвалён наш гаспадар
Над усемі гаспадамі!

На поля не выходзя —
На кані выязджая.

На кані выязджая,
Сваіх жнеяк выпрашая:

— Пажнеця й, мае жнейкі,
Прынясу вам гарэлкі!

Ой, гарэлачкі ў глячку,
Прыкачу піва бочку!

ВОСЕНЬСКІЯ ПЕСНІ

Дастаткова рэдкія ў запісах апошніх гадоў восеньскія песні ўсё яшчэ фіксуюцца ў жывым бытаванні на Міншчыне, прычым іх сюжэтная разнастайнасць адпавядае лепшым узорам беларускай восеньскай песеннасці.

Празрыстая, нібы восеньскія далягляды, сюжэтыка гэтых песень уключае, як правіла, у якасці галоўнага элемента разгорнутую паралелістычную канструкцыю, дзе прыкметы восені і ранняга перадзімовага перыяду рассыпаны па радках першых яе частак. Параўн.: «Бярозка з лістком, белая з вяршком Усю восень гаварыла», «Вот там пад ляском бярозка з лістком Усю восень шумела. Ветрык павеё, лісток ападзе, бярозка стаяць будзя», «Чаго, зімачка маразлівая, так рана выпадаеш?», «Плыла вутачка з вуцянятамі за мора зімуваці».

Другая частка паралелістычнай формулы носіць падкрэслена сямейны характар. Гэта, натуральна, невыпадкова, таму што восень у традыцыйным жыццёвым календары — час вяселляў, пераходу дзяўчыны ў новую пару жыцця, у дом мужа. А што ж там, у таямнічай будучыні?.. Вось гэта пяшчота надыходзячай восені ў спалучэнні з сумам хуткага расстання дзяўчыны з родным домам і вызначае агульны мінорны настрой восеньскай песеннай лірыкі.

Зразумела, у гэтым кантэксце набываюць «восеньскі» сэнс такія сімвалы сямейных песень, як «удава», «зязюля» («Ой, заржы, заржы, конік вараны»), абавязковае ўпамінанне «свякроўкі», у якой нявестку «гора спаймае» («Ой ты, рыбачка-пераплывачка») і інш.

Семантыка пераходу прыроды ў новы стан у афарыстычнай форме выражана ў радку «Зімачка — не летачка» («Чаго, зімачка маразлівая») і звязана з надыходам наступнага «ўстойлівага» перыяду традыцыйнай каляндарнай абраднасці — зімы.

125. Досіць каліне, досіць маліне...



Досіць каліне, досіць маліне
Ў ціхім лузе стаяці.

Досіць каліну, досіць маліну
Пташачкам аб'ядаці.

Ні так пташачкі, ні так пташачкі,
Як пташчыны дзеці.

І ў бор лятуць, і з бору лятуць,
А ўсё калінку клююць.

Ні так пташачкі, ні так пташачкі,
Як пташчыны дзеці.

Цябе Анечка, цябе моладу
Суседзі абгаворваюць.

Ні тонка прала, ні звонка ткала,
Коратка парэзала.

Ні так суседзі, ні так суседзі,
Як твае балынанячкі.

Для цябе сядзяць, пра цябе судзяць
Аб твае падарачкі.

Ні тонка прала, ні звонка ткала,
Коратка парэзала.

126. Ты калапенька, ты зялёная...



Ты калапенька, ты зялёная,
Час прыйшоў цябе рваці.

Ой, аддаў мяне мой татачка
На ўвесь час гаравaці.

Гарую гадок, гарую другі,
На трэці аглянуся.

А калі ж мне не палепшаець,
То пайду й утаплюся.

— Ой, не тапіся, маё дзіцятка,
Бо ты душу загубіш.

А было казаць, было гаварыць,
Што яго не любіш.

127. Мае хмарачкі, мае цёмныя...



Мае хмарачкі, мае цёмныя,
Разыдзіцеся, розна.

Рассварылася мая мамачка,
Што гуляла позна.

— Ці ты сварыся, ці не сварыся,
Мяне ты не навучыш.

Было навучаць, было разлучаць,
Як я была маленькая.

А цяпер жа я засмуцоная,
Няма майго міленькага.



Мінская майстрыца А. Лазарук. Фота Я. Казюлі.

128. Чаго зімачка маразлівая...



Чаго, зімачка маразлівая,
Так рана выпадаеш?

Ды чаго, кося, ды чаго, сівы,
Да зямлі прылягаеш?

Ды ці ты, кося, ды ці ты, сівы,
Ліхую зіму чуеш?

— Чую, ня чую — добра ведаю:
Зімачка — ня летачка.

Улетку пайду, травіцу найду,
Сам сабою напасуся.

Узімку вада, узімку іда —
Усё гэта выдыдзянная.

Чаго, Светачка, чаго, малада,
Так сільнінька плачаш?

Ці ты, Светачка, ці ты, малада,
Ліхую свякроў чуеш?

— Чую, ня чую — добра ведаю:
Свякроўка — ні мамачка.

У мамкі пайду, работку зраблю,
Песіняк напяюся.

129. Плыла вутачка з вуцянятамі за мора зімуваці...



Плыла вутачка з вуцянятамі за мора зімуваці,
А за нею ей селязень ды яе даганяці:

— Пастой, вутачка, пастой, шэрая,
Мы з табой пашчабечым.

Пашла Манячка па новых сенях, хустачкай махаючы,
А за ею яе Колячка, ды яе даганяючы:

— Пастой, Манячка, пастой, малада,
Мы з табой пагаворым.

Я на рынку быў, я на рынку чуў
На сваю галовачку:

Чэпчык прадаюць, вянкі купляюць
На тваю галовачку.

130. А ў цёмным леся...



А ў цёмным леся**
Мядзьведзь рыкаець.
Мядзьведзь рыкаець,
Дзевак пужаець.
Рыкай, не рыкай —
Я не баюся.
Толькі баюся
Асенняй ночкі.
Асення ночка
Разлуку даець.
Разлучыць мяне
І з дзевачкамі
Да злучыць мяне
З кабетачкамі.

** Кожны радок паўтараецца.

131. Ходзя галубка па галубятнічку...



Ходзя галубка па галубятнічку,
Галубочак за ею.
— Пастой, галубка, пастой сізая,
Пагаварым з табою.

Быў я ў леся, чуў я за лессем,
Праз цябе сізэнькую,
Ой, робяць клеці на твае дзеці,
Хочуць іх палавіці.

— Ой, ніхай робяць,
Я іх не баюся.
Разарву клеці, выпушчу дзеці,
А сама ўплаў пушчуся.

Ходзіць дзевачка па каморцы,
А малойчык за ею.
— Пастой, дзевачка, пастой малада,
Пагаварымо з табою.

Быў я на рынку, чуў я навінку
Праз цябе маладзенькую.
Венчык таргуе, чэпчык купляе
Усе табе маладзенькай.

— Ніхай таргуе, ніхай купляе,
Я яго не баюся.
Я венчык скіну, чэпчык адзену,
Хустачкай ухінуся.

132. Зялёны дубок, зелянюсенькі...



Зялёны дубок, зелянюсенькі,
Куды ты пахіліўся?
Малады малойчык, маладзюсенькі,
Куды ты заманіўся?

Ў праву ручачку ўзяў нагаечку —
Коніка паганяці,
Ў леву ручачку — белу хустачку —
Слёзы выціраці.

133. Ой,сарву, сарву з ружы кветачку...



Ой,сарву, сарву з ружы кветачку
Да пушчу на вадзіцу:
— Ды плыві, плыві з розы кветачка
Аж да новай крыніцы.

Ці ня прыдзя мая мамачка
Тую вадзіцу браці?
Мамачка прышла, вадзіцу брала,
Кветачку прызнавала.

134. Журавы лятуць, палудзянь нясуць...



Журавы лятуць, палудзянь нясуць,
Будзем мы палуднаваць.
Журавы селі, палудзянь з'елі,
Нет чэво палуднаваць.

Мамачка ідзе, палудзянь нясе,
Будзем мы палуднаваць.
Мамачка села, палудзянь з'ела,
Няма чаго палуднаваць.

Сястрыца ідзе, палудзянь нясе —
Будзем мы палуднаваць.
Сястрыца села, палудзянь з'ела,
Няма чаго палуднаваць.

135. Цераз мой двор зялёненькі...

Цераз мой двор зялёненькі
Цяцерка ляцела,
Не аддаў мяне татулька,
За каго хацела.

Я й хацела, я й жадала
За пісара-пана;
Ды аддаў мяне татулька
За мужыка п'яна.

Не захацеў мой татулька,
Каб я панавала,
Ды захацеў мой татулька,
Каб я гаравала.

Не захацеў мой татулька,
Каб грошы лічыла,
Ды захацеў мой татулька,
Каб нуду карміла.

136. Да чыраз шыр бор...





Да чыраз шыр бор,
Да чыраз шчыр двор
Да цяцера ляцела.

Да не доў мне Бог,
Не судзіў мне Бог,
Да каго я хацела.

З кім стаяла,
Размаўляла,
Падаруначкі брала.

А з каго кпіла
Да смяялася —
Сам-сама засталася.

137. Ляцела сава з бора ў дуброву...



Ляцела сава з бора ў дуброву
К саколу на размову:

— Скажы, саколю, скажы, сівенькі,
Да дзе мне лепяй будзя?

Ці ў гэтым бары, ці ў гэтам бары,
Ці ў зялёнай дубровя?

— Скажу, зязюля, скажу, шэрая,
Дзе табе лепяй будзя.

У бары шышкі, паколеш ножкі,
Ў дубровя лепяй будзя.

Ішла дзевачка з хаткі ў камору
Да мамкі на размову:

— Скажы, мамачка, скажы, родная,
Да дзе мне лепяй будзя?

Ці ў мамачкі, ці ў родненькай,
Ці ў свякроўкі лепяй будзя?

— Скажу, дачушка, скажу, родная,
Што у мамкі лепяй будзя.

Я ў мамкі сяджу, косачкі чашу,
Я ў яе работнічка.

К свякроўке хаджу, работкі раблю,
Я ў яе нягоднічка.

* * *

138. Ой, ты, рыбачка-пераплывачка...

— Ой ты, рыбачка-пераплывачка,
Пераплаў сіня мора!

Адгоніш лодку па жоўтым пяску
І зловіш шчуку-рыбку.

— Ой ці рыбачка, ці ня рыбачка,
Да ня быць жа мне ў моры.

— Ой ты, дзевачка маладзенькая,
Не была ты ў горы.

Як застанесся ты ў свякроўкі,
Там цябе гора споймя:

Цябе, моладу, пашлюць па ваду,
А самы вячэраці.

Горы высокі, воды далёкі,
Сцежка незнакомая.

Прынесла ваду на сваю бяду —
Каждаму піць падаці.

Падай старому, падай малому,
Міламу маладому.

Стары нап'ецца, малы надзьмецца,
Друг мілы надругнецца.

Пайду ў каморку, скланю галоўку —
Божа мой, есці хачу!

А ні свечачкі, ні агарачка,
Немагчыма свяціці.

А ні брацяйкі, а ні сястрыцы,
Нема з кім гаварыці.

Одвячэрала я хлеб сухама,
Слёзкамы праганяла.

А я слёзкамы да праганяла,
Сваю долю праклінала:

— Ой ці, доля, ты дзе ўтапілася?—
Я ў вадзе б памылася.

Ой ці, доля, ты а дзе згарэла?—
Я ж бы ручкі пагрэла.

139. А ўжо позненька, ды не раненька...[1]

А ўжо позненька, ды не раненька,
Сонейка на захадзе.

Наша Ніначка, маладзенькая,
У мамачкі на выходзя.

— А пі, мамачка, тую вадзіцу,
А што я нанасіла.

Любі, мамачка, таго зяціка,
А што я палюбіла.

— Ня буду я піць тую вадзіцу,
А буду разліваці,

Ня буду любіць таго зяціка,
А буду разлучаці.

— А не разлівай, мая мамачка,
Бо цяжанька насіці,

А не разлучай мяне, мамачка,
Бо цяжанька забыці.

[1] Да напеву № 126.

140. А чаго, ласёк, чаго, сівенькі...





— А чаго, ласёк, чаго, сівенькі,
Ты к сялу прыбягаеш?

А ці ты, ласёк, ці ты сівенькі,
Цяжкую зіму чуеш?

— А хоць цяжкую, хоць ня цяжкую,
Ня будзець мне лецечка.

Лецечкам пайду, калінку прыгну,
Ягадак насмакчуся,

А зімой пайду, сасонку прыгну,
Слёзкамі абальюся.

— Чаго, Манечка, чаго, малада,
Рана зажурылася?

Ці ты, Манечка, ці ты, малада,
Благую свякроў чуеш?

— А хоць благую, хоць не благую,
Ня будзець мне мамачкі.

Ад мамачкі йду, галоўку чашу,
Песнямі запяюся.

К свякроўцы пайду, работку зраблю,
Слёзкамі абальюся.

141. Сячыце лясы, масціце масты...[1]

Сячыце лясы, масціце масты —
Мамачка ў госці едзець.

— Не едзь, мамачка, не едзь, родная,
На маё падвор'е.

Да ўсе людзі добранька жывуць,
А маё бяздолле.

Ні хацела, мая мамачка,
Каб мне добрынька жыці.

А ты хацела, мая мамачка,
Мяне з хаты збыці.

Ні хацела, мая мамачка,
Каб мне добра жылося,

Ты хацела, мая мамачка,
Каб мне гора пілося.

[1] Да напеву № 125.

142. Пад лесам-ляском...



Пад лесам-ляском
Бярозка з лістком
Ўсю восень шумавала.

— Бярозка мая,
Белая мая,
Як жа мы расстанёмся?

— Ня бось, лісцятко,
Ня бось, жоўтая,
Лёгкая расставання.

Ветрык павея,
Лісток ападзе,
Голлятко стаяць будзя.

Галячка з мамкай,
Галячка з мамкай
Ўсю ночку бедавала:

— Мамачка мая,
Родная мая,
Як жа мы расстанёмся?

— Ня бось, дачушка,
Ня бось, родная,
Лёгкая расставання.

Сваты прыедуць,
Цябе забяруць,
А я адна астануся.

143. Вот там пад ляском бярозка з лістком...



Вот там пад ляском бярозка з лістком
Усю восень шумела.

Ветрык павеё, лісток ападзе,
Бярозка стаяць будзя.

Дачка з мамачкай, дачка з мамачкай,
Расставаціся будзя.

Ўзяла мядніцу, пашла ў святліцу,
Беленька ўмылася.

Вышла з святліцы, вышла з беленькай,
Мамачцы скланілася:

— Дзякуй, мамачка, дзякуй, родная,
За тваё гадавання!

Да ні я піла, да ні я ела,
Хораша не схадзіла.

Шыла сукенку з чыстага шолку,—
Я ж яе не знасіла,

Толькі адзін раз красавалася,
Як з мілым вянчалася.

Прыехала дамоў, скінула далоў,
Сільненька заплакала.

Стаяць дзевачкі, дзяржаць кветачкі,—
Яны мяне не прымаюць.

144. Ой, заржы, заржы, конік вараны...



Ой, заржы, заржы, конік вараны,
Па полю гарцуючы.

Ой, зачуй, зачуй, мая мілая,
Вячэру гатуючы.

Яна й зачула, цяжка ўздыхнула,
Сільненька заплакала:

— А каб я была шэрай зязюляй
Да ўмела кукаваці.

Паляцела б я па белым свеця
Да мілага шукаці.

Прыляту — паду ў вішнёвым саду
Да буду кукаваці.

Вышла удава з новага двара
Да стала вупрашаці:

— Пакінь, зязюля, пакінь, шэрая,
Жаласна кукаваці!

— Ой, не пакіну, пакуль загіну.
Мне так цяжанька жыці!

Пакінуў мілы дробныя дзеткі,
Іх з некім гадаваці.

Сцялю пасцельку я бяленькаю —
Не з кім ночы начаваці.

Вару вячэрку я смачненькаю —
Не з кім мне вячэраці.

Пасцелька бела, сценачка нема —
Нема з кім размаўляці.

145. Чэрвоная калінушка...



Чэрвоная калінушка**
Над вадою сцелілася.

А я, млода, журылася,
Што й ад роду адбілася.

Ох, ад роду, ад радочку,
Трудна сэрцу, жываточку.

Яшчэ трудней галовачцы,
Што на чужэй староначцы.

Ох ты, татка, не журбуйся,
Мне пасагу не гатуйся.

Ох ты, мамка, не журбуйся,
Мне вяночка не гатуйся.

Я страціла свой вяночак
Праз свой дурны разумочак.

Пад белаю бярозаю,
Не п'яная, цвярозая.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

146. Ой, кракала да шэрая вутка...





Ой, кракала да шэрая вутка,
Ой, што ў яе да вуценят многа.

Як павяла па дуброве,—
Не прывяла да й ніводнага.

Ой, плакала да старая матка,
Да што ў яе да й дзяцей многа.

Да пажаніла, да па'ддавала.
Да нема ж пры ёй ніводнага.

Ой, есць каму піці-есці,
Да нема ж каму парадачку весці.

Ой, есць каму да напіціся,
Да нема ж каму пажурыціся.

147. Ой, пайду я на талоку...



Ой, пайду я на талоку,
На талоцэ да й усе хлопцы**.

З мяне хлопчыкі смяюцца,
Што я ў тоўстай да й сарочачцы.

Пайду, пайду я дадому
Ды найду я да й рубашачку.

Ды найду я рубашачку
Ды тонкую да і доўгую.

Парадзіла мяне маці
Паміж роду ды бяздольную.

Пакуль мая матка жыва,
То ўсё маё ды здароўейка.

Барані, Божа, матка памрэ,
То ўсё маё нешчасцейка.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

* * *

148. Паляцелі журавелькі...

Паляцелі журавелькі
Да у сыр бор пажывіціся**.

Да й паехаў мой брацейко
На Ўкраінку й ажаніціся.

Прыляцелі журавелькі
З сыра бора, пажывіўшыся.

Да й прыехоў мой брацейко
З Украінкі, й ажаніўшыся.

А сам жа ён харошэнькі,
Жонка ж яго харашэйшая.

А сам жэ ён, як месечык,
Жонка ж яго да як сонейко.

КАЛЯДКІ І ШЧАДРОЎКІ

Як і ўсюды на Беларусі, каляды на Міншчыне пачынаюцца па юліянскаму календару 6 студзеня (24 снежня па ст. ст.) святкаваннем поснай куцці, працягваюцца шчадрухай, або багатай куццёй, напярэдадні Новага года (13 студзеня) і заканчваюцца 21 студзеня. Дзе-нідзе яны і зараз захоўваюць рэшткі старажытнага карнавалу, ў межах якога выконваліся аграрна-магічныя песні. Паводле думкі нашых продкаў, гэтыя творы павінны былі спрыяць ураджаю і дабрабыту.

Дух карнавалу патрабуе ад чалавека адпаведных дзеянняў і адпаведнага паэтычнага афармлення свята. З дапамогаю пераапранання змяняецца вонкавы выгляд каляднікаў, добрых вестуноў заможнага жыцця. У межах святочнага каляднага абходу двароў разам ходзяць людзі-каляднікі, жывёлы («каза», «кабыла», «мядзведзь»), птушкі («жораў»). Калі меркаваць па песнях, у час калядавання змяняюцца каардынаты такой катэгорыі, як прастора-час: кожны раз цэнтрам сусвету становіцца тая сялянская хата, да якой прыйшлі каляднікі. Сюды ідуць калядаваць месяц з зоркамі, завітаюць у госці да гаспадара сонейка, месячык, дожджык, боскія памочнікі...

Сустракае каляднікаў не звычайная сялянская сям'я, а высакародная нябесная, бо гаспадар — гэта сам ясны месячык, гаспадыня — сонейка, іх дзеткі —



«Пайшла Каляда, калядуючы». Фота Я. Казюлі.

дробныя зорачкі. На вялікую куццю гаспадары чакаюць святых дзядоў, а падчас багатай куцці клічуць на гасціну мароз.

Будучыня ў калядках натуральна спалучаецца з цяперашнім часам: на каляды гаспадар едзе ў поле сеяць «жыта-пшаніцу, усяку пашніцу», «із каласка — жменька, із снапка — мерка». Кожны бедны селянін малюецца як самы шаноўны і багаты чалавек на вёсцы: «На ім світа шоўкам шыта, А сабалямі аблажана».

Агульныя калядкі досыць красамоўна паказваюць свята як адраджэнне нейкага міфалагічнага першапачатку. Яго сутнасцю і адзнакай з'яўляецца вобраз Каляды. Яна набліжаецца да той мяжы прасторы-часу, адкуль пачынаюцца змены ў навакольным свеце, едзе «пасярод двара ў новым вазочку», садзіцца ў хаце на куце. Гэтыя паэтычныя дэталі зусім невыпадковыя. У рэальным жыцці каляды звязаны з пачаткам новага астранамічнага года, з паваротам зімовага сонца «на лета».

Усебакова малююцца ў калядных песнях вобразы гаспадароў. Але калі паўднёва-ўсходнія калядкі акцэнтуюць увагу на іх багацці, то паўднёвыя і паўночныя — на чалавечых якасцях. Касмічны маштаб асобы гаспадара апасродкавана падаецца праз апісанне яго каня: ён «капытцам грамы выбівае, А хвосцікам золата ўмятае», пералік святых памочнікаў. Ілля, напрыклад, клапоціцца, каб «у гэтага пана яшчэ й найлепей было, «Святая Прачыста па садочку ходзіць Ды раёчкі водзіць». Заўважым, на поўдні і ўсходзе Міншчыны сустракаем больш старажытны вобраз «пчалінай маткі». Бог у калядках хутчэй выконвае ролю дабрадзея, чым памагатага ў палявых работах. Гаспадар адра-

зу атрымлівае ад Бога «з токам жыта», жонка — «шубу да долу», дочкі — «па вяночку руцьвяненькім», сыны — «па коніку па варанёнькім».

Шмат калядак прысвечана дзяўчыне і хлопцу. Сялянская дзяўчына звяртае на сябе ўвагу прыгажосцю, працавітасцю, набожнасцю. Параўнанні, узятыя для яе апісання са свету прыроды, асацыятыўна звязаны з цёплай гамай колера (макаўка, каліна), прыемным пахам (ружа), ззяннем (зорачка).

Тэма шлюбу распрацоўваецца і з дапамогаю міфалагічных матываў, гэта сведчыць на карысць магічнай накіраванасці калядных пажаданняў. Для выбару шлюбных «надобеек» дзяўчыне служыць залатая кара цудоўнага дрэва. Закаханы хлопец перамагае на балоце «змяю лютую» і едзе да цара на параду. Яго конь «мора пераскочыць, капытоў не змочыць», гэта конь волата. Відаць, толькі на Міншчыне сустракаецца вобраз зязюлі, якая абяцае хлопцу дапамагчы ў жаніцьбе, памасціць «масты сярэбраныя», паставіць «стаўбы ўсе залатыя» (на Гомельшчыне — гэта адпаведна арол, на Брэстчыне — галубок, у запісах Я. Карскага, зробленых у Віленскай губерні,— сокал).

Адной з яскравых рыс беларускіх каляд з'яўляецца «ваджэнне казы» і «ваджэнне кабылы». Гэтыя жывёлы так або інакш прадстаўлены ў каляднай абраднасці славян. Не з'яўляецца выключэннем і Міншчына, дзе да гэтага часу захаваліся адпаведныя песні і рытуалы.

Найбольшую цікавасць выклікаюць творы, якія складаюць частку драматызаванага прадстаўлення з удзелам «казы» і «кабылы». Яго асноўны змест — вясёлыя скокі, смерць і ажыванне гэтых істот. Як вядома, іх ролю выконвалі людзі ў традыцыйных для кожнай мясцовасці масках і адзенні. На Міншчыне, як і ўсюды на Беларусі, значна больш захавалася песень пра казу. Пра кабылу мы фактычна ў



«Вы, калядачкі, набліжыцеся, Хоць нядзелечку працягніцеся». (майстар з Барысаўшчыны М. Ржэуцкі). Фота Я. Казюлі.



«Го-го-го, каза...» (каляданне ў Заслаўі). Фота Я. Казюлі

нашых запісах маем толькі тры тэксты, прычым два з іх мала чым адрозніваюцца ад песень пра казу. У іх выкарыстаны тыя ж тыповыя часткі: зварот да кабылы — «прыступіцца», «скланіцца нізенька к нашаму двару, к нашаму гаспадару», або — «расхадзіцца», «развесяліцца» па ўсяму двару, просьба да аднаго з гаспадароў даць кабыле ежы, пералік тыповых калядных дароў (рэшата аўса, наверх каўбаса, асьміна жыта, сем печ-перапеч і г. д.), тлумачэнне мэты дзеянняў («каб кабыла ўстала», «была сыта»). Як бачым, гэта кабыла па сваіх атрыбутах істотна адрозніваецца ад тых коней, пра якіх апавядаецца ў велічальных калядках, аднак усе гэтыя вобразы, відаць, трэба разглядаць у рэчышчы агульнай індаеўрапейскай культавай традыцыі спалучэння каня з богам Сонца.

У параўнанні з «кабылай» вобраз «казы» звяртаў на сябе ўвагу даследчыкаў значна больш. У казе бачылі дух поля, даўца ўраджаю, сімвал урадлівасці (М. Я. Грынблат, Н. С. Гілевіч, А. І. Гурскі). У пацвярджэнне сваіх думак вучоныя неаднаразова цытавалі класічныя радкі з выразным аграрна-магічным сэнсам: «Дзе каза ходзіць — Там жыта родзіць».

У песнях пра «казу» заўважаецца яшчэ адзін персанаж каляднага карнавалу — жораў: «Гаспадар сядзіць, на казу глядзіць, А гаспадыня — на журавельку».

Былыя шматлікія калядныя гульні ў сваім натуральным выглядзе амаль усе зніклі, аднак такія каларытныя, як «Жаніцьба Цярэшкі» і «Яшчар», пакінулі глыбокі след у памяці людзей. Мяжа паміж гульнёвымі калядкамі «каза» і «Цярэшка» знаходзіцца якраз на тэрыторыі Міншчыны: зона «казы» пашыраецца прыкладна да лініі Мінск — Магілёў, а тэрыторыя, размешчаная на поўнач ад гэтай лініі (найбольш заходняя яе палавіна),— зона «Цярэшкі». На першы погляд «Цярэшка» толькі вясёлая забава, калі выбраныя «бацька» і «маці» («дзед і «баба») клапоцяцца, як сабраць у пары, «ажаніць» усіх прысутных, але ў старажытныя часы ёй, відаць, надаваўся магічны сэнс. Як сведчыць замоўная формула, «Хто будзе Цярэшку жаніць, Той у золаце будзе хадзіць».

Змест песень-цярэшак цесна звязаны з гульнёй. Адным з асноўных момантаў гульні з'яўляюцца ўцёкі «дзеда», якога даганяе «баба». На Міншчыне бывала і наадварот, але больш захавалася песень, у якіх адлюстраваны клопат «бабы», як злавіць «дзеда». У якасці кампазіцыйнай формы песень ужываецца дыялог паміж дзеючымі асобамі гульні: дзедам і бабай, бацькамі і дзецьмі, хлопцам і дзяўчынай. Асноўную групу песень на Міншчыне складаюць песні-маналогі бабулькі са зваротам да дзядулькі «не ўцякаць», да сястрыц — дапамагчы злавіць дзядульку і г. д.

Вельмі падобнай да «Жаніцьбы Цярэшкі» была калядная гульня «Яшчар». Сутнасць яе ў тым, што хлопцы-яшчары ці жанаты мужчына забіралі ў дзяўчат хустачкі, пярсцёнкі, або іншыя рэчы, а потым пад песню-просьбу аддавалі іх. На наш погляд, можна ўбачыць гульню і ў святле барацьбы чалавека з яшчарам, у рэчышчы агульнай навагодняй барацьбы чалавека са «змярцвелым пачаткам» (У. І. Чычараў) у жыцці прыроды. Ад улады яшчара-смерці вызваляліся ўсе дзяўчыны, якія забіралі свае «вяночкі». Магічная перамога над яшчарам, як уяўлялі нашы продкі, павінна была садзейнічаць абуджэнню сонца, яго касмічнаму павароту «на новае лета, на хлябы-ўраджаі».

Калядныя песні Міншчыны захавалі ў сваёй структуры рысы старажытных уяўленняў, высветлілі актыўны пачатак у светаўспрыманні чалавека, які разглядаў сябе як адну з касмічных сіл.

149. Едуць, едуць калядкі...



Едуць, едуць калядкі,
Вязуць бліны й аладкі.

На сівенькім канёчку,
На малеваненьким вазочку.

150. І у дубнічку стрынаткі...



І у дубнічку стрынаткі,
Нідалёчка калядкі.

Адзін тыдзянь да каляд,
А пан тому да й не рад.

Пашла служка, скачучы,
Пан за ёю, плачучы.

— Вярніся, служка, вярніся,
На другі гадок застаніся.

— Не вярнуся, панок, не вярнуся,
На другі гадок не застануся.

Твая пані ліхая,
Мяне з печы спіхая.

151. У дубнічку стрынаткі...





У дубнічку стрынаткі,
Гэй-гэй-гэй, стрынаткі!

Недалёчка калядкі,
Гэй-гэй-гэй, калядкі!

Толька тыдзянь да каляд,
Гэй-гэй-гэй, да каляд!

Пан чэлядзі будзя рад,
Гэй-гэй-гэй, будзя рад!

Пячы, пані, кілбасу,
Гэй-гэй-гэй, кілбасу!

Я ад пані панясу.
Гэй-гэй-гэй панясу!

Вары, пані, акорак,
Гэй-гэй-гэй, акорак!

Я ад пані ў аўторак,
Гэй-гэй-гэй, у аўторак!

152. А калядачкі, бліны-ладачкі...



А калядачкі, бліны-ладачкі, ай лялё!
Калядкі блізка, кілбаскі нізка, ай лялё!
А калядачкі падбліжаюцца, ай лялё!
А кілбасачкі падніжаюцца, ай лялё!

153. Ідзе каляда калядуючы...



Ідзе каляда калядуючы,
Каляда, каляда!*
А дзевачка жабруючы.
Дзевачка носіць, малойчык просіць.
— Пакінь прасіць — цяжка насіць:
Дзіравыя мяшкі, пагубляла кускі.

154. Прыехала каляда ўвечара, ўвечара...



Прыехала каляда ўвечара, ўвечара,
Прывезла галушкаў рэшата, рэшата.

Паставіла на стаўпе, на стаўпе,
А сама села на куце, на куце.

Паставіла ножкі на прэстоля, на прэстоля,
Паклала ручкі на прыполя, на прыполя.

Пашла каляда на дворкі, на дворкі,
Загаю галушак далоўкі, далоўкі.

Ох вы, дзеткі, ня гуляйця, ня гуляйця,
Да этых галушак пазбірайця!

Ох, мелі шанькі мы ў талеркі, у талеркі,
Ох, былі шанькі мы ў кішэнькі, у кішэнькі.

155. Прыехала каляда ўвечара, ўвечара...





Прыехала каляда ўвечара, ўвечара,
Прывезла дудак рэшата, рэшата.

Паставіла дудкі на стаўпе, на стаўпе,
А сама села на куце, на куце.

Іграйця, дудкі, весяла, весяла,
Каб было паненкам весяла, весяла.

Іграйця, дудкі, жаласна, жаласна,
Дак будзя паненкам жаласна, жаласна.

156. Прыехала каляда ўвечара, ўвечара...



Прыехала каляда ўвечара, ўвечара
Да прывезла пірагоў рэшато, рэшато.

Паставіла на стаўпе, на стаўпе,
А сама села на куце, на куце
Да ў чырвонум кабаце, кабаце.

Да вы, дзевачкі, скачыця, скачыця
Да па піражку бярыця, бярыця.

А вы, хлопчыкі, іграйця, іграйця
Да і пасночку[1] складайця, складайця.

Да тыя песенкі ў рэшато, ў рэшато
Да паставілі на дубе, на дубе.

Адкуль ўзяліся вервіі, вервіі
Ды тыя песні разграблі, разграблі.

[1] «Пасночку» — тут зн. «песеньку».

157. А калядачкі, бліны-ладачкі...



А калядачкі, бліны-ладачкі,
Ой, рано й рано, бліны-ладачкі!

А калядачкі, прыбліжыцеся,
Ой, рано й рано, прыбліжыцеся!

А каб калядак нядзель дзесятак,
Ой, рано й рано, нядзель дзесяток!

Нашы б бабачкі нагуляліся,
Ой, рано й рано, нагуляліся!

У іх пальчыкі паспрадаліся,
Ой, рано й рано, паспрадаліся!

158. Ой, ў ляску, ў ляску на жоўтум пяску...

— Добры вечар, пане гаспадару!
Ці можна шчодрыка папець?
— Можна!





Ой, ў ляску, ў ляску на жоўтум пяску,
Святы вечар, на жоўтум пяску!

Пчолачкі гудуць, цэркаў будуюць.
Святы вечар, цэркаў будуюць!

Да збудавалі з трыма й акнамі,
Святы вечар, з трыма й акнамі!

Ў первае й акно зорачка свеціць,
Святы вечар, зорачка свеціць!

Ў другое акно месяц узойдзе,
Святы вечар, месячык узойдзе!

Ў трэцяе акно сонейко грэе,
Святы вечар, сонейко грэе!

Зорачка ўзойдзе — светленько будзе,
Святы вечар, светленько будзе!

Месяц узойдзе — відненько будзе,
Святы вечар, відненько будзе!

Сонейка ўзойдзе — цёпленько будзе,
Святы вечар, цёпленько будзе!

159. Добры вечар добрым людзям!



Добры вечар добрым людзям!
Ці дома, дома сам гаспадар?

А я бачу, што ён дома,
Сядзіць сабе кале стала.

На ім шапка пуховая,
На ім кажух бабровенькі.

160. Ой, учоры з вечоры...



Ой, учоры з вечоры**.
С паднябескага неба.

С паднябескага неба
Прыйшла к нам навіна.

Прыйшла к нам навіна:
Родзіць панна сына.

Родзіць панна сына,
Родзіць раджонаго.

Родзіць раджонаго,
Езуса мілого.

Небеса растварылісь,
Тры анёлачкі явілісь.

Тры анёлачкі явілісь.
— Пастушкі вы мілы!

Пастушкі вы мілы,
Небеса растварылі.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

161. Добры вечар табе, пане-гаспадару!



Добры вечар табе, пане-гаспадару!
Радуйся, ой, радуйся, земля,— сын Божый нарадзіўся!*
Засцілайце столы, усе, сколька маем.
Да кладзця калачы, святую пшаніцу.
Да прышлі к нам жэ да тры свята ў госці:
А першае свято — Хрыстова раджэнне,
А другое свято — святое Васілле,
А трэцяе свято — святое Вадохрышчэ.

162. Ой, над ракою, над глыбокаю...

— Добры вечар, пані-гаспадару!
Ці песню спяваць?
Ці так каляду калядаваць?
— Спявайце!





Ой, над ракою, над глыбокаю,
Святы вечар, над глыбокаю!*
Там стаіць явар тонкі, высокі,
Тонкі, высокі, ўверсе кудравы.
На том кудравом сіў арол сядзіць,
Сіў арол сядзіць, ўсё ў воду глядзіць,
Ўсё ў воду глядзіць, шчуку-рыбу бачыць,
— Ой, шчука, шчука, як ты глыбока,
Як ты глыбока, так я высока.
Ой, з цябе, шчука, луску скрабаюць,
А з мяне, арла, пер'е скубаюць.
Ой, з цябе, шчука, смачная юшка,
А з мяне, арла, мякка падушка.
Ой, з цябе, шчука, смачна вячэра,
А з мяне, арла, мякка пасцеля!

163. Ой, у мароза стаяла бяроза...

— Вечар добры!
— Добры вечар!
— Ці запець каляду,
Ці так дадзіце калбасу?
— Ну і спявайце!



Ой, у мароза стаяла бяроза,
Святы вечар людзям добрым!*
На той бярозе залатое вецце,
Выйшла, выцекла панна Манечка:
— А тое ж вецце я ж абірала,
Усё абабрала, у рукаўчык склала.
З рукаўца брала, вяночак віла.
Звіла вяночак, пайшла ў таночак.

164. Ой, у Кіяве на перавозе...



Ой, у Кіяве на перавозе,
Святы вечар, на перавозе!**
Красная панна перавоз дзержала.
Прыйшлі да яе тры панічыкі:
— Красная панна, перавязі ты нас!
— Не перавязу, нема мне часу.
Прыйшоў да яе бацюхно й просіць:
— Красная панна, перавязі мяне!
— Не перавязу, не маю часу.
Потым да яе прыйшоў мілы друг.
— Як ты мілы друг, дык перавязу,
Дык перавязу, бо ўсё цябе чакаю.

** Другая палова кожнага радка спяваецца пасля слоў «Святы вечар...»

165. А ў канцы села стаяла верба...



А ў канцы села стаяла верба,
А шчодры вечар ды добры дзень!*
А тая верба да караніста,
А на ёй кора да пазлаціста.
Вышла-уцекла слічна паненка
Да й тую кору і падабрала
І рамяснічку да й адаслала.
— Ну й рамяснічку, ну й пазлатнічку,
Акаж і ты мне да тры надоб'я:
Першы надобак —залаты кубак,
Другі надобак — залаты персцянь,
Трэці надобак — залаты венчык.
Першы надобак — для співаннейка,
Другі надобак — для менянняйка,
Трэці надобак — для вянчанняйка.

166. Закруцілася крутая гара...



Закруцілася крутая гара,
Святы вечар людзям добрым!*
Да не ўрадзіла шоўкава трава,
Толька урадзіў зялён вінаград,
Зялён вінаград даглядаць будзем,
Даглядаць будзя малада Ганначка.
Даглядаючы, моцненька ўснула.
Прышоў да яе бацюхна яе:
— Устань, дзіцятко, устань, родненьке!
Ўжо твой вінаград пташкі аб'елі,
Пташкі аб'елі да й паляцелі.

167. Да там на гарэ вінаград стаіць...



Да там на гарэ вінаград стаіць,
Святы вечар людзям добрым!*
Хто ж таго вінаграду даглядаць будзе?
Ой, абазваўся злічны панічык,
Злічны панічык, малады Ванячка:
— Я ж таго вінаграду пілнаваць буду.
Да ён пілнаваў, моцненько заснуў.
Прышла да его матухна яго:
— Устань, сыночак, й устань, родненькі!
Ўжэ твой вінаград пташкі й аб'елі,
Ўжэ тваю панну паны й абселі!
— Няхай абсядаюць, як самі знаюць,
Я сваю панну між усіх пазнаю.
Й у маей панны русая каса,
Русая каса да й да пояса,
Ў ручках хустачка тонка, белянька,
Тонка, белянька, са слёз мокранька.

168. Паляцеў каршун, каляда!



Паляцеў каршун, каляда!
Каля тога саду, каляда!

Нашоў жа ён, каляда!
Курэй стаду, каляда!

Стаў ён выбіраці, каляда!
Каторую ўзяці, каляда!

Што белыя скрылцы, каляда!
Тая — лятушчая, каляда!

Што жоўтыя ножкі, каляда!
Тая — нясушчая, каляда!

А што ў чубочку, каляда!
Тая — каршуночку, каляда!

169. Ясь коні пасе, арэхі трасе...



Ясь коні пасе, арэхі трасе,
Натрос арэхаў, сеў ды паехаў.

Німножка ехаў — чатыры мілі,
Прыстаў конічак, Божа ж мілы.

Ані сцежачкі, ні дарожачкі,
Як жа мне ехаць да дзяўчоначкі?

Я ўчора ні быў, і сёння ні быў,
Хто ж табе, дзяўчоначка, кубачкі пабіў?

— Былі жаўнера, былі маскале,
Пабілі кубачкі на новам стале.

Вынесла пучок да стрэла лучок,
На ж табе, мой мілы, да белых ручок.

Дала хустачку і капеячку,
На ж табе, мой мілы, на гарэлачку.

Ой, а куры тнуць цераз вуліцу:
Кыш-кыш-кыш, у хлеў, каб шуляк не з'еў.

170. Коляд, коляд, калядніца...



Коляд, коляд, калядніца,
Сладка с мёдам паляніца,
А без мёду не така,
Дай, цётка, пятака!

А не даш пятака,
Вазьму быка за рага,

А кабылу за чубрыну
Та й павіду у магілу.

А с магілы у кабак
Та й прадам за пятак.

Цебе, цётка, так,
А мене пятак!

171. Ну-ну-ну, казёл, ну-ну-ну, нябож...

Добры вечар людзям добрым!
Да святоя Васілля!
Разрэшыце песню спець!



Ну-ну-ну, казёл, ну-ну-ну, нябож,
Паварочайся, не забывайся!
Нашаму казлу немнога трэба:
Сем печ перапеч, рэшата аўса,
Рэшата аўса, наверх кілбаса
На паляніцы.
Дзе казёл рогам — там жыта стогам,
Дзе не бывая — там вылягая.
Дзе казёл ходзіць — там жыта родзіць,
Дзе не бывая — там вылягая.
Дзе казёл нагою — там жыта капою,
Дзе не бывая — там вылягая.

172. Ну-ну-ну, каза...



Ну-ну-ну, каза,
Ну-ну, шэрая,
Паварочайса,
Не саромяйса!

То на той бачок,
То на сёй бачок,
Зірні у бачок,
Дзе стаіць мачок.
Зірні ў другі,
Дзе стаяць крупы!

Нашаму казлу
Нямножка трэба:

Сем печ перапеч,
Рэшата аўса,
Наверх кілбаса.

Пайшоў наш казёл
Па ўсіх жа вазах,
Па ўсіх старанах.

Знайшоў наш казёл
Караля ў зямлі
З караліхаю,
З гаспадынькаю.

173. Ну-ну-ну, казёл, ну-ну-ну, нябож...



Ну-ну-ну, казёл, ну-ну-ну, нябож,
Паварочайса, не саромяйса!
Па ўсяму двару гаспадарскаму

На дваццаць валоў, на трыццаць кароў.
Каб нашы кароўкі не ялавелі,
Не ялавелі, цяляткі вялі.

174. Ой, ну-ну, казёл, паварочайся...

— Можна к вам шчодрэц папець?
— Можна!



Ой, ну-ну, казёл, паварочайся,
То на сей бачок,
То на тэй бачок,
То на рожачкі,
То на ножачкі.

Нашаму казлу
Ні многа трэба:
Сем печ перапеч,
Рэшато аўса,
Наверх кілбаса!

175. Ай, ну-ну, казёл...



Ай, ну-ну, казёл,
Ай, ну-ну, нябож,
Паварочайся,
Не саромейся,
То на ножанькі,
То на рожанькі,
На капыцікі,
На залатые.
Дзе казёл нагой —
Там жыто капой.
Дзе казёл рогам —
Там жыто стогам.
— Гаспадынечка,

Журавіначка,
Пайдзі ў клетачку,
Запалі свечачку,
Набяры мачку
На тарэлачку.
Нашаму казлу
Немножко трэба:
Сем печ перапеч,
Бочку пшаніцы
На паляніцы,
Рэшато аўса,
Наверх кілбаса!

176. Ну-ну-ну, каза...



Ну-ну-ну, каза,
Ну-ну, белая,
Паварочайся
Да на гужочках.
Дзе каза хвастом —
Там жыта кустом,
Дзе каза рагамі —
Там жыта стагамі.
А у том жыця
Перап'ёліца
Гуляла з дзецьмі —
Люба глядзеці.
Ой, дзеці, дзеці,
Дзе вас падзеці?
Й у тоя сяло,
Й у Залужжайка?
Да й у том сяле
Да й і два стралцы
Хацелі нашу козку
Забіці.
Наша козачка
Дагадаласа
Да й у пер'яйка
Захаваласа.
А Іваніха-
Балабаніха
Нашага казла
Не падарыла.
Нашаму казлу
Німножка трэба:
Сем печ-пярапеч,
Рэшата аўса,
Наверх кілбаса
І кусок сала,
Каб каза ўстала,
І капа грэчкі
На вярэячкі.

177. Ой, ну-ну, каза, ой, ну, нібога...



Ой, ну-ну, каза, ой, ну, нібога,
Да й разхадзіся, развесяліся.

Да й разхадзіся, развесяліся
Па ўсяму даму гаспадарскаму.

Ой, што ж там шуміць, шуміць да гудзе,
Пэўна матухна дзетачкі вядзе.

Ой, вядзе, вядзе да й навучае,
Свае дзетанькі да й выхвальвае.

На гары каза з казлянятамі,
На даліне воўк з ваўчанятамі.

Як прыбег ваўчок, да казу цоп-цоп,
А ваўчаняты — за казляняты.

Як прыбег заяц, стаў казу лаяць:
— Ой, ты, козынька, не гаспадынька.

Ой, ты, козынька, ці гаспадынька?
Узяла б сярпок, нажала б снапок.

Узяла б сярпок, нажала снапок,
Свае дзетачкі да й пакарміла.

Свае дзетачкі да й пакарміла,
У ніту лазу да спаць палажыла.

Як лягла спаці, ні можа ўстаці,
Ой, прашу ўстаці, каляду даці.

І палянгвіцу, і каўбасіцу,
І кусок сала, каб каза ўстала.

Нашай козіцы нямножка трэба —
Паўбочкі грэчкі на перапечкі.

Дзе каза хвастом — там жыта кустом,
Дзе каза рогам — там жыта стогам.

178. Ой, ну-ну, каза, ой, ну, небога...



Ой, ну-ну, каза, ой, ну, небога,
Дасць табе наш пан паўзалатога.

Паўзалатога, ці дзесяць грошэй,
Што ў нашай казы рогі харошы.

Што ў нашай казы рогі харошы,
Падзівіцеся, добрыя людзі.

Падзівіцеся, добрыя людзі,
На тую казу, старую бабу.

Старая баба салому сячэ,
Салому сячэ, пірагі пячэ.

На гары каза з казлятамі,
А ў даліне воўк з ваўчанятамі.

Як прыбег ваўчок, за казу — цоп-цоп,
А ваўчанята — за казлянята.

Як прыбег заяц — стаў казу лаяць:
— Ох, ты козінка, ні господзінка,

Узяла б сярпок, нажала снапок,
Сваіх дзетачак ды пакарміла

І ў ніцу лазу спаць палажыла.
Як лягла спаці, ні магла ўстаці.

Папрашу ўстаці, што-кольвек даці.
Нашай козіцы нямнога трэба:

Паўбочкі грэчкі на перапечкі,
Рэшата аўса, наверх каўбаса.

Рэшата аўса, наверх каўбаса
І кусок сала, каб каза ўстала!

179. Го-го, козачка, го-го, серая...



Го-го, козачка, го-го, серая,
Го-го, серая, го-го белая!**

Дзе каза хвастом —
Там жыта кустом,
Дзе каза мызаю —
Там жыта місаю.
Ці ты, козачка,
Не гаспадынька?
Узяла б сярпок,
Нажала снапок.

Гаспадар ідзе,
Каляду нясе
І кусок сала,
Каб каза ўстала.

** Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы.

180. Сядзі, сядзі, яшчар...



Сядзі, сядзі, яшчар,
Гэй, нам, гэй!*
На залатым крэслі,
На шчаслівым месцы.
Бяры сабе пані,
Каторую хочыш,
Каторую любіш,
За белаю ручку,
За русаю коску.

181. Яшчар, яшчар, паночак...

Яшчар, яшчар, паночак,
Проша аддаць вяночак.
Ой, я ж яго руціла,
Пару злотых плаціла,
Пару злотых чырвоных
За свой венчык зялёны,
Два конікі-іржакі,
Два музыкі-казакі,
Дзве шабелькі ясныя,
Дзве паненкі красныя.

182. Як пайду Цярэшку жаніць...



Як пайду Цярэшку жаніць,
Аж мне галоўка баліць,

І ручачкі завянуць,
Ні магу на дзеда ўзглянуць.

183. Цярэжка-Цярэжачка...



Цярэжка-Цярэжачка,
Цераз бор дарожачка,
Бітая, таптаная,
Я ў мамкі каханая.
Божа мой, галоўка баліць,
Як жа нам дзяцей ажаніць?
Якую раду браці,
Як дзяцём парадак даці?
Будзім мы піва варыць,

Будзім мы сыноў жаніць,
Будзім мы гарэлачку гнаць,
Будзім мы дачок аддаваць.
Анечка-дачушачка,
Мішачка-сынулечка,
Ай, роўная парачка,
Нам гарэлкі чарачка.
Кацілася калясо з клеці,
А жывіце харашо, дзеці!

* * *

184. Дзед бабу тапіць вядзець...

Дзед бабу тапіць вядзець,
А баба крычыць — ня йдзець:
— Мой жа ты дзядулячка,
Я ж твая бабулячка.
Сяду я на печы ў кутку,
Я ж табе кашульку вытку,
З беленькім каўнерчакам,
Каб ты быў жаўнерчакам.

Пайду я ў ток, у ток,
Там курэй куток, куток,
Куркі ўсе чорныя,
Петушка ніводнага.
Куркі, вы не сакачыця,
Галоўкі не клапаціця.
Прадам я рэшата пер'я,
Куплю вам пітушка-пеўня.

185. Божа мой, галоўка баліць...

Божа мой, галоўка баліць,
Не магу дзядульку ўлавіць.

— Дзевачкі, сястрыцы мае,
Улавіце дзядульку мне.

Будзем мы Цярэшку жаніць,
Будзем мы гарэлку піць.

Дзе тая барэлачка,
Што стаіць гарэлачка?

У жытоўцы пад лаўкаю,
Зарасла мураўкаю.

Будзем мы мураўку рыць,
Будзем мы гарэлку піць.

Выйду я на гулку, гукну:
— Прыляці, зязюлька, к акну.

Скажы, зязюлька, праўду,
Дзе я дзядульку знайду?

— Пад гаем зеляненькім,
З казачком маладзенькім.

186. Цярэжка-Цярэжухна...



Цярэжка-Цярэжухна,
Я твая пацежухна!

Цярэжку бяда стала:
З кім яго жана спала?

Яна спала пад ліпенькай
З маладым Піліпенькам.

Яна спала пад яворам
Ды з маладым Ягорам.

187. Цярэшка-Цярэшачка...



Цярэшка-Цярэшачка,
Дзе ж мая пацежачка?

Цярэшку бяда стала:
З кім мая жана спала?

А спала ці не спала,
А ўсё й мне бяда стала.

Пайду я пад тын глядзець,
Як мая мілка прадзець,

Тоненька-танюсенька,
С пальчыкам раўнюсенька.

Пастаўлю кросны ў кутку,
Міламу штаны вытку,

Ценькія, бяленькія
Я свайму міленькаму.

Дзевачкі, бяда, бяда,
Далі мне старога дзяда.

— Не ўцякай, дзядулечка,
Я твая бабулечка.

А хоць я павалюся,
За мілым паганюся.

Хоць я каленькі паб'ю,
Але мілага злаўлю.

188. Цярэшка валочыцца...



Цярэшка валочыцца —
Жаніцца ня хочыцца.

Ў Цярэшкі біда стала —
З кім яго жана спала?

— А ў полі пад елкаю
З маладою дзеўкаю.

А ў полі пад ліпаю
З маладым Піліпаю.

А мой жа Давыдзіла,
Я цябе ня відзіла.

Пайду цялушку даіць,
А Давыд за мной бяжыць.

Як пушчу даёначку
Давыду ў галёначку.

А маё ты дзядулечка,
Я ж твая бабулячка.

А я у цёмным кутку
Чацвёра штаноў натку.

Пятую кашулячку
Я свайму дзядулячку.

* * *

189. Казалі, мой дзед нічога...

Казалі, мой дзед нічога,
Насеіў пшаніцы многа.

Жыта аруды поўны,
Коні з стрэхамі роўны.

Боты на нагах блішчаць,
Кольцы на руках мігцяць.

190. На вакне ружа цвіцела...

На вакне ружа цвіцела,
Далі мне дзеда, каго я хацела.

Хоць ён росту меньшага,
Гонару важнейшага.

Як пайду я ў лавачку,
Набяру паркалечку.

Пашыю кашулечку
Я свайму дзядулечку.

191. Пайду я ў садочак...

Пайду я ў садочак,
Сарву васілёчак.

Васілёчак сіненькі,
Мой дзедзька красівенькі.

Васілёк за ўсё сіней,
Мой дзедзька за ўсіх красівей.

192. Дзядульку заву, заву...

Дзядульку заву, заву,
Здалёк пазнаю, пазнаю.

Тонкая, высокая,
Белая, румяная.

А то ж мой дзядулечка,
А я твая бабулечка.

Белая, румяная,
Прыгожая, удалая.

193. Як пайду на ток, на ток...



Як пайду на ток, на ток,
Там знайду курэй куток.

Петушка ніводнага,
Дзядульку асобнага.

А мой ты дзядулячка,
Я ж твая бабулячка!

194. Цярэшка-Цярэшанька...

Цярэшка-Цярэшанька,
Малы мой пацешанька!

— Не ўцякай, бабулечка,
Бо я твой дзядулечка.

Ці я табе лапцеў не плёў?
Ці я табе абор не віў?

Лапцікі ліповыя,
Аборкі шаўковыя.

Я куплю сукеначку,
Прыбяру, як дзевачку.

— Не ўцякай, дзядулечка,
Я ж твая бабулечка.

Пастаўлю кросны ў хатку,
Я табе штаны вытку.

Ценькія, бяленькія
Я свайму міленькаму.

Пашыю кашуліцу
І пайдзём на вуліцу.

195. П'яна бабулька была...

П'яна бабулька была,
Цераз рэчку брыла.

На кладачку ступіла,
Купалачку памачыла.

Суседка паглядзела:
Мая купка парудзела.

— Псіца, суседка, псіца,
Мая купка, як лісіца.

ПАЭЗІЯ РАДЗІН

Радзінны абрад і паэзія на Міншчыне — жывая з'ява, якая захавалася да нашых часоў у мностве рэгіянальных варыянтаў. Вось як запісалі абрад студэнты Белдзяржуніверсітэта ад Л. К. Туравай з в. Залужжа Старадарожскага раёна.

Пасля хрышчэння ў царкве дзіця прыносяць дадому, склікаюць гасцей. Першай запрашаюць павівальную бабку. Тая прыходзіць з падарункамі, купае дзіця, спавівае яго ў пялёнкі, якія прыносіць з дому. За стол садзяць спачатку кума і куму, павівальную бабку, жонку кума, а потым ужо гасцей. Пасля першай чаркі павівальная бабка падае на стол буракі — ежу, прыгатаваную з мяса, каўбас, буракоў, вострых прыпраў. Госці робяць выгляд, што ежа ім не даспадобы,

«ганяць» бабку за тое, што буракі перасаліла, крычаць «нясмачна». Але потым, быццам супакоіўшыся, прымаюцца за страву.

Пасля буракоў бабка падае на стол гаршчок кашы. Госці купляюць порцыю «кашы» за грошы. Больш за астатніх павінен даць кум. Заплаціўшы, той разбівае гаршчок на стале. Госці навыперадкі хапаюць кашу і крычаць: адны — «Горка», другія — «Салодка!».

На другі дзень застолле павінна зрабіць павівальная бабка. Калі яна адмаўляецца весці гасцей у сваю хату — яе садзяць у ночвы або на барану і водзяць са смехам па двары. Бабка можа наладжваць гасціны і ў доме парадзіхі. У гэты ж дзень была звычка хадзіць у госці да кума і кумы.

За бабку часцей бяруць каго-небудзь з родных (цётку, сястру, маці). Яна сама выбірае куму і кума. На хрэсьбіны госці ідуць з падарункамі, каб малому добра і багата жылося. На святы бабка, кум і кума прыходзяць да хроснага з пачастункамі і падарункамі. Яны жаданыя госці ў хаце. Іх віншуюць, частуюць.

У адрозненне ад іншых абрадаў, фон, які абрамляў хрэсьбінную ўрачыстасць на Міншчыне, быў больш сціплы. Тут выявіліся дзве важныя акалічнасці — больш ранні ў параўнанні з іншымі песеннымі цыкламі працэс аддзялення радзінных песень ад непасрэдных абрадавых дзеянняў і працэс адасаблення сям'і пад уплывам гістарычных умоў у вёсцы, якія прывялі ў пачатку XIX ст. да драбнення сямейных укладаў. Сваю ролю адыграла і тая акалічнасць, што нараджэнне дзіцяці — падзея сямейная (у той час як вяселле — свята для многіх, часта — для ўсёй вёскі), а таму ўдзельнікі хрэсьбін — самыя родныя і блізкія сям'і віноўнікаў урачыстасці: бацька з маці, сястра з братам, кум з кумой, бабулечка-павітулечка, суседзі. У вясёлых жартоўных песнях з кпінамі, намёкам выразна прасочваюцца адносіны паміж сваякамі і гаспадарамі дома. Гучаў у гэтых песнях і іншы матыў, які прымушаў гаспадароў і гасцей падумаць аб долі, што чакае дзіця ў жыцці. Працяг жыцця на зямлі, папаўненне роду людскога справядліва звязвалі з дастаткам у хаце: «Дзядулька пшанічку сее, Бабулька ў ваконца паглядае. Каб даў Бог пшанічка радзіла, Тады б я хоць бабкай хадзіла».

Самыя цёплыя, ласкавыя словы ў песнях адрасуюцца парадзісе (парадзіначцы). Яна і разумная, і хлебасольная, і спагадлівая: «А хто к ёй прыхінецца, Той розуму набярэцца, Піва і віна нап'енцца». Апісанне месца, дзе ляжыць парадзіха з малым, дае ўяўленне аб дабрабыце сям'і, настроі радні і гасцей. Упамінанне аб новай святліцы, дыванах, якімі да самай падлогі завешаны сцены пакоя, пераконвае нас у тым, што ў сям'і пануе дастатак. Таму і радасці многа за сталом, як многа віна і мёду.

Поўныя падзякі за чулыя адносіны да сябе, словы маладой маці, звернутыя да гасцей: «Самыя дарагія першыя госцікі — бацька з маці, Другія госцікі — братка з сястрой, А трэція госцікі — кум з кумой. Дзед і баба — уся парада, Кум з кумою — на гулянне, Брат з сястрою — на сядзенне».

У песенных сюжэтах пра бацькоў захаваны вобраз беларуса: працавітага, нешматслоўнага, скупога на ласку, але для сяброў, блізкіх гатовага аддаць апошні кавалак хлеба са свайго стала. У хрэсьбінных песнях ён услаўляецца за тое, што госцейкі справіў, бабулю, кума з кумой за стол паклікаў, віна-мёду не пашкадаваў. Гаспадар звычайна параўноўваецца ў хрэсьбінных песнях з кавалём, які «Малаточкам не стукаў, У ручкі не хукаў, Лучынкі не паліў, Сямейкі не будзіў і сыночка сабе нажыў». У многіх песнях раскрываюцца розныя грані характару гаспадара. Малоціць жыта — значыць, гаспадарлівы, працавіты; водзіць пад руку цяжарную жонку — клапатлівы; гаруе, убіваецца па жонцы, якая памерла пры родах, — любячы, верны.

Захаваўся ў хрэсьбінных песнях Міншчыны і матыў даўніх часоў, калі нараджэнне дачкі ў сям'і лічылася падзеяй не радаснай, бо дзяўчына — гэта будучая служанка для чужых людзей, якой да таго ж бацькам трэба рыхтаваць пасаг. Гаспадар цікавіцца ў бабкі-павітухі, каго нарадзіла жонка: «Калі сына, я мёду дабуду, Калі дачушку, я і так абыдуся». У запісах больш позніх гадоў з'яўляецца новы матыў гэтай тэмы. Калі раней гаспадар чакаў абавязкова сына, то зараз ён просіць жонку падарыць яму дачку: «Ой, дзякуй за сыночка, за яснага сакалочка. Нарадзі яшчэ й дачушку, ясную сакалушку».

Велічальная песня часта называла гаспадара па імені — Лёнечка, Ванечка, Колечка, укладваючы ў гэтыя словы сэнс асаблівай блізкасці, павагі гасцей.

Цэнтральнай фігурай на радзінах на Міншчыне з'яўляецца бабка. Ёй прызначаліся самае ганаровае месца ў чырвоным куце, самы салодкі пірог, мёд, ласкавыя словы. І на гэта былі свае падставы. Для маладой жанчыны прыгоннага часу, якая трапіла ў чужы край, чужую сям'ю, не абысціся было без спагадлівага слова жанчыны, якая многа пабачыла на сваім вяку. Яна часта замяняла маладой жанчыне і маці, і сястру, і сяброўку, была адначасова і лекарам, і сядзелкай, і нянькай. Таму ў час сямейных урачыстасцей бабуля — госць найпершы. «Сядзіць бабуля на куце, Як галубка ў гняздзе», — спявалася ў многіх песнях. Пра ўсведамленне асобнай ролі бабулі на хрэсьбінах сведчыць дыялог кума і бабулі-павітухі. На пытанне, чаму бабка заняла самае ганаровае месца, тая адказвае: «Я за гэты куток Адразала пупок». Найпершы клопат парадзіхі — не ўгнявіць сваю бабульку. Падносячы падарункі, маладая жанчына спявала: «Выбачай, бабка, выбачай, любка, Можа я не ўгадзіла. Кроіла падарак пры лучынцы, Можа ўкараціла». І ўжо, вядома, хто-хто, а бабулька не павінна дабірацца дадому пешкі: «Да запала дарожка сняжком, Да не пойдзе наша бабуля пяшком». Для яе паслуг радзінныя песні абяцалі дванаццаць валоў, варанога каня, дванаццаць ваўкоў ці сабак.

Значнае месца ў радзіннай паэзіі адводзіцца куму і куме. Роля іх у хрэсьбінных урачыстасцях вядомая — яны прысутнічалі пры хрышчэнні малога, былі яго хроснымі бацькамі. Таму і садзілі іх на самым ганаровым месцы — побач з бабуляй і гаспадарамі на покуце. І велічальныя песні ім спявалі, як і бабулі. Праўда, як правіла, адрасаваліся кумам не спецыяльныя песні, а асобныя звароты ў тэксце, прысвечаныя ў першую чаргу гаспадарам або бабулі.

І бабка, і кум з кумой прыйшлі «...не піці-есці, А з людзьмі пасядзеці, Унучка, хрышчэйніка паглядзеці». У разгорнутай дзеі хрэсьбінных урачыстасцей пік весялосці прыпадае на песні пра кумоў — жартоўныя, кплівыя, падчас з эратычным падтэкстам. Кума пытае кума, чаму ён піва не наварыў, маўляў, ці не гультай ты, калі не сабраў добры ўраджай ячменю? У адказ кум спяваў: «Урадзіў ячмень, не ўрадзіла пшонка. Не пазволіла піўца зрабіці маладая жонка». У гарэзлівай форме расказваецца ў песнях аб заляцанні кума да кумы, аб пірагу з хвастом, якім кума пачаставала кума.

Міншчына аказалася надзіва багатай не толькі на велічальныя, але і на застольныя песні. Як правіла, галоўнае прызначэнне іх — паказаць гасціннасць гаспадароў, выказаць падзяку гасцям, якія прыйшлі павіншаваць маладых бацькоў з нараджэннем дзіцяці. У адрозненне ад іншых застольных беларускіх песень, застольныя хрэсьбінныя ўказваюць на прычыну свята. Указанне гэта можа заключацца ў назве песні — «Ксціны», у зачыне — «Мы ўчора з вячора на хрэсцінах былі», у пераліку гасцей — «Дзед, баба, кум з кумою».

Галоўнай дзеючай асобай многіх гэтых песень з'яўляецца маладая гаспадыня

дома. Яна запрашае гасцей паспрабаваць хлеба-солі, віна, просіць радню і блізкіх не спяшацца дадому, а заначаваць у яе.

У асобных песнях весялосць застолля не можа заглушыць болю, слёз жанчыны, якая ў свой час была поўнасцю бяспраўнай, часта цярпела здзекі мужа і яго бацькоў. У песні «Ой, да была я на рыначку» гаворыцца: «Ой, будзе ж мяне да мой муж біць, Нема каму да бараніць. Ох, у мене ж е свекроўка дома, Яна ж мене ня дбароніць...»

Хрэсьбінныя песні, як і сама ўрачыстасць, закліканы былі хаця на некалькі гадзін адарваць чалавека ад яго паўсядзённых клопатаў пра хлеб надзённы, забыць пра свой гаротны лёс, з замілаваннем паглядзець на сваіх дзяцей, родных, блізкіх, пагутарыць за чаркай віна, пажартаваць, паспяваць. У параўнанні з хрэсьбіннымі велічальнымі застольныя песні больш сацыяльна і псіхалагічна завостраныя. У іх паўней раскрыты сюжэт, ідэя твора. Як правіла, усе гэтыя песні маюць назву, чаго не скажаш пра песні велічальныя. Аднак у хрэсьбінных велічальных і застольных песень шмат агульнага. Яны выконваюцца ў адзін і той жа час, дапаўняюць адна другую, суправаджаюць хрэсьбіны.

196. Да дзякуй Богу да за дар Божы...



Да дзякуй Богу да за дар Божы,
Што ў гэтум даму гаспадар гожы.

Што ў гэтум даму гаспадар гожы,
Гаспадынячка, як маліначка.

Гаспадар гожы — наварыў піва,
Наварыў піва і гарэлачкі.

Наварыў піва і гарэлачкі —
Паіць жа гасцей да й суседачак.

197. Паздароў, Божа, каваля...



Паздароў, Божа, каваля**,
Што скаваў нам каваляне!
Яно ў ручкі ня хукня
І ножкамі ня стукня.

Чабоцікаў не знасіў,
Паціхусеньку папрасіў
І бяседачку нам зрабіў.

** Апошняе слова кожнага радка спяваецца тройчы.

198. Ой, устань, устань, парадзішачка...



Ой, устань, устань, парадзішачка,
З-за белыя прасціны!**

Паглядзі сама, парадзішачка,
Ці ўся твая радзінка.

Ці ёсць браціткі, ці ёсць сястрыцы,
Ці ёсць татка з мамкай.

Ой, ёсць браціткі, ой, ёсць сястрыцы,
Ёсць мая родна й мамка.

Ёсць з кім піць-гуляць,
Ёсць з кім пагукаць.

Ёсць з кім пагукаць —
Горачка й расказаць.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

199. Па двару куніца пахадзіла...



Па двару куніца пахадзіла**,
Яна свайго саболю пабудзіла:
— Ай, устань, саболю, абагніся,
Нас з табой суседзі ўжо асудзілі,
А што мы з табой негадзяі.
Паедзем з табою на рыначак,
А купім мы птушку-шчабятушку,
Будзіць нас з табою яна пабуджаці,
Будзем мы з табою раненька ўставаці.

** Кожны радок паўтараецца.

200. Наша бабулька-малімонка...



Наша бабулька-малімонка**,
Не п'ець гарэлкі, кажыць «горка».
А ёй унучка падгадзіла —
Мёдам гарэлку прасаладзіла.

** Кожны радок паўтараецца.

201. Прывязіця, запражыця каня варанога...



Прывязіця, запражыця каня варанога**,
Пасадзіце, адвязіце кума маладога,
Бо ён ў нас усю гарэлачку пап'ець,
А спітачкі а з ярачкі з сабой забярэць.
А прывядзіце, запражыце кабылку сляпую,
Пагадзіце, адвязіце бабульку старую.

** Другая палова радка паўтараецца.

202. Запрагайця да дванаццаць сабак...



Запрагайця да дванаццаць сабак,
Атвязіця да бабульку ў кабак.

Наша бабка падвозкі любіць,
Яна ж й нам гарэлачкі купя.

Вой, купіць да й падсалодзіць,
Нам, молодым, ды йна й угодзіць.

Запрагайця да каня варанога
Да вязіця кума маладога.

Ён і сам падвозкі любя,
Ён жа й нам гарэлачкі купя.

Вой, купя да й падсалодзя,
Ён жа нам вэльма й угодзя.

203. Запражыця, запражыця...



Запражыця, запражыця
Да дзвенаццаць валоў**.

Атвязіця, атвязіця
Да бабульку дамоў.

Наша бабулька, наша рабулька
Да паязды любіць.

Завязіця ў карчомачку
Кварту гарэлкі купіць.

Запражыця, запражыця
Да дзвенаццаць валоў.

Атвязіця, атвязіця
Нашу кумку дамоў.

Наша кумка, наша галубка
Да паязды любіць.

Завязіця ў карчомачку
Кварту гарэлкі купіць.

Запражыця, запражыця
Да дзвенаццаць валоў.

Атвязіця, атвязіця
Да кумочка дамоў.

Наш кумочак, наш галубочак
Да паязды любіць.

Завязіця ў карчомачку
Кварту гарэлкі купіць.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

204. Тут жа, тут а радзіначкі жывуць...





Тут жа, тут а радзіначкі жывуць**,
Тут жа, тут а гарэлачку ды п'юць.
Запала а дарожачка сняжком,
Пойдзя дамоў наша бабулька пяшком.

** Кожны радок паўтараецца.

205. Бабка унучкі...



Бабка унучкі, бабка унучкі
Два гурочкі несла**.

— А на табе, ўнучка, а на табе, ўнучка,
Два гурочкі мае.

Каб не балелі, каб не балелі
Жываточкі твае!

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

206. Цераз гару сцежачка лежала...





Цераз гару сцежачка лежала,
Цераз гару чорная лежала.

Э хто тую сцежачку вытаптаў[1],
А хто тую чорнаю вытаптаў?

Да Колячка сцежачку вытаптаў,
Да Колячка чорнаю вытаптаў.

А да свае бабулі ходзячы,
А да свае любае ходзячы.

Хромавыя боцікі ізнасіў,
Пакуль сваю бабулю упрасіў.

Цераз гару сцежачка лежала,
Цераз гару чорная лежала.

Э хто тую сцежачку вытаптаў,
А хто тую чорнаю вытаптаў?

Да Колячка сцежачку вытаптаў,
Да Колячка чорнаю вытаптаў.

А да свае кумачкі ходзячы,
А да свае любае ходзячы.

Хромавыя боцікі панасіў,
Пакуль сваю кумачку упрасіў.

Цераз гару сцежачка лежала,
Цераз гару чорная лежала.

Э хто тую сцежачку вытаптаў,
Да хто тую чорнаю вытаптаў?

Да Колячка сцежачку вытаптаў,
Да Колячка чорнаю вытаптаў.

А да свайго кумачка ходзячы,
А да свайго любага ходзячы.

Хромавыя боцікі панасіў,
Пакуль свайго кумачка упрасіў.

[1] Другая, сёмая і дванаццатая строфы пачынаюцца дыялектызаваным прыназоўнікам «Э» замест «А».

207. Пяркуха, бабка, пяркуха...



Пяркуха, бабка, пяркуха,
Таўчы, малоць — ня дужа,
На падарачкі дасужа.

Таўчы, малоць — нявестачку шле,
Па падарачкі сама ідзе.

208. Бабулячка-кузурачка...



Бабулячка-кузурачка,
Я мёду хачу, я мёду хачу.

Запей, запей, бабулячка,
А я заплачу, а я заплачу.

209. А ў полі ябланка зеляненька стаіць...



А ў полі ябланка зеляненька стаіць**,
Ва Іванькі бабуля цверазенька сядзіць.
А ці ён чарачкі няпоўна наліваў?
А ці ён бабулю нядобра запрашаў?

** Кожны радок паўтараецца.

210. Сядзіць бабка на куце...



Сядзіць бабка на куце,
Як галубка у гняздзе**.

Я й далоў не зляту,
Я ж дамоў не пайду.

Я ж за гэты куток
Адразала пупок.

Сядзіць кумка на куце,
Як галубка ў гняздзе.

Я ж далоў не зляту,
Я ж дамоў не пайду.

Я ж за гэты куток
Атрымала ласкуток.

** Кожная страфа паўтараецца.

211. Бабуля, а таўчы, малоць — ня дужа...



Бабуля, а таўчы, малоць — ня дужа**,
Бабуля па намётачкі дасужа.
Бабуля, а таўчы, малоць — «ёсць сям'я!»
Бабуля па намётачкі — «я й сама!»
Бабуля, а таўчы, малоць — кох-кох-кох!
Бабуля па намётачкі — скок-скок-скок!

** Кожны радок паўтараецца.

212. Чаго, бабка, чаго, любка...



Чаго, бабка, чаго, любка,
Сёння надулася?**

Ці твая, бабка, ці твая, любка,
Намётка не ўдалася?

Пасеем, бабка, пасеем, любка,
Лянок ля крыніцы.

Запашом, бабка, запашом, любка,
Лянок на курыцы.

Будзем, бабка, будзем, любка,
Лянок гадаваці.

Будзем бабцы, будзем любцы
Намётку гатаваці.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

213. Ў нашага Віцечкі вінаград на дварэ...



Ў нашага Віцечкі вінаград на дварэ**,
Вінаград на дварэ, хрэсьбіны ў хаце.
Пасадзіў ён бабусю ды на самым куце,
Частуець, вяльмуець людзям, сам сабе,
Дзінькуе бабуся не людзям, ды яму.

** Кожны радок паўтараецца.

214. Ой, запала, ой, запала...



Ой, запала, ой, запала,
Ой, дарожка сняжком**.

Наша бабка, наша любка,
Яна й ня ходзя пяшком.

Запражом мы, запражом мы
А дванаццаць каней.

Павязем мы, павязем мы,
Ой, бабусю ў карчму.

Наша бабуся, наша любуся,
Яна й паезды любя.

Наша бабуся, наша любуся,
Нам гарэлкі купя.

Ой, запала, ой, запала,
Ой, дарожка сняжком.

Наш кумочак, наш галубочак,
Ён ня ходзя пяшком.

Запражом мы запражом мы
А дванаццаць каней.

Павязем мы, павязем мы,
Ай, кумочка ў карчму.

Наш кумочак, наш галубочак,
Ён й паезды любя.

Наш кумочак, наш галубочак
Нам гарэлкі купя.

Ой, запала, ой, запала,
Ой, дарожка сняжком.

Наша кумка, наша любка,
Яна й ня ходзя пяшком.

Запражом мы, запражом мы
А дванаццаць каней.

Павязем мы, павязем мы,
Ой, кумусю ў карчму.

Наша кумуся, наша любуся,
Ой, паезды любя.

Наша кумуся, наша любуся
Нам гарэлкі купя.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

215. Кланілася кума куму...



Кланілася кума куму
Нізенька у ножкі:**

— Дзякуй табе, мой кумочак,
Што прывёз з дарожкі.

Кланілася кума куму,
Нізенька у пяткі:

— Дзякуй, табе, мой кумочак,
Што прывёз да хаткі.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

216. Як кум куме рад...



Як кум куме рад
Да павёў куму ў сад:

— Еш, кума, ягодкі, каторыя салодкі.
Еш, кума, ягодкі, каторыя салодкі.

Каторыя горкі, кідай залоўкі,
Каторыя не, дык астаўляй мне.

217. Кум да кумы заліцаўся...



Кум да кумы заліцаўся,
Канапельку сеяць сабіраўся:

— Кумка мая, любка мая,
Хто б табе мачыў, каб ні я?

Кум да кумы заліцаўся,
Канапельку рваць сабіраўся:

— Кумка мая, любка мая,
Хто б табе рваў, каб ні я?

Кум да кумы заліцаўся,
Канапельку мачыць сабіраўся:

— Кумка мая, любка мая,
Хто б табе мачыў, каб ні я?

Кум да кумы заліцаўся,
Канапельку таўчы сабіраўся:

— Кумка мая, любка мая,
Хто б табе тоўк, каб ні я?

218. А дзе кум-верабей?



— А дзе кум-верабей?— Дома.
— А што ён робіць?— Хворы ляжыць.
— А што яму баліць?— Галоўка.
— Схадзі, кумка,ў агарод,
Выдзеры маркоўку, папар яму галоўку.

— Парыла я, кумушка, парыла, галубушка,
Пар яго не бярэ, толькі к сэрцу прыстае!**

— А дзе кум-верабей?— Дома.
— А што ён робіць?— Хворы ляжыць.
— А што яму баліць? — Ручкі.
— Схадзі, кумка, ў агарод,
Вырві кусцік бручкі, папар яму ручкі.

— А дзе кум-верабей?— Дома.
— А што ён робіць?— Хворы ляжыць.
— А што яму баліць?— Бачочык.
— Схадзі, кумка, ў агарод,
Выдзеры мачочык, папар яму бачочык.

— А дзе кум-верабей?— Дома.
— А што ён робіць?— Хворы ляжыць.
— А што яму баліць?— Пяткі.
— Схадзі, кумка, ў агарод,
Вырві кусцік мяткі, папар яму пяткі.

** Прыпеў-двухрадкоўе паўтараецца двойчы пасля кожнай страфы.

219. Ой, сасна к сасне да пахілілася...



Ой, сасна к сасне да пахілілася,
Вой, кума з кумою пасварылася.

Вой, кума з кумою пасварылася.
Ой, за што ж(ы) яны пасварыліся?

Ці за тоя яблачка да за вішнёвая,
Ці за тоя ангалька нахрышчоная?

Ды за тоя яблачка да за вішнёвая,
За тоя ангалька нахрышчоная.

220. Ў нас сягоння імяніны...



Ў нас сягоння імяніны**.
У гэтай хаце ў гаспадыні.
У нас сягоння госці будуць.
Первыя госці — дзед і баба.
Другія госці — кум з кумою.
Трэція госці — брат з сястрою.
Дзед і баба — ўся парада.
Кум з кумою — пагуляння.
А брат с сястрою — пагукання.

** Кожны радок паўтараецца.

221. Ой, чуць, чуць, дзе гарэлачку п'юць...



Ой, чуць, чуць, дзе гарэлачку п'юць,
Вясёлая тая вулачка, ды кудой яны йдуць.

Вот яны ж ідуць, а мяне не завуць,
Прылажу я ўма ды пайду сама.

Прылажу я ўма ды пайду сама:
— Частуй, частуй, мой брацяйка, бо я госця твая.

222. Ох, вы столікі мае да пазасціланые...



Ох, вы столікі мае да пазасціланые,
Ой, вы госцікі ж мае пазазываные!

Ой, чаго вы сядзеце, хлеба-солі не ясце,
Ой, ці мой хлеб не пухоў, ці не выпаланы?

Ці мой хлеб не пухоў, ці не выпаланы,
Ці мой муж нараўлён да й не выкараны?

Ой, палала хлеб пуховы да й начовачкамі,
Ой, карала свайго мужа да ўсё словушкамі.

Ой, палала хлеб пуховы, да й не выпалала,
Ой, карала свайго мужа, да й не выкарала.

223. Прабачайце, госцікі, да на маю чэсць...



Прабачайце, госцікі, да на маю чэсць,
Бо й у мене госцікі шчэ й другіе есць.

А е ў мене госцікі братко і сестра,
Братко і сестра — ро́дзіна[1] мая.

А другіе госцікі — кум і кума,
Кум і кума — дружына мая.

А первае госцікі буду частаваць,
А другіе госцікі буду й адсалаць.

[1] «Ро́дзіна» — тут зн. «радзіна».

224. Чаго, госці, сядзеце, хлеба-солі не ясце?





Чаго, госці, сядзеце, хлеба-солі не ясце?
Ці мой хлеб не пухоў, ці мой мілай не весёл?

Ой, я хлеба печонаго да й не выпалаю,
Вой, я дружка венчальнаго да не выкараю.

Ой, палала я хлеб ўсё й начовачкамі
Й пакарала дружка ўсё ль я словачкамі.

225. Мы ўчора су вячора...



Мы учора су вячора
На хрысцінах былі**,

А сягоння ранюсенька
На пахмелле прыйшлі.

А дзе тыя вотры, што хадзілі по тры,
Супаілі мяне?

Пад вішанькай, пад чарэшанькай
Спаць палажылі мяне.

Ой, ты, вішанька, ты, чарэшанька,
Не шумі для мяне.

Ой, ты, міленькі, чарнабровенькі,
Не журысь па мяне.

А як будзеш журыціся,
Дык я буду нудзіціся.

А як буду нудзіціся,
Скора стара буду.

А я ж табе, мой міленькі,
Немілая буду.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

226. Па бару я й хадзіла...



Па бару я й хадзіла**,
Белу сосну паваліла.
Шчуку-рыбу гатавала,
Кумочка частавала.
Па бару я й хадзіла,
Белу сосну паваліла.

Шчуку-рыбу гатавала,
Кумачку частавала.
Па бару я й хадзіла,
Белу сосну паліла.
Шчуку-рыбу гатавала,
Бабачку частавала.

** Кожны радок паўтараецца.

227. Ў бару сасонка зашумела...



Ў бару сасонка зашумела**,
Мая галоўка забалела,
Яна ж гарэлкі захацела.
А я рада ж яе купіці,
Ды не с кім сесці яе піці:
Мая радзінка за ракою,
Ай, за ракою за быстраю;
А мой братнейка за гарою —
Ай, не дайсці ж мне, не даехаць:
Летняй парою у чаўночку,
Зімняй парою у вазочку.

** Кожны радок паўтараецца.

228. Ой, да была я на рыначку...



Ой, да была я на рыначку
Да піла мёд-гарэлачку.

Ой, да была я ў мяду, ў мяду,
П'яненькая я дадому йду.

Ой, будзя ж мяне да мой муж біці,
Нема каму да бараніці.

Ох, у мене ж е свякроў дома,
Яна мене да ня 'дбароніць.

Ой, яна мене да ня 'дбароніць,
Дзіця свайго да не ўгаворыць:

— Ой, ты ня бі яе ў галовачку,
Да бі яе да хусцінкаю.

Ой, да бі яе хусцінкаю —
Яна будзе гаспадынькаю.

Ой, да наварыць да напячэ яна,
Да абедаць да паднясе яна.

229. А ў гародзе ярыначка...



А ў гародзе ярыначка,
За гародам стаіць жыта**.
Знатка тая жана ў мужа,
Каторая часта біта.

Сядзіць яна у радочку,
Як чарнічанька ў барочку,
Туды-сюды пахінецца
Ды слёзкамі абальецца.

А ў гародзе ярыначка,
За гародам стаіць жыта.
Знатка тая жана ў мужа,
Каторая век нябіта.

Сядзіць яна у радочку,
Як веснінка у садочку.
Туды-сюды пахінецца,
Пахінецца, засмяецца.

** Першыя два радкі кожнай страфы паўтараюцца.

230. А ты братец мой, я сестра твая...



А ты брацец мой, я сестра твая**,
Ты не зваў мяне, я сама прыйшла.
Я сама прыйшла, на куце села,
На куце села, песню запела.
На мяне кажуць, што пасялушка,
А я ў браціка весялушка.

** Кожны радок паўтараецца.

231. Ой, люба, люба ў той бок глядзеці...





Ой, люба, люба ў той бок глядзеці,
Дзе п'юць-гуляюць мамчыны дзеці.

— Чаму, дочачка, ты спазнілася?
Ці з работкаю не ўхадзілася?

— Мамачка мая, непраўда твая,
Я з работкаю ўхадзілася.

Я з работкаю ўхадзілася,
Я і з міленькім не сварылася.

Свёкарка ліхі, стаў ён мяне біць,
Стаў мяне біць, мілы — бараніць:

— Не бі, татачка, чужое дзіця,
Чужое дзіця не (а)дбіваяцца.

Чужое дзіця не (а)дбіваяцца,
Толька слёзкамі абліваяцца.

Бо яно у нас нагаравалася,
У канцы стала настаялася.

У канцы стала настаялася,
Лічаных кускоў накусалася.

Лічаных кускоў накусалася,
Лапцяў-атопкаў нанасілася.

Лапцяў-атопкаў нанасілася,
У людзей ануч напрасілася.

232. На кірмашы й усе нашы, а вы, людзі, чуйця...



На кірмашы й усе нашы, а вы, людзі, чуйця:
Далёкія — едзьця дамоў, блізкія — начуйця.

Далёкія — едзьця дамоў, блізкія — начуйця,
Да далёкіх — праважайця, блізкім — есці дайця.

233. Піця, людзі, да гарэліцу...



Піця, людзі, да гарэліцу,
А я, молада, воду,
Трудна жыці, трудна быці
Мне без свайго роду.

А я выду да на вуліцу:
Род з родам гаворыць,
А мне, млада-маладзёсенькуй,
Не с кім слоўца прамовіць!

А мой мілый да чарнабрывы,
Ён на скрыпачку йграя.
Кале яго да чужыя жоны,
Як бел мак расцвітая.

А яго ж жана неўдалая
Да й нідзе не бывая.
— Ой, вазьму я жану неўдалую
Да й пад белыя рукі.

Да вазьму я жану неўдалую
Да пад белыя рукі,
Павяду я жану неўдалую
Да ў Дунай жа глыбокі.

— Плыві, плыві, жана неўдалая,
Да й нідзе не ўнімайся!
— Жыві, жыві, мілый чарнабрывы,
Да й не разжывайся!

ВЯСЕЛЬНЫ АБРАД І ПЕСНІ

Вяселле — яркая, самая запамінальная, надзвычай важная падзея ў жыцці кожнага чалавека. Відаць, таму вясельныя песні і сёння з'яўляюцца найбольш захаванымі, папулярнымі з шэрагу іншых жанраў абрадавай паэзіі.

СВАТАННЕ, ЗАПОІНЫ, ЗАРУЧЫНЫ

Размова пра вяселле пачыналася са с в а т а н н я. У гэты час вырашалася, адбудзецца вяселле ці не. Шлюбныя справы амаль усюды мелі месца ўвосень, калі гаспадарчыя клопаты былі ўжо практычна ўладкаваныя. Ажаніціся (ці пайсці замуж) у гэты час лічылася добрай прыкметай — гарантыяй забяспечанасці для маладых у будучым.

Ішлі «ў сваты» часцей за ўсё ўвечары. Сватацца разам са сватам звычайна ехаў і сам хлопец, вельмі рэдка — у суправаджэнні бацькоў. Часта ў дом дзяўчыны сват прыходзіў адзін.

Ад свата ў час сватання залежала вельмі многае, ад яго дасціпнасці, умення выклікаць прыхільнасць дзяўчыны і яе бацькоў да шлюбу, здольнасці пераканаць іх у тым, што станоўчы адказ, згода на вяселле — у даным выпадку адзіна правільныя. Таму ў сваты выбіралі чалавека кемлівага, гаваркога і ўсімі паважанага. Ён станавіўся галоўнай дзеючай асобай.

У доме дзяўчыны звычайна ўжо чакалі прыходу сватоў, старанна рыхтаваліся, прыбіралі ў хаце. Дзяўчына апраналася больш урачыста, чым заўсёды, каб спадабацца сватам. Маці дзяўчыны апранала лепшую хустку.

І вось, нарэшце, з'яўляюцца сваты. У в. Таль Любанскага раёна гэта адбывалася наступным чынам. Сваты ўваходзяць са словамі

— Добры вечар у хату!
Добры вечар да хаты!
Дай вам Бог, каб жылі багата:
І на хлеб, і на грошы,
І на дзеці харошы!

Сваты называюцца далей падарожнымі, што заблудзілі ў дарозе:

— Мы — людзі з далёкага краю, дарогаю прытаміліся. Ці не пусціце, людзі добрыя, ноч пераначаваць?

Іх запрашаюць у хату. Пачынаецца размова, у якой сваты паведамляюць аб мэце свайго прыходу:

— Мы чулі, што ў вас цялушачка ёсць. Ці не прадасце яе нам?

— Не, цялушкі ў нас няма,— адказвае бацька дзяўчыны.

— Людзі добрыя, нам не цялушка патрэбна. Мы чулі многа добрага аб вашай дачушцы: што яна і прыгожая, і гаспадыня дбайная, і да работы спраўная ды спорая. А ў нас ёсць галубок да пары вашай галубцы: і прыгожы, і гаваркі, і ў полі работнік — пашукаць такога! Дык ці не спараваць нам нашых галубкоў, каб яны разам жылі, дзетак расцілі ды й на нас не забываліся?

Наш хлеб — ваша вадзіца,
Наш хлопец — ваша дзявіца.

Бацька хлопца вымае з торбы хлеб, які абавязкова бяруць з сабой, калі едуць да дзяўчыны, і аддае яго яе маці, якая пры гэтым прыгаворвае:

— Хлеб соль бяром,
А вас піраваць завём!

І толькі тут у пакой, дзе адбываецца дзеянне, уваходзіць сама дзяўчына. Бацькі звяртаюцца да яе з пытаннем, ці згодная яна браць шлюб з гэтым хлопцам. Звычайна адказ быў станоўчы, нават калі дзяўчыне зусім і не падабаўся яе будучы муж. «Бацькі сказалі, я і пашла»,— расказваюць многія жанчыны, успамінаючы сваю маладосць і сваё вяселле. У такім выпадку (пры наяўнасці згоды бацькоў і самой маладой) амаль паўсюдна на Міншчыне выпівалася бутэлька гарэлкі, якую прывезлі з сабой сваты. Гэты значыла, што адбываліся з а п о і н ы (малыя запоіны, «малыя барышы», заручыны). За сталом бацькі дамаўляліся наконт вялікіх запоін («вялікага барышу»), якія адбываліся праз некаторы час пасля сватання.

На вялікія запоіны маладая запрашае сваіх сябровак, суседзяў, сваякоў. Калі абодва бакі ў час запоін дамовяцца наконт пасагу (гэта маглі быць грошы, зямля, жывёла і інш.), таксама п'ецца гарэлка. У доме маладой пакідаецца хлеб да заручын.

Пасля запоін дзяўчына яшчэ мела права адмовіцца ад вяселля, але яе родныя абавязаны былі кампенсаваць усе выдаткі за «вялікі барыш» радні маладога.

З а р у ч ы н ы (змовіны) адбываюцца дзесьці праз тыдзень, два пасля запоін, у нядзелю. Сваты вязуць з сабой гарэлку, сала, сыр. У некаторых месцах прывозяць спецыяльна прыгатаваную ежу, якая называецца «ласіна», кашу і капусту.

У в. Таль Любанскага раёна заручыны адбываліся так. Сват заходзіць у хату са словамі:

— Добры вечар! Калі любіце — прыступім, а не любіце — назад адступім.

Госці з боку маладой пытаюцца:

— Чаго вы сюды прыйшлі? Ці не згубілі чаго-небудзь?

— Згубілі!— адказваюць сваты.— Вось шукалі жаніха — ішоў з намі ды згубіўся.

Сватоў абвязвалі рушнікамі ўжо на заручынах. На іх пытанне, у чым жа яны правініліся, адказваюць песняй:

Лазілі ў наш агарод,
Патапталі нам гарох.
А мы вас злавілі, абвязалі,
Каб добрыя людзі зладзеяў усюды пазналі.

Сваты ў сваю чаргу гавораць:

Мы гарох ваш не тапталі,
Маладую там шукалі.

Да гаворкі далучаецца маці дзяўчыны:

Гарох у гародзе атойдзе,
Хай вас, сваткі, ўсякае ліха абойдзе.

Усіх запрашаюць за стол.

На заручынах пачыналі гучаць вясельныя песні, папулярнымі былі і прыпеўкі.

Пасля невялічкага застолля амаль паўсюдна на Міншчыне дзяўчына і хлопец абменьваюцца падарункамі. У в. Стругалапы Мядзельскага раёна маладая аддае маладому «тошчую», г. зн. «пустую», бутэльку, у якую насыпалася жыта, а малады звычайна дарыць радні нявесты грошы, а ёй самой аддае заручальны пярсцёнак.

На заручынах вызначаўся тэрмін вяселля, агаворваліся ўсе гаспадарчыя пытанні, звязаныя з ім, і тым самым канчаткова замацоўвалася згода абодвух бакоў на шлюб, адмовіцца ад якога было ўжо немагчыма.

234. Кукавала зяўзюлька...



Кукавала зяўзюлька,
Ніпраўду да кукавала.

Ніпраўду да кукавала,
Як я красачкі рвала.

Кукавала сем год жыці,
А на восьмы да замуж выйсці.

А прыйшла я й з красачак —
За сталом сваты сядзячы.

За сталом сваты сядзячы
Да й мяне ўспамінаючы.

235. Чаго, сваты, ву прыехалі...



Чаго, сваты ву прыехалі**:
Ці па гарох, ці па чучавіцу?

Ці па гарох, ці па чучавіцу,
Ці па нашу сястрыцу?

Наш гарох не малочаны,
Чачавіца ў снапах стаіць.

Чачавіца й у снапах стаіць.
І сястрыца й у косках сідзіць.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

236. Прапілі дзевачку на мяду...



Прапілі дзевачку на мяду**,
Разбілі дуду на ляду.

Нашто была дзевачку прапіваць?
Нашто была дудачку разбіваць?

Хай ба дзевачка гуляла,
Няхай ба дудачка іграла!

** Кожны радок паўтараецца.

237. Ды на заповіны пазвалі...





Ды на заповіны пазвалі,
Кварту гарэлкі ня далі.

Каб я ведала — не пашла.
Ці я сабе работы б не нашла?!

Да зрабіла б кудзельку з грэцкі сноп,
Да ўвязала б яе я хоць у стоўп.

Да ўвязала б яе я хоць у стоўп,
Напрала б пачынак із падсвінак.

238. Ляцела сарока далёка...



Ляцела сарока далёка,
Села тая сарока на куце.

Да пячы, мамачка, калачы,
Прыехалі госцікі — два панічы.

Сталі маю хустачку трапаці,
Стала мая мамка плакаці.

— Не плач, мамачка, ты пры мне,
Да наплачэшся без мене.

Войдзяш у сені — куфра нет,
Войдзеш у хату — дзіцяці нет.

За сталом месцінка гуляя,
На стале ложачка сухая.

Войдзяш за варота цвяткі рваць —
Нідзе майго дзіцятка не відаць.

Куды ж гэта русачка талачона,
Туды маё дзіцятка павязёна.

Талачона русачка ў шчыры бор,
Павязёна дзіцятка к свёкру на двор.

КАРАВАЙ

У суботу, напярэдадні вяселля, — і ў маладой, і ў маладога — рашчыняюць і пякуць каравай. Шмат дзе на Міншчыне гэта рабілася ў дзень вяселля. У некаторых жа месцах каравай рашчынялі ў зборную суботу, а выпякалі ў той час, як маладыя ад'едуць да вянца.

Зранку маці маладой (ці маладога) ішла да суседак, каб запрасіць іх «да свайго дзіцяці каравай рашчыняці». Звычайна ў кожнай вёсцы ўсталёвалася дакладна акрэсленае кола жанчын, якія займаліся гэтай адказнай справай. Па агульнавядомаму народнаму звычаю каравайніцамі станавіліся толькі тыя жанчыны, якім пашчасціла ў сямейным жыцці, бо лічылася, што ад гэтага ў некаторай ступені залежыць лёс маладой пары. Менавіта таму ўдоў ніколі нельга было ўбачыць сярод запрошаных. Сярод каравайніц выбіралася старэйшая, якая і кіравала ўсімі дзеяннямі. Іншы раз у каравайным абрадзе прымалі ўдзел і мужчыны.

У якасці прыкладу прывядзём каравайны абрад з в. Сяргеевічы Пухавіцкага раёна. Каб рашчыніць каравай, жанчыны-каравайніцы пытаюцца тройчы благаславення ў бацькоў маладой (маладога):

— Бацька і маці! Благаславіце каравай рашчыняці!

Атрымаўшы неабходны адказ, яны бяруцца за справу. Спачатку ў дзяжы рашчыняюць жытні хлеб. Праз некаторы час яго замешваюць. На працягу ўсіх дзеянняў спяваюцца песні. Каравай рабілі тут круглай формы, унізе яго аздабляў выплецены з цеста «плячэньчык».

Перад тым, як пасадзіць каравай у печ, каравайніцы зноў пытаюцца благаславення. Калі садзяць,спяваюць:

Караваю, караваю
Я у печу пасаджаю.

А печка рагоча —
Прымаці не хоча,—

і прыгаворваюць: «Ну, печ, прымай! Караваю і табе дам». Маладая ў гэты час павінна была схавацца ці зусім выйсці з хаты. Вярталася яна тады, калі каравай быў ужо ў печцы.

З каравайнага цеста рабілі яшчэ і маленькія каравайчыкі (потым, на вяселлі, іх раздавалі дзецям ці яшчэ каму), а таксама цацкі: «вуткі», «шышкі» і да т. п.

Вутак павінна было быць дзве — бацьку і маці (як будуць дарыць); магло быць і болей.

Гатовы каравай аздаблялі кветкамі, цукеркамі, шкляначкамі і выносілі ў клець. Затым каравайніцы вярталіся ў хату, дзе іх частавалі гарэлкай, выказваючы такім чынам удзячнасць жанчынам за іх працу.

239. Малодачкі каравай маюць...



Малодачкі каравай маюць**,
Станьце да паслухайце.

Станьце да паслухайце,
Ці хорашэ музычэнькі йграюць.

Да ляцелі да гусі з гаю,
Пыталіся да караваю:

— Ці ўжэ ж да пасаджалі?
Да чаму ж нас ні ждалі?

Мы б вам да пасаджалі,
Ножкамі да патапталі.

Ножкамі да патапталі,
Крыльцамі да папісалі.

Ножкамі да бяленькімі,
Крыльцамі залаценькімі.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

240. Каравайная цеста...



Каравайная цеста**,
Чатыры нагі ўместа.

Каравай на лапату,
Просім вас у хату.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

* * *

Ад печы да клеці сцежка раўненька[1],
Каравай, каравай, папірайся.

Каравай, каравай, папірайся
Да на покуць, каравай, пабірайся.

** Да напеву № 309.

ЗБОРНАЯ СУБОТА

Напярэдадні вяселля дзяўчына запрашала да сябе сваіх сябровак на так званы дзявочы, ці паненскі, вечар (у некаторых месцах заходніх і паўднёвых раёнаў — «вянок»). Адбываўся ён звычайна ў суботу, што і адлюстравалася і ў такой яго назве, як «зборная (суборная) субота». Гэта быў апошні для дзяўчыны вечар, які яна праводзіла разам з дзяўчатамі-сяброўкамі ў бацькоўскім доме. Іменна таму звычайная суботняя вечарынка ператваралася ў своеасаблівае развітанне маладой з бесклапотным дзяцтвам.



«Суборная суботанька настала, Наша Манячка ўсіх дзевачак сабрала». Фота Я. Казюлі.

Раней на паненскім вечары дзяўчаты звівалі нявесце шлюбны вянок. Рабілі яго з барвінца, руты, мяты, з жывых альбо штучных папяровых кветак. Вяночак часцей за ўсё імкнуліся зрабіць невялікі, у некаторых рэгіёнах яго перавязвалі чырвонай стужкай, а ў сярэдзіне завязвалі маленькі банцік. Адначасова спявалі. Песні гэтыя заўсёды былі вельмі жаласныя, сумныя. У паўночных і заходніх раёнах зроблены вянок кацілі па сталу. Нярэдка яго павінен быў выкупіць адзін з дружак маладога. Усе дзеянні таксама суправаджаліся песнямі.

Калі маладая была небагатая і на вяселле ёй не хапала рушнікоў, тады да асноўных абавязкаў запрошаных на зборны вечар дзяўчат далучаўся яшчэ адзін: неабходна было папоўніць такі недахоп — рушнікі вышываюць. Старэйшая дружка рабіла яшчэ і кветачкі. У гэты ж час рыхтавалі і падарункі, прызначаныя радні маладога.

Зрабіўшы справу, дзяўчаты сядаюць за стол і частуюцца. Пачынаецца невялічкая вечарынка, на якую амаль заўсёды запрашалі музыкантаў.

Хлопец у гэты час звычайна не прыходзіў да сваёй нявесты, іншы раз прысылаў у яе дом гарэлку і пачастунак. Часта ў яго быў свой («хлапецкі») вечар, які праходзіў, у адрозненне ад «дзявочага», больш весела, але і больш сціпла. Хлопцы рыхтавалі коней, убіралі іх у кветкі, прыбівалі елачкі да дугі, падбіралі званы, шархоткі.

Позна ўвечары дзяўчына і хлопец — кожны паасобку — ішлі да родных, суседзяў, каб запрасіць іх да сябе на вяселле. Дзяўчыну часам суправаджалі яе сяброўкі-дружкі.

У асобных месцах усходняй часткі Міншчыны (у прыватнасці, дзе-нідзе ў Пухавіцкім раёне) абрад зборнай суботы не зафіксаваны наогул.

241. Суборная суботачка настала...



Суборная суботачка настала**,
Наша Манячка ўсіх дзевачак сабрала.
А сабраўшы, ў радок саджала,
Сама села, усіх дзевачак пасадзіла.

Скланіла яна галовачку найніжэй,
Сваей мамачца, сваей родненькай, найніжэй,
Бо яна ў яе за ўсю радзінку наймілей.

** Кожны радок паўтараецца.

242. А ў каморы Леначка заснула...



А ў каморы Леначка заснула**.
Прышлі дзеўкі вянок віць — ня чула.
Пашла ж яе мамачка будзіць,
А за ею дзевачкі прасіці:
— А не будзі, мамачка, нехай спіць!
Яна ў цябе госціца — хай гасціць!
Яна ж ў цябе гасціцца ня будзець,
Яна ж тваю раскошу забудзець!

** Кожны радок паўтараецца.

243. Да сядзім мы да ні сяк, ні так...





Да сядзім мы да ні сяк, ні так,
Дайця нам да маток нітак.

Дайця нам да маток нітак,
Мы жы будам да шыці-віці.

Мы жы будам да шыці-віці
Да гарэлачку піці.

А гарэлка з сытою,
Сашачка з жаною.

244. Млода Зоячка судзіць, плануіць...



Млода Зоячка судзіць, плануіць**,
Дзе ёй як лепей свой век жыць будзіць:
— Мае дзяўчаткі, мае сястрыцы,
Парадзьце ж вы мне, што мне рабіці —
Ці замуж ісці, ці дзеўкай быці?
— Замуж зайшоўшы — бедна галоўка,
А дзеўкай быўшы — людская моўка.
Замуж зайшоўшы — нагаруішся,
А дзеўкай быўшы — наслужышся.

** Кожны радок паўтараецца.

245. Ты, каліна-маліна...





Ты, каліна-маліна,
Ты ня стой, расцвітайся!

Ты ня стой, расцвітайся,
На белы цвет закладайся!

Мне твайго цвету трэба
Хоць на адзін вечарочак.

Хоць на адзін вечарочак,
Танячцы на вяночак.

Яна й таго не знасіла,
Завінула ў паперачку.

Завінула ў паперачку,
Налажыла ў куфэрачку:

— Ляжы, ляжы, мой вяночак,
Аж да Божай расіцы.

Аж да Божай расіцы,
Аж да меншай сястрыцы.

246. Маладзенька дзевачка...[1]

— Маладзенька дзевачка,
Ці хадзіла па лужочку?

Ці хадзіла па лужочку,
Ці ламала каліначку?

Ці ламала каліначку,
Ці змятала магілачку?

Ці змятала магілачку,
Ці прасіла сваей мамачкі?

Ці прасіла сваей мамачкі
Да сябе на вясельяйка?

Да сябе на вясельяйка,
Татачку на парадачку?

Татачку на парадачку,
Развесяліць сваю хатачку?

— Дзевачкі, мае сястрыцы,
Па лужочку хадзіла.

Па лужочку хадзіла,
Каліначку ламала,

Каліначку ламала,
Магілачку змятала.

І магілачку змятала,
Я й мамачкі прасіла.

Я й мамачкі прасіла
Да сябе на вясельяйка.

Да сябе на вясельяйка,
Татачку на парадачку.

Татачку на парадачку,
Развесяліць нашу хатачку.

[1] Да напеву № 283.

* * *

247. Шэрая зязюлячка...

Шэрая зязюлячка,
Не ляці рана ў поля.

Не ляці рана ў поля,
Бо спаткае саколя.

Бо спаткае саколя,
Возьме цябе на крылляйка.

Возьме цябе на крылляйка,
Растрасе тваё пер'яйка.

Растрасе тваё пер'яйка
На ўсялякае зелляйка.

Маладзенькая дзевачка,
Ня йдзі рана ў садочак.

Ня йдзі рана ў садочак,
Будзя ехаць малойчык.

Будзя ехаць малойчык,
Возьме табе на коніка,

Возьме табе на коніка,
На яснага саколіка.

На яснага саколіка,
Распляце тваю косачку.

Распляце тваю косачку,
Разалье тваю слёзачку.

248. Па вуліцы, да па шырокай рассыпаліся трэскі...



Па вуліцы, да па шырокай рассыпаліся трэскі,
Мінаюцца табе, Олячка, ўсе дзявоцкія жарты.

Па вуліцы, да па шырокай рассыпаліся карты,
Мінаюцца табе, Олячка, ўсе дзявоцкія жарты.

Дзеўкі будуць ў сад гуляці,
А ты, маладая, ў краваць спаці.

Дзеўкі будуць ў сад гуляці,
А ты, маладзенька, і з дзіцяці.

Дзеўкі будуць вянкі віці,
А ты, маладзенька, шапкі шыці.

Ой, сядзь сабе, падумай сабе,
Ці не жаль будзе табе?

— Ой, жаль жэ мне не ўжаляваць,
Да й ужэ пара пакідаць.

249. Ідуць, ідуць кавалеры...[1]

Ідуць, ідуць кавалеры
Да нясуць венчык на талеры.

Нясуць венчык на талеры,
Дзе, дзевачка, дагадайся.

Ты, дзевачка, дагадайся,
За гэты вяночак не хватайся.

За гэты вяночак не хватайся,
Гэты венчык —абманшчык.

Гэты венчык — абманшчык,
А ён цябе абмане.

А ён цябе абмане,
Ад мамачкі адвязе.

Ад мамачкі адвязе,
Да свякроўкі прывязе.

Ад мамачкі далёё,
Да свякроўкі бліжэё.

[1] Да напеву № 260.

ВЯСЕЛЛЕ Ў МАЛАДОЙ

Звычайна вяселле пачыналася ў нядзелю зранку амаль адначасова і ў маладога, і ў маладой. У кожнай хаце збіраліся госці (радня са свайго боку, суседзі, сябры). У маладога — крыху раней, бо яго неабходна было належным чынам выправіць да маладой. Калісьці шмат дзе на Міншчыне хлопца саджалі на пасад. Адбывалася гэта абрадавае дзейства ўсюды амаль аднолькава: ставілі скрыню з зернем ці дзяжу, пакрытую кажухом, усаджвалі на яе маладога, яго хросная маці (ці хросны бацька, часта — сястра) застрыгала яму пасмачку валасоў на патыліцы і падсмальвала яе свечкай. Пры гэтым гучалі адпаведныя песні. У некаторых месцах пасля пасаду маладога дарылі[1]. Перад ад'ездам «вясельны поезд» часцей за ўсё абсыпалі жытам ці, абыходзячы тры разы, палівалі вакол яго вадой. Рабіла гэта маці маладога, радзей — бацька. Пасля ўсіх гэтых цырымоній можна было адпраўляцца ў дарогу.

Маладая перад прыездам маладога, як сведчыць большасць апісанняў з Міншчыны, ідзе апранацца ў суседнюю хату. Апраналі маладую дзяўчаты, спяваючы ёй пры гэтым тужлівыя песні аб развітанні з дзявоцтвам, каб яшчэ больш расчуліць яе сэрца. Асабліва жаласныя песні спявалі сіраце. Нявеста-сірата перад апрананнем ішла на магілу сваіх бацькоў, каб «паспытаць» благаславення перад шлюбам. Пагаласіўшы на могілках, яна вярталася ў хату, пераапраналася і чакала тут прыезду маладога.

Сустрэча маладога ў доме маладой усюды нагадвае торг, спрэчку. У. в. Азярыцкая Слабада Смалявіцкага раёна дружкі маладога павінны былі выкупіць уваход ва двор, у хату, ім трэба было заплаціць выкуп і шафяркам нявесты за кветкі, зробленыя на дзявочым вечары. Толькі тады маладога і дружыну запрашаюць у хату. Сват тым часам накіроўваецца туды, дзе хаваецца маладая, каб выкупіць яе ў дзяўчат-дружак. Выкупам служаць цукеркі, гарэлка, дробныя манеты, каляровыя стужкі і інш. Сват дае іх столькі, колькі патрабуюць дзяўчаты.

[1] Увогуле і маладую, і маладога на працягу ўсяго вяселля дарылі некалькі разоў: пасля пасада, на каравай. Усе гэтыя віды дарэння аналагічныя адзін аднаму.

Затым ён вымае рушнік (ці хустку), дае адзін канец яго маладой, сам бярэцца за другі і такім чынам вядзе яе ў хату, дзе ўсе прысутныя ўжо размясціліся за сталамі.



Вяселле ў Анопалі Мінскага раёна. Фота Г. Маскалёвай.

Абрад пасада маладой даволі распаўсюджаны на Міншчыне, аб ім расказваюць усе наяўныя апісанні з гэтага рэгіёна. У в. Шчэса Вілейскага раёна ён адбываўся наступным чынам. Калі з'яўляецца маладая, прысутныя ўстаюць. Дзяўчына падыходзіць да сваіх бацькоў, цалуе кожнаму з іх, а таксама і кожнаму з хрышчоных бацькоў руку, кланяецца ўсім і просіць прабачэння грахоў. Госці хорам адказваюць: «Хай Бог прошае». Каб маладая была багатая ў сямейным жыцці, яе апранаюць у кажух, вывернуты воўнай даверху. Маці або старэйшы брат, калі няма маці, а нават і тады, калі ёсць, бярэ рушнік і абводзіць дзяўчыну тры разы вакол хлебнай дзяжы. Пры гэтым спяваюць:

Брат сястру на пасад вядзе,
Сястра брату на ногі падзе...

Маладая садзіцца на пакрытую кажухом дзяжу, да яе падыходзіць шафер і расплятае ёй касу. Потым хрышчоная маці пакрывае дзяўчыну якой-небудзь матэрыяй, працягвае праз пярсцёнак пасмачку валасоў, застрыгае іх і падсмальвае свячой. Затым выпівае з маладой трошкі віна і садзіцца побач з ёй. Тут да нявесты падыходзіць яе маці з іконай у руках і благаслаўляе сваю дачку на шлюб. Шаферка заплятае дзяўчыне касу.

А вось як апісвае пасад маладой жыхарка в. Ракаў Валожынскага раёна М. М. Набароўская (1922): «Пачыналі ад таго, што слалі на стале абрус і спускалі яго на пол — чым даўжэйша, аж пад дзверы... Колькі хватала. А на стале ставілі абраз, часцей — Матку Боску ці Мікалая-цудатворца. А пры абразе свечкі палілі. І з боку пры абрусе ставілі калоду дубовую, а як не было дубовай, то хоць якую. Калоду прыносіў бацька і слаў на яе кажух айчынай дагары. Маладую заводзілі цераз дзверы, яна кленчыла пры стале перад абразом і малілася. Тады да яе падыходзіў брат, браў за касу і вёў да калоды, што із кажухом. Ён садзіў яе на кажух, яна падбірала ногі, каб на зямлі не стаялі, а ён у той час нешта казаў шэптам. Калі ў маладой брата не было, то на пасад яе вёў хрышчоны бацька. Што казала маладая перад абразом, я не знаю, бо мяне саму на пасад ужо не вялі, як я замуж ішла — мяне і не вучылі. А што брат кажа — то я зусім не магу знаць: гэта мужчынскі сакрэт быў».

Пасад — даволі напружаная і ўрачыстая частка вясельнага дзейства, калі дзяўчына альбо хлопец быццам пераступаюць мяжу паміж падлеткавым узростам і дарослаcцю і становяцца такім чынам раўнапраўнымі і самастойнымі членамі роду. Маладая ў гэты момант амаль ніколі не магла ўтрымацца ад слёз.

Перад ад'ездам маладых да вянца бацька ці маці маладой тры разы абыходзілі каня, пасыпаючы вакол яго жытам або паліваючы вадой, часта бацька крысой сваёй вопраткі браў каня за аброць і выводзіў за вароты.

Адразу пасля вянчання малады, калі ён жыве недалёка, вяртаўся дадому збіраць дружыну, калі ж ён прыбыў здалёк — ехаў разам з маладой у яе хату. Маладых сустракаюць бацькі з хлебам-соллю, гарэлкай.

Калі малады вяртаецца з дружынай, яго запрашаюць у хату. Там рассаджваюцца за сталы, вячэраюць — ядуць юшку, крупеню, капусту і інш. У в. Азярыцкая Слабада ў час застолля кожнаму хлопцу і кожнай дзяўчыне з дружыны маладога, а таксама свату спявалі па песні альбо велічальнага, альбо жартоўнага зместу. Акрамя таго, тут існаваў і такі цікавы звычай. У той час, як ішло вяселле ў маладой, кожны з яе дружыны павінен быў запрасіць да сябе на пачастунак усю кампанію. Госці з боку маладога пры гэтым «давалі чэсці»



Вясельны танец у в. Вузла Мядзельскага раёна. Фота У. Таланава.

гаспадару — плацілі выкуп. А ў час вяселля ў доме маладога госці маладой таксама «давалі чэсці» кожнаму з яго дружыны.

Увечары або раніцай наступнага дня маладую адпраўляюць да маладога. Папярэдне яе дораць на каравай. Дзеля гэтага расстаўляюць сталы. Часта маладую водзяць вакол стала ці дзежкі тры разы і абсыпаюць збожжам. У в. Шчэса чалавек, які водзіць маладую, называецца «надкоснікам». У некаторых месцах (в. Лаўніца Барысаўскага раёна) гэта рабіў сам малады.

У в. Языль Старадарожскага раёна дарэнне адбывалася так. Дзяўчына станавілася ў канцы стала (або садзілася за стол), хто-небудзь з гасцей гаварыў:

— Бацька і маці, благаславіце каравай несці!

Бацькі адказваюць:

— Бог благаславіць!

— Ці дазволіце каравай у камору схаваці,
Ці на людзі раздаці?

Маці маладой кажа:

— На стол падаваці,
Людзям раздаваці!

Госці ж адказваюць песняй:

А сват каравай нясе
Ды песенькі пяе.
А вы, госцейкі, жуйце
Ды падарачкі рыхтуйце.
Хто будзе каравай есці,
Таму прыйдзецца кішэню трэсці.



Вяселле ў в. Вузла Мядзельскага раёна. Фота А. Нікалаева.

Першай дорыць маці, затым бацька, родныя і ўсе астатнія.

У в. Шчэса пасля дарэння малады накрываўся чым-небудзь, каб яго не пазнала маладая, падыходзіў да яе і хацеў пацалаваць, але гэта яму ўдавалася не з першага разу.

Паступова вяселлле набліжалася да сваёй кульмінацыі — развітання маладой з роднымі, з бацькоўскім домам, са шчаслівым дзявоцкім жыццём. Маладой у гэты час падаюць сімвалічную «вячэру», за сталом яна аддае ўсім родным «дабранач» — «не на нач, а на ўвесь век».

Ад'езд маладой да маладога — адзін з самых драматычных момантаў вяселля, бо раней, як вядома, дзяўчына ішла ў чужую сям'ю, дзе яе не заўсёды чакала лёгкае жыццё. Ніхто ў гэты час не можа стрымаць хвалявання, усе плачуць і спяваюць развітальныя песні.

У в. Азярыцкая Слабада маладую, калі яна выходзіць з хаты, бацька на парозе абсыпае жытнім зернем, якое напярэдадні было ўзята з клеці. Звычай гэты наогул адзін з самых распаўсюджаных на Міншчыне. Ад'язджае маладая звычайна ў суправаджэнні шафера, шаферкі, адной-дзвюх дзяўчат, хроснай маці.

250. Над варотамі месяц...



Над варотамі месяц
Усю ночку ясна свеціць,

Усю ночку ясна свеціць,
Маладзенькій дзяцінка,

Маладзенькій дзяцінка
Па двары да пахаджая.

Па двары да пахаджая
І з зорамі размаўляя:

— Зорачкі мае ясныя,
Да й ветры мае быстрыя!

Развіця жоўтыя пяскі,
Разбіця гнілыя дошкі!

Выпусцця маю мамачку,
Выпусцця маю родную!

Няхай ідзе прыбірая
І к шлюбу выпраўляя!

251. Каля жоўтага броду...



Каля жоўтага броду**
Піў конь вараны воду.

Ён піўчы, параготвае,
Капытымі пастукотвае.

А ў Радэўцы адзываецца,
Там Ванечка сабіраецца.

Там Ванечка сабіраецца,
У мамачкі да й пытаецца:

— Мамачка мая родная,
Колько мне сватоў слаць?

— Садзі, сынку, ўсю радзіначку,
Ўсю сваю да радзімачку:

Блізкую і далёкую,
Бедную да багатую.

Багатыя па застольейку,
А бедныя па заслоньейку.

Багатыя пышаваць будуць,
А бедныя жартаваць будуць.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

252. Ў дарожку, сваткі ў дарожку...





У дарожку, сваткі, у дарожку**,
Віцячка на вайну загадаў.
У каго конь ё — карміця,
А ў каго няма — найміця,

** Кожны радок паўтараецца.

Віцячку ў дарожку спяшыцца
Па тыя русыя валасы.
Па каваныя паясы,
Па тую дзевачку красавіцу.

253. Не сядзі, малойчык, не сядзі...



Не сядзі, малойчык, не сядзі,
Выйдзі, па падвор'ю пахадзі.

Выйдзі, па падвор'ю пахадзі,
На высока неба паглядзі.

На высока неба паглядзі,
Месяца, зорачку папрасі.

Месяца, зорачку папрасі,
Каб яна табе свяціла.

Каб яна табе свяціла:
— Свяці, зорачка, да свету.

Свяці, зорачка, да свету,
Пакуль я да дзевачкі заеду.

— Я ж табе тады свяціла,
Як цябе мамка радзіла.

Чырвоным паяском ўперазала
Да табе дарожку ўказала.

254. Із-пад дуба, із-пад корэня...



Із-пад дуба, із-пад корэня**
Там вада ручаём бежыць.

Там вада ручаём бежыць,
Там Валодзька да каня поіць.

Той конь да вады не п'е,
Ён яго па галоўцы б'е.

— Не бі мяне па галовачцы,
Буду табе я ў прыгоданьцы.

Як ты будзеш із двара ўязджаці,
То я буду памалу ступаці.

Як ты будзеш гарэлачку піці,
То я буду сыру землю біці.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

255. Із-пад саду, вінаграду...[1]

Із-пад саду, вінаграду
Сівы конь вылятая.

Сівы конь вылятая,
Малойчык выязджая.

Малойчык выязджая,
Пад ім конічак гроя.

Пад ім конічак гроя,
Капыцейкам зямлю кроя.

Капыцейкам зямлю кроя.
— Да ня грой, кося, ня грой.

Да ня грой, кося, ня грой.
Капыцейкам зямлі ня крой.

Капыцяйкам зямлі ня крой,
Кроіцца маё сэрдзячка.

Кроіцца маё сэрдзячка,
Я й адзін да бяз роду, бяз племячка.

Бяз роду, бяз племячка,
Да бяз роднага татачкі.

Да бяз роднага татачкі,
Я й радзімкі не маю.

Я й радзімкі не маю,
Сам дружынку збіраю.

[1] Да напеву № 283.

256. Ой, борам, борам, як звонам...



Ой, борам, борам, як звонам,
А дарожачкай, як шнурам,

Ехала казакоў сем палкоў,
А папераду Іванька.

Назад хустачкай махае,
Здалёку коніка ўнімае.

— Стойце, баяры, слухайце,
Хто ў гэтым ціраме звонка б'е?

Хто ў гэтым ціраме звонка б'е?
Гэта мая Танечка песні пяе.

А пяе песенькі звонкія,
А рэжа падаркі тонкія.

А таней лісціны, што ў клёне,
А бялей бумагі, што ў краме.

— А вяселлечка Бог нам даў:
Ажаніўся мех — торбу ўзяў.

Павесіў на плуг — нехта ўкраў.
Каб той вечара не даждаў!

Торбачка ж тая — Танячка,
А мяшочык той — Ванячка.

257. Хто ў гэтым лесе, хто ў гэтым цёмным гукае?



Хто ў гэтым лесе, хто ў гэтым цёмным гукае?
Маладая Галечка свайго бацюхна шукае:

— Ой, прыбудзь, прыбудзь, мой бацюхна, да мяне,
Бо тут без цябе нема параданьку ў мене.

— Прыйду, дзіцятко, у суботу вечарам,
У суботу вечарам, у нядзелю раніцой.

У суботу вечарам з цёплымі пірагамі,
А ў нядзелю рано з горкімі слезамі.

258. Да а хто гэтай цёмнай ночачкі не даспаў...



Да а хто гэтай цёмнай ночачкі не даспаў**,
Чэраз магілу чорную сцежачку вытаптаў?
Млода Манячка гэту ночачку не спала,
Чэраз магілу чорную сцежку таптала.
Яна хадзіла, сваю мамачку будзіла:

— Да ўстань, устань, мая мамачка, не ляжы
Да хаця ты мне гэты дзянёчак памажы.
— Я рада ўстаці свайму дзіцяці на раду,
Нямыя дошкі сціснулі плечкі — не крану,
Сыра зямелька на грудцы пала — не дыхну,
Жоўты пясочак засыпаў вочкі — не гляну,
Трава-мурава спавіла ножкі — не пайду.

** Кожны радок паўтараецца.

259. Сягодня ў нас ад пана Бога скрасэлле...





Сягодня ў нас ад пана Бога скрасэлле**,
Начынаецца ў нашай Зіначкі вяселле.
А ці ёсць ў яе ацец, родная маці,
Да ці пазволяць вяселейка згуляці?
Да ўжо пара цясовы сталы заслаці,
Ужо ж пара мілыя госці саджаці.
Да ўжо пара і дзевачкам пяяці,
Да ўжо пара і музыкам граці.

** Кожны радок паўтараецца.

260. Ня стой, Божа, у парозя...



Ня стой, Божа, ў парозя,
Да стань, Божа, на куце.

Да стань, Божа, на куце
Да дай долю сіраце**.
Сірата долі не мая,
Слёзкамі зямлю прабівая,
На сырую зямлю налягая:

— Зямля мая сырая,
Ўзяла маю мамку маладую,
Пакінула мяне сіратою,
На таткаву галоўку,
На людскую размоўку.

** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

261.. Ой, чаго сядзіш да што думаіш, Манечка?[1]

Ой, чаго сядзіш да што думаіш, Манечка?**
Чаго татачку да ты ў свадзьбачку ні завеш?
А твой татачка адзін на чужой старане,
Да ён ні знаіць, да ня ведаець пра цябе.
Да ён у сваіх да таварышоў пытаіць:
— Ці ні сягоння маю дочычку вінчаюць?

[1] Да напеву № 315.
** Кожны радок паўтараецца.

262. Да ты, чарнесенькі мачок...



Да ты, чарнесенькі мачок,
Дзе ні пасей, то ты ўзыйдзеш.

Дзе ні пасей, то ты узыйдзеш,
Да вялікім кусточкам.

Да вялікім кусточкам,
Да шырокім лісточкам.

Ты ж, маладзенька Манечка,
Дзе ні пойдзеш, то плакаць будзеш.

Дзе ні пойдзеш, то плакаць будзеш,
Па сваёй да русай касе:

— Каса ж мая да русенькая,
Як я ў табе да красавалась!

Як я ў табе да красавалась!
Да нікога ні баялась —

Ні старога, ні малога,
Ні Валодзькі да маладога.

263. Яснае сонца калясом ідзе, раненько...



Яснае сонца калясом ідзе, раненько,
Да брат сястру на пасад вядзе, раненько.

Ён яе вядзе да спыняе, раненько,
Да брат сястру праўду пытае, раненько:

— Да хто ж табе наймілей, найлюбей, раненько,
— Род, брацейко, наймілей, найлюбей, раненько.

264. Наша Людачка на пасад ідзець...



Наша Людачка на пасад ідзець,
Мамачка валоскі стрыжэць.

Стрыжы валоскі, стрыжы
Памалу, галоўкі ні спалі.

265. Покаціласо перо...



Покаціласо перо
Па цесовам століку.

Па цесовам століку.
Пакланісь, да Олячко.

Пакланісь, да Олячко,
І старому, й малому.

І старому, й малому,
Да наўперад — Госпаду Богу.

Да наўперад — Госпаду Богу —
Дасць табе Бог добру долю.

А й бацяхну — ў каленцы,
А мамачцы — ў белы ножкі.

Цябе матка гадавала,
Сорак ночак не спала.

Сорак ночак не спала,
Сорак свечак спаліла.

Сорак ночак цямненькіх,
Сорак свечак ясненькіх.

266. Божа, Божа! Павучок па сценцы йдзе...



Божа, Божа!
Павучок па сценцы йдзе,
Павуцінейка вязе.
Божа, Божа!**

Леначка да столу йдзе,
Мамачцы ў ножкі падзе:

— А мамачка родная,
Перайдзі дарожаньку.

Перайдзі дарожаньку
Бітую, таптаную.

Бітую, таптаную,
Дзіцяці каханаму.

Бітую, саджоную,
Дзіцяці раджонаму.

** Прыпеў «Божа, Божа!» абрамляе кожную страфу.

267. Ой, горна, горна на зязюлечку...



Ой, горна, горна на зязюлечку:
Чаго рана закукавала?**

А йшчэ мне горней на сваю мамку:
Чаму я ў яе не гуляла?

Шыла плащяйка атласовенька,
Да й таго не знасіла.

Первы раз надзела, первы раз надзела,
Як на пасадзя села.

Ручкі згарнула, цяжка ўздыхнула,
Горненька заплакала:

— Ці мне ў таночак, ці мне ў вяночак,
Ці да красных дзевачак?

Да таночкі тануць, вяночкі вянуць —
Там нас не прымаюць.

Малодачкі сядзяць, дзетачак дзяржаць —
Там нас ажыдаюць.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

268. Да застукалі кованы вазы на дварэ...



Да застукалі кованы вазы на дварэ,
Да й зачула малада Ганначка ў каморы,

Да й упала свайму татачку на ногі:
— Не 'ддай, не 'ддай, родны татачка, й ад себе!

Не 'ддай, не 'ддай, родны татачка, ад себе,
Пералетую ета лецячко й у цебе.

Ета лецечко навялікаё дзенькамі,
Ой, шчо ж бы я да пагуляла з дзеўкамі.

Ета лецечко невялікаё — адзін дзень,
Ой, хоць бы я шчо й пагуляла між людзей.

Ета лецечко невялікаё — нядзелька,
Ой, шчо б жа я да й пагуляла, як дзеўка.

269. Чаго ты, малойчык, прыехаў?





Чаго ты, малойчык, прыехаў?
Мы табе дзевачкі не 'ддадзім!

Мы табе дзевачкі не 'ддадзім,
Мы тваей паходкі паглядзім**,
Мы табе ганьбачкі тры дадзім:
А першая ганьбачка — конь малы,
Другая ганьбачка — сам стары,
Трэцяя ганьбачка — п'яніца.

** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

270. Пушна, цешча, пушна...[1]

Пушна, цешча, пушна**,
Проці зяця не вушла.

А на зяця да мяцель мяце,
Дробненькі й дожджыкі.

Крыйса, зяцю, крыйса
Да кунямі й бабрамі.

Да кунямі й бабрамі,
Маладымі сватамі.

[1] Да напеву № 254.
** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

271. Як казалі, так і ёсць...



Як казалі, так і ёсць:
Вялікія вочы, доўгі нос.
Вялікія вочы, доўгі нос,
Бруха, як начоўкі,— чуць унёс.
Чаму, Манечка, не ўглядалась,
За чым жа ты пагналась?

272. Ня гніся, сватка, ня гніся, ня гніся...



Ня гніся, сватка, ня гніся, ня гніся,
Палажы чырвонца на міся.

Палажы чырвонца другога, другога —
Будзя табе лаўка гатова.

Палажы чырвонца трэцяга, трэцяга —
Будзя табе лаўка змецяна, змецяна.

273. Да звязалі свата, звязалі...



Да звязалі свата, звязалі,
Да за што ж яго звязалі?

Да за што ж яго звязалі?
Што ўкроў кашэль з курамі.

Да ўкроў кашэль з курамі,
Да ўсіх жа іх дваццаць шэсць.

Да ўсіх жа іх дваццаць шэсць,
Да ўсе ж яны ў адну шэрсць.

Да адна была кудрава,
Да й тая на елку ўдрала.

У а д к а з с п я в а ю ч ы м:



— Ой, курачка-галубачка, лезь далоў!
Да паедам жа, да паедам жа дамоў!

274. Ой, ці гэта Манечко-сірата...



Ой, ці гэта Манечко-сірата,
Да стаяла ля воза, як роза?

Да стаяла ля воза, як роза,
Ўздахнула, ўздахнула: «Мой Божа!

Хто ж мяне да шлюба давядзе,
Хто ж мяне пад вянец падвядзе?»

Да шлюба давязе сівы конь,
Пад вянец давядзе братка твой.

Да шлюба давязе давязіца,
Да пад вянец падвядзе сястрыца.

275. Вылятала ластаўка...



Вылятала ластаўка
Із мора, пакупаўшыса.

Із мора, пакупаўшыса,
Крыльяйка распусціўшы.

Крыльяйка распусціўшы,
Пер'яйка разганіўшы.

Выязжала Людачка
Ад папа, з'янчаўшыса.

Ад папа, з'янчаўшыса,
У мамачкі не пытаўшыса.

— Мамачка мая родненька,
Да звязаў мне поп ручанькі.

Да звязаў мне поп ручанькі,
Да белаю да бяліцаю.

Да белаю да бяліцаю,
Да з чужою чужаніцаю.

Да з чужою чужаніцаю,
Да й навек маладзіцаю.

276. Ой, ці рад, ці рад, малойчык...



Ой, ці рад, ці рад, малойчык,
Што у Божым доме пабываў?

Што ў Божым доме пабываў,
Дзевачку за ручку патрымаў**,
Вернае слоўца ёй сказаў,
А яна яму другоя,
Павенчалеся абоя.

** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

277. Не ругай мяне, мая матачко...



Не ругай мяне, мая матачко,
Што я позна спазнілася.

Што я позна спазнілася
І ў поўдарогі станавілася**,
Бо не было ксёндза дома.

Паехаў ксёндз да Малінава
Пшанічаньку прадаваці
Да ключыкі купаваці,
І цэркаўку адмыкаці,
Да парачку да вянчаці.

** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

278. Папытай, мамка, ў дочкі...



Папытай, мамка, ў дочкі,
Да ці ясна свечы гарэлі?

А ці ясна свечы гарэлі,
Ці жаласна ўдоўцы пелі?

Ці быў Бог да на помачы,
Ангелы да на радасці?

Ці Прачыста святая
Ля прэстола стаяла?

Ля прэстола стаяла,
Свечачкі да зажыгала?

Свечачкі да зажыгала,
Двоя дзетак вянчала?

Адноя да раджоная,
А другоя — да суджоная.

279. Прыкракнула шэра вуціца пры бары...



Прыкракнула шэра вуціца пры бары**:
А што ж майго селязенюшкі доўга нет?
Ай, знаць, яго шэры вуціцы зманілі,
Ай, знаць, яго зеляной травой кармілі.
Прыплакнула Марусенька ў цераме:
А што ж майго Іванюшкі доўга нет?
Ай, знаць, яго красны дзевіцы зманілі,
Ай, знаць, яго ў высок церам звадзілі,
Ай, знаць, яго зеляным віном паілі.

** Кожны радок паўтараецца.

280. Ой, саколя, саколя..[1]

Ой, саколя, саколя,
Прасвішчы мне дарожачку!

Прасвішчы мне дарожачку —
Вузкую, не шырокую.

Вузкую, не шырокую,
Блізкую, не далёкую:

Каб мой конь не ўтаміўся,
Каб я сам не ўпыліўся.

Каб мая шапачка ззяла,
Каб мяне цешча пазнала.

Каб мяне цешча пазнала
Да мілым зяцем назвала.

[1] Да напеву № 250.

281. Пад вішэнькаю, пад нізенькаю...



Пад вішэнькаю, пад нізенькаю
Да стаяў малойчык на вараном коні.

Ён вішэньку ломіць, галовачку клоніць,
Ён сваю чошчухну харашанька просіць:

— Чошчухна-матухна, прымі радню маю,
Прымі радню маю, аддай дачку сваю.

— Ідзі, зяцю, ў хату хоць не ў багату
Да бяры дачку за правую ручку.

Вязі яе дадому к свёкру лютому,
Хай па яго хаця распусціць шчасця.

Хай па яго хаця распусціць шчасця.
Хай па яго полю распусціць долю.

Штоб яго ніва была ўрадліва,
Штоб яго нявестка да жыла шчасліва.

282. Вінная да яблынка...





Вінная да яблынка**,
Як на табе яблык многа!

Кіслыя да салодкія,
Віннаго да ніводнаго.

Віннаго да ніводнаго,
Саладосці не згоднаго.

Маладая Галячка,
Як у цябе бацькоў многа!

Хрышчоныя да суджоныя,
Роднаго да ніводнаго.

Роднаго да ніводнаго,
Параданькі не згоднаго.

Есць каму піці-есці,
Німа каму да ладу весці.

Есць каму да напіціса,
Нема к каму прыхіліціса.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

283. Маладзенькі малойчык...



Маладзенькі малойчык,
Ўмееш дзевачку браці.
Ўмееш дзевачку браці —
Ўмей яе шанаваці**,
З вадою пераймаці.
З вадою па дарозя,
З дрывамі на парозя.
Да ня бі яе дубцам,
Накажы яе слоўцам.
Йна дубца не баіцца,
А слоўца пакаіцца.
Каб лапцей не насіла,
Каб людзей не смяшыла,
Каб аборы не цягаліс,
А каб людзі не смеяліс.

** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

284. Сядзіць дзевачка за сталом...



Сядзіць дзевачка за сталом,
Да паклала ручачкі на стале.

А паклала ручачкі на стале:
— Белы маі ручачкі ў мамучкі!

Белы маі ручачкі ў мамучкі,
Ці будзеця белыя ў свякроўкі?

Ці будзеце белыя ў свякроўкі,
Да пуховы ячмень таўкучы?

Да пуховы ячмень таўкучы,
Да сырую пшаніцу мелючы?

А зачуяў дзяцючок у дому:
— Не плач, дзевачка, ня ўбягай!

Не плач, дзевачка, ня ўбягай,
Я пуховы ячмень сам стаўку.

Я пуховы ячмень сам стаўку,
Я сырую пшаніцу сам змялю.

Я сырую пшаніцу сам змялю,
Я жа твае ручачкі падмяню.

285. Ягада з ягадай пры бару раслі...



Ягада з ягадай пры бару раслі**,
Ягада з ягадай сакаціліся.
Манечка з Ванечкам пры сялу раслі,
Манечка з Ванечкам салучыліся.

** Кожны радок паўтараецца.

286. І маладзенька дзевачка...[1]

І маладзенька дзевачка,
Куды йдзеш — ня ведаеш.

Куды йдзеш — ня ведаеш,
Твой малойчык — п'яніца**,
Вялікая нядбайніца.
Дзе карчомку пачуя,
Там дзве ночкі начуя.

Або ён цябе прап'е,
Або ў карты прайграя,
Або з кем праменяя.

Як прап'е — будзе смешна,
Як заб'е — будзе грэшна.

[1] Да напеву № 283.

** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей, за выключэннем апошняй страфы.

287. Старшы сватка Яўхімка...



Старшы сватка Яўхімка,
Ты сядзіш, абедаеш.

Ты сядзіш, абедаеш,
Таго ладу ня ведаеш,

Што дома парабілася:
Сем кароў ацялілася,

Кабыла жарабё прывяла,
Жонка сына спавіла.

— Дзякуй Богу, што ўсё добра,
Волькамы араць буду.

Волькамы араць буду,
На коніку паязджаць буду.

На коніку паязджаць буду,
Сыночка пасылаць буду.

288. Крамяная мая печачка...[1]

Крамяная мая печачка**,
Вечар гарыш да й ні выгарыш.

Вечар гарыш да й ні выгарыш
І каменья да й ні распаліш.

І каменья да й ні распаліш,
Свае мамкі да й ні разжаліш.

Маладая Волечка,
Вечар сядзіш да й ні заплачэш.

Вечар сядзіш да й ні заплачэш,
Свае мамкі да й ні разжаліш.

[1] Да напеву № 251.
** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

289. І субірайцеся, людзі...[1]

І субірайцеся, людзі,
Дзевачку дарыць будзім.

Дзевачку дарыць будзім:
З хлявіцы — па цяліцы**,

А з сошкі — па вулейку,
З баронкі — па коніку.

[1] Да напеву № 283.
** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

290. Нясу, нясу каравай з клеці...



Нясу, нясу каравай з клеці**,
Сядзь сабе да на покуці.
Сядзь сабе да на покуці,
На харошанькум месце.
На харошанькум месце,
Дай, Божа, маладым жыці.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

291. Баславі, татачка, як хлеб закрояць!



Баславі, татачка, як хлеб закрояць!**
— Ніхай Бог баславіць — і я баслаўлю,
Ніхай Бог долю дасць шчасліваю.

Баславі, й мамачка, як хлеб закрояць!
— Ніхай Бог баславіць — і я баслаўлю,
Ніхай Бог долю дасць шчасліваю.

Баславі, й радзінка, як хлеб закрояць!
— Ніхай Бог баславіць — і мы баславім,
Ніхай Бог долю дасць — і мы даём.

** Кожны радок паўтараецца.

292. Сватка Мікалаю...



Сватка Мікалаю**,
Не крой караваю.
Не крой караваю,
Мы за гэтым караваём,
Мы за гэтым караваём
Ночку пагуляйём.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

293. А ўжэ соўняйка, а ўжэ ясная...





А ўжэ соўняйка, а ўжэ ясная,
Ўжэ ж яно на заходзя**.

А ўжэ дзевачка маладзенькая
Ад мамкі на выходзя.

Да яе мамачка, яе родная,
Вячэраці саджая:

— Сядзь, маё дзіця, сядзь, маё родна,
Са мною вячэраці.

— Да твая вячэра, да твая вячэра,
Вячэра гарачая.

Бо ў свякроўкі, ў мае лютоі,
Вячэра халодная.

Яды зварыла да й астудзіла,
Мяне дажыдаючы.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

294. А ці чуеш, мая мамачка, ці чуеш...



А ці чуеш, мая мамачка, ці чуеш,
Што пад страхою дробна пташачка начуе?

Там начуе дробна пташачка-сарока,
Нашто аддаеш мяне, мая мамачка, далёка?

А як буду, мая мамачка, і з горам,
То не дойдзеш, не даедзеш да мора.

А як буду, мая мамачка, з бядою,
То не дойдзеш, не даедзеш за вадою.

295. Садзіся, татка, разам вячэраць са мною...



Садзіся, татка, разам вячэраць са мною,
Павячэраўшы, будзем дзяліцца з табою.

Табе, татачка, пунькі-прыпунькі, тачок,
А мне маладзе, куфар адзежы, бычок.

Садзіся, мамка, разам вячэраць са мною,
Павячэраўшы, будзем дзяліцца з табою.

Табе, мамка, новы сені, камора,
А мне, маладзе, кубал адзежы, карова.

Садзіся, братка, разам вячэраць са мною,
Павячэраўшы, будзем дзяліцца з табою.

Табе, брацітка, конь вараненькі, кабылка,
А мне, маладзе, дзве авечкі і свінка.

296. Дождж ідзець, дождж ідзець, пераганяючы...



Дождж ідзець, дождж ідзець, пераганяючы**,
Мамачку Манечка перапрашваець:
— Мамачка-татачка, не забудзь мяне,

Як прыйдзець суботка, прыедзь па мяне.
Тут мае сцежачкі незнакомыя,
Тут мае суседкі невядомыя.
А пакуль сцежачкі ўсе распазнаю,
Дык маму з татачкам паўспамінаю.
А пакуль сцежачкі ўсе разведаю,
Дык не раз слёзачкамі падабедаю.

** Кожны радок паўтараецца.

297. Чаго сядзіш, што ты думаеш, дзевачка?



Чаго сядзіш, што ты думаеш, дзевачка?
Хто за табою і ў пруданачках паедзя?

Твой братачка, твой роднянькі ня хоча.
— Пусціця мяне, маладзенькую, ў застолля.

Абыйду я кругом століка блізенька,
Пакланюся свайму братачку нізенька:

— Паедзь, паедзь, мой братачка, за мною,
Ты будзеш жа ў паважанца са мною.

298. Не вечарыся, вечарок...



Не вечарыся, вечарок**,
Ой, не пазніся, Сашачка!
Цяпер ночачкі цёмныя,
Находзюць хмарачкі грозныя.
Ці ў полі стаці пастаяць,
Ці ў бару агонь раскладаць?

Сашачка ў бару начуя,
Мамачка вячэру гатуя.
Варыся, вячэра, з бабрамі,
Прыедзя Сашачка з сватамі.
Варыся, вячэра, з плоткамі,
Прыедзя Сашачка з цёткамі.

** Кожны радок паўтараецца.

299. На дварэ папялішча...



На дварэ папялішча**,
Маці дачку ішча.

Маці дачку ішча***.
— Дзе мая дачушачка?

Дзе яна начавала?

Што яна вячэрала?
— Начавала пад каберцам,
Вячэрала рыбку з перцам.
Начавала пад жупанам
І з харошанькім панам.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

*** Ланцужковая страфа вытрымліваецца на працягу ўсёй песні за выключэннем апошняй страфы.

ВЯСЕЛЛЕ Ў МАЛАДОГА. ПЯРЭЗВЫ

У той час, як маладога з маладой яшчэ няма, у яго доме вяселле ідзе сваёй хадой.

Нарэшце з'яўляюцца маладыя. Часта ўсяму «вясельнаму поезду» хлопцы перагароджваюць дарогу ва двор. Сваты даюць хлопцам гарэлку, закуску і гэтак выкупляюць сабе праезд.

У в. Азярыцкая Слабада насустрач маладым выходзяць свёкар і свякроў. Свёкар ссаджвае маладую з воза на кажух. Свякроў ставіць хлебную дзежку — калі маладая «чэсная», яна без лішняга роздуму сядзе ці стане на прыгатаваную дзяжу. Але ж калі нявеста падмане і падман будзе выкрыты, то прыйдзецца ёй чакаць вялікіх непрыемнасцей. Свёкар бярэ нявестку за руку і падводзіць да хатняга парога. Тут маладая аддае падарункі радні маладога: свёкру звычайна дорыць пояс, свякрухе — хвартух, залоўкам — грэбні. Затым маладыя ўваходзяць у хату.

Пасля прыезду маладых амаль усюды адбываўся абрад завівання маладой (апранання яе ў жаночы чапец).

Праз некалькі гадзін пасля прыезду маладых ці наступным днём зранку прыязджаюць прыданыя маладой і прывозяць яе куфар (пасаг). Іх сустракаюць і запрашаюць у хату.

Раней маладая, «як замужам пабудзе», мусіла аддаць свекрыві сваю начную кашулю. Свякроў, калі нявестка аказалася «чэсная», выносіць тую кашулю ва двор, паказвае ўсім, загортвае ў яе бутэльку гарэлкі і аддае прыданым, каб тыя потым перадалі такі своеасаблівы падарунак маці маладой. Усе, задаволеныя тым, што «маладая няславы не нарабіла», заходзяць у хату, да гасцей падыходзіць сама нявеста разам з жаніхом, і зноў пачынаецца пачастунак.

Свята ў доме маладога адзначаецца незвычайнай весялосцю, сумныя ноткі тут амаль адсутнічаюць зусім, спяваюць шмат жартоўных песень пра ўсіх удзельнікаў вяселля: дружак, свата, сваццю.

На цэнтральнай Міншчыне шырока распаўсюджаны абрад «як просяць у сваці пірага»: у час, калі ў хаце ідзе застолле, уваходзяць «запарожныя» — тыя, хто не быў запрошаны на вяселле,— і спяваюць адпаведныя жартоўныя песні, прысвечаныя свату, сваці, за што кожнага частуюць кавалкам пірага.

Бліжэй да вечара ці наступным днём маладога дораць на яго каравай, які пад музыку ўносяць у пакой.

У вечары прыданыя ад'язджаюць дадому. Гэта заўсёды цяжкая хвіліна для маладой, бо ў далейшым родныя яе ўжо не падтрымаюць. Прыданыя ад'язджаюць заўсёды шумна, весела. Гэтым і заканчваецца ўласна вяселле.

Пасля вяселля праз тыдзень або праз некалькі дзён — у залежнасці ад таго, як дамовяцца паміж сабой супрацьлеглыя бакі,— адбываліся так званыя п я р э з в ы (ці пярэзыўкі). Бацькі маладога запрашаюць да сябе бацькоў маладой і некаторых іншых удзельнікаў вяселля. У дом зяця бацька і маці маладой едуць яшчэ і з тым, каб адведаць сваю дачку, даведацца, як ёй жывецца «на чужой стране».

Малады сам прыязджае за цесцем і цешчай з запрашэннем, а затым прывозіць іх у сваю хату. Потым бацькі маладой запрашаюць бацьку і маці маладога да сябе на застолле (перазываюць іх).

У час пярэзваў вясельных песень спявалася вельмі мала. У асноўным гучалі песні бяседныя, на сямейную тэматыку.

Пярэзвы — апошняя ступень вяселля, апошні яго водгук. Далей пачыналася самастойнае сямейнае жыццё маладой пары, поўнае разнастайных праблем і цяжкасцей, але і светлых хвілін таксама.

300. Ой, цёмная да нявідная ночачка...



Ой, цёмная да нявідная ночачка,
Бядавала па салавейку пташачка.

Бядавала па салавейку пташачка:
— Ці там яго крынічнай вадой спаілі?

Ці там яго крынічнай вадой спаілі,
Можэ ж яго з шэрай зязюляй злучылі?

Ой, цёмная да нявідная ночачка,
Бядавала па малойчыку мамачка.

Бядавала па малойчыку мамачка:
— Ці там яго да дзевачкі злюбілі?

Можэ ж яго там дзевачкі злюбілі,
Можэ яго з маладой дзевачкай злучылі?

301. Да свякроў нявехну да жадом жадала...



Да свякроў нявехну да жадом жадала,
Ў вішнёвам садочку хату збудавала,
Каб мая нявехна ў цянёчку спала.
А пашла свякроўка нявехну будзіці,
Дак нявехна ўстала да ўвесь род зазвала:
— Ня ты мяне радзіла, каб ты мяне будзіла,
Ня ты мяне гадавала, каб ты мною пасылала.
Свякрова з тога ручкі заламала:
— А Божа мой, Божа, чаго я прыждала —
Каб само дзіцяці дзела загадала!

302. Да прыехаў дзяцінко...



Да прыехаў дзяцінко,
Да прывёз баярачку.

Да прывёз баярачку,
Пастанавіў да й на ганачку.

Пастанавіў да й на ганачку.
А сам пайшоў да й у хатачку.

А сам пайшоў да й у хатачку
Ды пытае свае матачкі:

— Матачка мая родная,
Прывёз да баярачку.

Я прывёз да баярачку,
Пастанавіў да й на ганачку,

Ідзі прымі да баярачку,
Ды прымі да й у хатачку.

— Да ні знаю, як ея прыняці,
Да ні знаю, як яе назваці.

Як назаву да баяркаю,
То не будзе хаджайкаю.

Як назаву да княгіняю,
То не будзе гаспадыняю.

303. Ой, знаці, знаці, што чужая маці...



Ой, знаці, знаці, што чужая маці,
Ні хоча прыняці чужога дзіцяці.

Ні хоча прыняці чужога дзіцяці,
Вывярнула кажушэк — хочэ адпужаці.

— Я ж цябе, мая мамка, я ж цябе ні баюся,
Да нізенька ў ножкі табе пакланюся.

304. Просім цябе, наша Анечка, ні тужыць...



Просім цябе, наша Анечка, ні тужыць**,
Мы цябе бяром ні за наймічку, ні служыць.
Мы цябе бяром за гаспадыньку — добра жыць.
Мы табе дадзім залаты ключ ад каморы
І пусцім цябе, маладзенькаю, па волі.
Ці будзіш жа ты нашай хатачцы спрыяці,
Ці будзіш умець нашай мамачцы гадзіці?
Добрая будзіш — у печы пятух пячэцца,
Дрэнная будзіш — на сцяне бізун пляцецца.
Добрая будзіш — будзем пятухом угашчаць,
Дрэнная будзіш — будзем бізуном лупцаваць.

** Кожны радок паўтараецца.

305. Ой, слаўна, слаўна дзевачка...



Ой, слаўна, слаўна дзевачка,
Што ні хадзіла ў цёмныя лясы ў арэшкі,
Да што хадзіла ў шчырыя бары ў ягадкі,
Да й ураніла чырвону ягадку ў краватку,
Да й пусціла харошу славачку на матку,
Да й ураніла чырвону каліну ў пярыну,
Да й пусціла харошу славачку на радзіну.

306. Штоб табе, Васілік, да Бог даў...[1]

Штоб табе, Васілік, да Бог даў,
Што чужую дзевачку сабе ўзяў.
Што чужую дзевачку сабе ўзяў,
Сваім дзевачкам ганьбу даў**.

— Я яе відзеў на гарэ,
Жала яна жыта густае.
Зялёныя лугі я касіў
Ды за жоначку прыгласіў.

[1] Да напеву № 253.
** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

307. Пышан шафер, пышан...



Пышан шафер, пышан**,
Да яго шуба з быка.

Ў панядзелак лавілі,
А ў аўторак дзялілі.

А ў сераду ў квас клалі,
А ў чацвер выймалі.

А ў пятніцу сушылі,
А ў суботу пашылі.

А ў нядзелю адзелі,
Каб людзі глядзелі.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

* * *

308. А суседачкі нашы...

А суседачкі нашы**,
Дзе ж кавалеры вашы?

Ці вы з дому не бралі,
Ці ў дарозе пагублялі?

— А мы з дому іх бралі.
Да ў дарозе пагублялі.

Аднаго прывезлі,
І ў таго штаны злезлі.

309. Дайце свахні пірага...



Дайце свахні пірага:
Ці салёны, ці бахон, ці з мякіны?

Ці з чыстае пшаніцы,
Ці німа ў пірагу метліцы?

Ці прыгожая расчыняла,
Ці прыгожая мясіла?

Ці прыгожая мясіла,
Госпада Бога прасіла?

— А вы, свахі-параняхі,
Па дарозе пірагі паранялі.

Каторая рэзва — пабяжыць,
Па дарозе пірагі пабярэць.

— Мы бегалі — не знайшлі
Да й назад к вам зноў прыйшлі.

Як ні дасце пірага,
Возьмем вала за рага.

Да павядом на таржок,
Да й купім сабе піражок.

310. Старшы сватка Ванячка...



Старшы сватка Ванячка,
Дай жа нам караваю!

Дай жа нам караваю,
Калі не дасі караваю,

Калі не дасі караваю,
Мы табе раду зрадзім.

Мы табе раду зрадзім:
Мы ў цябе сваццю ўкрадзем.

Мы ў цябе сваццю ўкрадзем,
Схаваем яе ў чаломку.

Будзеш шукаць — не нойдзеш,
Будзеш пытаць — не скажэм.

Будзеш пытаць — не скажэм,
Мы табе другую пакажэм.

311. Сваціцы, нашы ластаўкі...



— Сваціцы, нашы ластаўкі,
Загадаем вам загадку.

Загадаем вам загадку,
Ці будзеце ўмець адгадаці?

Ці будзеце ўмець адгадаці,
Харашэнька адказаці?

Рос дубок цэлы гадок,
На тым дубку дванаццаць гучкоў.

На тым гучку шэсць лісточкаў,
А сёмы — жалудочак.

— Сваціцы, нашы ластаўкі,
Ці мы ў людзях не бывалі?

Ці мы ў людзях не бывалі,
Загадак не гадалі?

Ды дубок — гэта гадок,
Дванаццаць гучкоў — дванаццаць месяцаў,

Шэсць лісточкаў — шэсць дзянёчкаў,
Сёмы, жалудок,— нядзелячка.

312. Наўчылася сваці ілгаці...



Наўчылася сваці ілгаці,
Каб нам пірага не даці.

Каб нам пірага не даці —
Павязець дадому дзіцяці.

Да не так дзіцяці малому —
Свайму дзеду старому.

Моршчыцца сваці, моршчыцца,
Да з кішэні пірог тошчыцца.

Да сядзела сваці на вуллі,
Пад ёю пчолкі загулі.

Адна пчолка піснула,
Да ў сваці пірог сціснула.

313. А ў нашага свата...



А ў нашага свата**
Саломная хата.
Кругом хаты мята,
А ў хаце — багата.
Кругом хаты роза,
А ў хаце — прыгожа.
Кругом хаты елле,
А ў хаце — вяселле.
Лезуць госці ў хату,
Паглядаюць ў печку:
— Ці густа капуста,
Ці вялік гаршчок кашы?
Вялік гаршчок кашы,
Нарвіць кішкі нашы.

** Кожны радок паўтараецца.

314. Як прыйшлі сваткі ў хату...





Як прыйшлі сваткі ў хату,
Як селі, дак вала з'елі.

І свінню з парасятамі,
І аўцу з ягнятамі.

Як селі, дак вала з'елі
І свінню з парасятамі.

І аўцу з ягнятамі,
І кошку з кацянятамі.

315. Ой, скакаў зайка да чэраз гайка ў ярыцу...



Ой, скакаў зайка да чэраз гайка ў ярыцу**,
Ой, папалася наша Манечка п'яніцу.
Ой, скакаў зайка да чэраз гайка да ў жыта,
Да ні раз будзіш, наша Манечка, тут біта.
Ой, скакаў зайка да чэраз гайка да ў гарох,
Ой, чаму цябе ніхто, Манечка, ні сцярог.

** Кожны радок паўтараецца.

316. Няшчасце тваё, нядоля твая, Іванька...



Няшчасце тваё, нядоля твая, Іванька**,
Да ня йдзець твой татачка дарыці,
Ня хочыць табе шчасця, долечкі ўлажыці.
А хоць кладзець, хай не кладзець — не ўложыць,
Няхай Іванька ў Бога долейкі папросіць.

** Кожны радок паўтараецца.

317. Казалі людзі, казалі людзі...



Казалі людзі, казалі людзі,
Што ў моры вады многа**.

А як сталі браць, ваду выбіраць,
Дык і няма нічога.

Казалі людзі, казалі людзі,
Што ў Іванькі радні многа.

Як сталі дарыці, сталі падхадзіці,
Дык няма нікога.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

318. Едзьця, сваткі, дадому...



Едзьця, сваткі, дадому,
Бо паелі коні салому.

Каля тыну — крапіву,
Каля саду — расаду.

Вот дарожка, як дошка,
Вот калаінка, як струнка.

319. Ой, сваціцы, вы мае сястрыцы, просім вас...



Ой, сваціцы, вы мае сястрыцы, просім вас,
Пераехала наша Манечка жыць да вас.

А хоць яе таўчы, малоць застаўляйця,
Але ж часта вы да нас ў госці пускайця.

— Да яна ж у нас таўчы, малоць ня будзя,
Да яна свае частыя госці забудзя.

320. Ой, свацця свацці да пакарылася...





Ой, свацця свацці да пакарылася,
Каб на маё дзіцятка да не сварылася.

Каб ня будзіла, як певень пяе,
Каб пабудзіла, як пастух гоніць.

Як певень пяе, дак рана будзя,
Як пастух гоніць, дак само будзя.

321. Брацятка родненькі, паездзем дамоў!



Брацятка родненькі, паездзем дамоў!**
Мы тут начаваць ня будзім:
У свата лаўкі гібкія,
У свата пярына цвёрдая,
У свата вячэрка нясмачная;
А дома лаўкі кляновыя,
А дома пярына пухова,
А дома вячэрка смашна.

** Кожны радок паўтараецца.

322. Да брат сястрыцу харошанька просіць...





Да брат сястрыцу хорашанька просіць:
— Едзем, мая сястрыца, да разам дадому,
Ўжо паелі конікі да ўсю салому.
— Ой, едзь, едзь, мой братка, да адзін дадому,
Бо мне тут пасцелька да ўжэ ж паслана,
Смашная вячэрка ўжэ прыгатавана.

323. Мы паедзім горы-даліны раўнаваць...



Мы паедзім горы-даліны раўнаваць**,
Мы аддалі сваю сястрыцу гараваць:
— Гаруй, гаруй, наша сястрыца, не кайся,
Як прыедзіш к нам у госцікі — не жалься.
Калі прыедзіш ў гадочык разочык
Да пасядзіш за нашым сталом часочык.

** Кожны радок паўтараецца.

324. Ехалі перазвяне...



Ехалі перазвяне**
А калінавам мостам.
А калінку ламалі,
А за шапкі таркалі.
Каб іх людзі зналі,
Што яны перазвяне.

** Кожны радок паўтараецца.

* * *

325. А йшоў піразоў лёдам...

А йшоў піразоў лёдам**,
Каціў бочку з мёдам,
А другую з макам
І с усякім прасмакам,
А трэццію з півам,
І с усякім дзівам.

326. З віннага да калодзезя...[1]

З віннага да калодзезя
Манечка да воду брала.

Манечка да воду брала,
Ў свой край да пазірала.

Ў свой край да пазірала,
З сакаламі размаўляла:

— Вы ж мае два саколікі,
Паляцеце на маю старану.

Паляцеце на маю старану,
Накажэце бацьку майму:

Калі мяне запродае,
Ніхай едзе, пераведае;

Калі да навек 'ддае,
Ніхай едзе да выкупляе.

— Манечко, маё дзіцятко,
Я ж цябе не продаю.

Я ж цябе да навек 'ддаю,
Я ж еду пераведаю.

Манечко, маё дзіцятко,
Пераначуй хаця ночаньку.

Пераначуй хаця ночаньку
Да пераднюй хаця дзянёчак.

Да пераднюй хаця дзянёчак,
Ператыднюй хаця тыдзеньчык.

Табе горы да паніжаюць,
Калодзезі да паблізаюць.

Калодзезі да паблізаюць,
Суседачкі да палепшаюць.

[1] Да напеву № 251.

327. Прыехала маці ў госці к дзіцяці...

Прыехала маці ў госці к дзіцяці,
Прывезла іголку і маточак шоўку:

— Шый, мая дачухна, як вышывала.
— Німа калі, маці, шыць-вышываці.

Німа калі, маці, шыць-вышываці,
Трэба рана ўстаці да ўсё дзело знаці:

І вады прынесці, і хату падмесці,
І ложкі памыці, свякроўкі гадзіці.

ПАХАВАЛЬНЫЯ ГАЛАШЭННІ

Са старажытнай эпохі на Беларусі распаўсюджаны народны пахавальны абрад. Нягледзячы на тое, што царква з даўніх часоў асуджала гэты рытуал, ён захаваўся на тэрыторыі нашай рэспублікі з большай ці меншай паўнатой да цяперашняга часу. У аснове пахавальнага абраду і яго паэзіі ляжаць дахрысціянскія ўяўленні народа пра смерць, замагільнае жыццё, а таксама вера ў тое, што чалавек і пасля сваёй смерці можа дапамагаць або шкодзіць людзям. Аднак з цягам часу старажытная вера ў замагільнае жыццё памерлых і рэлігійна-магічныя элементы ў абрадах паступова страчваліся, пастаянны абрад аплаквання нябожчыкаў усё больш набываў характар толькі бытавога абраду. З даўнейшых часоў людзі імкнуліся забяспечыць сабе дапамогу і заступніцтва памерлых, выкарыстоўваючы ў пахавальным абрадзе магію і гэтым самым задобрываючы нябожчыка (пакіданне для яго месца і ежы на помніках, тапленне лазні, дзе першая пара прызначалася памерламу).

Хоць нам удалося запісаць не так і многа пахавальных галашэнняў на Мінскай вобласці, аднак частка з іх з'яўляецца сапраўднай вяршыняй пахавальнай лірыкі. Асабліва хочацца адзначыць творы гэтага жанру, сабраныя студэнткай філфака Белдзяржуніверсітэта А. Яновіч. Яна запісала ў сваёй вёсцы Кузьмічы Мядзельскага раёна на працягу шэрагу гадоў ад маці, бабулі, аднавяскоўцаў 66 галашэнняў. Важна тое, што А. Яновіч упершыню сярод збіральнікаў нашага фальклору сабрала галашэнні саміх памірающых.

Паэтычна ярка і шматгранна ў пахавальных галашэннях Мінскай вобласці адлюстравана сацыяльнае жыццё народа, яго быт, таму галашэнні па шырыні ахопу жыцця і глыбіні выражанай у ім народнай псіхалогіі з'яўляюцца адной з важнейшых крыніц вывучэння нашай рэчаіснасці ў не вельмі далёкім і блізкім мінулым.

Галашэнні маюць разнастайную структуру, але ў іх можна вылучыць і найбольш тыповыя часткі: зварот да нябожчыка, апавяданне аб яго жыцці, цяжкасцях сям'і, выказванне надзеі на сустрэчу, развітанне.

Для пахавальных галашэнняў Міншчыны характэрна шырокае ўжыванне разнастайных мастацкіх сродкаў (псіхалагічны паралелізм, метафарычная іншасказальнасць, паўторы слоў, звароткі і да т. п.), што служыць сродкам узмацнення іх эмацыянальнай выразнасці і драматычнага напружання. Як правіла, пахаванне

нябожчыка называецца дарожкай дальняй або адлётам, труна — хатачкай, домікам. Шырока выкарыстоўваюцца ў галашэннях словы з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі, лексіка-стылістычныя паўторы, у тым ліку анафара, эпіфара, шматзлучнікавасць і да т. п. Галашэнні хоць і адрасаваны канкрэтным нябожчыкам, аднак нярэдка ў іх ужываюцца адны і тыя ж вобразы-сімвалы, сталыя эпітэты і іншыя мастацкія сродкі, што сведчыць аб іх цеснай сувязі з традыцыямі народнай паэзіі.

У канцы галашэння звычайна падводзіцца вынік і гаворыцца аб цяжкай беззваротнай страце.

328. Па маці





Ох мамачка ж мая, родная ж мая, мае ножкі ж залатые! Куды ж вы хадзіць будзеце? А чаго ж мене ніхто ні ўстрачае? Ніхто ж мене праважаць не будзе! А ручкі ж маі рабочые, ручкі ж маі харошые, а куда ж вы ат нас уходзіце?

329. Па маці

А мая мамачка, а мая мілая, а прабачай мяне, што я рэдка цябе адведвала. Я ж далёкая, я ж адзінокая, з малымі дзеткамі. А мая мамачка, чаму ж ты не адзываешся, пра сваіх унучыкаў не пытаешся? Як жа ты мне іх гадаваць памагала, як жа ты імі цешылася, як жа ты іх пераймала! Хоць я раз у гадочак, але шчырае слоўка ад мамкі чула. А цяпер да каго ж я прыеду, хто ж мяне пярэйміць, хто мяне ўстрэціць?! Не будзіць у мяне мамкі. Ты ж мяне аж за кусточкі правадзіла, аж каля рэчачкі ўстрачала. А цяпер, мамка мілая, ляжыш, ні слоўцам не адзываешся, нічога не пытаешся. Мая мамачка, зарастуць сцежачкі, зарастуць дарожачкі, як нет маёй мамачкі. Ці папрасіла ты сваю нявестачку, майго брацітку, каб ён мяне не вычурваўся, каб ён мяне за сястрыцу шчытаў? Ах, мая мамка родная, як жа мне цяжанька, як жа мне трудненька. Мы ж ніколі не думалі на такую бедачку. Мы ж усё думалі, што наша мамка крутая, што наша мамка крэпкая. Як прыедзеш да мяне, ты ж адной мінуткі не пасядзела, ты ж адной мінуткі не пагуляла. То дварышчайка мяцеш, то ў гарод ідзеш. А ўсё работку сама сабе знаходзіш, ты ж мяне ўсё цешыла, ніколі не прызналася, ніколі не пахвалілася, што ты была гэткая хворая, што ты не магла хадзіць, не магла рабіць. А нам усё казала, што ты здаровая. Ах, мая мамачка, ах, мая мілая, ах, мая родная, паследні дзянёчак, паследні часочак відзім сваю мамачку.

330. Па маці

Мая мамачка, а мая госціца, а з якой старонкі дажыдаць будзім, у каторае аконца паглядаць будзім, ці ідуць нашы татка з мамкай нам памагаць, нас навучаць? Мая мамка, папрасі сваіх браціткаў, сваю сястрыцу, каб нам, круглым сіроткам, яны што памагалі. А мая мамка, хоць бы ты хворанькая, хоць бы ты якая каб ты ў нас была, хоць бы ты не рабіла, хоць бы ты нас на работку выпраўляла, сваімі слоўцамі пацяшала, сваімі слёзкамі абмывала, сваімі гарачымі саграваля. Ва ўсіх дзяўчатак і папкі і мамкі, а мы ж засталіся адны, як калочкі, як пянёчкі. Нет у нас ні таткі, ні мамкі. А мы ж яшчэ малыя, як жа мы будзем жыць? Чаму наша доля такая няшчаслівая?

331. Па бацьку

А мой ты татачка, ты ж гадаваў мяне з торбачкі. А ты ж нада мной ночкі не спаў, ты ж мяне маленькую калыхаў. А можа ж ты маліўся, а можа ж ты прасіўся, а я ж цябе не дагледзела, я ж табе нічога не памагла, я ж табе піцькі не падала. Ты ж мяне, маладзенькую, выгадаваў, я ж цябе, старэнькага, не дагледзела. Я ж не знаю сваёй мамачкі, я ж не знаю яе жаласці. Ты не раз прасіў чужых мамачак, чужых бабачак, чужых суседачак, каб мяне глядзелі. А ты ж мяне жалеў, каб я не была голая, каб не была босая, каб не была галодная. Як табе цяжанька было мяне, маленькую, гадаваць. А мы ж ужо цешыліся, мы ж ужо сваю хатку паставілі. Яна ж была нам вясёлая, цёплая, а цяпер некаму ў ёй жыць. Што ж я буду рабіць у ёй без цябе? Яна ж на полі ў нас стаіць. Я ж ніколі не думала, што будзе такая бедачка, што не будзе майго татачкі. Прасці мяне, татка, што не дагледзела. Мае дзяўчаткі, як вам добра: у вас ёсць татачкі, а я бедная няшчасная, бязродная, у мяне нікога нет. А мой татачка, мы ж стараліся, каб паставіць хатачку. Я ж служыла, людцам гадзіла, я ж думала, каб жыць. А цяпер у ёй некаму жыць. А мае цётачкі, дайце мне парадачку, як жа мне жыць без свайго татачкі? А дзякуй вам, цётачкі, а дзякуй вам, дзядзечкі, што памагаеце хаваць мне татачку, што ка мне прыхінуліся. Што б я адна рабіла?

332. Па бацьку

Пячэя цячэ, Іванка дровы сячэ, з мосту звaліўся, насмерць забіўся, дзеткі крычалі, татку ратавалі, мамка памагала, галасілі, галасілі, татку прасілі, калі ты к нам прыйдзеш, ці ў суботу, ці ў нядзелю, мы будам ждаці, будам пазіраць, да татку частаваць, каб ён нас навучаў, каб ён нас гадаваў. Татулечка наш, мы ночку не спалі, татулечку лісточкі пісалі ды іх адсылалі. Але татулечка не прыходзіць, хіба што пісьмо да яго не даходзіць, ці хіба што адрасочак не сыходзіць, а можа дарожка доўгая, камяніста, а можа дарожка гарыста? Дык мы, татка, калі дарога доўгая, то конікаў падашлём і самі прыбяжым. А калі дарожанька камяніста, то камні раскачаем, а калі дарожка гарыста, дык мы тыя горы раскапаем. Прыйдзі, прыйдзі да нас, татачка, устань, устань, ты наш татачка. Мабыць, у труне дошкі прыціснулі табе ножкі, што нельга табе ўстаць. Гора наша, на сэрцы цяжка. Таткі з магілы вярнуць ня можам. Галованькі нашы бедныя, асталіся мы сіраты вечныя. Татачка наш родны, татка наш мілы, куды ж ты ад нас адлятаеш, з кім ты нас пакідаеш? Ці ты адлятаеш у лес за пташку, дзе мы цябе глядзець будзем? Цвяточак наш родненькі, што ж ты ад нас адсыпаешся? Ці цябе ветрыкі адбілі, ці цябе дожджыкі адмылі? Але ж і загадаў ты нам загадачку. Мы збудавалі табе хатачку, хатачку новую, за адзін дзянёчак гатовую. Хатачка твая цёмная. І схадзіць к табе нельга будзе. А як прыйдзе цёпла лецейка, мы пойдзем у зялёны лясок. Там кукулькі кукаваць будуць, салавеечкі шчабятацьмуць, а мы слухацьмем. Можа гэта наш татачка з пташкамі песенькі пяе. Куды ж ты гэта прыбраўся, у якую дарожаньку і ў якую староначку проціў лецейка цёплага? Проціў урэмячка вясёлага? А татка наш, галубчык наш! А хто ж нам цяпер лапцейкі спляце? А хто ж нам аборачкі саўе? А хто ж нам дроў насячэ? А цяпер нам з табой, татка,

болей не ўбачыцца. А нашто ж ты проціў лецейка цёплага здзелаў нам пераломаньку? Усе пташачкі заспяваюць, усе мурашачкі павыпаўзаюць, а цябе нідзе не будзе, цябе ў пясочак жоўценькі закапаюць.

333. Па мужу

А мой ты Язэпка, а што ж ты мне нарабіў?! А з кім я буду поле абсяваць, з кім буду малых дзетак гадаваць? Мае палоскі, як мне вас убіраць, як вас засяваць? А памажыце мне, палоскі, дробных дзетак гадаваць. А мая Галячка, а мая дачушка, ты ж не будзеш знаць, што ў цябе татка быў. А ты ж яшчэ засталася маленькая, ты ж за ўсіх горшая бясчасніца. Мае дзетачкі, мае дробныя, што я з вамі рабіць буду? А ты ж мне ўсё казаў, што будзем старацца гадаваць, а яны ж усе нашы. А цяпер ты мяне аставіў з гэткімі маленькімі. А мой ты Язэпка, а папрасі ты сваіх суседцаў, каб яны мяне не астаўлялі, каб што памагалі, мае палоскі ўбіраць. Мае дзеткі будуць абіджаны, ва ўсіх будуць таткі. Што ж я зраблю з імі, маленькімі?! Мой Пётрачка, ты ж у мяне самы большы, ты ж у мяне самы гаратнейшы. Табе ж будзе горачка большае за ўсіх. А ты ж яшчэ маладзенькі, ты ж яшчэ нядужанькі, цябе ж плужок будзе валяць. Мой ты Язэпка, я ж цябе прасіла: ты ж вучы сынка, каб ён рабіць умеў. А ты ж мне казаў, што яшчэ рана, што яны маленькія. А цяпер уся цяжбачка ўзвалілася на яго плечкі. А мае дзетачкі, а мае маленькія, вы ж паследні дзянёк відзіце свайго татку. Вы ж, маленькія, будзеце яго дажыдаць, у ваконцы паглядаць, што татка прыходзіць. Вы ж маленькія, вы ж не знаеце, што татка пойдзець ад нас назаўсёды. Мае дзетачкі, мае дробныя, што ж я буду рабіць з вамі? Вы будзеце дробныя слёзкі ліць, будзеце горкія слёзкі глытаць, а я буду з вамі гараваць.

334. Па мужу

Мой ты Сяргейка, я плачу не па Грыгору, а па свайму гору. Мой ты Сяргейка, ты ж знаў, што мне пажаліцца некаму, пахваліцца нечым. Не раз я начавала ў чужой хатцы і пад вуглом. Калі дзетак паспею захваціць, а калі і не. А ты ж як краў мяне, казаў, што будзем, Манечка, добра жыць, я ўжо не буду піць. А цяпер усё тое самае. Я ж не слухала ні таты, ні мамы, я ж за цябе ішла, я ж цябе любіла, я ж думала, што будзем жыць. А ты ж гэту гару не кінуў піць. А п'яны ты мне з дзеткамі трудзіў. Ты ж не раз іх бедных напужаў, ты ж не раз іх паразганяў. У нашай жа хатцы ніколі не было парадку. Ты ж не глядзеў, што нашы дзеткі абарваныя, а ты ж не папытаўся, ці накормлены. У цябе ў галаве была толькі чарка, табе ж не думалася гаспадарка. Мой ты Сяргейка, ты ж сваёй смерцю і не памёр. Каб ты мяне з дзеткамі не паразганяў, можа б я цябе да такога няшчасця не дапусціла. Мы ж спалі ў хлеве з кароўкамі, а ты ж навек заснуў у хатцы. Каб я лепі ў таткі сядзела, сівую касу насіла, чым з табой было жыць, горкія слёзкі ліць. А цяпер мае вочкі не будуць цябе відзіць, можа трошкі асохнуць. Я ж табе прабачаю, усё сваё горачка забылася: як ты

нас муштраваў, як ты нас разганяў. Мой ты Сяргейка, а я ж усё думала, што ты не будзеш піць, што ты не будзеш разбівацца. Усё ж некалі нап'ешся, наб'ешся, а як цвярозы, дык і паможыш. А цяпер я засталася з гэтай дробяззю. Яны ж яшчэ маленькія, яшчэ ж нядужанькія, ім жа трэба памагаць.

335. Па дачцэ

А мая Танечка, а як жа вам весела, а як жа вам добранька. А вы ж жывенькія, а маёй Манечкі ўжо няма. А куды ж вы яе прыбіраеце, куды ж заплятаеце? Мая дачушка, а ты ж не хвалішся, куды ж ты пойдзеш, куды ж ты ад'язджаеш? А твае дзяўчаткі болі да цябе не прыйдуць. Яны ж цябе паследні разок прыбіраюць. Мая Манечка, проці вясенкі, проці цёплінькай, проці вясёлінькай. Птушкі папрыляталі, зязюлькі кукуюць. Усе варочаюцца, усе весяляцца. А ты ж, мая дачушка, ад мяне ўцякаеш. Болі я цябе не ўвіджу, тваіх песенак не пачую. Ах, мая птушачка, я ж буду прыслухáцца, як будуць дзяўчаткі пяяць. Мне ж будзе здавацца, што я галасок сваёй Манечкі пачую. Ах, мая птушачка, ах, маё соўнейка яснае, ты ж мяне засмуціла, ты ж мяне зацямніла. Дачушка мая мілая, дачушка мая родная, з якой староначкі мне цябе дажыдаць, з якой дарожачкі мне цябе пераймаць? Ах, мая Манечка, ах, маё дзетачка, хоць разок адзыўніся. Сабраліся і твае сястрыцы, сабраліся і таварышкі, а ты на ўсіх загневалася, ні да каго не адзываешся. А ты ж засмуціла ўсю нашу радзінку. Ты ж зацямніла нашу сямейку. Мая дачушка, нашто ты мяне астаўляеш старэнькую, мяне, нядужую?! Я ж буду рада ісці з табой, каб нас закапалі ў адну ямачку, у адну магілачку.

336. Па сыну

Сынок мой міленькі, Іванька мой даражэнькі, мая дарагая ягадка, мая садовая малінка, мая мілая былінка, а што ж ты мне нарабіў, навек засмуціў. Для мяне і сонейка закрылася, і птушачкі болі не запяюць, і галасок твой не зазвініць. Сынок мой, Іванька мой, як мне да цябе загаварыць, як мне цябе папрасіць, каб ты да мяне прыходзіў, свае бедачкі прынасіў?

337. Па сыну

А мой татулечка, а мой родненькі, а чаму ж ты мяне адну сустракаеш? А чаму нічога не пытаеш: а дзе сыночак мой, маё сонейка? А мой сыночак, мой галубочак пайшоў ад нас далёка — не прыйдзе больш зусім.

338. Па сястры

А мая сястрыца, чаго ты мяне не страчаеш, чаму ж не пытаеш, як я жыву, што я раблю? А я асталася адна. А да каго я прыйду? Каму прынясу чорну бяду? А каму я сваё гора раскажу? А ўжо мне сюды не ісці, а да мяне німа нікому выйсці, ніхто мяне не стрэне, нічым ні пачастуе і дадому не справядуе.

339. Па брату

Чаму мы такія няшчасныя?! Чаму мы ўсе выгадаваліся добра, а цяпер у нас усе паміраюць? Мой ты Сашачка, мой ты браток, усю вайну прайшоў. А наш Сашачка, ты нас усё цешыў. А мы ж думалі, што болі не ўвідзімся, што будуць твае костачкі бадзяцца. Ты нам усё пісямцы слаў, а сваю смерць прынёс у сваю хатку, памёр на сваёй пасцельцы. А мае горачка, добра, што хоць смерць прынясла ў сваю хатку, на сваю пасцельку. Мой татачка, мой родненькі, пераймай свайго сыночка. Вас там чацвёра, а нас тут трое засталося.

340. Па брату

А мой брацейка, брацейка-саколіку, чаго ж ты наш домік пакінуў, карміцелька наш, прамяняў на сырую зямельку, на каго ж ты нас пакінуў?.. А ты ж добры быў, і ты ж усім памагаў, а ты ж усіх шкадаваў, нас, малых, даглядаў, за бацьку-маці нам быў. Адкрый жа вочкі, адкрый жа блакітненькія, паглядзі, як усе па табе плачуць, як цябе, сокала яснага, шкадуюць. А хай жа табе там добра будзе і прыходзь да нас, хай табе зямля як маці будзе, хай яна табе пухам будзе.

341. Саміх паміраючых

Мама мілая, наша рутачка ў садочку завяла, зялёная рутачка пажаўцела. Мамка мілая, я знаю, што я ўжо памру. Галоўка не дзержыцца, ручкі трасуцца. Мамка мілая, памажы Галіяшу гадаваць дзетак. Цешце мяне, не цешце, я знаю, што я ўжо памру, што я ўжо не аджыву. Галіяшка міленькі, глядзі дзетак.

342. Саміх паміраючых

А мая ты Танечка, а мая міленькая, а ты ж пастаянна прыходзіла, ты ж мяне адведвала, а як у гэту няшчасную мінутачку, дык і ты да мяне не прыйшла. А ён жа мяне і рэзаць сабіраўся, і ручкі мне пазбіваў, і зубы выдзіраў, аж пакуль не прыехала міліцыя, ноччы яго ж забрала. Дзякуй жа ім, што яны паслухалі, што яны прыехалі, хоць я спакойнінька паляжу. Мне ж такі боль у грудочкі, а яшчэ і спакойнінька паляжаць няможна. Мамку з хаты выгнаў, а сам усе дзверы парасчыняў, каб я мерзла. Бабкі міленькія, дзякуй вам, што адведалі, што вы мяне не баяліся, маёй хваробы. Танечка міленькая, прынясі гарчычнічкі, абагрэй маё цельца.

ЗАМОВЫ

Да найбольш старажытных жанраў вуснай народнай творчасці адносяцца замовы (загаворы, нагаворы, шэпты, прысушкі, адсушкі і інш.) — славесныя формулы, якім надавалася магічнае значэнне. Замова асноўваецца на перакананні забабоннага чалавека у тым, што магічныя дзеянні і адпаведныя словы, здольныя ператварыць жаданне ў рэальнасць. У гэтым жанры народнай паэзіі пра-

явіліся адны з самых ранніх асаблівасцей рэлігійнага светапогляду — магія і вера ў сілу слова.

Хоць да замоў у сённяшні дзень па зразумелых прычынах звяртаюцца радзей, чым у папярэднія часы, аднак і цяпер іх выкарыстоўваюць у асноўным для лячэння разнастайных хвароб і захворванняў (рожы, скулы, спалоху, крывацёку, уроку і інш.) або і ў іншых мэтах. Больш таго, і сёння часам здараюцца выпадкі, калі ўрачы не ў стане вылечыць хворага, і толькі зварот апошняга (ці яго родзічаў, сваякоў) да шаптуна ратуе яму жыццё. Гэта, верагодна, звязана з тым, што знахар уздзейнічае на пацыента як з дапамогай магічных слоў, дзеянняў, так і выкарыстоўвае цэлы арсенал сродкаў народнай медыцыны, што нярэдка станоўчым чынам адбіваецца на канчатковым выніку лячэння.

Замова адрозніваецца ад іншых жанраў сваёй кампазіцыяй. Шэраг заклінанняў захавалі сваю старажытную структуру і складаюцца з зачыну, асновы і замацавання.

У зачыне, як правіла, указваецца, куды ідзе загаворваючы і загаворваемы: «Лягу я, памалюся я, устану я, вытруся я, пайду я з дзвярэй у дзверы, з варот у вароты, выйду я ў чыста поле, у зялёны луг, стану на сыру зямлю, пагляджу на ўсходнюю старану». У архіве навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору Дзяржуніверсітэта маецца ўсяго толькі некалькі замоўных формул з падобным зачынам.

Больш паловы замоў складаюцца з асноўнай, эпічнай часткі (без уводзінаў-малітвы, замацавання і зааміньвання). У ёй змяшчаецца зварот-патрабаванне, або дыялог ці дзеянне, з наступным пералічэннем і адсыланнем хваробы.

Заканчваецца закліканне на Міншчыне нярэдка замацаваннем (напр.: «Будзьце, мае словы, уперад мяне крэпкі, лепкі, заборчывы, загаворчывы і недагаворчывы ва векі вякоў. Замок. Камень») і вельмі рэдка словам «амінь». Часта функцыю замацавання ў замовах Мінскай вобласці выконваюць словы: «Я — словам, Гасподзь Бог — з помаччу» ці падобныя ім.

У замовах Міншчыны выкарыстоўваюцца разнастайныя мастацкія сродкі: эпітэты, гіпербала, паўторы і г. д. Напрыклад, у запісанай на Барысаўшчыне замове для назвы розных відаў рожы ўжыта 9 эпітэтаў-прыдаткаў: *маліна, чарніца, урочная, спарочная, снявольная, спагаворная, цеплавая, вадзяная, ветраная.*

Шырока выкарыстоўваюцца ў замоўных формулах параўнанні. Асноўваюцца ж яны на адным з галоўных прынцыпаў магіі: падобным можна выклікаць падобнае. Напрыклад: «Як [імя] з таго свету не ўстаці, так нуду-перапалоху ў [імя] не бываці».

Асаблівае месца ў замовах Мінскай вобласці адводзіцца паўторам, прычым паўтараюцца не толькі асобныя дзеясловы, але і прыназоўнікі *(з, із, ад)*, злучнікі *(і)*.

Замовы вылучаюцца сваёй багатай, распрацаванай народнай мовай. Разам з тым у іх часам сустракаюцца царкоўнаславянізмы, русізмы, паланізмы. Апошнія трапляюцца часцей на захадзе Міншчыны.

Большасць замоў паходзіць з Бярэзінскага, Мядзельскага, Чэрвеньскага раёнаў. Натуральна, што пераважная іх частка — ад розных хвароб, аднак часам сустракаюцца любоўныя (прысушкі, адсушкі), на лепшы, здаровы сон. У прапануемым зборы ёсць некалькі шэптаў ад хвароб жывёлы. Сярод замоў ад хвароб адно з першых месц займаюць заклінанні ад звіху (вывіху), ад залатніка, на сцаленне малака ў каровы, рожы і скулы, уроку. Менш запісана замоўных формул ад зубнога болю, крывацёку, увярэду, змяінага ўкусу і інш.

343. Ад пчалінага ўкусу

Сыра зямля-матушка, Ізасіма-Саўвацця пчолья маці. Пчолачкі-матушкі, вы мяне не жальце, у бела цела не ўпівайцесь, кроў руду на зямлю не пускайце. Крэпка-накрэпка, ныне і прысно ва векі вякоў. Амінь.

344. На сцаленне малака ў каровы

Ёсць на свеце белае мора, на моры сібірская вада, на сібірскай вадзе шаўковая трава, на шаўковай траве ляжыць белы камень, на камні стаіць касцёл, а ў касцёле стаіць прыстол, за прыстолам сядзіць Бог, урокі замаўляе, кароўцы рабой малако сабірае. Ляцеў сызон па чыстаму полю, па беламу мору, кароўцы малачко збіраючы. Бог — з духам, а я — з помаччу.

345. На сцаленне малака ў каровы

Прашу Госпада Бога і Духа Святога, і ўсіх святых апосталаў, і Прачыстай Мамкі, і ўсіх святочкаў, і будзенных дзянёчкаў, і пятнічку-мамачку. Госпадзі Ьожа, благаславі, прачыстая, памажы! Прачыстая па цэрквях лятала, абразы смывала. Раінай (любое імя) рабой карове вымя падмывала, каб малачко прыбывала: з жыл, з суставаў і гаручай крові. На моры вярба стаіць, за гэтым прэстолам красна дзеўка сядзіць, кніжку дзяржыць, урокі вычытае, вымаўляе, [імя] карове вымя падмывае, каб малако прыбывала: з жыл, з суставаў, з гаручай крові.

346. На сцаленне малака ў каровы

На воснянскіх гарах стаіць Цэрква, на гэтай Цэркве — крэст, на крэсце стаіць святы Міхаіл Архангел з залатымі трубамі. Як затрубіць святы Міхаіл Архангел у свае залатыя трубы, так займець чараўнікам, чараўніцам, ведзьмарам, урочнікам, прыгаворшчыкам усе зубы і губы. Як ведзьме цераз мора не пераплысці і з грыў травы не сарваць, і з цэрквы залатога крэста не сняць, так у гэтай каровы [масць] ведзьме малака не ўзяць ні вечарам пад ясным месяцам, ні ўдзень пад ясным сонцам ці пад цёмнымі начамі, ці пад яснымі зорамі, ці пад ясным сонцам. Святы отча Мікіта, мудрасці ўмудрыся, Хрыстом абгарадзіся, адгані ад гэтай каровы [масць] усе д'ябалскія помачы, усе нячыстыя духі, усю нячыстую сілу, усіх ворагаў, усіх чараўнікоў, ведзьмуроў і ведзьмуравак, спасі, Госпадзі, маю кароўку на рацэ, на ключавой вадзе і на мяккай траве.

347. Ад лесуна

Хаджу па лясах, па кустах, па імхах, па балотах, па гніліцах, па чарніцах, па малінах; куды ні хаджу, ніколі не блуджу: сонца — па сонцу, месяц — па месяцу, пры частых зорках, пры вячэрніх зорках хаджу — не блуджу, а табе, лясны хазяін, пакорнасць аддала, ад мяне, рабы, атшатніся, у бярозу абярніся. Амінь.

348. Ад змяінага ўкусу і вужа

Прашу Госпада Бога і Святога Духа, і ўсіх святых апосталаў, і Прачыстай Мамкі, і ўсіх святочкаў, і так будзённых дзянёчкаў, і пятнічку-мамачку. Ездзіў Бог па полю і сабіраў зелле ад дзевяці гадзюк: ад баравой, ад палявой, ад вадзяной, ад межавой, ад каменнай, ад чорнай, ад семянной, ад канаплянай, ад макавай. Каб яе расторгала, расморгала на макава зелле! Шло тры панны ад сонца да сонца, ад месяца да месяца. Адна ў злоце, другая ў срэбры, а трэцяя абцугі несла. Словамі замаўляць, абцугамі вынімаць.

349. Ад зубнога болю

Ой вы зубы, зубы! Чаму ж вы белы, ды руды? Хіба вы што кепска жавалі, што хваробы дасталі. Перастаньце ж вы хварэці, будзеце як велькі пан у гарэце. А калі не перастанеце балеці, то мы будзема вас жалезамі цягнуці. Ідзі ж ты, хвароба, у шырокае поле, у сухія лясы, ды ў мокрае балота. А хваробы нам жаднай не трэба, бо яна прыйшла ад чорта, але не з неба.

350. Ад рожы

К [імя] прыступаю, Госпада Бога прызываю. Прашу Госпада Бога, Духа Святога, святых святочкаў, гадавых празнічкаў. Рожа-ражыца, красна дзевіца, ад чаго падпала? Ці з падуму, ці з падзіву, ці з прыгавору? Па целе не хадзі, касцей не ламі, сэрца не тамі. Ідзі ў чыста поле, на быструю рэчку, на крутыя берагі, на гібкую кладку. Там табе ўмываццa, там табе красавацца, чырвонай хустачкай уціpацца. Ішоў Бог полем, нашоў тры рожы: адна — бяла, друга — вяла, трэця — сухая. Каб у [імя] рожа прапала. Я — словам, Гасподзь Бог — з помаччу, Госпадзі, прыступіся, [імя] на помач станавіся.

351. Ад рожы

Прачыстая Маці, на помач устаці. Рожа-маліна, рожа-чарніца, рожа ўрочная, рожа спарочная, спавольная, спагаворная, цеплавая, вадзяная, ветраная. Цеплавая на цяпло, вадзяная на ваду, ветраная на вецер— Прачыстая Маці, на помач устаці, Бог на помач.

352. Ад рожы

Рожа-ражавіца, красная дзявіца. Высылаю цябе, вымаўляю цябе з жыл, касцей, румянага цела на балоты, на мхі, на ніцыя лозы, дзе людзі не ходзяць, сабакі не брэшуць, певень не пяе, гусак не крычыць. Там цябе, рожа, дажыдаюць, столікі накрываюць, чарачкі наліваюць. Там табе, рожа, красавацца, век на [імя] не атрыгацца.

353. Ад скулы

Скула балючая, скула пякучая, скула калючая, скула і ўрочная,

загаварваю з буйнай галавы [імя], з жыл, з касцей, на ніц і ложа ссылаю. Там вам жыць-пажываць, а [імя] галавы не чапаць. А Бог — помаччу, а — я словам. А, Прачыстая Маці, прашу помачы даці. Хух, Святы Дух!

354. Ад звіху (вывіху)

Йшоў святы Юры на кані па межах, па барознах. Конік спатыкнуўся, дай, Божа, каб [імя] звіх і ўшыб амінуўся. Я ж цябе, звіх і ўшыб, высылаю на сухія лясы, на буйныя вятры. Там табе, звіх і ўшыб, красавацца і век на [імя] не атрыгацца.

355. Ад звіху

Ехаў Ісус Хрыстос праз залаты мост, мост скалыхнуўся, конь спатыкнуйся, — звіх звіхнуўся. Стань косць у косць, кроў у кроў, вада ў ваду, зямля ў зямлю. На дапамогу Госпад Бог і Дух Святы і дух мой. Ху-ху-ху.

356. Ад касталому

К [імя] прыступаю, Госпада Бога прызываю. Прашу Госпада Бога, Духа Святога, святых святочкаў, гадавых празнічкаў. Ішоў касталом чыстым полем, чыстай дарожкай. А ў чыстым полі там стаяць касталомы: вымаўляць, выбаўляць, касталомы. Ідзі, касталом, у чыста поле, ламі там асіну, ялінку, хваінку, дубок. Не ламі [імя] касцей. Я — словам, Гасподзь Бог — з помаччу, Госпадзі, прыступіся, [імя] на помач станавіся.

357. Пры родах

Госпадзі Божанька, Матачка Насвенчая, прасвятая Багародзіца, прыхініцеся, прыступіцеся. Сінія жылачкі, расцапіцеся, жоўтыя костачкі, расхініцеся, душачкі, разлучыцеся. Калі галубок — няхай выплывае, калі галубка — няхай скоранька вылятае.

358. Ад залатніка

Залатнічок-увярод, ты ж не ідзі напярод, разайдзіся, расхініся, макавым зернем пакаціся, на сваім месцечку астанавіся. Дзе цябе мамка радзіла, бабка бабіла, кумка куміла, на тваім месцы астанавіла, на залатым месцечку пасадзіла.

359. Ад залатніка

К [імя] прыступаю, Госпада Бога прызываю. Прашу Госпада Бога, Духа Святога, святых святочкаў, гадавых празнічкаў. Залатнічок-старычок, каля пупа віся, крэпенька дзяржыся. Ідзі ў чыста поле на касцяную гару. Там стаіць прэстол, на прэстоле крэсла, там тваё места. Там цябе маці радзіла, на залатым месцы пасадзіла. Там табе красавацца, там

табе развівацца, залатой палачкай апірацца. Я — словам, Гасподзь Бог — помаччу. Госпадзі прыступіся, [імя] на помач станавіся.

360. Ад спалоху

Прашу Госпада Бога і Духа Святога, Насвенчаю Матачку. Там у канцы сяла стаяла вярба, ня ўмела ні мыць, ні шыць, толькі перапалохі і ўрокі лячыць, урокі: жаночы, мужчынскі, хлапецкі, дзявоцкі, цыганскі, татарскі і жыдоўскі. Я— з духам, Бог — з помаччу.

361. Ад спалоху

Ехаў Бог па поліку на сівым коніку. А ў тым полі стаіць хатка на курынай лапцы. А ў тэй хатцы тры ўдавы: ні шыюць, ні мыюць, толькі перапалох размаўляюць і адмаўляюць: хлапецкі, удавецкі, дзіцячы, кашачы, мышачы із-пад нагцей, із-пад серца, із-пад жылак, адмаўляюць і прыгаворваюць. Хай ідзе на цёмны лес, на горкі асіннік і на жоўтыя пяскі.

362. Ад спалоху

К [імя] прыступаю, Госпада Бога прызываю. Прашу Госпада Бога, Духа Святога, святых святочкаў, гадавых празнічкаў. У пятнічку ранічкай ішоў Ісус Хрыстос на мукі. У яго пыталіся: «Ці баішся ты, ці пужаешся, ці цябе калоце ці цябе трасе?»— «Не, я не баюся, я ні пугаюся, мяне ні калоце, мяне ні трасе. Хто мае мукі помніць, той не будзе баяцца, таго не будзе ні калаціць, ні трэсці». Ішоў Бог чэраз мост, пытаўся ў Тамаша: «Хто ў вас хворы?» [імя] «скажы, каб яна была здарова». Я — словам, Гасподзь Бог — з помаччу. Госпадзі, прыступіся, [імя] на помач станавіся.

363. Ад жабы

Сядзела жаба на ліпавым кусце, віла вянок. Вянок спадзе, жаба прападзе. Жаба-жабішча, тут табе не быць, сэрца не нудзіць [імя], не сушыць. Сядзець табе, жаба, пад кустам са сваімі жабкамі: палявыя — на полі, межавыя — на мяжы, а лесавыя — у лясу, а ў [імя] жаба з языка злезь. Бог — з помаччу, а я — з сваім духам.

364. Ад каўтуна

Каўтун-каўтунец, прышоў табе канец: пасяку, пачапаю і на плот пачапляю, а заўтра на ваду папускаю. Каб цябе ў [імя] у галаве не быць, галовачку не тлуміць і па целу не хадзіць. Дай Гасподзь, здароўе [імя], каб ён не бываў, не атрыгаўся, каб ад [імя] цела адказаўся.

365. Ад лішая

Іду я ў гумно і бяру палову і свінням мяшаю. А ты, лішай, рабу Божаму не мяшай і выхадзі з яго: із касцей, із мажджэй, із ясных ва-

чэй, із гарачай крыві, із чыстага цела і карэння не пускай. Уздымала цябе маці Божая духам сваім і ссылала цябе на імхі і балоты, і на дзікія лозы — там яны гуляюць і сталы засцілаюць, і ўсіх лішаёў дажыдаюць: і красных, і белых, і лупленых, і каленых, і падзіўных, і прастудных, і пасмешных, і ветраных, і вадзяных, і знаючых, і нязнаючых. І чур цябе, хрышчонага, нараджонага!

366. Ад уроку

Запрашаю Госпада Бога і Духа Святога, усіх святочкаў, гадавых празнічкаў. Прачыстая Маць, да помачы стаць. У чыстым полі, на сінім моры стаіць дуб, а на дубе тым 12 сукоў, а ў тых суках 12 гнёздаў, на тых гнёздах па 12 галубоў, а ў тых галубоў — 12 языкоў. Выгаворваю ўрок прыгаворны, суморны, мужчынскі, жаночы, дзявочы, хлапечы, рабячы, панскі, цыганскі, удовін. Праз пень, праз калоду, скачы, урок, скачы ў ваду.

367. Ад уроку

Госпаду Богу памалюся, Хрысту пакланюся. Прыступіце, памажыце, святая Пакрова, святы Спасіцель, Хрыстова, прыступіце, памажыце [імя] урок зняць. Урокі спешныя, смешныя, падуманыя, радзімыя, судзімыя, страшныя, злыя. Тут вам не калоць, не пароць сэрца, не таміць сэрца, не валнаваць і з жыл кроў не сасаць, у гарачку не кідаць, балючаю кроў разагнаць: із жыл, з касці, з разумнага цела. Тут Божая Маці стаяла, дапамогі давала. Я — з Духам Святым, Гасподзь — з дапамогай.

368. Ад начніц (крыксы, плаксы)

Першым разам, добрым часам. Госпаду Богу памалюся, Матцы Прачыстай пакланюся. Матка Божая, святая, стань жа ка мне на помач, рабу Божаму, маладзенцу, крыксы гаварыці. Зоры-зарніцы, красныя дзявіцы, вазьміце вы крыксы-начніцы, і бацькавы, і маткіны, і дзявоцкія, і парабацкія, і жаласныя, і карысныя, і ўцешныя, і дзяныя, і светавыя, і заравыя. І вам, зорачкі, на стаянне, а рабу Божаму, младзенцу, на здароўе, вам, зорачкі, пасвяціце, а рабу Божаму, младзенцу, паспаці.

369. На лепшы сон

Лажуся спаць, даю Богу знаць. Анелкі мае, станьце пры мне, што вам, то і мне. Карысна, радасна, здарова, вясёла назаўтра ўстаць.

370. Прысушка

Лягу я, памалюся я, устану я, памыюся я, вытруся я, пайду я з дзвярэй у дзверы, з варот у вароты, выйду я ў чыста поле, у зялёны луг, стану на сыру зямлю, пагляджу на ўсходнюю старану. Як красна сонейка ззяе, так і ты прыбягай ка мне, прысыхай ка мне. Вочы ў вочы, сэрца ў сэрца, мыслі ў мыслі. Спіш — не засынай, гуляй — не загуляйся, а ўсё ка мне прыбягай.

ПРЫКАЗКІ, ПРЫМАЎКІ, ВЫСЛОЎІ

Парэміяграфічная спадчына Міншчыны — жывая, цікавая, прадуктыўная з'ява нашых дзён, якая можа стаць у сучасных умовах надзейным сродкам выхавання лепшых агульначалавечых якасцяў, развіцця нацыянальнай самасвядомасці, узбагачэння літаратурнай мовы, пазбаўлення яе, сродкаў масавай інфармацыі і мовы паўсядзённага ўжытку газетных, палітызаваных, вульгарна-сацыялагічных штампаў, канцылярызмаў, жаргонаў і аргатызмаў.

Папярэднія публікацыі прыказак, прымавак, выслоўяў на тэрыторыі цэнтральнай Беларусі налічваюць сотні тысяч запісаў, дзесяткі тысяч публікацый. Велізарная колькасць іх як вынік больш чым трыццацігадовай збіральніцкай працы студэнтаў і выкладчыкаў захоўваецца ў архіве навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору і дыялекталогіі Белдзяржуніверсітэта. У гэтым раздзеле сістэматызаваны лепшыя з запісаў гэтага архіва.

З прыказкамі, прымаўкамі і выслоўямі па шырыні ахопу рэчаіснасці не можа параўнацца ніводзін жанр народнай творчасці, таму існуе многа спосабаў класіфікацыі. Сучасныя запісы Міншчыны раскласіфікаваны тут у 8 раздзелах, што ахопліваюць тыя вобласці акаляючай рэчаіснасці, чалавечай дзейнасці, паўсядзённага побыту, духоўнага жыцця і поглядаў народа, якая гучыць у сучаснай вобразна-афарыстычнай мове. Здаецца заканамерным, што ў сучасных запісах большае развіццё атрымалі прыказкі і прымаўкі,, якія адлюстроўваюць праявы духоўнага жыцця народа, яго мараль, этыку, сучасныя ўзаемаадносіны паміж людзьмі. Таму невыпадкова, што самым прадстаўнічым аказаўся раздзел «Чалавек і яго якасці, мараль».

Прыказкі і прымаўкі — адзін з найбольш абагульненых жанраў фальклору, які адлюстроўвае агульначалавечыя каштоўнасці. Таму рэгіянальныя адметнасці, лексічныя і фанетычныя, іншыя дыялектныя асаблівасці ў парэміяграфіі не з'яўляюцца паказальнымі. Самабытнасць праяўляецца тут у той бясконцай разнастайнасці асацыятыўных значэнняў, якія з'яўляюцца вынікам мнагазначнасці прыказак.

Такім чынам, цэнтральны рэгіён Беларусі ў парэміяграфіі адрозніваецца тым, што ён увабраў у сябе найбольш характэрныя рысы ўсіх іншых этнаграфічных раёнаў і з'яўляецца ў нейкім сэнсе ўзорным у тэматычных, жанравых, мастацкіх і моўных адносінах.

371. Прыказкі, прымаўкі, выслоўі

ПРЫРОДА, ГАСПАДАРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ, ПРАЦА

Дзе дубы, там грыбы.
На ваўка стрэльбу рыхтуй, а не пугу.
Плюнь на лес, каб язык аблез.
З голага куста і ягада пуста.
Варона напрамую лятаіць, ніколі дома не бываіць.
Без пары няма травы.
Калі рана прылятаюць буслы — да цёплай вясны.
Ластаўкі нізка лятаюць, кабеты дажджу чакаюць.
Калі раса — да абеду, на другі дзень дождж будзе.
Калі павуціна доўгая ўсюды, пагода будзе.
Калі шышкі пад верх — то зіма вялікая будзе пад вясну.

Калі шышкі ўніз — то зіма вялікая будзе спачатку, з восені.
Вецер бушуе — нарве дажджу.
Якая птушка — такое і гняздзечка.
Што ў лесе родзіцца — у хаце спадобіцца.
Колькі, вутка, не мудрыся, а лебедзем не быць.
Шэра сава не радзіла сакала, а гэткага ж чорта, як сама.
Гара багата каменнямі, дрэва — карэннямі.
Вялікаму каню вялікі і хамут.

Прайшла Прачыстая — стала поле чыстае.
На Пятра хлеба толькі прыпякла, а на Льлю поўну печ напальлю.
На грамніцы пявун нап'ецца, на Юр'я вол напасецца.
Прыдзе люты, папытае, ці ты абуты?
Ад Пятра да Іллі тры дні.
Прыйшла Прачыстая — і стала чыстая.
Бусько прылятае адзін да Благавешчання, пасля Благавешчання — з бабаю.
Зімовы дзянёк, што камароў насок.
Калі перад калядамі на небе многа зорак — будзе многа грыбоў.
Снегу навее — хлеба прыбудзе.
Сухі марац, мокры май — будзе жыта, нібы гай.
Прайшоў Ілля, накідаў у рэчку гнілля.
Жураўлі лятуць высока — зіма яшчэ далёка.
Восень на рабым кані ездзіць.
Хвалі садок восенню, а не вясною.
Дзяры лыка ўлетку, пляці лапці ўвосень, а насі ўзімку.
Калядкі — добрыя сваткі: пад'еў куцці — і на палаткі.
На Пятра хлеба толькі прыпякла, а на Льлю поўну печ напалю.
Прышоў Успас — пашло лета ад нас.
Прышлі Грамніцы — скідай рукавіцы.
Прышлі Варвары — ног уворвалі.
Жураўлі ляцяць нізка — зіма ўжо блізка.
Жураўлі ляцяць высока — да зімы яшчэ далёка.
На Пакрову стаў у хлеў карову.
Сёння Купалле, заўтра — Ян, набярэм, дзеванькі, ягад поўны збан.

Прыйдзе каза да ваза, папросіць сена.
Карова з поля — пастуху воля.
Лепш ралля ранняя, чым позняя: на ранняй — пшаніца, на позняй — мятліца.
Што летам ножкай коп, то зімой ручкай хоп.
Калі добра ўзарэш, то і ўраджай збярэш.
Не той хлеб, што ў полі, а той, што ў свірне.
Зімою згодзіцца, што летам родзіцца.
Косі, коса, пока роса, роса долой — коса домой.
Дзе гультай ходзіць, там зямля не родзіць.
Не сей пшаніцы, калі людзі ідуць у суніцы.
Страчанага вясною дня не купіш.
Днём раней пасееш — тыднем раней збярэш.
Не карміўшы буракамі, не пасылай за быкамі.

Хто рана сее, той насенне не губляе.
Кінь авёс у гразь — будзеш князь.
Дзе арэ сошка, там хлеба нямножка.
Хто не сее, той не вее.
У порачку сей, зерня не жалей, жыта зжынай і зярняткі з каласкамі падбірай.

Як сам нагаруеш, дык своей працай смело жыць будзеш.
На Бога спадзявайся, але сам старайся.
Як пасцелішся, так і выспішся.
Па рабоце майстра відаць.
Калі хочаш смашна есці, трэба толькі раз у дзень прысесці.
Калі зерне ў каласку — не спі ў халадку.
Зімняя ночка — бацьку сарочка.
Зімняя ночка — дзеткам сарочка.
Не той харош, хто тварам прыгож, а той харош, хто на справе гож.
Ранняя птушачка зубкі калупаіць, а позняя птушачка вочкі праціраіць.
Казка дзелаецца быстра, а дзело ідзе доўга.
Пакуль вочы — патуль свет, пакуль рукі — патуль хлеб.
Не чакай з неба дараванага хлеба.
Хоць ручкі чорныя, да работа бела.
Якая заслуга, такая і пашана.
Не мялі языком, а калі штыком.
Хто які есць, таму такая і чэсць.
У Вільні, як і здзесь, як пасееш, так і з'еш.

МАТЭРЫЯЛЬНЫ БЫТ

Хто дбае, той і мае.
Нават і ў дурня ёсць сена да Юр'я.
Не гані каня пугаю, а гані аўсом.
Сабака гаспадару прыяцель, а кот — вораг.
Ні вады, ні яды, і сабака босы.
Хто хоча зажыцца, без вячэры спаць лажыцца.
Ніхто не ведае, як хто абедае.
Каб ні ежка і адзежка, то была б грошай дзежка.
Будзе час — будзе і квас, не ўсё за раз.
Не еўшы — лягчэй, а пад'еўшы — лепей.
Лепш хлеб ды вада, чым мёд, пірог і бяда.
Як мукі скрыня, то і свіння гаспадыня.

ГРАМАДСКАЕ ЖЫЦЦЁ

Не той свет, што ў вакне, за акном яшчэ большы.
Добрая птушка ў сваё гняздо не паскудзіць ніколі.
Чым за морам віно піць, лепш з Нёману вадзіцу.
Дораг той куток, дзе рэзалі пупок.
Што сядло, то нараўцо.
У сваім краі, як у раі.

Дзе нарадзіўся, там і прыгадзіўся.
У чужым краю, як на пагарэллі.
На чужой старонцы рад і сваёй варонцы.
Адна маці хлеб пячэ — дзяжа ўсяму свету.

За сваё жыта я стала біта.
Цар указам, а пан бізуном.
Багаты дзівіцца, чым бедны жывіцца, а бедны смяецца — дзе ў багатага дзяецца.
Пан пану вока не выпара.
Скачы ўража, як пан кажа.

Папа ўсе знаюць, поп нікога.
Поп сваё, а чорт сваё — аддай маё кадзіла.
Людзям засуха, папу — сноп.
Беражыцесь, куры, калі ліса становіцца свяшчэннікам.

Бяда шчэ, браце, не бяда, калі яна не гора.
Ад бяды не схаваешся.

Як мы к людзям падыходзім, так яны нас угашчаюць.
У харошай кампаніі розуму набярэшся, а ў плахой і той згубіш.
Свет дасць па нітцы — голаму сарочка будзе.
Ні да парасят свінне, калі яе смолюць.
Мужык не верыць, пакуль не памацае.
Цыган за плот валіць, а сваё хваліць.

СЯМ'Я І СЯМЕЙНЫ БЫТ

Не глядзі на дзяўчыну, на фэст ідучы, а глядзі на дзяўчыну, лён біручы.
Горка рэдзька, а ядуць; замужам блага, а ідуць.
Хоць за лапаць, толькі б не плакаць.
Жэняцца — смяюцца, разводзяцца — б'юцца.
Жэняцца — скачуць, разводзяцца — плачуць.

Свой са сваім біся, кусайся, а чужы не мяшайся.
Хто бацьку і маці зневажае, той дабра не знае.
Як ёсць матка, дык поліўка гладка.
Аднаму і ў кашы няспорна.
Адной рукой вузел не завяжаш.
Свая сярмяжка — не цяжка.
Бабе дарога — ад печы да парога.
Хлеб прымачы худзей, чым сабачы.

Ад благога семя не чакай добрага племя.
Які лён, такая і сарочка; якая маці, такая і дочка.
Які свердзел, така дзюрка; яка матка, така цурка.
Яка матка, тако ягнятка.
Які ты да старасці, так да цябе ў старасці.

У каго дачок сем, то есць долі ўсем, а ў каго адна — то тая долі жадна.
У адной маткі дзеткі рознай закваскі.
Маеш дачку — трымай гарэлачку ў глячку.

Як няма роду, ідзе хоць у воду.
Брат для сястры — госцік мілы, сястра брату — як воўк сівы.

ДУХОЎНАЕ ЖЫЦЦЁ

Хочаш знаць навіны свету — чытай газету.
Бачыць бажок, адкуль ражок.
Балота без чорта не бывае.
Навука хлеба не просіць, а хлеб дае.
Хочаш многа знаць, трэба мала спаць.

ЧАЛАВЕК І ЯГО ЯКАСЦІ. МАРАЛЬ

Глухі не пачуе, праўды не скажа.
Сваіх вачэй не дасі таму, хто радзіўся касы.
Хвароба чалавека ў дугу сагне.

Галава, як каробка, а дурны, як пробка.
Галава, як кацёл, а розуму няма.
Чалавек невучоны, што тапор нетачоны.
Красата прыглядзіцца, а ум прыгадзіцца.
Розум не кулеш — у галаву не ўвальеш.
Не злуй вельмі, а то вантробы перагараць.

Пуджаная варона хваста свайго баіцца.
Авечку стрыгуць, а баран дзівіцца.
Яму гаворы, а ён — брык дагоры.
Я яму пра козы, а ён мне пра лозы.

Маной свет пройдзеш, назад не вернешся.
Будзеш часта маніць — будзеш дрэнна жыць.
Лепш чыстая праўда, чым хлусня з грашыма.
У ціхім балоце чэрці растуць.
Не бойся звяглівага — бойся маўклівага.
Пры сустрэчы — лісою, а за вочы — воўкам.
Праўду гавары ў вочы, ды не ляпячы за вочы.

Бяздонную кадушку не напоўніш, а багатага не накорміш.
Пей песні, хоць трэсні, толькі есці не прасі.
Скупы свежае не есць.
Ад свайго — іжжога, ад чужога — нічога.
Хоць жыватом накачацца, абы дабру не валяцца.
Пакасіў бы, каб касу насіў.
Пайшла лында ў поле жаць, а серп забыла ўзяць.

Ні за то прапалі, што пілі-гулялі, а за то прапалі, што на печы ляжалі.

Песні пець — ногі крывыя, плясаць — голас не даець, вось пайшоў бы к цёшчы ў госці, ды не знаю, дзе жывець.

Бяло не бяло, абы толькі ў вадзе было.

Народу цьма, а работы няма.

У няўмелага рукі не баляць.

Калі ўлез у дугу, не кажы: «Не магу».

Пакуль іх свая вош не ўкусіць, дык яны нічога ведаць не будуць.

Як наварыла Люця, дык не паесць і цюця.

Із-пад серады пятніца відаць.

Поўнае бруха да навукі глуха.

Хоць салому еш, а хвост дудою нясі.

Хто сам сябе хваліць, той ходзіць, як апляваны.

Хто высока нясецца, той нізка сядзе.

Не поп — не ўбірайся ў рызы.

Малы жук, ды вялікі гук.

Язычо, язычо, куды цябе чорт тыча?

Нагаварыла, як свіння ў бярлогу нарухкала.

Языком гавары, што хочаш, а рукам волі не давай.

Хто з языком, той і з пірагом.

Маўчы язычок — будзеш кашку есці.

Адна кума скажа, а другая дзесяць разоў перакажа.

Сяўрук і Барбара — родная пара.

Хто сала краў, таму ў вочы дым ідзе.

Хочаш прапасці, дык ідзі красці.

Каб гэта быў не мой дурань, то я б рагатала разам з усімі.

Галава гуза шукае.

На чужы раток гузікі не нашыеш.

Не б'е мужык, а б'е язык.

Языком меле, як хвастом сцеле.

Не срам піць за сталом, а срам піць за сталбом.

АГУЛЬНЫЯ РАЗВАЖАННІ

Аднаму аж з горла прэ, а другі з голаду мрэ.

Аднаму шчасце ракою плыве, а другі ў няшчасці цэлы век жыве.

Беднаму рай на небе, а багатаму на зямлі.

Лепш раз згарэць, як два разы жаніцца.

Бог сірату любіць, але шчасця не дае.

Цяпер рай, хоць жыві ды не ўмірай.

Пражыла, як у ступе пратаўкла.

Ад смерці не ўцячэш, дак і не бойся.

Еш, пакуль рот свеж, як умрэш, то калом не ўб'еш.

Не бяры нічога і не бойся нікога.

Жыць дык жыць, але дажываць цяжка.

Як пажывеш, так і праслывеш.

РОЗНЫЯ ПАВУЧАННІ І НАЗІРАННІ

Якая кудзеля, такая прадзеля.
У людзей пытай, але і сваю галаву май.
Як пасцелішся, так і выспішся.
Салодкі будзеш — расклююць, а кіслы будзеш — расплююць.
Будзь не салодкі і не горкі, бо салодкага з'ядуць, а горкага выплюнуць.
Не капай ямы для другога, бо застанецца для самога.
Не цешся чужой бядзе, бо свая едзе.
Што стары кажа на глум, ты бяры, маладое, на ум.
Не кайся, позна лёгшы, а рана ажаніўшыся.
І на здаровым целе болька ёсць.
Лепш упасці брухам, чым духам.
Які ўдод, такі і даход.

З адной кветкі вянца не спляцеш.
Нешта будзе: або рыбка, або скрыпка.
І на гладкай дарозе можа быць няшчасце.
Адной рукой і вузла не завяжаш.
Усе чэрці адной шэрсці.
Гаршочак з гаршка смяецца — абодва чорныя.
Як топішся, дык і за брытву ўхопішся.
Дзе наша не прападала — хай і тут лясне.
Свіран згарэў, але ж колькі і мышэй ляснула.
Як пугай па вадзе правёў.

ЗАГАДКІ

Загадка — разнавіднасць мініфальклору з кароткім апісаннем у іншасказальнай форме прадметаў, з'яў, якія трэба апазнаць, адгадаць.

З вялікай колькасці загадак, зафіксаваных у Мінскай вобласці, мы адабралі найбольш характэрныя менавіта для яе фальклору, дзе яны ўжываюцца жыхарамі ў адпаведных жыццёвых сітуацыях.

Тэмы гэтых загадак самыя разнастайныя: побыт людзей, акаляючы іх раслінны і жывёльны свет, гаспадарка, хата і яе абсталяванне, сам чалавек.

Паэтыка загадак Міншчыны, як і загадак увогуле, заключаецца ў тым, што амаль кожная з іх адлюстроўвае метафарычны, вобразны падыход чалавека да тых рэчаіснасцей, якія зашыфраваны ў іх. Метафарычнасць узнікае на аснове скрытага ці яўнага параўнання аднаго прадмета, з'явы або іх уласцівасцей з другімі адпаведнымі ім рэаліямі. У якасці параўнанняў могуць выкарыстоўвацца канкрэтныя прадметы, паміж якімі ёсць колькаснае супадзенне (Расце ў лесе дзерава, на ём дванаццаць галінак, на каждуй галінцы па чатыры сучкі, на каждум сучку па сем ліcткоў.— Г о д, м е с я ц ы, т ы д н і, д н і) ці падабенства іх формы (Што за паненачка, што ў гармошку сукеначка?— С ы р а е ж к а), колеру (Як была я малада, дык была я белая, а як пастарэла, дык пачырванела.— К а л і н а), знешняга выгляду (Галава, як у шчукі, хвост, як у рыбы. Не ён дарагі, а яго шуба.— Б а б ё р). Прадметы могуць параўноўвацца па характару ўздзеяння на чалавека (Выйшла пані ў чырвоным кафтане. Сталі раздзяваці, сталі плакаці,

рыдаці.— Ц ы б у л я), па функцыі (Як разгарачуся, дак па палатне імчуся, дзе праеду — стане гладка. Вот, дзяўчаты, вам загадка.— П р а с), па якасці (Весь век у вадзе ляжыць, а ніколі не гніе.— К а м е н ь), па прасторавым (Сколькі на небе зорачак, столькі на зямлі дзірачак.— І р ж ы ш ч а) і часавым прыметам (Што гэта за вочы: адно свеціць удзень, а другое ўночы?— С о н ц а і М е с я ц).

У адным радзе пры параўнанні могуць стаяць канкрэтныя неадушаўлёныя прадметы (На дварэ гароха, а ў хаце вадоха.— С н е г), адушаўлёныя прадметы (У пачатку мая прылятае птушка такая, хто яе заб'е, той сваю кроў пралье.— К а м а р), адушаўлёныя прадметы і абстрактныя (Чорная кабылка ўсіх людзей палажыла, белая кабылка ўсіх людзей падняла.— Н о ч і д з е н ь), чалавек і жывёла (У Маруські сем кажушкоў, вецер падуе — і цела гола.— К у р ы ц а), адушаўлёны і неадушаўлёны прадмет (Дзве рыжыя кароўкі злажылі ўместа галоўкі.— Л а ў к і).

372. Загадкі

Сігала — блеск, за блескам — трэск, за трэскам — плеск. (Маланка, гром, дождж).

Зара-зараніца, красная дзевіца, па небу гуляла, слёзы пагубляла. Месяц убачыў — не падняў, сонца ўстала — падабрала. (Раса)

Белы, чысты, як крышталь, рэдка калі бывае, сам ад матулі рождзен і яе раждаіць. (Лёд)

Без голасу, а вые. Без рук, а абрусы сцеле. (Завіруха)

На дварэ гароха, а ў хаце вадоха. (Снег)

Два браты век адзін на аднаго глядзяць, а падысці не могуць. (Берагі).

Ёсць у Бога коні — ніхто не суніме. Ёсць у Бога скрыня — ніхто не падыме. (Вецер і зямля)

Весь век у вадзе ляжыць, а ніколі не гніе. (Камень)

Доўгі, як качалка, круглы, як качан. (Месяц)

Што гэта за вочы, адно свеціць удзень, а другое — уночы? (Сонца і Месяц)

Каціласа катушка — ні звер, ні птушка, ні камень, ні вада, не адгадаеш нікагда. (Сонца)

Рыкнуў вол на сем сёл, на сем рэчак, на сем печак, на тысячу балот. (Гром)

Ішоў даўгавяз, у самую зямлю ўвяз. (Дождж)

Чорная кабылка — усіх людзей палажыла, белая кабылка — усіх людзей падняла. (Ноч і дзень)

Расце ў лесе дзерава, на ём дванаццаць галінак, на каждуй галінцы па чатыры сучкі, на каждым сучку па сем лісткоў. (Год, месяцы, тыдні, дні)

Ляжыць Стася — расцягнася, каб устала, дык неба заслала б. (Дарога)

Доўгі Мітрошка бразгае ў акошка. (Дождж)

Што за паненачка, што ў гармошку сукеначка? (Сыраежка)

Круглатварае дзіцятка спіць спакойна на баку ў шараватым кажушку.

Яно сястрычак мае шмат, адно імя ва ўсіх блізнят. (Бульба)

Тонка стоя, слабка віся, сам касматы, кончык лысы. (Арэх)

Маленькі галышок упаў з вышок. Не так пабіўся, як шапачкі забыўся. (Жалуд)

Стаіць стаюк, вісіць вісюк, прыйшоў парсюк да стаюка, просіць: «Пазыч вісюка». (Жалуды)

А што за трава, што сляпой знае? (Крапіва)

Не сучок, не лісток, не кветка, а на дрэве расце. (Кара).

Як была я малада, дык была я белая, а як пастарэла, дык пачырванела. (Каліна)

Стаіць пані на гары ў чырвоным каптуры. Хто ідзе — не міне: кожны паклоніцца. (Суніцы)

За лесам, за каралесам сіненькі агонь гарыць. (Лён)

Сіненькая, маленькая, увесь свет адзяе. (Лён).

Рыгор ляжыць між гор, плотам накрыўся. (Гарбуз)

Стаіць дзед нізан, а на ім сто рызан. (Качан капусты)

Чырвоненькі петушок закапаўся ў пясок. (Бурак)

Паранджовая і злая на Вялікдзень памагае. (Цыбуля)

Выйшла пані ў чырвоным кафтане. Сталі раздзяваці, сталі плакаці, рыдаці. (Цыбуля)

Сядзіць Хадося, распусціўшы валоссе, кожны, хто ні ідзе, не міне, як забачыць, так і заплачыць. (Цыбуля)

Стаіць калок, а на тым калку домік, а ў тым доміку сямсот дзетак. (Макаўка)

То па дзесяць, то па пяць, залупіўшыся, вісяць. (Маліна)

Чырвоны колер, вінны смак, каменнае сэрца. (Вішня)

Паверх лесу дзяжа кіснець. (Яблыка на яблыні)

Улетку ёлка, зімой кароўка. (Каноплі)

Усе ў полі ў завушніцах. (Авёс)

Залацісты і вусат. У ста карманах сто рабят. (Колас)

Галава, як у шчукі, хвост, як у рыбы. Не ён дарагі, а яго шуба. (Бабёр)

Ішло тотало цераз плотало, пыталася ў жмуры, ці дома лёпало? (Воўк, сабака, свіння)

У цёмнай цямніцы ткуць паненкі красніцы, ніхто так ні вытча, як яны. (Пчолы)

Чатыры паненачкі ў адну дзірачку цурчаць. (Вымя і даёнка)

Возіць усіх на сабе і за сабой, сам жа заўсёды ідзець пехатой. (Конь)

У Маруські сем кажушкоў, вецер падуе — і цела гола. (Курыца)

Ляцеў лятутар, сеў на палютар, пытаецца ў кохтаркі: «Дзе твае пыхтаркі?» (Каршун, курыца, цыпляты)

З белага касяля, жоўтага воска радзіўся прарок, стаў праракаць, сталі людзі ўставаць. (Певень)

У адной бочцы два розных піва, баўтаюцца, баўтаюцца, а ніколі не змяшаюцца. (Жаўток і бялок)

Хто два разы нараджаецца: першы раз гладкі, другі раз мяккі? (Яйцо, кураня)

У пачатку мая пралятае птушка такая, хто яе заб'е, той сваю кроў пралье. (Камар).

Сіта — не сіта, рукамі не віта. Пража — не пража, хто знае, той скажа. (Павуціна)

Ідзе ў баню камінарам, а выходзіць — пыша жарам. (Рак)

Лунавокая Матруна, вечна мокрая макруна. (Жаба)

Пад кустом сіпуля, за нагу шчыпуля. (Гадзюка)

Маці таўстуха, дочка краснуха, а сын перабор ды пайшоў на двор. (Печ, агонь, дым)

Паміж лісіц свіння вісіць. (Клямка)

Пад гару ідзе, а з гары і разу не ступіць. (Агонь)

Два стаяць, два ляжаць, пяты ходзіць і ўсіх водзіць. (Дзверы)

Поўна дзежачка мукі, а на версе жукі. (Попел з вуголлем)

Стаіць дуб, на дубе лён, на лёне гліна, а ў гліне свіння. (Стол, абрус, гліняная міска, а ў ёй мяса)

Старэнькі дзядок на хату гарбок. (Драўляны крук)

Дзве рыжыя кароўкі злажылі ўместа галоўкі. (Лаўкі)

Сам голы, а сарочка ў запазусе. (Нітка ў свечцы)

Тры браты пайшлі на рэку купацца, два купаюцца, а трэці на беразе валяецца. (Два вядры і каромысел)

Стары дзедзя на печы едзя. (Гаршчок)

Ніхто не такоў, як Іванька Петракоў — сядзе на каня і едзе ў агонь. (Чыгун на вілах)

Шыла-бадзіла па хаце хадзіла, у куточку стала, хусту падрала. (Венік)

Каб не дзедава рамясло, у бабы б па калені абрасло. (Венік)

Як разгарачуся, дык па палатне імчуся, дзе праеду — стане гладка. Вот, дзяўчаты, вам загадка. (Прас)

Жалезны ток, свіны пераскок, грэцкая пасцель. (Патэльня, падмазка, блін)

Стучыць, грыміць, верціцца. Ходзіць увесь век, але не чалавек. (Гадзіннік)

Сіла звініць, лес вянець, на тым месцы гара станець. (Касец, стог)

Тысяча людзей адным поясам падпяразаны. (Сноп)

Сколькі на небе зорачак, столькі на зямлі дзірачак. (Іржышча)

З зямлі ўстала, хатай стала, ды гаспадар у ёй не жыве, калі пачнеш адчыняць хату — разбярэш яе па шмату. (Капа сена)

Лезу, лезу па жалезу, па дзірачках, па бірачках, падай, кума, шапку. (Азярод)

Рыжыя цяляткі перакінулі хвасты праз градкі. (Цапы)

Кланяецца, кланяецца, гулка б'е, рукой матляе, людзям зерне на хлеб выбівае. (Цэп)

Чаго не люблю — не прадам, а што люблю — не куплю. (Маладосць)

Цэлы век нашу іх, а ліку не знаю. (Валасы)

Кіну крывульку цераз тын на вулку, сякачыкі сякуць, Андрэй наварочвае. (Лыжка, язык, зубы)

Дзень з ноччу сутыкаецца — стражнік у норку хаваецца. (Вока)

Поўны хлявец белых авец, добра жывецца, добра жуецца дружнаму статку, хто засмяецца — скажу вам загадку. (Зубы)

КАЗКІ

Змешчаныя ў зборніку казкі — толькі невялічкая частка запісаў, якія былі зроблены студэнтамі, выкладчыкамі і навуковымі супрацоўнікамі Белдзяржуніверсітэта ў апошнія дзесяцігоддзі. Знаёмства з імі дапамагае праз стан лакальнай традыцыі Міншчыны прасачыць дынаміку гістарычных працэсаў, якія характарызуюць агульнае развіццё казачнага эпасу беларусаў на сучасным этапе. З аднаго боку, прыведзеныя творы даюць больш поўнае ўяўленне аб сюжэтна-рэпертуарным багацці і разнастайнасці эпічнай традыцыі нашага народа, аб геаграфічнай прымеркаванасці і актыўнасці бытавання паасобных сюжэтных тыпаў, з другога — яны дазваляюць прасачыць у часе глыбінную сувязь цесна знітаваных паміж сабой калектыўнага і індывідуальнага пачаткаў, акрэсліць агульную тэндэнцыю вар'іравання асноўнага сюжэтнага ядра ў адпаведнасці з развіццём сацыяльнага індывіда, а таксама выявіць заканамернасці эвалюцыі паэтыкі беларускага казачнага эпасу.

Казачная спадчына Мінскай вобласці шырока прадстаўлена ўсімі жанравымі разнавіднасцямі. Аднак франтальнае абследванне апошніх дзесяцігоддзяў паказвае, што найбольш распаўсюджаны казкі пра жывёл. Прычым шырокі гістарычны спектр іх функцый паступова звужаецца, і сёння яскрава вылучаюцца толькі дзве: маральна-этычныя і выхаваўчыя. Гэта становішча тлумачыцца тым, што жывёльны эпас цалкам скіраваны на дзіцячую аўдыторыю. Узрост слухачоў, іх невялікі жыццёвы вопыт, спецыфіка ўспрыняцця навакольнага свету абумовілі, відаць, кола найбольш пашыраных казачных сюжэтаў. Сярод іх на Міншчыне часцей за ўсё сустракаюцца казкі тыпу «Ліса крадзе рыбу з воза», «Воўк ля палонкі», «Ліса абмазвае галаву цестам» і «Біты нябітага вязе», якія могуць расказвацца казачнікамі асобна, а могуць аб'ядноўвацца ў адзіны, лагічна разгорнуты твор. Вялікай папулярнасцю сярод дзяцей карыстаюцца казкі тыпу «Воўк-дурань», «Каза лупленая» і асабліва «Кот, пятух і лісіца». Неабходна адзначыць, што падчас фальклорных экспедыцый збіральнікам пашчасціла запісаць казкі аб тым, як заяц і вожык бегалі навыперадкі і як свіння хадзіла ў Маскву на багамолле, якія вядомы ў адзінкавых запісах. Як правіла, усе яны заснаваны на рытмізаваных паўторах, напоўнены шматлікімі мастацкімі формуламі, якія дапамагаюць дзецям лёгка запамінаць сюжэтныя паваротy, у пэўнай ступені персаніфікаваць герояў і, што вельмі важна, адчуць сябе быццам бы саўдзельнікамі разгортваемых падзей.

Значнай разнастайнасцю сюжэтнага рэпертуару вылучаюцца на Міншчыне чарадзейныя казкі, хаця актыўнасць іх бытавання далёка не аднастайная. Часцей за ўсё казачнікі расказваюць казкі на такія сюжэты, як «Мачаха і падчарка», «Бязручка», «Марка Багаты», «Цудоўныя ўцёкі», «Хлопчык-з-пальчык у ведзьмы». У гэтых творах арганічна спалучыліся фантастычная выдумка і шматлікія рэаліі сялянскага жыцця, апаэтызаваныя ў адпаведнасці з эстэтычнымі законамі народнай творчасці. Кожная з іх — гэта своеасаблівы гімн дабру, волі, бясконцаму пошуку і веры ў шчаслівую будучыню. Менавіта таму чарадзейная казка адразу палярызуе сваіх персанажаў, разводзіць іх у супрацьлеглыя бакі, не дапускаючы

пры гэтым ніякіх прамежкавых варыянтаў. Мастацкая эстэтыка вусна-паэтычных твораў цалкам адпавядае крытэрыям народнай этыкі, таму востра асуджаецца эгаізм і несправядлівасць мачахі ў адносінах да падчаркі і разам з тым паэтызуецца цярплівасць і высокая маральнасць дзяўчыны-бязручкі, працавітасць і душэўнасць малодшых сясцёр.

На жаль, запісы апошніх гадоў сведчаць аб значных зменах у паэтыцы чарадзейных казак. Побач з казкамі, напоўненымі прыгожымі, лёгказапамінальнымі формуламі-апісаннямі, загадкамі, самахарактарыстыкамі, рыфмаванымі і рытмізаванымі дыялогамі, усё часцей трапляюцца творы, у якіх замест разгорнутых трохразовых паўтораў падаецца спрошчанае фабульнае апісанне, з'яўляюцца навацыі, якія не заўсёды стасуюцца да зместу, парушаюць логіку сюжэтнага развіцця, разбураюцца ўстойлівыя каноны кампазіцыйнай пабудовы.

Беларускі казачны эпас XIX — пачатку XX ст. быў надзвычай багаты навелістычнымі і сацыяльна-бытавымі казкамі, якія былі разлічаны перш за ўсё на дарослага слухача. Фальклорная практыка паказвае, што гэтая жанравая разнавіднасць пакуль што надзейна трымаецца ў памяці казачнікаў-балагураў, але спакваля яна выходзіць з актыўнага ўжытку, як адышло ў нябыт начное, калядныя вечары з гульнямі і ігрышчамі, паўсюднае ткацтва. З калісьці шырокага кола сюжэтаў сёння часцей сустракаюцца казкі пра дзве долі, Праўду і Крыўду, мудрую дзяўчыну, дзяўчынку і разбойнікаў, беднага і багатага братоў, лянівую жонку. У адрозненне ад чарадзейных казак, творы бытавой тэматыкі акцэнтуюць увагу на розных аспектах псіхалогіі чалавека, на няпростых узаемаадносінах паміж людзьмі ў сацыяльна неаднародным грамадстве. У іх высока апаэтызаваны жанчыны, якія захоўваюць свой гонар і праяўляюць жыццёвую мудрасць, кемлівасць, знаходлівасць. Разам з тым вострыё народнай сатыры накіравана супраць персанажаў, якія занядбалі агульначалавечыя каштоўнасці, зняважылі чалавечую годнасць, пакрыўдзілі малодшага, парушылі законы вясковага суіснавання.

373. Кот, пеўнічык і лісіца

Жыў дзед і баба, быў у іх каток і пеўнічык. Але баба іх не карміла. Каток і кажыць:

— Пойдзем упрочкі.

У катка была скрыпачка і тапарок. Ішлі яны, ішлі — стаіць у лесе хатка, але хатка пустая (ці ніхто ў ёй не жыў, ці чорт яе ведаіць).

Ну, пасяліліся яны ў гэтай хатцы, сталі жыць. Жывуць, неяк каток і кажыць:

— Я пайду ў дровы, а ты, глядзі,— нікуды.

Толькі ён пайшоў, прыходзіць лісіца пад вакно і пяець:

— Петушок, петушок, залаты грэбушок, масляна галоўка, шоўкава бародка, пусці, я не буду цябе есці.

Петушок той паверыў і пусціў. Яна ўзяла яго і папёрла. Тут што ж рабіць, панясла — пачаў петушок крычаць:

— Каток-браток, залаты лабок, мяне ліска панясла за высокія горы, за далёкія моры.

Прыляцеў каток, адбараніў.

Добра, другі раз пайшоў каток у дровы. Ізноў прыляцела ліска пад вакно:

— Петушок, петушок, залаты грэбушок, масляна галоўка, шоўкава бародка, пусці, я не буду цябе есці.

Той і пусціў. Ізноў яна яго гэтак папёрла, але каток адбараніў. Там і трэці раз яна прыйшла і як ухапіла, дык ужо спёрла яго за такія горы і моры, што каток нічога не чуў (петушок жа крычаў).

Пайшоў каток шукаць петушка. Прыйшоў да лісы, схаваўся за гарой і кажыць:

— Ліса, ліса, аддавай петушка, што ты ўхапіла.

А ліса:

— Не, я не хапаю, мая дзядзіна толькі хапаіць.

А кот зайшоў да гор і дымок відзіць. Гэта ўжо ліса з дочкамі петушка варыць у катле. Кот пачаў у скрыпачку іграць:

— Дуль-дуль-дуль, адна Мар'я, дуль-дуль-дуль, другая Кунар'я, дуль-дуль-дуль, трэцяя Пасялушніца, дуль-дуль-дуль, а чацвёртая — Няслушніца (гэта ўжо дочкі лісы).

Ліса тут і кажыць:

— Хто гэта гэтак стройна іграіць? Ты ідзі, Мар'я, кліч яго.

А Мар'я пайшла. Кот яе тапаром і засек. Німа і німа Мар'і. Лісіца і Кунар'ю паслала, і Пасялушніцу, і Няслушніцу. Усіх кот пазасякаў. А кот усё пяець:

— Дуль-дуль-дуль, а ў ліскі новы двор, дуль-дуль-дуль, чатыры дочкі на выбор.

Ай, прыбралася лісіца, сама пайшла зваць. А каток тут яе і засек. Прыйшоў ён у ліссі двор. Хто яго ведаіць, падзьмуў ужо неяк на петушка. Той і ажыў і цяпер жывець.

374. Пра гусака

Жылі сабе дзедка да бабка, і быў у іх гусак. Пайшоў гусак у Маскву Богу маліцца. Ішоў ён, ішоў і бачыць — бяжыць мядзведзь:

— Гусак, гусак, куды ты ідзеш?— пытае мядзведзь у гусака.

— Пайду ў Маскву Богу маліцца!— адказвае яму гусак.

Падумаў мядзведзь ды кажа:

— Пайду і я з табою.

— Ну, ідзі,— згадзіўся гусак.

Вось ідуць яны ўдваіх, а насустрач ім бяжыць воўк.

— Гусак, мядзведзь, куды вы ідзяцё?— пытаецца ён у іх.

— Ды вось ідзём у Маскву Богу маліцца.

— А ці возьмеце мяне з сабою?

— Калі хочаш, то пайшлі.

Вось ідуць яны ўтраіх. Бяжыць ім насустрач лісічка-сястрычка. Убачыла іх і пытаецца:

— Куды вы гэта ідзяцё?

— Ды вось у Маскву Богу маліцца ідзём,— адказвае гусак.

— А ці можна мне з вамі ісці?

— Ідзі.

Вось ідуць яны ўчацвярых. Насустрач ім бяжыць кабанец.

— Куды гэта вы ўсе ідзяцё?— пытае ён у іх.

— Ідзём у Маскву Богу маліцца.

— А ці возьмеце мяне з сабою?

— Ну, калі хочаш, то пойдзем з намі.

Вось ідуць упецярых. Ішлі яны не мала, не многа, дарогу ім перашко-

дзіў глыбокі роў. Сталі яны думаць, што рабіць і як яго перайсці. Гусак падняўся, пераляцеў і пайшоў сабе далей. Мядзведзь разагнаўся — ды ў роў і ўваліўся. Воўк разагнаўся — ды ў роў таксама ўваліўся. А ліса стаіць і смяецца:

— Эх, ты, ваўчышча-дурачышча, вось як я пабягу, дык і пераскочу, не то што вы!

Разагналася яна, пабегла — ды ў роў і ўвалілася. За ёй кабанец разагнаўся — і той туды паляцеў.

Сядзелі яны, сядзелі ў рове, захацелася ім есці. А што рабіць — не ведаюць. Думалі-думалі, а ліса тут і кажа:

— Давайце, хто старэйшы за ўсіх нас, таго і з'ядзім.

Згадзіліся ўсе. Кабанец кажа:

— Мне ад роду пяць гадоў.

Воўк кажа:

— Мне ад роду чатыры гады.

Мядзведзь кажа:

— А мне ад роду тры гады.

А ліса кажа:

— А мне ад роду ўсяго два гады.

Вось сталі яны кабана есці. Пасля ўзяліся за ваўка. А лісіца хітрая была — выкапала ямачку і пахавала ў яе кішак. Калі ваўка з'елі, лісіца, седзячы на ямачцы, цягне з-пад сябе кішкі ды есць. А мядзведзь глядзеў-глядзеў ды не ўтрымаўся, папрасіў у лісы:

— Лісічка-сястрычка, дай мне хоць адну кішачку!

А ліса адказвае яму:

— Ах ты, касалапішча, ты ж бачыш, як я лапай цягаю з жывата свае кішкі, вось вазьмі ды лапай сам з сябе свае кішкі цягай ды еш!

Мядзведзь паслухаў, лапай кішкі зачарпнуў з сябе і цягне, ды сам сябе і разарваў. Лісіца і яго з'ела. Пайшла яна па дну рва. Бачыць — стаіць дуб. А на тым дубе — гняздо дзятла. Ліса і кажа:

— Дзяцел, выдаўбай мне лесвічку. Калі зробіш гэта, тады не трону тваіх дзетак, а калі не выдаўбаеш, дык узлезу і дзяцей тваіх паем.

Паслухаў дзяцел, выдаўбаў лесенку, а ліса ўзлезла па ёй, з'ела дзятліных дзетак і сама на зямлі апынулася.

375. Піражок

Быў дзед і баба. Абодва яны былі сляпыя і не было ў іх дзяцей, самі былі. От адзін раз кажа дзед:

— Бабка, вазьмі ты да й спячы піражок, да й пойдзем мы к валапасікам-канапасікам.

Спяклі піражок, ідуць. Прыйшлі, кажуць.

— Валапасікі-канапасікі, дайце нам вала, а мы вам піражка.

А тыя кажуць:

— Бярэце, дзідку.

Узялі яны таго вала і ідуць. Ідуць-ідуць і ўвайшлі ў лес. Ідзе лісічка і пытае:

— Бабка, куды вы ідзеце?

— Ой, ліска, куды ідзем? Вось хочам сабе саначкі зрабіць.

Ліса ім у адказ:

— Ідзіце ў вялікі лес і кажыце: «Сані, сані, рабіцеся самі з вялікага дрэва і з малога».

Тыя так і зрабілі. Пасля запраглі таго воліка і едуць. Ідзе воўк насустрач:

— Кумка-галубка, вазьмі мяне з сабою.

— Ой, куме-бісе, паломяцца сані.

— Кумка-галубка, ну хоць адну лапку.

— Ой, то лажы.

Паехалі, а сані патрэскваюць.

— Куме-бісе, злазь — сані трашчаць.

А ён:

— Не, кумка-галубка, гэта я арэшкі кусаю. Дай я яшчэ адну лапку палажу.

— Ну, добра.

Едуць яны, а сані зноў трашчаць.

— Кумка-галубка, я гэта арэшкі кусаю. Дай я яшчэ лапку і хвост-даўгунец палажу.

— Ну, добра.

Як сеў, так сані і паламаліся. Бабка пытае:

— Што ж нам рабіць?

Воўк ім кажа:

— Прывяжэце вала да карча, а самі ідзіце ў вялікі лес санкі прасіць.

Яны пайшлі, а воўк узяў да й з'еў гэтага вала. З'еў у вала ўсё ў сярэдзіне, а ў кожу саломы напхаў. Прыйшлі бабка і дзед — стаіць вол.

— Ну-у-у, волік, паехалі, бо дамоўка далёка, а ты ўжо начаў саломкаю ср...

А як тая саломка ўпала — а вала нет. Ідуць, галосяць:

— А што нам рабіць? І воліка няма, і піражка няма.

Ну, усё. Больш няма казкі.

376. Дзед і воўк

Жылі дзед і баба. Жылі добра яны. Баня была. Так дзед у суботу баню выпаліў, выбрыўся. А грыбоў было, дык гэта ж многа, дык ён рана і пайшоў у грыбы. Набраў кошык грыбоў, ідзець. Гэта ж стаіць воўк.

— Го, дзедзька,— кажыць,— я цябе з'ем.

— Дык, а як ты,— кажыць,— будзеш мяне есці?

— А чаму ж ты во які,— кажыць,— стройны, а я касматы?

— Дык ты ж прыхадзі ка мне, і я цябе пабрыю.

— А калі?

— У суботу, і баня будзіць.

Ну, воўк у лесе паждаў, прыйшоў яшчэ завідна. А ён кіпятку накіпяціў, чалавек, і крошку саломай заслаў.

— Ну, вот, хадзі, садзіся,— кажыць.

Нешта ён пачуў цяпло, гэты воўк, кажыць:

— Мусіць, горача.

— Не,— кажыць,— і я во які, упадабаў жа і ты, пабрыўшыся.

Гэты воўк як шукнуў задам. Ён яшчэ папхнуў яго. Дык пакуль ён з бані выскачыў, дык аблез (ну, вар) і паляцеў.

Дзед яшчэ пасля яго памыўся: быў цэбар вады.

А назаўтра ж — свята. Пайшоў дзед у грыбы. Нясець, дык стаіць гэты воўк голы. Кажыць:

— Го, дзедзька, во цяпер я цябе з'ем.

— А як жа ты будзеш есці: старыя косці і свянцоныя? Ідзі, навастры зубы.

— А аб што?

— Аб камень.

Вот ён лётаў, лётаў (у лесе ж не надта гэтых камней), найшоў-ткі нейкі камень і стаў вастрыць. А дзед грыбы паставіў і на сасонку ўзлез. Воўк прыляцеў: грыбы ёсць, а дзеда няма. Тады глядзіць ён на сасну — як завыў, дык сто ваўкоў прыляцела. І воўк на ваўка станець, каб дастаць дзеда. А воўк голы — пад самым нізам. І аднаго ваўка не хапіла. Дзед відзіць, што могуць дастаць, дык ён як крыкнуў:

— Баба, ва́ру, ва́ру!

А гэты голы знаіць у вары ўжо смак. Як скочыў з-пад нізу — як абрыліся, і пакалечыліся, і на смерць пазабіваліся.

Ну, дзед злез, у яго нож быў, палупіў з гэтых ваўкоў скур (а даўней скуры ваўкоў былі дорага), дык багата надта жыў і жывець і цяпер.

377. Каляда

Быў дзед і баба. Была козачка ў іх. Дзед выйшаў, карміў скаціну, і козачка выскачыла. Выскачыла козачка і лётала да вечара. А дзед і баба забыліся запёрці.

Козачка лётала, лётала, а воўк, як сцямнелася, і прыляцеў па яе. Каза ўбачыла воўка і схавалася на вербу і сядзіць. Воўк падышоў пад вербу, кажыць:

— Каляда, злезь, козачка, пагукаім, каляда.

А каза, седзючы:

— Каляда, чаму ў цябе, воўча, вочы вялікія, каляда?

А воўк кажыць:

— Каляда, я ў караля ўсю ночку пакоі асвяшчаў, каляда. Каляда, злезь, козачка, пагукаім, каляда.

А каза:

— Каляда, чаму ў цябе, воўча, зубы вялікія, каляда?

Воўк ужо казе кажыць:

— Каляда, я ў караля ўсю ночку парасяткі калоў, каляда. Каляда, злезь, козачка, пагукаім, каляда.

— Каляда, чаму ў цябе, воўча, лапы вялікія, каляда?

А воўк:

— Каляда, я ў караля ўсю ночку перапечкі пляскаў, каляда. Каляда, злезь, козачка, пагукаім, каляда.

— Каляда, чаму ў цябе, воўча, хвост вялікі, каляда?

— Каляда, я ў караля ўсю ночку пакоі падмятаў, каляда. Каляда, злезь, козачка, пагукаім каляда.

Падманяваў, падманяваў, алі стала віднецца, і ні падманіў воўк. І ўсё-такі каза засталася на вербе. Гэта каляда.

378. Дзве дачкі

Жылі-былі дзед да баба. У дзеда была дачка, і ў бабы была дачка. Баба вельмі любіла сваю кравіначку, рабіць нічагуткі не давала, спаць позна дазваляла. А дзедаву дачку неўзлюбіла.

Аднойчы баба пазвала да сябе дзеда і кажа яму гэтак:

— Вязі, дзед, сваю дачку ў лес на снеданне ваўкам. А не завязеш, то і цябе са свету звяду!

Заплакаў дзед ад гора, але не стаў пярэчыць ліхой бабе. Рана-ранюсенька, калі яшчэ не ўзышло нават красна сонейка, калі толькі на небе расступіліся хмаркі, запрог дзед каня, пасадзіў на воз сваю любіміцу і павёз у цёмны гушчар. Але не змог стары кінуць дачку ў лесе адну, не прывязаў да тоўстага дуба, як наказвала баба перад дарогай. Ён знайшоў сярод елак невялічкую хатку, куды і прывёз сваё дзіця. На развітанне сказаў:

— Ты гатуй, дачка, мне вячэру, а я паеду ў лес далей па дровы.

А сам направіў каня дамоў. Каб дачка не магла зразумець пра хлусню, дзед прывязаў палена да дрэва. Вецер — «шух-шух», палена — «тук-тук». Вецер — «шух-шух», палена — «тук-тук» — нібыта дзед дровы сячэ.

Асталася дзяўчына адна-адзінёшанька ў цёмным лесе. Нанасіла сухіх елачак, распаліла печ, пачала гатаваць вячэру. Хуценька ўправілася з гэтай работай. Выйшла на ганачак, гукае:

— Татуль, татуль, ідзі есці — вячэра ўжо гатова!

Але не пачуў яе бацька, не прыйшоў на вячэру. А палена ўсё «тук» да «тук». Агледзела яго дзяўчына, усё зразумела. Выйшла ізноў на ганачак, гукае:

— Хто ў лесе, хто ў цёмным — ідзі ка мне на вячэру!

Пачуў пра гэта мядзведзь, адказвае з цёмнага гушчару:

— Я ў лесе, я ў цёмным — іду к табе на вячэру!

Пачаставала дзяўчына мядзведзя кашай і зноў стала клікаць:

— Хто ў лесе, хто ў цёмным — ідзі ка мне на вячэру!

Пачуў пра гэта воўк, адказвае:

— Я ў лесе, я ў цёмным, іду к табе на вячэру!

Пачаставала дзяўчына і ваўка. Выйшла трэці раз на ганак, пачала зноў гукаць. Прыйшлі да яе на вячэру кабан, заяц, ліса, вожык, вавёрка. Усіх пачаставала дзедава дачка смачнай вячэрай. Выскачыла з норкі і мышка, просіць кашкі:

— Дзявіца-руса касіца, дай ложачку кашкі!

А мядзведзь кажа:

— Дай, Маша, па лабашы, каб і лоб трэснуў!

Не паслухала Маша мядзведзя, дала мышцы кашкі.

Стала зусім цёмна. Час і спаць класціся. Мядзведзь кажа:

— Дзявіца-руса касіца, сцялі пасцель: рад камення, рад палення і ступу пад галаву. Спаць будзем класціся. А ты не спі — танцуй па хаце. Вось табе ключыкі, звані імі!

Палажыла дзяўчына ўсіх спаць, а сама не спіць — танцуе па хаце. Зробіць крок дзяўчына, ключыкі — «дзінь-дзінь», а мядзведзь — «бух» каменем. Ключыкі — «дзінь-дзінь», а мядзведзь — «бух» каменем. Разгубілася Маша. А тым часам мышка з норкі выскачыла, шэпча:

— Лезь, дзявіца-руса касіца, у маю нару, а я за цябе званіць буду. Я маленькая, мяне цяжка апоўначы злавіць, а цябе заб'юць яшчэ.

Гэтак і зрабілі. Мышка — «дзінь-дзінь», мядзведзь — «бух» каменем.

Усю ноч званіла мышка, але не ўдалося звярам забіць яе. Раніцай мышка паказала дзяўчыне дарогу дамоў і дала клубочак нітак, каб не заблудзілася, яшчэ і поўны мех золата з сабою дала.

Прыйшла Маша дамоў, з радасцю сустрэў яе бацька. А злая мачаха аж ад зайздрасці нагамі затупала, рукамі замахала:

— Вязі і маю, дзед, дачку ў лес! Хачу і я, каб у яе было многа золата!

Не стаў і на гэты раз пярэчыць дзед бабе. Запрог каня, пасадзіў бабіну дачку на воз. Ледзьве конь здолеў з месца крануцца ад тых клункаў, што дала баба з сабой у дарогу дачцэ.

Прывёз дзед на тое самае месца і бабіну дачку. Нічога гультайка не стала рабіць. Села, склаўшы рукі, а як есці захацела, пачала шарыць па гаршках і місках, што на прыпечку стаялі. Знайшла кашку, што зварыла Маша. Стала есці, запаліўшы лучыну. На агонь сталі збірацца звяры. Але нічым не частавала бабіна дачка гасцей. Пачалі самі звяры аблізваць міскі.

Вылезла з норкі і мышка, просіць:

— Дзявіца-руса касіца, дай ложачку кашкі!

Мядзведзь кажа:

— Дай, Маша, па лабашы, каб і лоб трэснуў!

Бабіна дачка гэтак і зрабіла. Піскнула мышка, палезла ў норку. А тым часам звяр'ё спаць клалася. Даў мядзведзь лянівіцы ключыкі, наказаў, каб усю ноч танцавала. Бабіна дачка — «дзінь-дзінь» ключыкамі, мядзведзь — «бух» каменем. На трэці раз папаў мядзведзь у галаву бабінай дачцэ, забіў яе.

А баба тым часам пякла бліны, гатавалася да сустрэчы з дачкой. Адпраўляе дзеда ў лес за кравіначкай. Паехаў дзед у лес.

Баба бліны пячэ. Пад сталом сядзіць Жучка, зацяўкала:

— Цяў-цяў, дзедава дачка ў золаце сядзіць, а бабінай дачкі костачкі вязуць!

Баба кінула ў Жучку калодку драўляную, перабіла ёй лапу, а сама далей стаіць каля печы. Жучка ізноў зацяўкала:

— Цяў-цяў, дзедава дачка ў золаце сядзіць, а бабінай дачкі костачкі вязуць!

Баба другую лапу перабіла. Жучка трэці раз зацяўкала, а тут — і дзед на парог. А ў руках мяшочак з костачкамі бабінай дачкі. Загаласіла баба, з хаты пабегла. А ў гэты час на двор заехаў малады купец каня паіць. Убачыў прыгажуню — дзедаву дачку ды давай прасіць яе рукі. Забраў са двара дзяўчыну, павёз у прыгожыя палацы. Вяселле зладзілі. Усяго на сталах было, усім вяселле гулялася. І я там быў, мёд-віно піў, па барадзе цякло, у рот не папала. Дзедавай дачцэ добры папаўся маладзец. Вось і казачцы нашай канец.

379. Пра кароўку

Быў дзед з бабай і была ў іх дачка. Але баба памёрла. Дзед ажаніўся. Узяў бабу другую. А мачыха благая. А дзедава дзяўчына невялікая была.

— Гані на паству дачку,— кажыць мачыха.

Вось яна і сягоння каровы, свінні, авечкі пагнала, і заўтра. Тады мачыха ёй дала сем кудзелін і сем верацён, каб спрала, выткала, выбеліла і ў трубачку звярцела гэтага палатна. Дзяўчына сядзіць і плачыць: дзе ж яна гэдак зробіць за дзень? Дык карова кажыць:

— Чаго ж ты плачаш?

А дзяўчына гаворыць:

— Дык мяне мачыха дала сем кудзелін, сем верацён, каб я спрала, выткала, выбеліла, і ў трубачку палатно звярцела.

Карова кажыць:

— Лажыся.

— Не, я баюся.

— Не, лажыся.

Вось каровы гэтыя і авечкі ўсё спралі, выткалі, выбелілі і ў трубачку звярцелі. Пабудзілі яны дзяўчыну і кажуць:

— Гані дамоў нас ужо.

Яна прыгнала і кажыць:

— Мае вы кароўкі.

І гладзіла іх. Глядзіць мачыха — усё зрабіла дзяўчына, што яна загадала.

— Ай-яй-яй, як ты гэта зрабіла?!

А дзяўчына ў адказ:

— Памаглі авечкі, кароўкі.

На другі дзень загадвае мачыха сваёй роднай дачцэ:

— Гані і ты з ёй кароў, хай і табе гэдак зробяць.

Дык гэта поўзала, пугай увічыла іх там — і кароў, і авечак.

— А,— кажыць,— каб вас воўк паеў.

Тыя кажуць:

— Лажыся.

Яна і лягла спаць, а як лягла, дык і заснула. А каровы з авечкамі сарвалі, стапталі гэтую кудзелю за тое, што матчына дачка біла іх пугай. Устала дзяўчына і бачыць, што ссысолілі тую кудзелю, сажралі тамака. Прыйшла дадому, а мачыха кажыць:

— А, каб яе воўк, мы яе зарэжам, гэту карову.

Пачула гэта дзедава дачка і пабегла да кароўкі.

— Мая кароўка, мая мамка, цябе ж будуць рэзаць.

А тая адказвае:

— Ну што ж, нехай рэжуць, алі не дай нікому чароў перабіраць, сама перабірай. Там найдзеш два зярняткі яблачныя. Пасадзі іх у садзе.

Яна і пасадзіла. Дык з аднаго зярнятка вінны калодзеж зрабіўся, а з другога — вінная яблынька. І вось аднойчы прыехалі сваты да іх у хату і кажуць:

— Хто дастаніць яблык з яблыні і з калодзежа вады і віна, таго замуж браць буду.

Пайшла бабіна дачка. Дык тут яблыня зрабілася высокая, і ніяк яна яблык не дастала, а як падышла да калодзежа — той зрабіўся глыбокі. Тады падышла дзедава дзяўчына і кажыць:

— Можа, я дастану.

— Да ну, ты дастанеш!

— Не, пайду.

І вось, як гэта дзяўчына прыйшла, дык яблынька зрабілася нізенькая, а калодзеж — мялюсенькі: і дна дастала, і яблык, і ў хату прынесла. Дык тыя сваты яе і засваталі. А бабіна дачка засталася.

Усё ж байка.

380. Дзве сястры і брацік

Былі дзве сястры і маленькі брацік. Пайшлі яны адзежу паласкаць, а хлопчык лез у ваду. А ведзьма яго ўзяла і ўкрала. Пайшла большая сястра шукаць. Ідзець яна, ідзець — стаіць кароўка:

— Дзеўка-дзявіца, русая касіца, падаі мяне, табе малачко будзіць.

— Няма мне калі, пайду браціка шукаць.

Ідзець яна, ідзець, аж бачыць — гусі:

— Дзеўка-дзявіца, русая касіца, пакармі нас, табе яечкі будуць, а нам лягчэй будзіць.

— Няма калі, трэба брата шукаць.

Ідзець яна, ідзець, аж тут — яліна:

— Дзеўка-дзявіца, русая касіца, абдзяры смаліцу, табе — смала, а мне лягчэй.

— Няма мне калі, трэба брата шукаць.

Прыходзіць дзяўчына да ведзьмы ў хату. Бачыць: ведзьма сядзіць, а каля яе брацік іх маленькі.

— Чаго прыйшла? Па брата?— пытаецца ведзьма.

— А не,я па грыбах хадзіла, увідзела дымок, зайшла пагрэцца.

Ведзьма кажа:

— Дык пашукай мяне.

Яна шукае ведзьму, а ведзьма заснула, тады яна — за браціка і пабегла. А ведзьма як агледзелася, як пазвала гусей, кароўку, ялінку — усе пабеглі і адабралі хлопчыка і аддалі ведзьме.

Прыйшла большая сястра дадому, кажыць:

— Бачыла браціка ў ведзьмы, але не адабрала.

Пайшла тады меншая сястра па браціка. Сустрэла кароўку:

— Дзеўка-дзявіца, русая касіца, падаі мяне, табе — малачко, а мне лягчэй будзіць.

Падаіла яе дзяўчына і пайшла далей. Аж тут гусі:

— Дзеўка-дзявіца, русая касіца, пакармі нас. Табе — яечкі, а нам лягчэй будзіць.

Пакарміла іх і пайшла далей. Аж тут ялінка:

— Дзеўка-дзявіца, русая касіца, абдзяры смаліцу, табе — смаліца, а мне лягчэй будзіць.

Паслухала яна і яе.

Прыйшла да ведзьмы, а ведзьма і кажыць:

— Чаго прыйшла? Па брата?

— А не, я па грыбах хадзіла, увідзела дымок, зайшла пагрэцца,— сказала дзяўчынка.

— Дык пашукай мяне.

Стала яна ведзьму шукаць, а ведзьма і заснула. Тады сястрыца — за браціка і пабегла.

Прачнулася ведзьма і сказала гусям, кароўцы і ялінцы, каб адабралі хлопчыка. Але яны не паслухалі ведзьму, а дапамаглі сястрыцы дадому шчасліва дайсці, бо яна і ім памагла.

381. Пра невялікага хлопчыка

Быў у бабы з дзедам хлопчык. Невялікі яшчэ быў — гадоў пяць, можа, чатыры. Аднойчы бацька паехаў араць. Дык гэты хлопчык і кажыць:

— Я тады тату прынясу есці — снедаць.

А бацька рана паехаў араць. Маці ў печы паліла і бліноў напякла і лічак, налажыла тэго-сего, кілбасы, і ён панёс, як у нас кажуць, вунь да таго, Шклёнікаўскага азярка ўжо.

Ішоў, ішоў хлопчык, а з кустоў воўк выйшаў:

— Куды ідзеш?

— Тату есці нясу.

— А што ты нясеш? *(А воўк галодны.)*

— Ну, мама ж тату нешта ўлажыла есці.

Воўк вырваў сумку, паглядзеў, што там, і з'еў бліны, і яйкі з'еў — усё паеў, і ні пад'еў. Узяў хлопчыка глынуў. Алі добра, што маці і спічкі ўлажыла ў карманчык яму, бо ён думаў ля бацькі касцёр разлажыць.

Вось воўк паляцеў у лес і гэтага хлопчыка панёс. А хлопчык жывы: што ж рабіць? Надумаўся, выняў спічкі з кармана і давай там паліць. Ваўку тожа солана, а той і па дзве запаліць спічкі. Тады воўк у лесе падышоў — ды аб сасонку задам:

— Хто ў чаровах, хто ў гужме — лезь вон!

А хлопчык адказвае:

— Не, не палезу. Нясі на татаву вуліцу мяне.

Ваўку ж горача, блага, думае, можа не замецяць там каля сяла. Прынёс на вуліцу — і аб плот:

— Хто ў чаровах, хто ў гужме — лезь вон!

А хлопчык усё:

— Не, не палезу. Нясі на татава дварышча мяне.

Воўк і ў дварышча прынёс, тожа гэдак таўчэць задам:

— Хто ў чаровах, хто ў гужне — лезь вон!

А хлопчык:

— Не, не палезу, нясі ў татаву віранду мяне.

Воўк лапай адчыніў неяк віранду памаленьку, а хлопчык выскачыў і дзверы — хляп — зачыніў. *(А бацька з мацярай ужо яго шукалі, думалі — прапаў.)* Тады хлопчык і закрычыць:

— Ай, тата, скарэй, воўк у вірандзя.

Бацькі пачулі голас — іхняга хлапца. Бацька выляцеў.

— Во, — кажыць хлопчык,— воўк.

А воўк, хлопчык яго ўжо ў чаровах спёк, убачыў, што прапаў, лёг

пад сцяну і ляжыць. Бацька тапаром яго і засек і скуру злупіў. Дык хлапца прыбралі: і бацінкі, і касцюм купілі, і штаны, і бабе спадніцу яшчэ, і грошы гэдак за скуру набраў.

382. Ярынка і Раманька

Былі дзед і баба. Былі ў іх Раманька-сынок і Ярынка-дачка. Матка памярла, а бацька зноў ажаніўся. Мачыха не любіць дзяцей мужа. Ярынка тады кажыць:

— Раманька-брацятка, пойдзем у свет. Я недзе буду рабіць, а ты будзеш ля мяне.

Ішлі яны дарогаю, гарачыня гэдакая, піць хлопцу хацелася. У конскім капытку стаіць вада, дык ён кажыць:

— Ярынка-сястрыца, нап'юся.

— Раманька-брацятка, ня пі ты,— кажыць Ярынка,— будзіш конікам.

Ня піў. Прайшлі, прайшлі — у кароўім сляду стаіць вада.

— Нап'юся,— кажыць Раманька.

— Раманька-брацятка, ня пі, будзіш кароўкай.

Ня піў. Тады прайшлі, дык у баранням капытку стаіць вада. Раманька ўзяў ціхенька і напіўся, і перавярнуўся (вада зачараваная была) баранькам. Парасла на ім воўна ўжо гэткая пазлацістая.

Ідуць далей удваіх — стаіць панскі стог. Узлезлі на стог. Гэты баранька сена есць, а дзяўчына ксёнжачку чытаіць.

Прыязджаюць панскія парабкі па сена. Дык хацелі забраць бараньку, а Ярынка кажыць:

— Я не аддам, вазьміце і мяне, і я буду рабіць, і бараньку, дык толькі тады.

Паехалі парабкі да пана. А той адказаў:

— Сена хваціць, бярыця.

Прывезлі парабкі дзяўчыну з баранькам. Ярынка работу робіць, а баранька з ёй.

Панясла аднойчы Ярынка бялізну мыць на раку, дык ведзьма яе ўтапіла, а сама ў яе адзежу надзелася і прыйшла ўжо, як быццам бы гэта Ярынка. Ухадзілася, за стол села, і віно перад ёй, і мёд стаіць, сядзіць яна, есць. Нешта ж парабкі заўважылі, што не гэдакая, як Ярынка трошку.

А яна на пана кажыць:

— Рэж гэтага бараньку. Нашто ён? Рэж!

Ну, ён тады парабкам і кажыць:

— Ну, што яна кажыць — рэзаць, зарэжця.

Дык тыя парабкі пайшлі рэзаць, а баранька і кажыць:

— Панічкі-ражнічкі, пусціця да рэчкі напіцца — болей крыві будзіць.

І парабкам шкода: надта прыгожы баранька. Пусцілі яго. Ён бяжыць да ракі і ўсё:

— Ярынка-сястрыца, мяне пан будзіць рэзаць, ножыкі вострыць, карытцы мыіць.

А Ярынка адзываецца:

— Раманька-брацятка, ня бось, ня бось, ні на год, ні на два, а назаўсёды.

Вось ён са два разы злётаў, а тады ідзець трэці раз да ракі (і гэдак

парабкі не рэжуць — шкадуюць). Тым часам ідзець старычок із сеткай рыбу лавіць.

— Чаго ж ты гэдак плачаш?— пытаецца.

— У мяне ж,— адказвае баранька,— ведзьма сястру ўтапіла, Ярынку, а мяне хочаць рэзаць.

— Ну, пачакай жа,— кажыць старычок.

Упусціў сетачку ў раку і выцягнуў Ярынку. Яна тамака адзетая была. Прыйшлі яны ціханька да пана. А парабкі глядзяць, што вось — Ярынка, і пану сказалі, што тая — ведзьма. Тады ведзьму да конскіх хвастоў прывязалі. Аднаго каня туды, другога — сюды, і раздзёрлі яе.

А Ярынка і сягоння там жывець, і баранька той з ёй.

383. Разумная дачка

Жылі-былі дзед і баба. Жылі яны надта бедна. Нарадзілася ў іх дачка Ганулька. Яны не зналі, за што пахрысціць дзяўчынку. Недалёка ад іх жыў багаты мужык. Што не годнае ў гаспадарцы ў яго, ён выкідаў у кусты. Пайшоў некалі дзед каля гэтых кустоў за вадой, чуе — нешта там шапячыць. Прыгледзеўся — аж там жывое цялятка, ды такое прыгожае, толькі худое. «Ну,— думае дзед,— будзе чым радзіны справіць». Вярнуўся дамоў за пасцілкай і прынёс цялё дамоў. Жонка зарадавалася.

Яны рашылі гадаваць цялушку, а радзіны як-небудзь справіць.

Расла Ганулька, расла і цялушка. І тут багач агледзеўся і пазнаў у карове тое слабае цялё. І пачаў патрабаваць назад карову. А дзед кажа:

— Не, ты яе выкінуў, яна табе была не патрэбная, а цяпер, як я яе выгадаваў, яна табе патрэбна. Не аддам.

Багач падаў у суд. Вызваў суддзя абодвух да сябе, выслухаў іх і, каб рашыць, каму карова, загадаў ім тры загадкі: што за ўсё быстрэй? што за ўсё саладзей? што за ўсё жырней?

Прыйшоў дзед дамоў і пытаецца ў сваіх. Ганулька падумала, падумала і адгадала: быстрэй за ўсё чалавечыя думкі, саладзей за ўсё сон, жырней за ўсё зямля.

А багач з жонкай адгадалі так: наш жарабец быстрэй за ўсё, наш мёд саладзей за ўсё, наш парсюк за ўсё жырней.

І пайшлі яны да суддзі з гэтакімі адгадкамі. Суддзю лепей спадабаліся адгадкі беднага, і ён папытаўся ў яго, хто такі ў яго сям'і мудры.

— Дачка мая Ганулька.

Суддзя даў дзесяць яек і сказаў, каб за ноч яго дачка выседзіла дзесяць цыплянят.

Дачка спекла з яек яечню, а праз бацьку паслала просьбу, каб суддзя даў, чым карміць цыплянят.

Суддзя падумаў і рашыў, што за дзень гэта зрабіць немагчыма. Тады ён даў жменю ільну і сказаў, каб з гэтага ільну выйшла рубашка яму. А Гануля паслала яму палена дроў і сказала, каб ён ёй з гэтага палена зрабіў кросны.

— Гэта ж нельга,— сказаў суддзя.

На трэці раз суддзя запрасіў Ганулю ў госці, але каб яна прыехала ні на коні, ні пяшком прыйшла, каб ні голая, ні адзетая, каб прывязла падарак, які б суддзя не змог узяць.

Гануля абкруцілася сеткай рыбацкай, села на калок, злавіла зайца — і да суддзі. Суддзя ўбачыў яе і спусціў сабак. Гануля ж выпусціла зайца, сабакі і пабеглі за ім, а Гануля прыйшла да суддзі. Пагаварылі яны, ды ўжо патрэбна Ганулі дамоў варочацца. Яна запрасіла суддзю да сябе ў госці. Прыехаў суддзя і пытаецца, да чаго прывязаць каня.

— Да зімы або да лета.

Пан не зразумеў.

Яна ўзяла лейцы і прывязала каня да лета (да воза). Пагасціў суддзя і паехаў дамоў. Праз некаторы час запрашае ён Ганулю да сябе ў госці. Прыехала Гануля. Пачаставаў ён яе гарэлкай. Але Гануля маладзец — спаіла пана. Суддзя сказаў, што ён падорыць Ганулі ўсё, што яна папросіць.

Назаўтра прынеслі яму пісьмо. Суддзю патрэбна было ехаць у сваю далёкую вёску, дзе жылі яго бацькі, а Ганулю ён пакінуў на сваё месца суддзі. У першы ж дзень яна выпусціла з цюрмы многа асуджаных.

Да Ганулі прыйшлі раз два мужыкі. Яны ехалі на базар, ды ажарабілася кабыла. Воз быў аднаго мужыка, а кабыла другога. І заспорылі яны, каму што пакінуць. Гануля сказала:

— Раз так, то вазьміце кожны сваё ды і расцягніце ў розныя бакі, за кім жарабё пабяжыць, таго і будзіць.

Зрабілі яны гэтак і прыйшлі дзякаваць ёй за добры савет.

Прыехаў суддзя і зноў пачаў гасціць Ганулю, ізноў сам спіўся. А Гануля ўзвалiла яго на воз і прывезла дамоў. Спаць палажыла на гнілы бульбоўнік. Прачнуўся суддзя, агледзіўся, а Гануля яму тапор у рукі:

— Ідзі, паночак, пасячы дроў, а той мой бацька стары ды нядужы.

Суддзя згробся ды наўцёкі.

384. Лёс чалавека

Быў чалавек багаты. Надумаўся ён пашукаць свой лёс. Ішоў, ішоў, далёка пайшоў. Бачыць — сядзіць чалавек і ўсё клубочак у клубочак звівае. Пытае багаты ў яго:

— Што ты робіш?

Той адказвае:

— Судзьбу з судзьбой звіваю.

— А дзе ж мая судзьба?

— Твая судзьба сем год ляжыць у пасцелі хворая.

Пайшоў багаты далей. Ідзе, ідзе, ідзе. Заходзіць у сяло, у першую хату. Ляжыць там хворая. Запытаўся ён у яе, што з ёй. Яна адказала, што ўжо сем год ляжыць, хварэе, бо ў яе пляўрыт. Гаворыць ён:

— А дзе ж твае бацька з маткай?

— Пасуць авечкі.

Выйшаў з хаты і думае, што калі гэта мая судзьба, то зарэжу я яе. Вярнуўся, узяў нож ды парнуў у бок. Гной у яе і выцек. Але ж ён

адумаўся, што можа бацькі яе бедныя, то і пахаваць не будзе за што. Паклаў пад падушку сто рублёў, бо сам быў багаты, і пайшоў дадому.

А яна ўстала, паздаравела. Прыходзяць бацькі дадому — што зрабілася, што ўчынілася! Яна і расказала, што прыходзіў такі і такі чалавек. Знайшлі пад падушкай сто рублёў.

Прайшоў час. Дзяўчына стала здаровая, вырасла, прыгожая стала. А той чалавек жыў сабе дома адзін.

Быў фэст. Усе дзяўчаты ішлі пад царкву, і тая дзяўчына з імі. І той багаты чалавек ехаў з кучарам. Крычыць кучару:

— Спыніся!

Сталі. Запрашае чалавек тую дзяўчыну з ім паехаць. Распытаўся пра яе ўсё ды ў хуткім часе ўзяў яе замуж.

А аднойчы пайшлі яны ў баню. Яна ўсё хавае шрам ад нажа. Але ж ён угледзеў, запытаўся ў яе. Яна ўсё і расказала. І тады ён успомніў, што гэта быў ён, а дзяўчына гэтая і ёсць яго судзьба.

385. Тры браты

Жылі на белым свеце тры браты — два старэйшых багатых ды малодшы брат бедны.

Багатыя браты жылі-пажывалі ды грошы ў куфры сабе складалі, а малодшы брат рабіў на сваіх старэйшых братоў ад рання да рання. Доўга ці коратка, але падышоў братам час жаніцца. І так яно адбылося, што пайшлі яны сватацца ўсе ўтрох да адной дзяўчыны — тонкай арабіны.

Раз пад вечар пайшлі браты да адной хаты, дзе жыла тая дзяўчына— тонкая арабіна. Пастаялі на ганку, пастукалі ў дзверы ды зайшлі ў хату. Старэйшыя браты-жаніхі селі на шырокай лаве ля светлага вакенца, каб усім было відно, якія яны тоўстыя ды добра апранутыя. Малодшы ж брат ціха сеў у цёмным кутку, што ледзь відзен быў адтуль.

Тады запытала маці дзяўчыны ў братоў, хто яны такія, што параб-ляюць?

— Ну і змарыўся я сёння,— кажа старэйшы брат,— увесь дзень пша-нічку сваю мерыў, і канца краю ёй няма, гэткі ўраджай сёлета вялікі — мерай не перамераеш.

— Ну і змарыўся я сёння,— кажа сярэдні брат,— увесь дзень грошы лічыў. Ад вялікага прыбытку столькі грошай — лічы не пералічыш.

— А ты што маўчыш?— спытала старая ў малодшага брата.

— А я ўвесь дзень працаваў на сваіх братоў,— адказаў той.

Паглядзела маці дзяўчыны на жаніхоў ды й сказала:

— Пшаніца годам, а грошы пераходам.

І пайшла дзяўчына — тонкая арабіна замуж за малодшага брата — працавітага і стараннага работніка. Згулялі вяселле маладыя ды жылі яны доўга і весела. Можа, і зараз яшчэ жывуць.

386. Поп і браты

Адзін бацюшка наймаў касцоў. Ён ужо дамовіўся з імі па торбе пшаніцы. Сам павёў іх на пакос.

І косяць, і косяць, і косяць. Прыходзіць абед. Яны паабедалі. Давай

зноў касіць. Ужо заходзіць сонца, і людзі ідуць дамоў, а гэты бацюшка не рушыцца дадому. Браты гавораць:

— Бацюшка, ды ўжо месяц узышоў. Ужо ж пара дамоў ісці.

Дык ён кажа:

— Ды гэта сонца брат.

Ну, яны думаюць: «Абаждзі. Ты такі хітры, і мы не будзем дурачкі». Скасілі яны гэты пакос пры месяцы і пайшлі.

Назаўтра бацюшка гаворыць:

— Пабярыце торбы і прыхадзіце на разлік. Я вам дам па торбе пшаніцы.

Яны што: «Мы ж касілі і пры сонцавым брату». Узялі ды папрышывалі к торбе мяшкі, а торбу папрапорвалі. І ідуць з гэтымі торбамі. Прыходзяць.

Бацюшка кажа:

— Нясіце торбы.

Яны трымаюць гэтыя торбы. Ён сыпле, сыпле — няпоўныя гэтыя торбы.

— А гэта што? Каля торбы што?

— А гэта торбін брат. Мы касілі к сонцаваму брату, ты сып к торбінаму брату.

Ён ім і насыпаў па мяшку пшаніцы, і яны пайшлі.

387. Гора

Раз жылі на свеце маці, сын і бацька. І яны — бацька і маці — казалі, што е Гора, а сын, што — не. А потым ён сабраў торбу і пайшоў палямі, лясамі, лугамі і даламі. І ўбачыў хату. Зайшоў у тую хату, а там яно і жыло — Гора. А ён так узяў выцягнуў з печы чыгун мяса авечага, бо вельмі есці хацеў, і з'еў усё. Толькі спаць стаў, чуе — нехта, як трактар тухкае: хух-тух-хух, хут-тух-хух — то Гора ідзе.

— Што за руская косць пахне?— кажа яно.

А хлопец кажа:

— Я кузнец, я шавец, я і лекар-маладзец.

Яно ўзрадавалася і кажа:

— Устаў мне адно вока.

Яно крывое было. А хлопец кажа, каб знайшло вяровак якіх ці скур з быка.

Прывязаў ён Гора моцна-моцна, узяў прут стальны, якім кабаноў коляць, і яму ў другое вока. Гора як кінецца на яго, а ня відзіць нічога, дык зачыніла дзверы, і давай усё хапаць. А ў іх авечкі былі, дак хлопец узяў кажух, вывернуў на другі бок, а сам у яго ўлез. Гора яго і выпусціла. А ён, дурань, яшчэ рагоча, як выйшаў:

— Абдурыў я цябе.

— Ну, што рабіці, бяры ўжо тады і мой скарб: залатую сякеру з сярэбранай ручкай. У вярбе яна,— адказала Гора.

Ну, ён і пабег, схапіў і — прыліп. А тут чуе — Гора бяжыць. Дак ён адрэзаў сабе руку і цякаць. А з тае пары стаў верыць, што е Гора. Толькі людзям бяды нарабіў: Гора цяпер не бача, да каго прыстае.

388. Муж-вуж

Жылі ўдваіх брат і сястра. Гэта сястра была ўжо пажылая, замуж не выйшла. Пайшла яна к рацэ купацца, раздзелася ды й уздыхнула, кажа:

— Хоць бы вуж да быў муж.

Пайшла ў рэку. Вылезла адзявацца — ляжыць на адзёжы вуж. Яна проста разгубілася. А ён зрабіўся такім красаўцам і гаворыць:

— Што ж ты пужаешся? Ты ж сама мяне звала. Цяпер ты — мая жонка, а я — твой муж.

Ён ёй даў платочак і сказаў:

— Ты будзеш прыходзіць к рацэ, махнеш — і я заўсёды буду страчаць.

Яна ўжо хадзіла туды к яму. Ён яе забраў к сабе. А цераз тую рэчку нікому нельга было перабрацца. Яны жывуць там удваіх. Вось нарадзілася ў іх двое дзяцей: хлопчык і дзяўчынка. Яна захацела да радні:

— Я паеду к брату ў госці.

Накупляла гасцінцаў, усяго і паехала з гэтым у госці. Браціне вельмі панравілася. Яна і разадзета, і багата. Браціха пытае:

— Хто твой муж? Чаму з ім ты не прыехала?

Яна кажа:

— Мой муж абыкнавенны, як і ва ўсіх.

Тады яна бачыць, што нічога не возьмець, і давай пытаць хлопчыка. Ён кажа:

— Наш папа, як папа, красівы...

Не сказаў. А дзевачку папрасіла — яна ёй і сказала:

— Наш папа парою вужам, парою ўжэ папа наш. Ён нам даў платочак. Мы будом вяртацца, ён стрэціць і забярэ нас.

Браціха адабрала ў яе платочак. Прыйшлі яны к той рэчцы, няма чым махнуць. Ён і не стрэў яе. Яна ўжо стаіць і плача. Тады ён стрэў яе і кажа:

— Вось ты ўжо не выдала.

На хлопчыка кажа:

— І ты, сынок, не выдаў мяне. Ты будзеш салаўём. Будзеш лётаць па садах і спяваць.

А на дзяўчынку сказаў.

— А ты будзеш зязюляю. Будзеш скітацца, кукаваць. У цябе мужа не будзе, удава будзеш.

Яно гэтак і ёсць.

ПАДАННІ, ЛЕГЕНДЫ, БЫЛІЧКІ, АНЕКДОТЫ

Побач з вершаванымі жанрамі вусна-паэтычнай народнай творчасці ў Мінскай вобласці шырока бытуюць і празаічныя жанры, куды акрамя казак уваходзяць паданні, легенды, былічкі, анекдоты.

Найбольш цікавымі і разнастайнымі па тэматыцы з'яўляюцца паданні і легенды. Гэта творы аб стварэнні сусвету, паходжанні людзей, жывёл, назваў населеных пунктаў і г. д. Так, напрыклад, у Пухавіцкім раёне запісана легенда пра



Авеяныя паданнямі ўзоры Нясвіжскага замка. Фота Я. Казюлі.

паходжанне і афарбоўку бусла, якая пабудавана ў адпаведнасці з лепшымі фальклорнымі традыцыямі і народнымі ўяўленнямі аб жыцці.

Больш устойлівым жанрам з'яўляюцца шырока распаўсюджаныя ў беларускім фальклоры паданні, звязаныя з мясцовай гісторыяй, населенымі пунктамі, прыродай, людзьмі. Паданні падзяляюцца на гістарычныя і тапанімічныя. У асноўным паданні ўзнікалі ў сувязі з якой-небудзь гістарычнай падзеяй, назвай паселішча і да т. п. Такім прыкладам можа служыць паданне пра дзяўчыну Браніславу, узнікненне вёскі Лукашэвічы, паданне «Мамчына горка». Яны тлумачаць паходжанне паселішча, помніка з гістарычнага пункту гледжання, і даволі часта гэтыя паданні называюць гісторыка-тапанімічнымі.

Запісана многа самых разнастайных па зместу і характару тапанімічных паданняў. Сярод іх ёсць вельмі простыя, пабудаваныя па закону народнай этымалогіі: пра вёскі Пацейкі, Сямернікі, Крычын, Каўшова і звязаныя з гісторыяй: Галавачы, Галоўні, Лаўніца або з элементамі казачнай фантастыкі — Чараўкі.

У вуснай народнай творчасці беларусаў існуе група невялікіх апавяданняў пра падзеі, якія цяжка адразу зразумець і растлумачыць, бо галоўнымі ўдзельнікамі іх з'яўляюцца розныя звышнатуральныя сілы, мерцвякі і г. д. Гэта былічкі або прымхіцы.

Звышнатуральныя істоты ўмешваюцца ў жыццё людзей, змяняюць яго — і ў гэтым характэрная асаблівасць былічак. У зборніку запісана некалькі такіх твораў: пра бабулю-чараўніцу, сям'ю Галубоў і інш. Былічкі звязаны з народным светаўспрыманнем, міфалогіяй, хаця ў асноўным апавяданне ў іх ідзе пра нядаўнія падзеі.

Больш распаўсюджаным жанрам няказачнай прозы з'яўляецца вуснае апавяданне. Гэта апавяданні аб нядаўнім мінулым або сучасным, прычым без удзелу звышнатуральных сіл, удзельнікам або сведкам якіх з'яўляецца сам апа-

вядальнік. Цяжкасцю ў вызначэнні жанру можна назваць неакрэсленасць межаў паміж, з аднаго боку, апавяданнямі, якія перадаюцца ў размове, і, з другога — паданнямі, што аб'ядноўваюцца шэрагам агульных мастацкіх сродкаў. Тэматычна вусныя апавяданні падзяляюцца на гістарычныя, аб падзеях нядаўняга мінулага і сённяшняга часу, бытавыя. У большасці выпадкаў — гэта сказы бытавога зместу.

Надзвычай шырокае бытаванне ў апошні час набылі анекдоты. Па ідэйна-тэматычнаму зместу, вобразах яны вельмі блізкія да сацыяльна-бытавых казак, але актуальнасць, невялікі памер, дынамізм апавядання і нечаканы вынік вылучаюць іх у самастойны жанр.

389. Браніслава

Гэта было вельмі даўно. Уся гэта легенда звязана са стараствам Антона Кошчыца, асобы злавеснай і жорсткай. Аб ім нямала і на сённяшні дзень ходзіць паданняў. Адно з іх расказвае, што гэты магнат быў доўгі час бяздзетным. Маліць Бога аб патомстве ён хадзіў у Кіеўскую Лаўру, ездзіў у Іерусалім. Будучы ў Рыме, магнат паабяцаў Богу, што, калі жонка народзіць дзіця, ён пабудуе ў Старым Мядзеле касцёл. З Італіі быў прывезен архітэктар. Ён і кіраваў усімі будаўнічымі работамі.

Жонка Кошчыца нарэшце нарадзіла дзіця. Патрэбна сказаць, што потым на гэтых фактах доўга спекулявалі царкоўнікі. Яны ўнушалі веруючым, што ўсё можна вымаліць у Бога, асабліва за грошы.

Дзіця ўвесь час хварэла. Нянька, маладая і вельмі прыгожая з прыгонных дзяўчына Браніслава, аднойчы выпусціла ад бяссоніцы яго з рук. Дзіця памерла.

І вось за гэту смерць вырашылі пакараць дзяўчыну-няньку. Для гэтага вывелі яе за Мядзель. Загадалі нерухома стаяць на высокай гары, а ў гэты час па загаду Кошчыца сталі абкладваць дзяўчыну цэглай. Так і замуравалі яе жывую ў вялікі каменны слуп.

Без усякага надпісу гэты слуп стаяў да першай сусветнай вайны каля дарогі, што вядзе на Нарач. Калі яго разабралі рускія салдаты, то ўбачылі, што слуп унутры быў пусты, а на дне яго ляжалі чалавечыя косці.

390. Лукаш

Было гэта яшчэ ў сівую мінуўшчыну, многа соцень год таму назад. Валуны на нашых землях сустракаліся рэдка. За цэлы дзень ворыва, бывае, два-тры камяні патрапіш. Зямліца наша памяркоўная. У сухі год збажыну не высушыць, у мокры не вымачыць. У лесе звяры вадзіліся, барза мёдам багаты. Зразу за ёўнямі стаяў векавы лес — было з чаго будыніну зрабіць. Увогуле: быў хлеб, была прыварка, такая-сякая гаспадарка. Жылі людцы мірна і спакойна, а звалі нашу вёску Багатая.

Аднойчы трывожная чутка ўскалыхнула наваколле: брадзячы ваявода з дружынай блукае па вёсках, зараз рухаецца сюды, спадзяецца знайсці багатую пажыву. Бы растрывожаны вулей зашумела вёска. Пачалі рыхтавацца да адпору ворагу. З суседніх вёсак на падмогу мужчыны прыйшлі. Усе ўзброіліся: хто сякерай, хто даўбачом ці таўкачом ад ступы,

жанчыны пачалі паходні спальваць. Асабліва завіхаўся і вызначаўся да адпору ворагу каваль Лукша, а ў вёсцы яго называлі Лукаш.

Прывыклі рабаўнікі крыўдзіць безабаронны народ, а тут раптам нечакана, да багатай пажывы рукой падаць, а тут доступ закрыт... Дрэнна адчувалі сябе чужынцы на беларускай зямлі: то лазутчыкі не вернуцца назад, то абознікі разам з коньмі як праз зямлю праваляцца або пасля ночы застанецца мала воінаў.

Сярод воінаў быў асілак, і рашыў ён запужаць сялян. Але сяляне не напужаліся, многія маладыя, дужыя хлопцы прасілі паслаць іх на паядынак. Параіліся паважаныя старцы вёскі і вырашылі даручыць гэту справу Лукашу: ён розумам хуткі, сілы ў яго не менш, чым у другіх, ды і рука кавальская больш выносліавая і хуткая.

Раніцай выйшлі на сутычку два асілкі. Цэлы дзень па вербалозніку раздаваўся бразг булаў. Пад вечар Лукашова булава зламалася. Дубовымі доўбнямі-калодкамі стаў біць ён ворага. Адна ламалася, а яму ўжо другую падавалі. Зламалася булава і ў праціўніка. Вялізнымі валунамі пачаў кідаць ён у Лукаша. Лукаш не аставаўся ў даўгу. Тры дні і тры ночы насіліся ў паветры саракапудовыя каменні, але ні адзін асілак не адступаў ні на крок. На чацвёрты дзень сабраў Лукаш усю сваю сілу, падхапіў камень пудоў на восемдзесят, запусціў яго са свістам — і засціг ворага. Учуўшы хруст касцей і крык свайго асілка, ворагі бясслаўна ўбяглі прэч.

З песнямі вярталіся сяляне дадому. Насустрач беглі дзеці, жонкі. Пад усеагульную весялосць Лукашу ўзлажылі вянкі з палявых кветак — знак удзячнасці і павагі.

На гэтым месцы, дзе стаяла вёска Багатая, вырасла новая вёска Багацькі. Там, дзе рыхтавалі доўбні да бою, калоды, вырасла вёска Калодна. А на месцы перамогі над ворагам узнікла вёска і назвалі яе ў гонар Лукаша — Лукашэвічамі.

391. Беніца

Было гэта вельмі даўно. Жыў-быў багаты пан. Ехаў ён аднойчы дадому, а коні былі маладыя, хуткія. Вось і пабеглі яны, што было сілы. Спужаўся тут пан, пачаў маліцца: «Калі застануся жывым, то пастаўлю касцёл, дзе спынюцца коні». І коні спыніліся паміж вёскамі Беніца і Сівіца. Але места пану не падабалася. Ён паставіў там толькі вялізны белы слуп. А ў вёсцы быў заснаваны касцёл. У парог пан залажыў шмат грошаў. Калі хацелі дастаць тыя грошы, падняць пліту, то будынак пахіснуўся, разламіўся папалам. Тая пліта яго трымала.

392. Пра пана

Раней паны любілі, каб іх мужыкі будавалі хаты па роўнай вуліцы. І крыху далей ад хат пан будаваў свой дом. Гэта рабілася з той мэтай, каб ён мог выйсці на вуліцу ў любы момант і пабачыць усе мужыцкія хаты.

Вельмі пільна паны сачылі за малымі дзецьмі. Звычайна дзеці хадзілі ў доўгіх кашулях. Калі хлопчыкі падрасталі, пачыналі насіць штаны. Вось

паны і лічылі, што калі хлопчык надзеў штаны, то ён ужо дарослы і яго трэба браць на работу ў маёнтак.

Так трапіў да пана адзін хлопчык. Вельмі моцна плакала яго матка, прасіла пана, каб не чапаў сына, але нічога не памагло. Некаторы час хлопчык працаваў у маёнтку, але да пана аднойчы прыехаў сябар з Літвы і выменяў хлопчыка на сабаку.

393. Мамчына горка

Даўней у гэтым замку жыў пан Жаба, багаты дужа быў. Жыхары нашай вёскі рабілі на яго. А ў пана была служанка, у якой сын быў дужа красівы. І вот гэты сын улюбіўся ў панскую дачку. Яна яго тожа палюбіла. Але ж бацька не дазваляў ім жаніцца, дык яны ўзялі ды і ўцяклі ўдваіх невядома куды. За гэта пан загадаў пакараць служанку сваю. Яна была закапана ў зямлю жывой на гэтай горцы. Вот чаму яна і называецца «Мамчына горка».

394. Святы калодзежак

Гэты святы калодзежак знаходзіцца каля вёскі Язвіны Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў полі Ліпаве.

Колькі раней людзі не хадзілі ў лес, у поле, ніколі не бачылі, каб з-пад зямлі біла вада. Аднойчы прыйшлі яны ў поле Ліпава і заўважылі, што з-пад зямлі б'е фантанчык, а вакол яго на пяску босыя сляды. На гэтым месцы пабудавалі калодзеж.

Старыя людзі і цяпер ходзяць на трэці дзень Сёмухі туды маліцца. Людзі казалі, што вакол калодзежа хадзіла Насвенчая матка і на пяску засталіся сляды яе ног.

Гэтае месца лічыцца святым. Людзі бяруць з гэтага калодзежа ваду і кажуць, што яна дапамагае ад хвароб.

395. Плямы на Месяцы

Жылі два браты, адзін бедны, а другі багаты. Багаты і бедны паклалі паліць ахвяру. Беднага ахвяра паднялася да неба. Значыць, Бог забраў беднага ахвяру, а багатага не забраў.

Потым багаты беднага закалоў сахаром. Калі прыгледзецца на Месяц, то можна ўбачыць на ім вочы, нос, рот, а таксама бачна, як адзін брат дзержыць другога на сахары. Вось што азначаюць плямы на Месяцы.

396. Рынкава балота

Недалёка ад вёскі Пярэжар Валожынскага раёна ёсць Рынкава балота. Праўда, балота там мала, досыць, што болей як палавіна — сенажаць.

Дык от некалі даўней, ужо ніхто не помніць калі точна, было на гэтым мейсцы мястэчка, у якім штонядзелі збіраўся вялікі торг. Быў там вялікі пляц, на ім стаяла Цэрква са званіцай, а кругом — базар.

І от, кажуць, першы час людзі і ў Цэркву хадзілі, і на торг, а потым

разбэсціліся, сталі грашыць, адзін аднаго ашуківаць, забіваць нават за грошы. У Цэркву перасталі хадзіць. Бог на іх разгневаўся, і ў адну нядзелю, калі людзі на рынку бойку вялікую ўчынілі, правалілася ўсё мястэчка пад зямлю, і стала там балота. А людзі празвалі яго — Рынкава балота.

Яно і цяпер у месячную ноч, калі поўня толькі пачынае сходзіць на ветах, прылажыўшы вуха да зямлі і добра прыслухаўшыся, можна ўчуць, як там, пад зямлёй, б'юць званы на званіцы.

397. Замак

Мядзель акружалі тры замкі на астравах азёр Мядзель, Мястра і Нарач. Усе яны і зараз называюцца мясцовымі жыхарамі «Замак». Тое, што на ўсіх трох астравах былі сярэдневяковыя замкі, можна заўважыць яшчэ і зараз. Захаваліся рэшткі фундаментаў, скляпенняў, земляных валоў. Сустракаюцца тут адзічэўшыя пладовыя дрэвы і хмызнякі. Заснаванне замкаў прыпісваецца каралеве Боне, якая жыла ў адным з іх — на Мястры. У іншых жылі яе сёстры. Гэта была чараўніца. Гэту цудадзейную сілу даваў ёй залаты Бог з брыльянтавымі вачыма, які быццам захаваўся з часоў язычства на замку.

Сцвярджаюць, што каралева ажыўляла мёртвых, вылечвала людзей ад усіх хвароб, што яна заваражыла Мядзель і яго ваколіцы ад змей.

Замак быў грозны і недаступны. Увесь час у ім знаходзіўся моцны гарнізон. З усіх бакоў ён акружаўся вадой, а з берагам злучаўся мастом. На ноч мост падымаўся, а днём апускаўся ў ваду, таму яго нельга было бачыць. Некалькі разоў замак асаджаўся войскамі, але ўзяць яго не маглі. Нарэшце, вайна са шведамі. Войскі непрыяцеля захапілі горад, але да замка ніяк не маглі даступіцца. Дапамагла ім выпадковасць: карова ад берага па падводным мосце пайшла на востраў. За ёй кінуліся шведы. Так замак быў узяты. Каралева выратавалася па тайнаму падземнаму ходу, што быў пракапаны пад возерам ад замка да старамядзельскага касцёла. Перад сваім бегствам яна кінула цудадзейнага залатога ідала ў студню. Так болей ніхто нічога не ведае аб каралеве.

398. Пра русалку

Неяк прыехаў хлопец на Нарач, пахадзіў навокал, паглядзеў на блакіт неба, сінь вады, зелень берагоў, паслухаў шэпт хваль, песні салаўя, і палюбіў ён Нарач. Не мог спаць па начах. Як толькі ўзыходзіў месяц, бег да Нарачы, кідаўся ў возера. Гадзінамі плаваў, а калі зусім стамляўся, засыпаў на хвалях. Хвалі адносілі яго да берага і захоўвалі ад начной прахалоды.

Аднойчы юнак спаткаў на беразе дзяўчыну-русалку. Пасля яны сустракаліся кожную ноч, купаліся ў вадзе, бегалі па лузе. Русалка падарыла юнаку каралі з жоўтага і чырвонага бурштыну і сказала пры гэтым, што жоўты бурштын — яе слёзы, а чырвоны — кроў, што каралі абароняць яго ад няшчасцяў, і пакуль яны будуць цэлыя, будзе жыць іх каханне.

Неяк запрасіў юнак дзяўчыну-русалку на танцы. Яна прыйшла ў туф-

лях з ракавін. Туфлі выклікалі агульную ўвагу, да яе пачалі прыглядацца. Нехта заўважыў, што ў дзяўчыны незвычайнае адзенне, убачылі водараслі ў валасах.

— Русалка!— крыкнуў нехта. І тут здарылася нечаканае — дзяўчына скакнула цераз дзверы і знікла, упаўшы ў возера.

— Утапілася, утапілася!— закрычалі навокал. Кінуліся ў ваду хлопцы ратаваць яе. Прыехалі на лодках рыбакі з сеткамі, пачалі шукаць тапельніцу. Але дзе хто калі знаходзіў русалку ў возеры?

Адны кажуць, што ўтапілася дзяўчына, другія — што русалка прыходзіла на танцы.

Аднойчы, туманнай ноччу, юнак шукаў і клікаў па нарачанскіх берагах русалку. Яна падплыла да берага і сказала, што з вады ёй цяпер ніколі не выйсці, а калі ён яе кахае, няхай ідзе назаўсёды ў возера. Пачала русалка юнака пад ваду клікаць. Кінуўся юнак да русалкі ў возера а яна далей адплыла, пад месецам мыецца, прыхарашываецца, глядзіцца ў люстэрка вады. Так некалькі гадзін юнак па вадзе за русалкай ганяўся, а як зусім стаміўся, паплыў да берага; не хацелася яму тапіцца. А русалка побач плыве, сваволіць, у вочы зазірае.

— Не ідзі ад мяне,— просіць юнака. Але ён штурхнуў русалку, падплыў да берага, яе падарунак — каралі — у возера кінуў. Возера ў тую хвіліну ўдарыла хвалямі юнака, ён у непрытомнасці на бераг звалiўся. І тут на возеры бура пачалася. А русалка знікла пад вадой. Закрычала тужліва і назаўсёды знікла.

Вось з таго часу некаторыя шчасліўцы знаходзяць на Нарачы бурштын. Людзі знаходзяць на Нарачы жоўтыя кавалачкі бурштыну, якія заўсёды цёплыя, а гэта і ёсць слёзы русалкі, якая плачыць па-сённяшні дзень аб сваім каханым.

399. Завод

Завод быў у 1703 гаду. Быў дом, а на яго коміне заслонка. Лічбы «1703», якія знаходзіліся на заслонцы, сведчаць аб тым, што ўжо ў гэтым годзе завод існаваў.

Людзі строілі завод уручную. Збіралі на лугу руду, на баржах прывозілі і плавілі тут у доменных печах. Завод строіў нейкі ўкраінскі князь. А яго хрэснік быў надзірацелем тут.

Потым князь напісаў пісьмо свайму хрэсніку, што завод не дае даходу... Трубы, машыны павывазілі ў Днепрапятроўск, а сцены завода засталіся. Сцены прадавалі вёсцы Лаўніцы, але не купіла яна. А потым нехта прыехаў і ўзяў пад арэнду ўсё: і землі, і луг вакол будынка, і сам будынак.

Рабочыя, якія працавалі на заводзе, жылі ў зямлянках. Зямлянкі рабілі ў гары. На паліва рэзалі навакольны лес. Зараз вырас ужо новы...

400. Сабачая горка

Даўно гэта было, яшчэ як пан Радзівіл жыў. Вельмі ж гэты пан любіў сабакаў, з імі ён ездзіў на ахоту. І от калі ён ехаў, то тут у нас у вёсцы прыпыняўся ў сваім палацы.

Аднойчы ехаў ён ужо з ахоты і захварэў у яго ў дарозе сабака любімы. І сказаў тады пан: «Калі гэты сабака здохне, то заб'еш усіх астатніх і закапаеш». Вось і закапалі іх на гэтым месцы, дзе цяпер горка тая стаіць. І пачалі людзі называць яе «сабачай».

401. Панна

Ехала аднойчы пані на конях, а гэта было недалёка ад вузкакалейкі, што зараз ідзе з Праўдзінска ў Рудзенск. І вось ехала калісьці даўно пані па гэтым месцы, і здарылася так, што насмерць разбілася. І ў памяць па ёй насыпалі на тым месцы бальшы курган, на якім паставілі вялікую вежу. і з тых часоў тое месца называюць «Панна».

402. Сямернікі

А ведаеце, адкуль вёска Сямернікі называецца? У маткі было сем сыноў. І назвала яна іх пад адно імя. Вот адсюль і вёска так называецца — Сямернікі.

403. Івянец

Было гэта многа год назад. Яшчэ дзяды нам гэта расказвалі. Ехала чэраз гэта месца знатная нявеста са знатным жаніхом да вянца. І нада было ім раку пераехаць. Заехалі яны на высокі мост. Мост праламаўся пад лашадзьмі. Далей ехаць стала немагчыма.

Нявеста сказала: «Ну, вось наш і вянец». Так узнікла назва нашага паселішча Івянец.

404. Колкі

Адкуль пашла назва вёскі Колкі? Даўней вёска была размешчана за кіламетр ад ракі Морач і называлася Любашоў. У час адной з войнаў вёску поўнасцю спалілі, а ўсіх жыхароў перабілі і закапалі на беразе ракі, дзе і да сённяшніх дзён захаваліся вялікія курганы.

Аднаму ж чалавеку ўдалося выратавацца. Пасля гэты чалавек перасяліўся бліжэй да вады і пабудаваў сабе зямлянку. Ён сярод лесу і балота быў адзін, як кол. Вось ад гэтага слова «кол» і пайшла назва вёскі «Колкі».

405. Какорычы

Адкуль узялася назва вёскі Какорычы?

Некалі пан прывёз сюды людзей перасяленцаў. А ў гэтым месцы было шмат карчоў. Людзі іх карчавалі, і адсюль пашла гэта назва.

406. Прозвішчы

У вёсцы Языль ёсць такія прозвішчы, якія нельга знайсці больш нідзе ў Беларусі. Напрыклад: Міхаленя, Шпіленя, Раманеня, Капачэня, Яшчэня, Пучэня і г. д. Ёсць у Язылі прозвішчы такія, якія звязаны з жывёламі або якімі рэчамі: Воранаў, Каровін, Дубік.

Прозвішчы языльцаў маюць старажытнае паходжанне і адносяцца да часу прыгоннага права.

Многія жыхары не мелі прозвішч, і для гэтага, верагодна, у вёску прыслалі пісара-гумарыста аднекуль з воласці. Магчыма, напаілі яго гарэлкай і той пачаў раздаваць прозвішчы жыхарам Языля. А пасля таго, як прыехаў на месца службы, магчыма, доўга рагатаў, як рагочуць запарожцы, якія пішуць ліст турэцкаму султану.

Я ўпэўнены, што з прозвішчамі здарылася іменна так.

407. Крычын

Вёска наша, Крычын, так завецца таму, што спачатку гэта хутар быў у лесе, і, кажуць, часта воўк рваў то жанчыну, то чалавека (мужчыну), яны вельмі крычалі ад болю і жаху.

408. Назвы

У нас кажуць: «Як едзеш са Старых Дарог да Слуцка, дык спачатку солана, потым горка, а ўжо потым добранька».

Ад назваў вёсак: Солан, Горкі, Добрынка.

409. Верхуціна

Назва вёскі Верхуціна тлумачыцца так: у 1902 гаду рабілі чыгунку, але да канца яе не зрабілі, а апошні прыпынак па схеме быў у самым версе, адсюль і бярэ пачатак назва. Вярхушка чыгункі — адсюль і Верхуціна.

410. Галавачы, Галоўні

Галавачы і Галоўні — вёскі, якія знаходзяцца бліз вёскі Магільна, зараз Нёман, Уздзенскага раёна. Назва гэтых вёсак звязана з бітвай пад Магільна. Так у Касцяшы звозілі і захаранялі косці, а ў Галоўні і Галавачы — адсечаныя галовы.

411. Чэрнеўка

Калісьці, да рэвалюцыі, гэту вёску насялялі яўрэі. Асноўным заняткам быў той, што яны займаліся фарбаваннем матэрыі. Ад слова «чарніць», красіць, фарбаваць. Вот адсюль і паходзіць назва вёскі Чэрнеўка, ад слова «чорны», «чарніць».

412. Лаўніца

Вёска Лаўніца паходзіць ад слова «лаўнікі». Лаўнікі — гэта людзі, якія займаліся сплавам лесу.

Калісьці землі гэтай вёскі былі вельмі бедныя, неўрадлівыя, і сяляне пражыць на гэтай зямлі не маглі, таму большасць жыхароў вёскі вымушана была займацца лесасплавам. Высякалі лес, вязалі яго ў плыты і ганялі па рацэ Бобр да Бярэзіны, а потым з Бярэзіны аж да

Бабруйска. Вот адсюль і паходзіць вёска Лаўніца. Лаўнікі — значыць плытагоны.

413. Чараўкі

Раней вёска называлася Чараўнікі, таму што ў ёй жыло многа чараўнікоў. Адзін з іх быў пан, які ажаніўся на дзяўчыне з бедных. Пан ператвараў яе ў сучку і хадзіў з ёй на паляванне.

Аднойчы прыбегла дзяўчына-сучка дадому, а маці пякла бліны. Прыгнула сучка на прыпечак, схапіла блін, а маці яе па спіне чапялой.

— За што ж, мамка, б'еш мяне? Я ж вельмі есці хацела,— сказала дачка і пабегла.

Сыны, браты яе, адпомсцілі за сястру і спалілі чароўную кнігу.

З таго часу слова «чараўнік» стала агідным, таму вёску перайначылі ў Чараўкі.

414. Раманаўка

Старыя людзі казалі, што назва нашай вёскі вельмі даўняя. Пры царыцы Кацярыне II першым на гэтым месцы пачаў будавацца чалавек па прозвішчу Раман. У чэсць заснавальніка рэчка была названа Раманаўкай. І вёсцы далі такую ж назву.

415. Гудзялі

Яшчэ даўным-даўно гаварылі людзі, што недалёка ад нашай вёскі стаяла Царква і за адну ноч прапала. Цяпер на тым месцы, калі ідзеш ці кінеш камень, то звініць зямля. Таму нашу вёску і назвалі Гудзялі.

416. Каўшова

Вёска была заснавана да вайны, яшчэ пры панах. Раней там быў лес. Мясцовы пан прадаваў людзям кавалкамі лес, і людзі пачыналі будавацца. І вёска ўзнікла сярод лесу. Яна знаходзіцца як бы ў каўшы і таму называецца Каўшова.

417. Пра смерць

Бог сказаў людзям, што я ўзыду на неба і вы нічаво не будзеце знаць, кагда будзеце ўміраць. Тады выслаў Бог смерць.

Прыйдзе смерць да людзей — той і памрэ. Началі людзі клясці смерць, што без усякай прычыны прыйдзе і забярэ.

Тады Бог сказаў: «Я вышлю прычыну». І вот цяпер ёсць прычына: ці прастыў, ці зламаў што.

418. Пра бусла

Бог сабраў гэта ўсё, даў жанчыне і сказаў: «Занясі на крыжавыя дарогі і там усё гэта палажы, толькі не развёртвай, не глядзі, што тамака».

А той жэншчыне інцярэсна паглядзець, што ён там навязаў. А яна як развязала, дык яны ўсе паразбягаліся — гэтыя мошкі, лягушкі, гадзюкі ўсякія, гэтыя яшчуркі, што былі звязаны, і паляцелі ўсе.

Так ён ёй сказаў: «За тое, што ты не паслухала мяне...» — і ператварыў яе ў бусла. Вот ён ходзіць, як жэншчына, у чорнай спадніцы, а тут кофта белая. Ходзіць і збірае, пакуль усё гэтае не пазбірае.

419. Самалёт

Ой, а самалёт як першы раз убачылі! Божа, а ня ведалі ж, што гэта. Ідзёт, равёт высока-высока! Картошку якраз убіралі — ляціць машына. Ня ведаю, куды дзявацца? А брат у хлеў схаваўся. Выгляне, дзе самалёт, і зноў схаваецца. Зараз смешна, а тады ж дурнымі бязменамі жылі.

420. У панах

Зямля была едзіналічная. Сваё хватаеш, хватаеш, а тады ляціш зарабіць, каб на сукеначку якую. А есці шляхта работнікам добра давала, дзе я рабіла, у сямі кіламетрах ад Мінска.

Я сільна сцяслівая была, у бяседзе не магла есці. То паны ўжо бачаць, што я нічога ня ем, так паклікаюць, каб я адна паела. А работала я, не хвастаюся, вельмі добра. Така была ўжо работніца! Яшчэ жнейкі толькі пачнуць жаць, а я ўжо далёка абагнала і іду дальша. Так пан бачыць, што я вельмі добра работаю, так яшчэ к заробку дзве капейкі прыбавіў.

421. Паўдурак

А жыў у нас у Ракаве адзін чалавек. Звалі яго ніхто не ведае як. А называлі ўсе Паўдуркам. Ну, Паўдурак і Паўдурак. А за што яго так звалі? Бо меў карову, якую ён прывучыў да хамута і запрагаў у воз, у сані. І араў на сваёй карове. Казалі людзі, што яна яшчэ і даілася. Але дзеля малака ў яго была другая карова.

Але ішоў раз Паўдурак цераз кладку. А была ўжо восень, марозік, слізка, то ён упаў і патануў. Так ніхто яго і не зразумеў за ўсё жыццё. А мне яго шкада. Ніякі ён не дурны. Дзівак проста.

422. Паляўнічы

Даўно гэта было, яшчэ за Польшчай. Жыў у Казаках, недалёка ад нас, адзін чалавек. Раеўскі зваўся. То быў ён з'ядлы паляўнічы. А сам з мужыкоў, то зброі трымаць яму няможна было. Але досыць, што меў драбавік, хадзіў на паляванне.

Пайшоў ён раз у лес. Узімку гэта было. Ажно бачыць: ідзе чарада ваўкоў. Наперадзе матка ішла, а ззаду сямёра меншых ваўчкоў. А Раеўскі на елцы сядзеў і цікаваў. Ён знаў, што калі па матцы пацэліць, то ўсе астатнія пасядуць кругом дзерава і будуць сядзець, пакуль ён не злезе ці не зваліцца ад холаду. То ён стрэліў па апошняму воўку і ўлучыў. Ваўчок той упаў, а астатнія паўцікалі.

Злез ён з елкі і пайшоў да воўка. Той ляжыць сівы, вялікі, а з боку кроў цвірчыць патроху, снег тане. Убачыў Раеўскі, што воўк вялікі, трэба санкі, каб прывезці. От ён і пайшоў у Казакі па каня. Пакуль туды, сюды, прыйшоў — няма воўка. Толькі снег прытаптаны і смужка чырвоная па снезе цягнецца. Пайшоў чалавек па слядох. Ідзе, ідзе — няма воўка. Нарэшце знайшоў. Той за гэты час кіламетры з тры прайшоў, а там бухнуўся ў снег, ісці ўжо ня можа. Але дыхае яшчэ. То Раеўскі прыстрэліў яго і неяк там зацягнуў на санкі.

Пад'язджае Раеўскі да Казакоў, а сабакі ўчулі воўка і такі брэх паднялі, такі гвалт! Пакуль ён да свайго двара даехаў (а жыў ён на другім канцы вёскі), то за санкамі ўжо цэлая гайня сабак ляцела, усё роўна як за сучкай вясною. На гэткі страшны брэх сабачы сталі людзі з хат вылазіць, глядзець, хто ды што. От пазапальвалі: хто лучыну, хто лямпу газавую, хто ліхтара — па ўсім сяле агеньчыкі, як на каляды.

А Раеўскі вялікай карысці з таго воўка не меў, бо пакуль вёз, то сабакі, як ён іх ні адганяў, пару разоў паспелі ўхапіць і шматануць воўка, то скуру папсавалі. Але ж затое слава якая! Гэта, пэўна ж, важней за скуру...

423. Чараўніца

Раней жыла ў Язылі бабуля. Была яна сляпая, хадзіла з палачкай. Расказваюць, што яна магла варажыць, нейк чароўна раскладваць травы, ведала замовы, людзі прыходзілі да яе за дапамогай.

Але аднойчы ў аднаго мужыка карова не стала даваць малака. І гаспадар вырашыў даведацца, у чым справа. Ноччу ён схаваўся недзе і бачыць: ідзе голая жанчына (тая чараўніца) і нібы нешта шукае. Потым яна ператварылася ў вялікую жабу, якая забралася да каровы і выпіла ўсё малако. Дык мужчына падбег у хлеў і выкалаў той жабе вочы. Раніцай людзі заўважылі, што жанчына-знахарка стала сляпая і крывая. Яны перасталі да яе заходзіць. Так яна і пражыла свой век у адзіноце. І паміралa зусім адна, доўга паміралa, цяжка. Пакуль не прарубілі столю.

424. Галубы

Жылі людзі Галубы. Сярод іх былі мужык з жонкай. І вельмі любілі яны піць гарэлку. Адзін раз сабраліся і пайшлі ў госці, узялі разам з сабою сваё маленькае дзіцятка. Моцна, моцна напіліся, позна, позна вярталіся дадому. Але вельмі доўгі шлях п'яніц дахаты, і вельмі многа гісторый з імі здараецца. Так і тут. Ужо дзеці пачалі выглядаць на дарогу, дзе дзеліся іх бацькі. Але нікога не было відаць. Тады старэйшы сын учуў голас маленькага дзіцяці. І пайшлі яны на голас. Прыйшоўшы, дзеці ўбачылі такое дзіва: чэрці разулі таго Голуба і гавораць: «Лезьце, дзядзечка, на печ, лезьце». А ў кустах вельмі голасна крычала дзіця.

425. Бабулі

Раней былі тут чараўнікі і зараз ёсць. Вось, жыла тут жанчына, брала некалькі разоў у мяне клубніку, ды і запыталася: як я сябе

адчуваю. Я і сказала, што жывот баліць. Яна нешта пашаптала, і нічога, больш не балела.

Ці каўтун. Кажуць, што калі цяжка працаваць і есці толькі бульбу — будзе каўтун. Тады дапамагаюць такія бабкі. Яны шэпчуць нешта, потым кажуць: «Праз год прыйдзеш да мяне, сам не страгіся». Праз год гэты чалавек заходзіў да яе, і чараўніца састрагала гэтую «шапку» валасоў. Але магло быць так, што каўтун зноў з'яўляўся. Тады яна зноў шаптала і ціхенька-ціхенька састрагала.

426. Сваты

Не ведаю, праўда гэта ці не, але мне расказваў мой бацька, а я расказваю вам.

Сабраўся адзін хлопец у сваты ў далёкую вёску. Маці дае яму сала кавалак, хлеба і наказвае: «Глядзі ж, сын, за сталом многа не еш, а то скажуць, нейкі абжора». Сабраўся ён з дзядзькамі і паехаў.

На дварэ зіма, мяцеліца. Прыехалі. Іх хочуць адразу ж за стол. Але хлопец кажа: «Я зараз прыйду». Выйшаў ён у сенцы і давай сала з хлебам есці. Чакаюць, няма. Выйшла маці дзеўкі паглядзець, дзе ж ён. Стаіць у сенцах і, не бачучы хлапца, кажа: «Але ж і прэ, ну і прэ»,— думаючы пра мяцеліцу.

А хлопец ёй: «Пру сваё, не тваё».

427. Насаліў

Служыў у пана Дажынскага адзін наш чалавек поварам. І была ў пана вялікая заля, досыць што фурманкі ўвесь пляц вясковы занялі. Ну і вечарам госці банкятуюць, а мужыкі нашы з двара праз дзверы на кухню глядзяць, цікава ўбачыць, што паны ядуць. А там усяго поўна наварана, насмажана, і афіцыянты з талеркамі і міскамі лётаюць, новыя стравы носяць. Аж бабы не ўпраўляюцца пасуду мыць.

Тут пан нейкую страву патрабуе, а місы няма чыстай. Тады той чалавек, што поварам быў, узяў нямытую, паклікаў сабаку, што пры парозе ляжаў, і яго хвастом раз-два выцер місу ды мужыкам кажа: «Хоць гэтак пану насалю». Ды бух у тую місу мяса нейкага, а афіцыянты лётам панеслі ў залю.

428. Хабар

Мела баба нейкі інтарэс у воласці. Ну і каб справа пайшла лягчэй, панесла яна валасному пісару груш-цукровак, якраз у яе паспелі. Ён кажа бабе: «Мо, не трэба, хай бы лепей твае дзеткі паласаваліся». А баба: «Нічога, паночку, ешце, я дзецям скажу, што свіння паела».

429. Пані

Сустрэліся неяк чалавек і жанчына. Дзецьмі яны разам раслі на вёсцы, а патом яна выйшла замуж у горад, стала такая гжэчная пані, што аж далей няма куды. Разгаварыліся, ды ён і пытае:

— Слухай, а сколькі гэта табе год?

— А столькі, на сколькі я выглядаю.
— Ты гэтыя жарты кінь, людзі гэтулькі не жывуць.

430. Сябры

Сустрэліся неяк двое мужыкоў ды пайшлі ў карчму. Пасядзелі добра, ды адзін і кажа:
— Давай яшчэ вып'ем! Хто знае, калі ўбачымся?
— А другі адказвае:
— Я цябе ўжо і так не бачу.

431. Пан

Жыў у нас у Пярэжарах пан Дажынскі. І меў ён у судзе нейкую справу. Ажно тут прыслаў адвакат тэлеграму, дзе той піша: «Праўда перамагла». А пан і кажа сам сабе: «Во, і не спадзяваўся саўсім, што прайграю».

432. Амерыка

Прыехаў селянін у Амерыку. Прыйшоў у магазін, а там вісела табліч-ка, што ў магазіне ўсё ёсць. А затым спыталі, калі хто скажа, чаго няма ў магазіне, то таму дадуць сорак долараў. Селянін падумаў і сказаў: «Лапцей няма».

433. Аддзячыў

Заехаў адзін чалавек да другога пераначаваць. Той яго есці не пазваў. Чалавек з'еў моркаў на агародзе. Гаспадар паглядзеў назаўтра і кажа: «Паеў моркаўку, паеж і націнку».

Цераз год, а можа цераз два паехаў гэты чалавек, і прыйшлося яму да таго заехаць, катораму ён націнку паесці загадваў, але ён яго не пазнаў. А той яго пазнаў, зарэзаў барана, наварыў мяса і частуе. З'еў госць барана, гаспадар і кажа: «Я ў цябе моркаўку з'еў, ты сказаў, з'еш і націнку, а ў мяне ты з'еў мяса, бяры еш і аўчынку».

ПАЗААБРАДАВАЯ ЛІРЫКА

БАЛАДЫ

Балады на Міншчыне — жывая ў народным побыце, разнастайная і развітая ў сюжэтах з'ява, якая мае ў сваёй мастацкай структуры напластаванні найстаражытных эпох. Тут ёсць анімістычныя пераўтварэнні чалавека ў дрэва, птушку, выпрабаванні чалавека загадкамі, матрыярхальнае кроўнае сваяцтва, антрапаморфныя ўяўленні, персаніфікацыя прыродных стыхій. Многія балады захавалі прымеркаванасць да абрадавых цыклаў веснавых, купальскіх і пятроўскіх, а таксама жніўных песень, у нетрах якіх яны ўзніклі і развіліся. Ёсць сярод іх трагедыйныя сюжэты, якія блізкія да тэм любоўных, сямейных, карагодных, казацкіх і салдацкіх песень. Але балады на больш познім этапе, чым названыя песенныя цыклы, у сюжэтах, мелодыі і мастацкіх дэталях развіліся ў самастойны цыкл. Аснову яго склалі драматычныя бытавыя канфлікты з трагічнай развязкай сюжэта. Яны адлюстраваны ў напеве на багата арнаментаванай мелодыцы, у пераважнай большасці многагалосай, хоць незразумела, чаму часта не толькі не трагедыйнай, але і танцавальна-гарэзлівай.

На Міншчыне больш чым дзе некаторыя сюжэты захавалі сувязь з рэаліямі тых ці іншых гістарычных падзей, што характэрна для большасці рускіх балад. Беларускія ж балады размяжоўваюцца па сувязі з ужо названымі старажытнымі вераваннямі. Сярод вядомых на Беларусі звыш 150 сюжэтаў у цэнтральнай частцы зафіксавана больш палавіны ўсіх пяці разнавіднасцей: з міфалагічнымі ўяўленнямі, казачна-легендарныя, балады-загадкі, карагодна-гульнёвыя і навелістычныя. Самы папулярны сюжэт сярод першых — «дачка-птушка», які зафіксаваны на ўсёй тэрыторыі ў дзесятках самых разнастайных варыянтаў.

Не менш папулярны на Міншчыне, як і па ўсёй Беларусі, сюжэт, у якім чуецца ўладарная сіла старшай жанчыны — роданачальніцы перыяду матрыярхату, дзе магіяй слова свекрыві нявестка ператвараецца ў каліну, таполю... Сучасныя запісы варыянтаў гэтай балады пры іх вялікай колькасці ўнікальныя тым, што кожны з іх мае свае адметнасці.

Арыгінальны сюжэт «Ой, ляцелі жураўлі» дзе ў «травіцу брат-сястрыца» ператвараюцца дзеці, бацька якіх з першай жонкай «...дзеці маў, А з другою гадаваў, А з трэцёю разганяў». Не менш унікальныя запісы з водгукамі далёкіх гістарычных часоў: «Жонка турка», «Сын паехаў на вайну» і інш.

Самымі папулярнымі на Міншчыне ў наш час сталі больш рэалістычныя

па зместу навелістычныя балады, але не ў выглядзе так званага жорсткага або сентыментальнага раманса, а ў дастаткова драматычных жыццёвых сюжэтах: «Пара галубкоў», «Сыны-карабелы», «Няшлюбнае дзіця», «Муж-разбойнік». Арыгінальныя балады «Муж жонку прапіў», яе варыянты («Рэчачка крынічная», «Ой, адзін казак вёў каня паіць») вядомыя ў запісах з Гомельшчыны як «Із-пад каменя, із-пад белага».

У трагедыйным гучанні балады «Жонка не дужа любіла мужа, Узяла вострый меч і зарэзала», у постдыялогу яе з'яўляюцца гумарыстычныя ноткі:

— Ой, гора-бяда з ліхім мужам жыць,
Яшчэ горшае гора, як і таго няма.

Відаць, упершыню зафіксаваны сюжэт «Невяроўшчына», дзе муж забівае няверную жонку і вязе цела да сваёй і жончынай маці. І нарэшце, найбольш папулярны сюжэт сярод сучасных навелістычных балад — «Сын праганяе маці».

Такім чынам, балады на Міншчыне — папулярныя і любімыя ў народзе песні, якія больш, чым у іншых мясцінах, разнастайныя па сюжэтах. Аздобленыя выдатна распрацаванымі мелодыямі, у вялікай колькасці варыянтаў, яны гучаць песенным гімнам дабру, справядлівасці, чалавечнасці, адмаўляюць зло, жорсткасць, бесчалавечнасць.

434. У лузе каліначка рана зацвіла...



У лузе каліначка рана зацвіла,
Парадзіла мамачка, долі не дала.

І долечкі ні даўшы, замуж аддала.
Не вялела мамачка ў госцікі хадзіць.

Не вялела мамачка ў госцікі хадзіць,
А вялела мамачка свякроўцы гадзіць.

Гадзіла я гадочык, гадзіла я два,
А на трэцім гадочку саскучылася.

А на трэцім гадочку засмуцілася,
Да мамачкі ў госцікі захацелася.

Абвярнуся, малада, шэрай зязюляй
Да й паляту я, малада, к мамачцы ў госці.

Ды сяду я, малада, ў вішнёвым саду,—
Ці ня выйдзе мамачка рана па ваду?

От ня вышла мамачка, вышла сястрыца,
Па дварэ пахадзіла і ў сенцы пашла.

Уставайце, брацяткі, мае сакалы,
Прыляцела птушачка з чужой стараны.

Адзін кажа брацятка: «Стрэльбачкай заб'ю»,
Другі кажа брацятка: «Я й так улаўлю».

Мне, моладзе, жаль стала, я й паляцела,
Прыхінулася, малада, к белай бярозе.

Прыхінулася, малада, к белай бярозе,
Не ведае мамачка, што я ў дарозе.

Лугамі ляцела я, вадзіцу піла,
Бо я ў сваей мамачкі ў гасцях не была.

435. Да й у полю-полюшку каліна цвіла...



Да й у полю-полюшку каліна цвіла, эх!**
Ў тую мяне порушку матка радзіла.

Да й радзіўшы мэне, да й узрасціла,
А ўзрасціўшы мяне, замуж аддала.

Да й аддаўшы замуж, да й прыказала:
— Не хадзі, дачухначка, часта у госці.

Не пашла гадочак, не пашла другі,
На трэці гадочак захмурнілася.

На трэці гадочак захмурнілася,
Мне к матачца ў госцейкі захацелася.

Да й пашла ж бы пешшу — пешшу не ўзайду,
Папрасіла б каня — каня не дадуць.

Да й кінуся-рынуся сівой зязюляй,
Да й палячу-палячу к матца й у госці.

Як к матачца ляцела, мора сушыла,
Ад матачкі ляцела, мора тапіла.

Да лячу я полюшка, лячу другоя,
На трэцяя полюшка узлятаючы.

На трэцяя полюшка узлятаючы,
На матчын садочак паглядаючы.

Да села я, пала, закукавала:
— Што ж там за слайдзюлячка й у нашум саду?

Калі сіва зяўзюлячка, ляці ў шыры бор!
Калі наша дачухначка, ляці к нам за стол!

** Першы радок кожнай страфы заканчваецца словам «эх!».

436. Шумлівая дубровушка, шумлівая...



Шумлівая дубровушка, шумлівая,
Была ў мяне свякровушка сварлівая.

Сварылася яна на мяне як дзень, дак ноч:
— Ідзі, мая да нявехначка, ат мяне ўпроч!

Не садзіся ў цёмнум лузе калінаю,
А садзіся ў чыстум полі арабінаю.

Будзе ехаць мой сыночак с Украіны
Да убачыць арабіначку за тры мілі.

Да прыйшоў ён к арабіначцы, стаў дзівіцца,
А як прыйшоў дадоменьку, стаў хваліцца.

— Не хваліся, мой сыночак, не хваліся,
А бяры ж ты, мой сыночак, сякірачку.

Да бяры ж ты, мой сыночак, сякірачку
Да парубай жа ты ету арабіначку!

Ўзяў сякіру, пайшоў рубаць арабіначку,
Секануў жа ён першы раз — цела бела.

Секануў жа ён другі раз — кроў канула,
Секануў ён у трэці раз — азвалася:

— Не сячыся, мой міленькі, не сячыся,
А ідзі ж ты дадоменьку, ажаніся.

А табе ж, малодзенькаму, жонка будзя,
А маім жа дробным дзеткам мамкі ня будзя.

437. Пэклівая крапівушка, пэклівая...



Пэклівая крапівушка, пэклівая,
Сварлівая да свякровушка, сварлівая.

Сварылася з нявехнаю як дзень, так ноч:
— Ідзі, ідзі, нявехначка, ад мяне ўпроч.

Да не станавіся ў лузе калінаю,
Стань сабе ў чыстым полі рабінаю.

Будзе ехаць мой сыночак з Украіны,
Да й угледзіць рабінушку за тры мілі.

Прыехаў мой сыночак да й гаворыць:
— Матачка, мая мамка, увесь свет прайшоў,

Матачка, мая мамка, увесь свет прайшоў,
То такое рабінушкі нідзе не нашоў.

— Да вазьмі ж ты, мой сыночак, тапарочак,
Ды парубай рабінушцы каранёчак.

Секануў жа ён разочак — цело бело,
Секануў другі разочак — кроў канула,

Секануў ён трэйці разочак — прамовіла:
— Да чаму ж ты, мой міленькі, так рубаеш?

Будзе табе, мой міленькі, жонка звонка,
А маім жа малым дзеткам доля горка.

438. Свякроў нявехну біла-карала...



Свякроў нявехну біла-карала,
Біла-карала, ўпроч выпраўляла:

— Йдзі, нявехна, ўпроч на ўсю цёмну ноч,
Стань сабе ў полі хоць калінаю,

Стань сабе ў полі хоць калінаю,
Хоць калінаю, хоць чырвонаю.

Будзя йці сыну, будзя дзівіцца:
Прыдзя дадому, будзя хваліцца:

— Ой, мама, мама, увесь свет прайшоў,
Увесь свет прайшоў і назад прыйшоў.

Нідзе такога дзіва не відаў —
На нашым полі каліна стаіць.

На нашым полі каліна стаіць,
Каліна стаіць, ўся чырвоная.

На ёй ягадкі без сонца спеюць,
На ёй лісцяйка бяз ветру шуміць.

На ёй лісцяйка бяз ветру шуміць,
На ёй расіца без дажджу стаіць.

Секануў я раз — цела белая,
Секануў я два — кроў чырвоная,

Секануў я тры — аказалася:
— Не сячы меня — а жана твая.

Эта ягадкі — дзетачкі мае,
Эта лісцяйка — валаскі мае.

Эта лісцяйка — валаскі мае,
Эта расіца — слёзачкі мае.

Студню не капаўшы — вады не піці,
Матку слухаўшы — жонку не меці.

439. Быў у бацькі адзін сын...



Быў у бацькі адзін сын**,
І той бацькі не слухаў.

І той бацькі не слухаў
Да на вайну паехаў.

Там яму Бог не памог,
Яго конік гарой стаў.

Яго конік гарой стаў,
А сядзелца — камянем.

А сядзелца — камянем,
А сам малады яварам.

Праз той явар сцежачка,
Тудой ішла дзевачка.

Тудой ішла дзевачка,
Гаварыла з яварам:

— Ой, явару, явару,
Цяпер з табой гавару.

Ой, зялёны ты, харош,
Прыйдзе люты да й мароз.

Тваё вецце памерзнець,
А лісточык ападзець.

А лісточык ападзець,
Ў ціхі Дунай уцячэць.

— Ой, дзевачка, дзевачка,
Цяпер жа ты хароша.

Цяпер жа ты хароша,
Як у сваей мамачкі.

Будзе табе ліхі муж,
Тваю коску надатрэць.

Тваю коску надатрэць,
Твайго ліца надаб'ець.

— Бадай явар не даждаў,
Як жа ты мне звестку даў!

Ёсць у мяне два браткі,
Да абодва мужыкі.

Скажу явар сеч-рубаць,
На скрыпачцы пазгібаць.

Скрыпачкі будуць іграць,
А я, молада, гуляць.

— Ой, дзевачка, дзевачка,
Ты не праўду гаворыш.

Скрыпачкі будуць іграць,
А ты, молада,— плакаць,

Ад мамачкі ідучы,
Да свякроўкі ступлячы.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

440. Паехаў Марусь, Марусь на вайну...



Паехаў Марусь, Марусь на вайну,
Пакінуў дома Марусю й адну.

А сам паехаў вайну ваяваць,
Марусю аставіў гора гараваць.

Заехаў к цешчы, ў цешчы начаваў,
Ў цешчы начаваў, дзіўны сон сасніў.

— Устань, цешча, устань, мой сон разгадай,
Цешча устала, сон разгадала:

— У цябе, мой Марусь, дома навіна,
Твая Маруся сына радзіла.

Твая Маруся й сына радзіла,
Сына радзіла — сама не жыва.

— Дзетачкі мае наймілейшыя,
Закладайце коні найбарздзейшыя.

Ехаў я, ехаў, мой конь не бяжыць,
А ўехаў я ў сад, мой сад не шуміць.

Я ўехаў на двор — мой двор не вясёл,
Я да святліцы — дзеткі ў цямніцы.

Я да каморы — жана не жыва,
Ручкі злажыла, вочкі зжмурыла.

Ручачкі мае, чаго злажыліся,
Ці ж мы з табою не любіліся?

441. Сын у матулі ночку начаваў...



Сын у матулі ночку начаваў,
Ночку начаваў, дзіўны сон відзяў**.

Каму ні сказаў, ніхто не згадаў,
Матуля ўстала, сон разабрала:

— Ох, сынку, сынку, няшчасце тваё,
Няшчасце тваё, нядоля твая.

Жана маладая сына радзіла,
Сына радзіла, сама нежыва.

Еду я праз сад, мой сад не зялён,
Мой сад не зялён, сакол не вясёл.

Еду праз лес, мой лес не шуміць,
Мой лес не шуміць, сакол не звініць.

Прыйшоў я ў сені: цяслоў цяслуюць,
Цяслоў цяслуюць, труну гатуюць.

Прыйшоў я ў хатку — там мамкі-нянькі,
Там мамкі-нянькі дзіця калышаць.

Краваць заслана, Кася прыбрана,
А ў галоўцы свечачкі гараць.

А ў галоўцы свечачкі гараць,
А ў ножачках дзетачкі плачаць.

Свечачкі гараць, прыпалаючы,
Дзетачкі плачаць, прымаўляючы.

— Сціхнеце, дзетачкі, зрублю хатачку,
Зрублю хатачку, вазьму матачку.

— Табе, татачка, нова хатачка,
А нам, татачка, чужа матачка.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

442. Да сын у мамкі ночку начаваў...



Да сын у мамкі ночку начаваў,
Ночку начаваў, сон дзіўны відзяў**.

— Мамачка, устань, ды сон разгадай:
З-пад правай ручкі сакол вылятаў,
А з-пад левай саколачка.

Мамачка ўстала, сон разгадала:
— Ой, сынку, сынку, што наймілейшы,
Запрагай каня, што найскарэйшы.

Ды ў тваім доме бяда случылася,
Ды твая жана сына радзіла,
Сына радзіла, ды сама няжыва.

Ехаў я лесам, мой лес ні шуміць,
Ехаў я полям, мой конь ні бяжыць.

Ехаў я садам, мой сад не цвеціць,
Прыехаў на двор, мой двор невясёл.

Мой двор невясёл, мой конік зарзаў,
Мой конік зарзаў, ўсю праўду сказаў.

Прыйшоў я ў сені — цяслы цяслуюць,
Цяслы цяслуюць, труну гатуюць.

Прыйшоў я ў хату — ложак засланы,
Ложак засланы, жана прыбрана.

Ў яе ў галоўцы свечачкі гараць,
Свечачкі гараць нястухаючы.

Свечачкі гараць нястухаючы,
Дзетачкі плачуць, прымаўляючы.

Прыйшоў ў камору — калыска вісіць,
А у тэй калысцы дзіцятка ляжыць.

— Ой, жана, жана, ці жаніцца мне?
— Жаніся, мілы, дык жонка будзя,
Маім жа дзеткам мамкі ня будзя!

Ты будзіш, мілы, за сталом сядзець,
Мае дзетачкі на палу бразджэць.

Ты будзеш, мілы, мёд-віно піці,
А мае дзеткі слёзачкі ліці.

** Строфіка ў песні пераменная; пры двухрадкоўі паўтараецца другі радок.

443. Сын у матулі ночку начаваў...



Сын у матулі ночку начаваў**,
Ночку начаваў, страшны сон сасніў.
Сон не разгадаў, матулі сказаў.
Матулька ўстала, сон разгадала:
— Ў тваім дамочку бедачка стала,
Твая жонка сына радзіла,
Сына радзіла, сама няжыва.
Вы служкі ж мае найвярнейшыя,
Залосьця каня найскарэйшага.
Сяду, паеду, хоць сёрад начы,
Ці ні застану жану жывучы.
Ехаў я полям — поля ні звініць.
Ехаў я садам —мой сад ні цвіціць.
Прыехаў — падвор'я цясным цясноё,
Маей жоначца труну гатуюць.
Ўхаджу я ў сені — ўсе служкі ў чэрні.
Ўхаджу ў святліцу — ложак заслана,
Ложак заслана, жана прыбрана.
Ў яе ў галоўца свечачкі гараць,
Да ў яе ножках дзетачкі сядзяць.
Свечачкі гараць, патухаючы,
Плачуць дзетачкі, прымаўляючы.
— Ні плачця, дзеткі, пастаўлю хатку,
Прывязу вам другую мамку.
— Згары ты, татка, і з сваёй хаткай,
Прападзі, татка, і з другой мамкай.
Табе, татачка, жоначка будзіць,
А нам, сіроткам, мамкі ня будзіць.

** Кожны радок паўтараецца.

444. Жыла ўдава ў канцы сяла...

Жыла ўдава ў канцы сяла,
Мела сабе тры дачкі.
Пайшлі яны ў лес па ягады.
Саму большу звяры з'елі,
Селядорша ўтапілася,
Саму меншу туркі ўзялі.
Туркі ўзялі, замучалі,
Па свайму не навучылі.

Чужаземка па сенечках ходзіць,
У міленькага вядра просіць:
— Дай, міленькі, вядзёрушка,
Пайду ў крыніцу па вадзіцу.
Туркава матка яшчэ не спала,
Яна гэта пачула:
— Не давай, сынку, вядзёрушка,
Чужаземка знудзілася,
Яна пойдзе, утопіцца!
Чужаземка знудзілася,
Па сенечках ходзіць, даёначкі просіць:
— Дай, міленькі, даёначку,
І яшчэ к таму вяровачку.
Я пайду даіць каровачку.
Туркава матка яшчэ не спала,
Яна гэта пачула:
— Не давай, сынку, даёначку,
Чужаземка знудзілася,
Па сенечках ходзіць, ножыка просіць:
— Дай, міленькі, нож гастрэнькі,
Пайду рэзаць тры кашулі,
Адну ту, што падсцілаецца,
Другую ўціраецца, трэцюю адзяваецца.
Туркава матка, яна заснула,
Яна гэта не чула.
Сынок даў нож гастрэнькі,
Пайшла рэзаць тры кашулі,
Не папала ў палаценца,
Да папала ў шчыра сэрца.
Як папала так і ўпала.
Турка мамку абуджае:
— Уставай, уставай, мамка родненька.
Чужаземка знудзілася,
Яна ўжо зарэзалася.
— Рабі, сынку, залатую трунку,
І нясі яе на крутую горку.
Прыляцелі тры зязюлі.
Адна села ў галаве, другая на грудзь,
Трэцяя села ў ножках.
Сталі яны кукаваць,
Турку жалю надаваць.
Што ў галаве, то то́ мамка,
Што на грудзі, то то́ сястра старшая,
А на ножках селядорша.

445. Вот жыў-пражываў да й багаты купец...



Вот жыў-пражываў да й багаты купец,
Ён імеў пры сабе да дзве дочары радной.

Ой, старшая доч так, як цёмная ноч,
А младша дачка так, як роза расцвіла.

От старша да младшу маліла тако:
— От, пайдзём-ка, сястра, от пайдзём-ка, радна!

Да на той беражок, да дзе жоўцянькі пясок,
Там халодна вада, стаіць грабніца мала.

Там халодная вада, стаіць грабніца мала,
— Ты, сястрыца радна, падступі-ка сюда.

От сястрыца падступіла і грабніцу скалыхнула,
І грабніцу скалыхнула, і сястрыца утанула.

— Да ці добра, сястра, да ці ў моры на дне?
— Як майму жаніху на чужой старане.

446. У са́ду-са́ду пад яблынкаю...





У са́ду-са́ду пад яблынкаю
Сядзеў галубок з галубіцаю.

Яны сядзелі, любаваліся,
Сваімі крыламі й абдымаліся.

Сваімі крыламі й абдымаліся,
Сваімі дзюбкамі цалаваліся.

Прыляцеў сакол і сы крутых гор,
Разбіў-разлучыў пару галубоў.

Галубка забіў, галубку злавіў,
Узяў за крыльцо, прынёс дадому.

Прынёс дадому, пусціў на волю,
Насыпаў пшанца аж па каленца.

Насыпаў пшанца аж па каленца,
Наліў вадзіцы аж па крылачцы.

— Галубка мая, чаму не така?—
Пшанца не клюеш, вадзіцы ня п'еш?

Пшанца не клюеш, вадзіцы ня п'еш,
На крутыя горы ўсё плакаць ідзеш.

447. Ой, там, на гарэ, ой, там, на крутой...



Ой, там, на гарэ, ой, там, на крутой,
Ой, там літала пару галубоў.

Яны леталі да й цалаваліся,
Сызымі крыламі абдымаліся.

Адкуль жа ўзяўся ахотнік-стрэлец,
Разбіў-разагнаў пару галубей.

Галуба ўбіў, галубку злавіў,
Узяў пад палу, прынёс дадому.

Насыпаў пшэнца аж па каленца,
Наліў вадзіцы аж па крыліцы.

Галубка ня есць, галубка ня п'е,
А ўсё на ту гору да й плакаць ідзе.

—Галубка мая сізакрылая,
Чаму ж ты такая клапатлівая?

— Ой, як жа мне быць да й не клапатаць,
Была я ў пары, цяпер — я адна.

А ў мяне ёсць сад блізка для мяне,
Блізка для мяне да ў маім сяле.

Ой, я там была і там літала,
Каго ўціпала — таго ні нашла.

Ня тыя крыла, ня той жа палёт,
Ня той разгавор, ня міл, ня дружок.

448. Ой, з-пад горы, з-пад крутое...



Ой, з-пад горы, з-пад крутое,
Буйны вецер вее**.

А мой мілы ў чыстым полі
Пшанічаньку сее.

Ой, ён сее, пасявае,
Баразны не знае.

А за ім жа два галубкі
Зёрнышкі збірае.

Скуль ўзяліся два смышлёнца,
Хочуць іх пабіці.

Яны хочуць іх пабіці,
Пару разлучыці.

А галубка як зачула,
Ўзяла паляцела.

Крылышкамі ўстрапянула,
Ня бярозе села.

Ой, Божа ж мой міласцівы,
Дзе мой мілы дзеўся?

Ой, калі ж бы на базары,
То б людзі сказалі.

Калі б яго ваўкі з'елі,
То б лугі шумелі.

Ой, калі б ён утапіўся,
То б Дунай разліўся.

** Другі радок страфы паўтараецца як пачатак наступнай.

449. Ой, там, пры дарозе, бяроза стаяла...



Ой, там, пры дарозе, бяроза стаяла,
На тое бярозе зязюля кукавала.

Во, йна кукавала, ўсю праўду казала,
Маці свайго сына ў войска выпраўляла:

— Вот пайдзі, сыночак, ў войска, адслужыся,
Чэраз год, на другі дадому вярніся.

Вот прайшоў гадочак, другі наступая,
Маці свайго сына з войска сустрачая.

— А дзень добры, маці, ці рада ты мною,
Ці рада ты мною, маею жаною?

— Я рада табою — ты мая дзяціна,
Малада нявестка — чужа чужаніна.

Маці свайму сыну дала піці-есці,
Маладой нявестца — на парозя сесці.

Маці свайму сыну піва наварыла,
Маладу нявестку навек атруціла.

Вышла сама ў сені, ціха гаварыла:
— О, Божа ж мой, Божа, што я нарабіла!

О, Божа ж мой, Божа, што я нарабіла!
Ўсю сваю сямейку навек загубіла!

Маладога сына пахаваю ў садочку,
Маладу нявестку — ў жоўценькім пясочку.

Па сваём сыночку пасажу каліну,
Па чужой дзяціне — горкую асіну.

Чырвона каліна будзя расцвітаці,
Горкая асіна будзя ўпасыхаці.

Горкая асіна будзя ўпасыхаці,
Малада дзяўчына замуж праклінаці.

450. Паехаў сынок на Русь жаніцца...



Паехаў сынок на Русь жаніцца**,
Забыўся сынок мамцы скланіцца.
Прыехаў сынок і з нявестачкай.
Сынка пераймалі з чырвоным віном,
А нявестачку з горкай атрутай.
Сын віна ня піў, на каня паліў,
А горку атруту папалам дзяліў.
Сынка вязлі чатыры кані,
А нявестачку на адным коніку.
Сынка пахавалі перад цэркаўкай,
А нявестачку аж за цэркаўкай.
Па сынку саджалі клянок і дубок,
А па нявестачцы вербу кудраву.
Па сынку плакала ўся радзінка,
Па нявестачцы — ні людзіначка.

** Кожны радок паўтараецца.

451. Удава сына ды парадзіла...



Удава сына ды парадзіла,
Люлі-люлі, ды парадзіла**.
А парадзіўшы, ды гадавала,
Выгадаваўшы, шубку пашыла,
Шубку пашыла, каня купіла.
Каня купіла, у свет пусціла.
Ждала йна гадок, ждала йна другі.
На трэці гадок аж едзіць сынок,
Аж едзіць сынок з нявестачкай.
Ой, маці сына ды піраймала,
Залатым віном пачаставала.
Залатым віном пачаставала,
А нявестачку — горкай 'трутачкай.
Сын віна ня піў, пад каня выліў,
Горку 'трутачку папалам выпіў.
— Ня ўмела, маці, нас пераймаці,
Умей жа, маці, нас пахаваці!
Пірад цэркаўкай, пірад ганачкам,
Ў адну труначку, ў адну ямачку.
А маці гэта ды й ня слухала,
Узяла дзеці ды й пахавала:
А свайго сына — пірад цэркаўкай,
А нявестачку — аж за цэркаўкай.
На сынку вырас зялёны дубок,
На нявестачцы — бела бярозка.
Ой, раслі ж яны, спахіліліся,
Чэраз цэркаўку сашчапіліся.
Усе ж з гэтага да дзівіліся,
Што на тым свеце спалюбіліся.
А маці гэта не ўпадабала,
Ўзяла сякеру ды й парубала.
Трэскі сыплюцца, косці валяцца,
Ды й ня сок цячэць — гэта ж кроў ідзець.
Людзі з гэтага усе дзівіліся,
Што на тым свеце спалюбіліся.

** Прыпеў «люлі-люлі» паўтараецца з другой часткай кожнага радка.

452. Ой, да наша Марусячка сына радзіла...



Ой, да наша Марусячка сына радзіла,
Ой, спавіла ў пялёначкі, ў Дунай пусціла.

— Плыві, плыві, мой сыночак, усё рэкаю,
А я буду, маладзенька, яшчэ дзеўкаю.

Ой, а там жа рыбаловы рыбу лавілі,
Ні злавілі шчукі-рыбы, злавілі дзіця.

Ой, узялі дзіцятачка на белы рукі
Да й прынеслі дзіцятачка на жалобны двор.

Да й прынеслі дзіцятачка на жалобны двор,
Ударылі, барабанілі ў жалосны звон.

Загадалі ўсім дзевачкам сабірацца
І гэтаму дзіцятачку прызнавацца.

Ўсе дзевачкі-паненачкі папарадзе йдуць
Да й на сваіх галовачках вяночкі нясуць.

Адна наша Марусячка пазадзі ідзець
Да й на сваей галовачцы вянка не нясець.

— А чаму ж ты, Марусячка, вянка ні звіла?
— Ой, бо ў мяне галовачка больна балела.

Вот узялі Марусячку пад белы рукі,
Укінулі Марусячку ў Дунай глыбокі.

Ішчэ наша Марусячка, йшчэ ні ўтанула,
Да сваю мамачку йна ўспамянула:

— А мая ж ты мамунячка, ішчэ дома пяць,
Ні пускай жа па начлегах, ніхай дома спяць.

А мая ж ты мамунячка, ішчэ дома дзве,
Ні давай жа такой долі, як мне, маладзе.

453. Ой ты, каваль, каваль, каваленьку...



— Ой ты, каваль, каваль, каваленьку,
Чаму куеш ціха, памаленьку?

Ці у цебе сталі не хватае,
Ці ты сабе дзяўчыны не маеш?

— Ой, нашто ж мне да тая дзяўчына,
Есць у мене душа-Кацярына.

Есць у мене душа-Кацярына,
Ой, да яна ж мне тры горы ўчыніла.

Учора звячора гуляці хадзіла,
Ой, а к паўночы дзяціну радзіла.

А зрадзіўшы — тапіці насіла,
А ўтапіўшы, да й Бога прасіла:

— Ой, дай жа, Божа, снягі да марозы,
Каб задуло шляхі да дарогі!

Каб тудою людзі не хадзілі,
Шэрых валоў паіць не вадзілі.

Шэрых валоў паіць не вадзілі,
Каб сыночка майго не будзілі.

Спі, мой сыночак, спі, не прасынайся,
На мамачку ты не абіджайся.

454. Свеця месяц і зара...



Свеця месяц і зара,
Я молада удава**.

Па садочку хадзіла,
Два сыночка радзіла.

У кітайку спавіла,
Ў ціхі Дунай пусціла.

На дваццатым на гаду
Пашла ўдоўка па ваду.

Стала ўдоўка ваду браць,
Стаў карабаль прыплываць.

А у тэм жа караблі
Два ўдалыя малайцы.

Адзін стаіць на насу,
Чэша русаю касу.

Другі стаіць на насу,
Смотрыць глазам на ўдаву.

— За старшага сама йду,
За младшага доч даю.

Нідзе ж таго не чуваць,
Штоб за сына — родна маць.

Стала плакаць і рыдаць,
Свае годы праклінаць.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

455. Вот што гэта за вярба...



Вот што гэта за вярба,
Што без кораню расла, да?

Вой-вой, о-ха-ха!
Што без кораню расла?**

Вот што гэта за ўдава,
Сем лет без мужа жыла?

Камандзіраю была,
Два сыночка радзіла.

Два сыночка радзіла:
Зваць Ванюша й Васіля.

Кругом лесу абнясла,
На палянца аставіла.

На палянца аставіла
Да й на Дунай пусціла.

— Ох ты, Дунай, не шумі,
Маіх дзетак не будзі.

Ніхай мае дзеткі спляць,
А я пайду пагуляць.

На семнаццатам гаду
Вышла ўдава па ваду.

Стала ўдова воду браць,
Стаў карабаль прыплываць.

Стаў карабаль прыплываць,
У ім парні два сідзяць:

Адзін седзіць на насу,
Разганяя ўсю ваду.

Другі стаіць на карме,
У ўдовушкі пытае:

— Эй, ты, ўдовушка-ўдава,
Да й ці пойдзяш за меня?

— За цябе я сама йду,
За другога доч даю.

— Эй, ты, ўдовушка-ўдава,
Дурна твая галава!

Нідзе ў свеце не чуваць,
Каб за сына вышла маць.

Каб за сына вышла маць,
А за брата сястру 'ддаць!

** Такі прыпеў утвараецца ў кожнай страфе.

456. А у полі бяроза стаяла...



А у полі бяроза стаяла**,
Пад бярозай Маруся ляжала,
Чорным шоўкам галоўку звязала.
Прыехалі тры казакі з полку,
Развязалі Марусі галоўку.
Адзін кажа: «Я Марусю люблю».
Другі кажа: «Я Марусю вазьму».
Трэці кажа: «Я з ёй ажанюся».
Загадала Маруся загадку:
А хто з'ездзя за мора па зелля —
І з тым будзя ў Марусі вяселля.
Адазваўся Ясю маладзенькі:
«Ёсць у мяне тры коніка на стайне:
Адзін конік, як воран чарненькі,
Другі конік, як лебедзь бяленькі,
Трэцці конік, як голуб сівенькі.
На чорненькім поля пераеду,
На беленькім мора пераплыву,
На сівенькім на земельку стану».
Стаў жа Ясю зельечка капаці,
Прыляцела шэрая зязюля,
Села, пала, стала кукаваці:
— Кідай, Ясю, зельячка капаці,
Едзь Марусі вяселля гуляці —
Твая Маруся за другога вышла.

** Кожны радок паўтараецца.

457. Калі тая нядзелячка будзя...



Калі тая нядзелячка будзя**,
Што я пайду на вулку гуляці?
Мілы будзе дзіця калыхаці.
Падыйду я пад аконца ціха:
Ці гаворыць свякровачка ліха.
Чую, чую, свякровачка судзіць:
— Ці ж ты, сынку, нагайкі не маеш?

Чаму жонку не б'еш, не караеш?
— А я, мамка, я й нагайку маю,
А я жонку і б'ю, і караю.
Стаіць сынку, як лебедзь бяленькі,
Ляжыць жонка тонка, як вугаль чарненька.
— Маці ж мая, парадніца ў хаце,
Парадзіла мне жонку забіці,
Парадзь жа мне, дзе яе схаваці.
— Схавай, сынку, ў вішнёвым садочку,
Там будуць дзеці вішанькі шчыпаці,
Й будуць сваю мамку ўспамінаці.
— Маці ж мая, парадніца ў хаце,
Парадзіла мне, дзе жонку схаваці,
Парадзь жа мне, дзе другую ўзяці.
— Запрагай, сынку, варану кабылку,
Аб'едзь, сынку, усю сваю краінку.
Знойдзеш сабе жонку, як малінку.
— Ні хачу я із малінай жыці,
Пайду сваю мілаю будзіці.
— Устань, мілая, дзетачкі плачуць.
— Няхай плачуць, да хоць паўміраюць,
Няхай знаюць, што мамкі ня маюць.

** Кожны радок паўтараецца.

458. Ой, паехаў сын Ванюша...



Ой, паехаў сын Ванюша
Да й на Русь на вайну,
Да пакінуў Кацярыну
Да й удома адну.

Матка яго старэнькая
Села лісты пісаць,
Села лісты пісаць
Дай на Русь пасылаць.

— Ой, вярніся, сын Ванюша,
Да й із Русі із вайны,
Да ўжэ твая Кацярына
Да па-своему пашла.

Да ужэ твая Кацярына
Да па своему пашла,
Сукні твае дарагія
Паразгортывала.

Сукні твае дарагія
Паразгортывала,
Коні твае вараныя
Пазаезджывала.

Коні твае вараныя
Пазаезджывала,
Слугі твае верненькія
Пазамучывала.

Ой, вярнуўся сын Ванюша
Да із Русі із вайны;
Да й не ўспела Кацярына
Шчэ й вароты адчыніць.

Ой, не ўспела Кацярына
Шчэ й вароты адчыніць:
Азірнулась з-поў дарогі,
З плеч галоўка ляціць.

Пакацілася галоўка
Да й у цёмны куток,
Палілася кроў гарача
Да й на жоўты пясок.

— Ой, цяпер жа, мая мамка,
Ў мяне грэх на душы,
Першы грэх, першы грэх —
Кацярыну я убіў.

Першы грэх, першы грэх —
Кацярыну я ўбіў,
Другі грэх, другі грэх,
Што дзяцей пасіраціў.

459. Малада дзяўчына па саду хадзіла...



Малада дзяўчына па саду хадзіла
Да ўдарыла ножку аб суху дарожку.

Баліць мая ножка, баліць яна больна,
Любіў барын дзеўку, любіў да не верна.

Сам сеў да й паехаў у горад-гарадочак,
А за ім дзяўчына ўслед-услядочак.

Гнала дзеўка, гнала, гнала ні дагнала
Да й у паўдарожкі начаваці стала.

Да ехалі ўланы, ўланы маладыя,
Да будзілі дзеўку, да й ні разбудзілі.

— Ой, устань, дзяўчына, ой, устань, ачніся,
Да на нашы коні, коні наглядзіся.

Да на нашы коні, коні вараныя,
Да на нашы седла, седла залатыя.

460. Ой, у полі, полі карчомка стаяла...



Ой, у полі, полі карчомка стаяла
Да й у той карчомкі ўланы маладыя.

Адзін п'е гарэлку, а другі гуляе,
Трэці красну дзеўку сабе падмаўляе.

— Дзяўчыначка мая, паязджай із намі,
Паязджай із намі, з намі, з уланамі.

Паязджай із намі, з намі, з уланамі,
Лучшай табе будзе, як у твае мамы.

Да й у твае мамы кашулі латаны,
А у нас, уланаў, шоўкам вышываны.

Дурна дзеўка была, ўланаў паслухала,
Села на чаўночак да й паехала.

Едуць аны поле, едуць і другое,
Прыехалі к гаю да й к чужому краю.

Прывязалі дзеўку к сасне валасамі,
Запалілі сасну знізу да й даверху.

Да сосенка гарыць, дзяўчына гаворыць,
Да сосенка тлее, дзяўчыначка млее:

— Да хто ў етум лесе, да хто ў етум полі,
Йдзіце, паглядзіце маю горку й долю!

Да хто дочкі мае, ніхай спагадае —
Як сонейка зайдзе, ў карчму ні пускае.

461. Ой, жана мужа знінавідзіла...



Ой, жана мужа знінавідзіла,
Узіла яго да й павесіла

Ў зялёным саду, на сухім суку,
А сама пайшла да й пашла дамоў.

Да пашла дамоў, села за сталом,
Села за сталом і піша пяром.

І піша пяром, пяром новінькім:
— Ой, гора ж,гора за плахім мужам.

Ой, яшчэ ж гарней без ніякага.
Як пайду я ў сад да й будзіць назад:

— Устань, міленькі, ужэ дзень белінькі,
А ці ты вот тут да ня выспаўся?

А ці ты вот тут да ня выспаўся,
Да ўсякіх птушак ні наслухаўся?

— Ну, а-ну, а-ну, такую жану!
Такую жану прывязаць к каню,

Да пушчай жа ён нагарцуіцца,
А жана-шэльма намуштруіцца!

Што то ў лесе гукае,
А хто дзяцей шукае.

— Йдзіце, дзеткі, дадому,
Трудно жыці самому.

— Жыві, бацько, як Бог даў,
Што й харошу жонку ўзяў.

Што й харошу жонку ўзяў,
Ты ж нас у ліс праганяў.

462. Ой, у полі, полі стаяла береза...



Ой, у полі, полі стаяла береза,
Дле тое берозы стаяв парэнь гожы.

Ля тога парэня тры дзеўкі любілі.
Адна любіма бело вышывало,

Другая любіма пасцель белу слала,
Трэйця любіма абед гатавала.

Трэйця любіма абед гатавала,
Абед гатавала ды й ачаравала.

— Ой, Божа ж, мой Божа, што ж ты нарабіла?
Маладога парня ўзяла атравіла!

Будзеш жа знаці, будзеш ты ведаці,
Як парню маладому даваць абедаці!

463. Ляцела зязюла цераз сад, куючы...



Ляцела зязюля цераз сад, куючы,
Заплакаў жа хлопец, з вечароўкі йдучы.

Прыйшоў ён дадому, не сказаў нікому,
Палажыўся спаці ды не мог устаці.

Прыйшоў яго бацька, стаў жа разбуджаці:
— Ўставай, ўставай, сынку, пойдзям мы касіці.

— Не буду ўставаці, не пайду касіці,
Баліць мне галоўка, не магу падняці.

Прыйшла яго сестра, стала разбуджаці:
— Ўставай, ўставай, братка, пойдзем мы гуляці.

— Не буду ўставаці, не пайду гуляці,
Баліць мая галоўка, не магу падняці.

Прыйшла яго маці, стала разбуджаці:
— Трэба была, сынку, дзевак не кахаці.

Першая любіла — рубашачкі мыла,
Другая любіла — атруты купіла.

У нядзелю рана званы зазванілі,
Маладога хлопца ўжэ й пахаранілі.

Трэба тую дзеўку ў землю закапаці,
Каб не было каму атруты купляці.

464. Мальчышачка-бедняжачка...



Мальчышачка-бедняжачка
А схіліў сваю да галовачку.

Ён схіліў сваю да галовачку
На правую да староначку.

А з праваі — да на леваю,
На грудзь да маю, да на белую.

А з грудзі устаў, «прашчай!» сказаў.
— Прашчай, мая да красавіца!

Прашчай, мая да красавіца!
Красата мне твая не наравіцца!

А з тае таскі пайду ў лужкі,
Сарву цвяток, саўю вянок.

Сарву цвяток, саўю вянок,
Свайму мілому на галовачку.

А насі, мілы, не скідывай,
А любі мяне, не пакідай!

Адну любіў — шчаслівым быў,
А другую стаў — ў цюрму папаў.

Ў цюрме сяджу, ў акно гляджу:
Ці ня ідзя хто, ці ня нясе што?

Ой, ідзе мая да красавіца,
А ў правай руцэ цвяток алянькі.

А ў правуй руцэ цвяток алянькі,
А ў лявуй руцэ сынок малянькі.

Ой, не рад я цвятку, цвятку аламy,
Ох, рад я сынку, сынку маламy.

465. Зялёны дубочак на бор пахіліўся...



Зялёны дубочак на бор пахіліўся,
Малады казачэ, аб чом зажурыўся?**

Малады казачэ, аб чом зажурыўся,
Ці валы прысталі, ці з дарожкі збіўся?

— Валы не прысталі, з дарожкі не збіўся,
Ох, я маладзенькі без долі ўрадзіўся.

Ой, пайду я ў поле шукаць сабе долю,
Не знайшоў я долю, знайшоў быстру рэчку.

А ў той быстрай рэчке шчука-рыба йграе,
Шчука-рыба йграе, сабе пару мае.

Ой я, маладзенькі, не п'ю, не гуляю,
Не п'ю, не гуляю, парачкі не маю.

Не п'ю, не гуляю, парачкі не маю,
Ох, пайду, ўтаплюся у сіням Дунаю.

— Не тапісь, казачэ, бо душу загубіш,
Хадзем павянчаймось, калі верна любіш.

Ох, пайшлі вянчацца — німа папа дома:
— Ці тваё нішчасце, ці мая нідоля?

Забалеў казача ў зялёнай дуброве,
Пракрасна дзяўчына ў мамкі на парозе.

Пракраснай дзяўчыне мёд, віно падносяць,
Малады казачэ ў зямлі вады просіць:

— Зямліца-сырыца, дай вады напіцца,
Няхай людзі знаюць, як з дзевай любіцца.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

466. А ў нядзелю ранюсенька...



А ў нядзелю ранюсенька
Сынок мамку упроч прагнаў.

— Ідзі, мамка, да дарожкаю,
Дарожкаю раўненькаю.

Дарожкаю раўненькаю,
Травіцаю зеляненькаю.

Да сядзь, мамка, пад кусточкам
Да накрыся хвартушочкам.

А ў нядзелю ранюсенька
Ідзе сынок, гукаючы.

Ідзе сынок, гукаючы,
Сваю мамку шукаючы:

— Ідзі, мамка, дадомачку,
Ў мяне дома беда стала.

Ў мяне дома беда стала:
Жонка сына да прыспала.

Яшчэ к таму і другая:
Да на стайне канёк упаў.

467. А што ж гэта за свет настаў...



А што ж гэта за свет настаў,
Сын мацеры жалець ні стаў.

Сын мацеры жалець ні стаў,
Узяў яе да проч паслаў!

Пашла ж яна ў роўна поля,
Памаленьку ступаючы,

Памаленьку ступаючы,
Дробны слёзкі раняючы.

Села ж яна пад кусточкам,
Накрылася хварасточкам.

Адну ночку праседзіла,
Другую — праплакала,

А на трэцю — на рассвеце.
Йдзе сынок, гукаючы:

—Йдзі, мая мамка, дамоў,
Ў мяне дома біда стала.

Ў мяне дома біда стала,
Жана сына да прыспала.

— Гэта цябе Бог наказаў,
Што ты маці упроч паслаў.

468. Цёмна хмарка наступае...



Цёмна хмарка наступае**,
Дробны дожджык накрапляе.

Дробны дожджык накрапляе,
Сын мацеру праганяе.

— Ідзі, маці, проч ад мяне,
Не для цябе хата ў мяне.

Пашла ж маці гаранкамі,
Абліўшыся слёзанькамі.

Яшчэ маці з гор не зышла,
А на сынка бяда нашла.

Больша дачка захварэла,
Яго жонка памірае.

Яго жонка памірае,
Сын мацеру даганяе:

— Ой, вярніся ж, мая маці,
Буду цябе ж паважаці.

Пашла ж маці сцежачкаю,
Сын ўстрачае із дочкаю.

— Чаго ж, маці, тады кляла,
Як та зямля пачарнела?

— Доню, доню, прымі к сабе,
Буду жыці я ў цябе.

— Ох, рада б жэ я прыняці,
Горка доля ў мяне ў хаці.

Будзем, доню, зарабляці,
Ліхой долі дагаджаці.

Падсякаці рукі, ногі —
Тым дагодзім горкай долі.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

469. Ой, лецелі жураўлі...



Ой, лецелі жураўлі**,
Селі-ўпалі на раллі.

Да й гавораць пра раллю,
Каторая ралля лепш.

Каторая ралля лепш —
Ці ранняя, ці позня?

А на раннёй пшаніца,
А на пузнёй ветліца.

Сабраліся удоўцы
Да й гавораць пра жонкі.

Каторая жонка лепш —
Ці первая, ці друга?

Я з перваю дзеці маў,
А з другою гадаваў.

А з другою гадаваў,
А з трэцёю разганяў.

— Йдзіце, дзеткі, ў цёмны лес,
Нехай вас там звір паесць.

— Хадзем, братка, ў дуброву
Да й скіньмося травою.

Прыдуць дзеўкі цвет ірваць
Да й будуць жа ўспамінаць.

А што ж гэта за цвяток —
І сястрыца і браток?[1]

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.
[1] Пра кветку «Іван-да-Мар'я».

ЛЮБОЎНЫЯ ПЕСНІ

Сярод вялікай колькасці любоўных песень, якія бытуюць на Міншчыне, сустракаюцца сапраўдныя жамчужыны народнага песеннага мастацтва: «Чаму не прыйшоў, як месяц зышоў?», «Вецер з поля, туман з мора», «А ў полі, полі зеляненькім», «Кукавала зязюленька ў лузе на пакосе», «За туманам нічога не відна» і многія іншыя.

Песні пра каханне характарызуюцца эмацыянальна-духоўнай напружанасцю ў перадачы інтымна-лірычных пачуццяў і перажыванняў. Яны ўвабралі ў сябе цэлы комплекс чалавечых узаемаадносін з іх этычнымі і эстэтычнымі праблемамі. Адсюль разнастайнасць іх тэматыкі.

Галоўныя героі любоўных песень — дзяўчына і юнак. Дзяўчына прыгожая не толькі сваёй знешнасцю, але і працавітасцю; яна прыгожая ў працы, і тым звяртае на сябе ўвагу хлопца. Маці раіць свайму сыну браць у жонкі не багатую дзяўчыну, у якой «валы да каровы», а бедную сіраціначку, у якой «толькі чорныя бровы». Хлопец марыць пра разумную, верную і пяшчотную сяброўку, і тады іх сумеснае нялёгкае жыццё не будзе такім цяжкім. Дзяўчына марыць пра сустрэчу з хлопцам, чакае любага, ёй «часок ды здаецца, Ой, да за дзянёчак». Яна марыць выйсці замуж за такога «пана, як сама». Але жыццё складанае і цяжкае. І ў песнях дзяўчына скардзіцца, што мілы яе больш не любіць, хоць яна і не горшая за сваю саперніцу.

Матыў долі распаўсюджаны ў любоўных песнях («Зялёны дубочак, куды пахіліўся?», «Ты, ранняя кукулячка», «Ой, я хаджу да пахаджаю» і інш.).

Часта дзяўчыну наперадзе чакае разлука з каханым. Вінаватыя ў гэтым і родныя, і чужыя людзі. Але ніхто не можа разлучыць тых, хто любіць адзін аднаго: «Ніхто нас не разлучыць: Ні свет, ні зара, Ні блізкія суседзі, Ні маці мая. Ні сыра зямліца. Ні вада-вадзіца».

Вялікае пачуццё дзяўчыны нярэдка прыводзіць яе да бяздумнасці, за што яна горка расплачваецца: «Ой, Божа, мой Божа, што я нарабіла, Усяму свайму роду неславу зрабіла». І невыпадкова маці папярэджвае нявопытную дачку ад паспешных і неабдуманых учынкаў, каб дачка не падманулася ў пачуццях.

У іншых песнях маці папракае сына ў тым, што быў лёгкадумны і кахаў адразу трох, за што і быў жорстка пакараны адной з іх.

Сюжэты і матывы любоўных песень можна працягнуць, але ўсе яны разбіваюцца на два полюсы: матыў светлага і радаснага кахання ў матыў горычы і смутку.

Калі звярнуцца да паэтыкі любоўных песень Міншчыны, то знойдзеш у іх тыя ж сродкі і прыёмы вобразнай выразнасці, якія характэрны для ўсёй любоўнай лірыкі беларусаў. Вось некаторыя з іх: эпітэты, якія раскрываюць і вызначаюць якасці і ўласцівасці прадмета адлюстравання («сухі дуб», «рання куку-



«Мая беларусачка...» (майстрыца з Маладзечна В. Чырванцова).

лячка» «удалыя малайцы», «сосна тонкая», «доля ліхая», «коні вараныя» і г. д.); сімволіка, якая дазваляе замяніць жыццёвую з'яву ці паняцце ўмоўным абазначэннем (у песні «Зарадзілі чорныя ягады ў бары»— перавоз праз раку — дзяўчыну «за жоначку ўзяць»; «А ішлі, ішлі валы да палавыя»); такі прыём паэтычнай мовы, калі з'явы прыроды супастаўляюцца з момантамі і з'явамі чалавечага жыцця; увасабленне, калі з'явы прыроды, жывёльны свет надзяляюцца пачуццямі і думкамі чалавека («Ты, палоса, ты, палосанька мая»); метафара — паэтычны троп з яго пераносным значэннем; таўталогія, якая паўтарае адно і тое ж меркаванне рознымі словамі («стукаціць, гракаціць», «горад-гарадочак», «след-слядочак») і г. д. Усе гэтыя паэтычныя сродкі ўзбагачаюць народную мову ў любоўных песнях.

Кампазіцыйна песні пра каханне ў асноўным будуюцца ў форме маналога, дыялога, маналога-дыялога. Іншы раз сустракаюцца песні ў апавядальнай форме, якая даецца ад трэцяй асобы.

Выканаўцамі любоўных песень з'яўляюцца ў большасці жанчыны, пачы-

наючы з маладых, якія засвоілі традыцыйную любоўную песню ад сваіх родных, і канчаючы старымі. Кожная жанчына валодае індывідуальнай манерай выканання. Жыццё і песня атаясамліваюцца выканаўцамі, таму што любоўная песня праўдзівая, што робіць яе блізкай і зразумелай, жывучай і папулярнай.

470. Зарадзілі чорныя ягады ў бары...



Зарадзілі чорныя ягады ў бары,
Заблудзіла красная дзевіца ў лесу.

Заблудзіла красна дзевіца ў лесу,
Прыблудзіла і к Дунаю-берагу.

Ля Дунаю паравозчык маладой:
— Паравязі быстру рэчку і Дунай!

— Во, што ж ты мне паравознага дасі?
— Нету ў мяне срэбра-злота на руке.

Нету ў мяне срэбра-злота на руке,
Вот, каб табе паравознага аддаць.

— Не хачу я паравознага, ой, браць,
А хачу цебе да й за жоначку узяць!

471. Ой, бяроза мая раскудравая...



— Ой, бяроза мая раскудравая,
Ой, калі ж ты ўзышла, калі вырасла?

— Я вясною ўзышла, летам вырасла,
На высокій чарот пахілілася.

Там гуляла Маша позна звечара,
Зажыгала свячу з воску ярага.

Зажыгала свячу з воску ярага,
Прыжыдала дружка разудалага.

Стукаціць, грукаціць ўсёй па вулушкі,
Ой, ці вор там гручыць, ці разбойнічак?

— Я ні вор, ні па-вор, ні разбойнічак,
Я да Машы-душы палюбоўнічак.

Я й да Машы-душы распрасіціся,
Ці пазволіш, Маша, мне жаніціся?

— Ой, жанісь, маладзец разудаленькай,
Вазьмі сабе жану — дачку царскую.

Вазьмі сабе жану — дачку царскую.
— Мне ня нада жана — дачка царская,

А мне нада жана — доч хазяйская,
Каб рабіла дзела гаспадарская.

472. Із-пад гор-гары едуць мазуры





Із-пад гор-гары едуць мазуры.
Едуць, едуць мазурочкі,
Вязуць, вязуць нам вяночкі,
Вянок залаты**.

Прыехаў мазур к мазурцы на двор,
Стук-бразь у вакенца:
— Выйдзі, сэрца, на крылечка,
На крылечка.

Прыехаў мазур к мазурцы на двор:
Стук-бразь у другое:
— Выйдзі, сэрца дарагое,
Дай каню вады.

— Не магу я ўстаць, каню вады даць.
А мне матка прыказала,
Штоб я з панам не стаяла.
Я маткі баюсь.

— Маткі не бойсь, сядай на мой воз.
Мы паедзем у чыста поле,
На шырокае раздолле,
Там мы зажывём.

Селом ехалі — людзі дзівіліся:
— Ой, што ж гэта за дзяўчына,
Харошая, чарнабровая,
З панам ехала?

Лесам ехалі, дрэўя скланяліся:
— Ой, што гэта за дзяўчына
Харошая, чарнабровая,
З панам ехала?

** Апошні радок кожнай страфы паўтараецца.

473. У полі вярба, пад вярбой вада...



У полі вярба, пад вярбой вада,
Там хадзіла, там гуляла дзеўка малада**.

Ехаў казачок, ехаў малады,
Папрасіў у дзяўчыначкі: «Дай каню вады».

— Рада бы я даць — холадна стаяць,
Халодная раса, я босая — холадна стаяць.

— Куплю сапожкі на белы ножкі,
Улей, улей каню вады, хаця б нямножкі.

Дзяўчына мая чарнабрывая,
Скажы, скажы верну праўду, ці будзеш мая?

— Рада тваёй быць, ня ўмею рабіць,
Шыці, мыці, кросна ткаці, то ж мне не рабіць.

— Есць у мяне біч, ён научыць рабіць,
А белая бярозачка раненька будзіць.

— Яшчэ не ўзяў, абяшчаеш біць,
Багдай ты не даждаўся!— як жа з табой жыць?

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

474. Ой, у бары сосна тонкая выросла...



Ой, у бары сосна тонкая выросла,
Й аддаў мяне бацька — лет не даросла.

Вот як не даросла, як маладая,
Стрэла мяне доля, доля ліхая.

Ой, ў саду гуляла да ўсю цёмну ночку,
Да выцягла ножку аб быліночку.

Баліць мая ножка, баліць яна больна,
Любіў барын дзеўку, любіў не давольна.

Любіў барын дзеўку на час, на часочак,
А сам сеў, паехаў ў горад-гарадочак.

А сам сеў, паехаў ў горад-гарадочак,
А за ім дзяўчына ў след, у слядочак.

Гнала яна, гнала, гнала, не дагнала
Да й у поўдарожкі начаваці стала.

Начаваці стала, моцна заснула,
Наехаў дзяцінка — дзяўчына не чула.

— Устань, устань, дзеўка, устань, прабудзіся
Да на мае коні, коні наглядзіся.

Да на мае коні, коні вараныя,
Да на мае сёдла, сёдла залатыя.

475. А ішлі, ішлі да валы палавыя...



А ішлі, ішлі да валы палавыя
Да ў даліне пасталі**.

Ох, любіліся да мы з міленькім,
Вот цяпер перасталі.

Скацілася ясная зорачка
да й упала дадолу.

Ох, журылася красная дзевачка:
Хто завядзе дадому?

Абазваўся да й маладой казачэнька,
Да й на вараном кані:

— Гуляй, гуляй, красная дзевачка,
Я завяду дадому.

— Ах, вядзі ж, вядзі, маладой казачэнька,
Да вядзі ж, не баўляйся!

А то па мне, дзеўке-красавіцы
Да ўвесь род зажурыўся.

А не так род, да не так жа род,
Як ацец, родна маці.

Ой, казаў жа ж ацец, родна маці
За старога аддаці.

Ой, хіба ж ба ліха не даждала,
Каб не з любым звенчалась.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

476. Я учора су вячора весялюсянька была...



Я учора су вячора весялюсянька была, эх**,
А сягодня жалка плачу, выпраўляючы дружка.
— Не плач, міла, чарнаброва, наплачышся без мяне.
Прышлю табе падарунак, даражэй будзе мяне.
Як узложыш на галоўку, так і ўспомніш пра мяне,
Будзеш плакаць і тужыць — без мілога худа жыць.
— Ты, дубочак, ты, зялёны, шырок лісток на цябе.
Ты, мой мілы, ты, мой ўдалы, нету праўдачкі ў цябе.

** Кожны радок паўтараецца.

477. Усе боры пагарэлі...



Усе боры пагарэлі,
Й асталася поля.
Да ўсім людзям жыці добра,
Адной жа мне гора.

Усе людзі жыта сеюць,
А я — сваё гора.
Усе людзі Бога просяць,
Каб жыта ўрадзіла.

А я, млода, Бога прашу,
Каб гора не ўсхадзіла.
Як узышло маё гора
Густымі кустамі.

Нема цвету сінейшога,
Як сіні васілёчак,
Нема друга любейшога,
Як мілы дружочак.

478. Ты, ранняя кукулячка...



Ты, ранняя кукулячка**,
Чаму рана кукавала?

Чаму рана кукавала,
Усіх людзей паўбуджала?

Усе людзі рана ўсталі,
Сабе долі поўбіралі.

Я ж, малада, спазнілася,
Горка доля судзілася.

Яна горкая, няшчасна,
Прапаў мой век, як макаў цвет:

У ночы зацвіў, удзень адпаў.
Етак мой век прапаў.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

479. Па садочку я хадзіла...



Па садочку я хадзіла**,
Сама сабе гаварыла.

Сама сабе гаварыла,
Няма таго, што любіла.

Няма таго і не будзець,
Адсудзілі злыя людзі.

Адсудзілі, адраілі,
Каб па пары не хадзілі.

Па пары не хадзілі,
Друг дружочка не любілі.

А гляну я на ставочак,
Плывець гусачак радочак.

Адна адну даганяець,
Бо кожная пару маець.

Стану, стану падумаю,
Бо я парачкі не маю.

А стану падзіўлюся,
Горкай слязой залюся.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

480. Зялёны дубочак, куды пахіліўся?





Зялёны дубочак, куды пахіліўся?
Малады казача, чаго зажурыўся?

Малады казача, чаго зажурыўся?
Ці валы прысталі, ці з дарожкі збіўся?

— Валы ня прысталі, з дарожкі ня збіўся, —
Ацец-матка помяр, а я не жаніўся.

Ды пайду я з гора, шукаючы долі, —
Не нашоў я долі, нашоў рыбалоўцаў.

— Ох, вы рыбалоўцы, ўдалыя малойцы,
Вы закіньця сеці на быстрыя рэчы[1].

Вы закіньця сеці на быстрыя рэчы
Да ўлавіця ж долю вы мне, маладому.

Закінулі сеці на быстрыя рэчы, —
Не ўлавілі долі, да ўлавілі шчуку.

Шчука-рыба йграя, й тая пару мая,
А я ж, маладзенькі, парачкі не маю.

[1] Рэчы — тут: «рэкі».

481. У полі бераза кудрава стаяла...





У полі бераза кудрава стаяла,
А хто йдзе, не мінае, берозу ламае**.

Хто йдзе, не мінае, берозу ламае***.
А гора ж таму жыці, хто пары не мае.

Да яшчэ найгорша, хто двух-трех кахае,
Дадому праводзіць, адзін спаць лягае.

Да сцяны вачыма, на хату плячыма,
Да сцяны гаворэ, а сцяна не чуе:

— Хто ж мяне раздзене, хто ж мяне разуе,
У румяны губкі сто раз пацалуе?

Адазвалася Галя ў сенях за дзверымя:
— Я ж цябе раздзену, я ж цябе разую.

Я ж цябе раздзену, я ж цябе разую,
У румяны губкі сто раз пацалую!

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.
*** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

482. Ой, я хаджу да пахаджаю...





Ой, я хаджу да пахаджаю
Па чыстаму полю. Полю...

Ой, я сею да высеваю
Сваю горку долю. Долю...

— Расці, расці, горка доля,
Рувнымі кустамі. Кустамі...

Квеці, квеці, горка доля,
Рознымі цвятамі. Цвятамі...

Не спёў, не цвіў, да не спёў, не цвіў
Ні адзін васілёчак. Васілёчак...

Ніхто не міл, ніхто не міл,
Як мілы дружочак. Дружочак...

Сядзеў жа ён да за столікам,
Як сіў галубочак. Галубочак...

— Скажы, скажы, мой міленькі,
Чаго кудры ўюцца? Кудры ўюцца...

— Ад роскашы кудры ўюцца,
С печалі сякуцца. Сякуцца...

За харошага дзеўкі б'юцца,
З гэткага смяюцца.

483. Гневаецца маці ды ўсё хоча біць...





Гневаецца маці ды ўсё хоча біць:
— Перастань ты, горды хлопец, да мяне хадзіць!**

— Я не перастану, бо цябе люблю,
Як распусціць верба лісце, то тады вазьму.

Дзеўка здагадалася — вербу паліла,
«Можа, скора выйду замуж», — думала яна.

Распусціла верба лісце на дварэ, —
Хлопец дзеўку толькі зводзіць, замуж не бярэ.

— Паглядзі, дзяўчына, — камень у вадзе,
За мяне ты выйдзеш замуж, як ён паплыве.

— Дзе ж ты гэта бачыў, каб той камень плыў,
Бела лічка, чорны бровы навек засмуціў.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

484. Ды ў зялёнай дуброве, эх!



Ды ў зялёнай дуброве, эх!
Там Дуня й волы пасла.
Напасвіўшы волы,
Пайшла ў сад гуляці.

Пакуль Дуня гуляла, эх!
Свае волы пагубляла.

Што ж Дуне робіці,
Будзе маці біці.

Будзе маці Дуню біць, эх!
Стануць бабы гаварыць:
— Неўдала дзяўчына,
Не вазьму, ой, за сына.

485. Ой, гуляла дзеўчына, ой, па садочку, э-гэй!



Ой, гуляла дзеўчына, ой, па садочку, э-гэй!
Накалола ножачку на вішнёчку.

Баліць мая ножачка, ой, ды й не больна, э-гэй!
Любіў хлопец дзеўчыначку да й недоўга.

Збіраюць парнішачку, ой, у салдаты, э-гэй!
Забылася дзеўчыначка папытаці.

Забылася дзеўчыначка, ой, папытаці, э-гэй!
— Ці мне замуж іцці ці гуляці?

— Гуляй, гуляй, дзеўчынка, ой, як гуляла, й гэ-гэй!
Не сцялі ты пасцель белу, як ты слала.

Яны ж тваю пасцель белу, ой, апракінуць, й гэ-гэй!
Яны ж табе любіць будуць да й пакінуць.

486. Цекла рэчка з-пад млынэчка...



Цекла рэчка з-пад млынэчка,
О-хо-хо-хо!
А другая ўскрай Дуная,
Ох, я!**

Вела дзеўка коні паіць,
Коні храпуць, вады ня п'юць.

Коні храпуць, вады ня п'юць,
А за Дунай паглядаюць.

А за Дунай паглядаюць —
Там казакі ў карты граюць.

Там казакі ў карты граюць,
Młоду дзеўку падмаўляюць:

— Паедзь, паедзь, дзеўка,
з намі,
З маладымі казакамі!

Дзеўка мамкі не слухала,
З казакамі паехала.

Едзя поля і другоя,
На трэцяя уз'язджая.

— Дзе мы будзем начаваці?
А ўжо пара пасцель слаці.

Дзеўка пасцелі не слала,
Белы ручкі заламала.

Белы ручкі заламала,
І да мамкі ліст паслала:

«А ты, мамка, не турбуйся,
За мой венчык не таргуйся.

Я траціла свой веночык
Праз свой глупы разумочык.

Пад зялёненькім кусточкам
З маладзенькім казачочкам».

** Такія прыпеўныя словы спяваюцца ў кожнай страфе.

487. А на гарэ сухі дуб...



А на гарэ сухі дуб,
А ў даліне арашок, да,
Та-дры-та, Ваня, та-ра-ра**,
А ў даліне арашок.

А ў даліне арашок,
Падай, дзеўка, галасок, да.

— Я голасу не падам,
Клічуць мене ў сад гуляць, да.

Клічуць мене ў сад гуляць,
Ў саду вішэнькі шум'яць, да.

Ў саду вішэнькі шум'яць,
Праз нас людзі гавораць, да.

Праз нас людзі гавораць,
Пра цебе і пра мене, да.

Пра цебе і пра мене,
Што ты ходзіш да мене, да.

Што ты ходзіш да мене,
Пагавору не рабі, да.

— Ох, які тут пагавор,
Ты не мая, я не твой, да.

** Прыпеў спяваецца з другім радком кожнай страфы.

488. Да куды ляціш, да куды й атлятаяш...





Да куды ляціш, да куды й атлятаяш,
Чарнесенькі ворля?**

Да хто мене, да такую маладзеньку,
Шчыранько прыгорня?

— Эй, прыгартайся, да мая разлюбезна,
К другому й такому.

Эй, да не кажы да шчырай праўды,
Як мне ж, маладому.

— Ой, да як стане шчыро прыгартаці,
То і мушу сказаці.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

489. Гэй! Да у полі цёмна ды дымна...



Гэй!** Да у полі цёмна ды дымна,
За туманам свету ня відна.

Толькі відаць роўная поля,
А там казак каня поя.

Там дзяўчына воду брала,
На казака паглядала.

— Ты паедзеш, дзеўка, з намі,
Ой, да з намі, казакамі?

— А рада б я паехаці —
Не пускае мяне маці.

** Слова «Гэй!» спяваецца перад кожным радком.

490. Ой, борам, борам, борам парою...



Ой, борам, борам, борам парою
А хто там едзіць вечараною?

А едзя, едзя Іванька п'яны:
— Адчыні, Манечка, я твой каханы!

— Я й ня 'дчынюся, мамкі баюся!
— Я тваёй мамцы нізка скланюся.

Нізка скланюся, нізка скланюся,
Я с табой, Манечка, спаць укладуся.

— Ай, дочка, дочка, бі качаргою,
Каб не лёг, дочанька, спаці с табою.

— Ай, маці, маці, не трэба біці,
Харошы, прыгожы, — буду любіці.

491. А я выду на даліну...



А я выду на даліну,
На прыўдаленькі лужок,
Зірну-гляну ў ту старонку, да,
Дзе мой міленькі дружок.

Дзень працуя, ноч стаўбуя,
Панапрасна слёзкі лье;
Слёзка таня, снег растаня, да,
Расці, траўка, зяляна!

— Расці, траўка, зяляная,
Ніхто цябе не сарвёт;
Жыві, дзеўка маладая, да,
Ніхто цябе не вазьмёт!

— Ці ты мяне сам не любіш,
Ці мамаша не вяліць?
— А я цябе верна люблю, да,
Мне мамаша не вяліць.

Як убачу, так заплачу,
Серца-душанька баліць,
Баліць серца і душа, да,
Што дзяўчына хараша!

492. А ў канцы сяла там стаяла вярба...



А ў канцы сяла там стаяла вярба,
А пад таю вярбою там жыла ўдава.

А ў тае ўдавы была доч хараша,
Яна вывадзіла варанога каня.

Яна вывадзіла варанога каня,
Яна вынасіла залатое сядло.

— Пасадзі, мілая, а ў варотах вярбу:
А дзе будзяш піць-гуляць, буду ў госці заязджаць.

Высцялі, мілая, да кітайкаю двор,
Каб я не папыліў да сваіх сапагоў.

— Не на тоя мяне мамка радзіла,
Каб я нягадзяю вярбу садзіла!

СЯМЕЙНА-БЫТАВЫЯ ПЕСНІ

Сямейныя песні Міншчыны разнастайныя і багатыя па зместу и функцыянальнай прыналежнасці. У іх выражаны шчырыя пачуцці замужняй жанчыны-працаўніцы, якая апавядае пра свой лёс, узаемаадносіны са сваімі і мужавымі бацькамі і родзічамі. Гэта пранікнёная споведзь маладзіцы прымушае слухача не толькі спачуваць гаротніцы, але і яскрава ўспрыняць самі сямейныя і сацыяльныя абставіны, у якіх яна жыла.

Нямала ёсць песень-роздумаў аб будучым замужжы, якія тэматычна нібыта не звязаны з сапраўднымі сямейнымі калізіямі патрыярхальнай сям'і. Але яны як бы падрыхтоўваюць слухачоў да ўспрыняцця разваг аб будучым рэальным жыцці жанчыны ў чужым доме, у нязвыклых для яе абставінах. Песні-роздумы дзяўчыны і хлопца пра будучае сямейнае жыццё ў адрозненне ад вясельных песень, якія спяваліся да сватання, падчас сватання і на заручынах амаль пазбаўлены іншасказання. У іх пераважае бытавая вобразнасць, і пабудаваны яны ў большасці ў маналагічнай форме. Дзяўчына раздумвае над сваёй доляй, просіць у Бога даць харошую чалядзіну («Каб не біўся, не ругаўся, З мяне, млоды, не здзекаваўся») або «мілага шчаслівага» («А свякратка багатага, А свякроўку рабочую Ды на дзела ахвочую, Што б я дзела не рабіла, Бело, хорашанька хадзіла». У некаторых дзявочых песнях ёсць павучанні, як паводзіць сябе ў чужой сям'і. Гэтыя творы могуць мець таксама іншасказальны пачатак:

Быстрая рэчка беражыстая,
Пакідай берагі ды ідзі ў лугі.
А ты, дзевачка, наравістая,
Пакідай наравы, што ў маткі былі,
А бяры наравы свякроўчыны.
Трэба рана ўстаць ды цяляткам даць,
Сені і хату падмясці і вады прынясці,
Усё дзела парабіць і свякроўцы ўнаравіць.

У гэтай песні вобразны паралелізм не такі разгорнуты, як у вясельных песень. Тут паралель толькі пазначана ў агульным плане, але затое адразу выразна выяўлена галоўная думка твора: імклівая рэчка з крутымі берагамі павінна змяніць сваё рэчышча, роўна прайсці праз лугі, а дзяўчыне неабходна адкінуць свае кепскія звычкі, прыладзіцца да новых невядомых ёй абставін у чужой сям'і. У песні сцвярджаецца думка аб тым, што як нельга змяніць рэчышча ракі, так і немагчыма змяніць прыроджаны і гадамі выпрацаваны характар чалавека. Пра гэта гераіня адной з песень гаворыць: «Маёй натуры не перастановяць. Мая натура — айца і матулі».

Тэмы і матывы дзявочых песень тыпу выказванняў і лірычных роздумаў бываюць розныя: ад нараканняў на няўдалае каханне, горкае бяздолле да значных разважанняў-абагульненняў на падставе шматлікіх жыццёвых фактаў. У пераходных песнях ад любоўных да вясельных з сямейнай тэматыкай глыбока і шматгранна паказана вольнае і шчаслівае жыццё дзяўчыны да замужжа ў бацькоўскай хаце. Дзяўчына паказваецца паслухмянай, яна паважае сваіх бацькоў, ва ўсім просіць у іх дазволу і парады, разважае з імі: «Што мне рабіць: Ці замуж ісці, Ці дома быць? Замуж пайшоўшы — вялікае гора, А дома быць — людская мова». Песні гэтай падгрупы ўсебакова раскрываюць крыштальна чыстую душу дзяўчыны, у іх шырока і змястоўна выявілася гама пачуццяў дзяўчыны перад замужжам, якое з'яўляецца для яе загадкай: «Ручанькі мае, ручанькі белыя, Каму ж вы будзеце, мілыя? Калі старому — бронь Божа!



«Нам цымбалы надаелі, зайграем на акарыне...» (майстар з Івянца Ф. Целішэўскі). Фота Я. Казюлі.

Калі пароўні мяне — дай Божа!» Дзяўчыну палохаюць магчымыя абставіны, якія прымусяць яе выйсці замуж за старога, малога, п'яніцу ці ўдаўца. Іншы раз яна асмельваецца звярнуцца да бацькоў з просьбай аддаваць замуж толькі за роўнага, бо:

Не за роўным быць — сухата мая,
А за любым быць — красата мая.

У дзявочым уяўленні найбольшы страх выклікаюць лютая свякроў і свёкар з іх павучаннямі і нараканнямі, бо ім маладзіца павінна будзе ва ўсім падпарадкоўвацца. На нявестку мужава радня глядзіць перш за ўсё як на рабочую сілу, даўно жаданую ў сям'і:

А ў мяне дома ды й ліхі свёкар,
Ды ліхі свёкар ды й свякруха.
Ой, сустрэнуць мяне на варотачках,
Ой, пашлюць мяне ды й па вадзіцу,
Ой, ў шчыры бор у крыніцу.

У песнях-роздумах жанчына звычайна звяртаецца ў думках да маці, якая можа яе пачуць і ўспомніць, сядаючы за стол вячэраць. Дачка не апавядае ёй пра свае пакуты, а толькі ў марах адмаўляецца ад запрашэння ісці вячэраць:

Я ўжо дома вячэрала,
Не сухі ж хлеб ела,
Слёзкамі палівала,
Сваю долю праклінала.

Роздум аб долі тут не толькі ўмоўны, сімвалічны, але і набывае рэальную аснову. Клічучы долю, якая невядома дзе дзелася, «ці ў моры ўтапілася, ці ў агні згарэла», маладзіца ўспамінае родны бацькоўскі кут і раздумвае над сваім лёсам.

Песень-роздумаў хлопца пра будучую жаніцьбу значна менш у беларускай сямейна-бытавой лірыцы, чым у любоўнай. Хаця на Міншчыне і «хлапечых» і «дзявочых» песень бытуе шмат.

У песнях падрыхтоўчага перыяду хлопца да жаніцьбы шмат разважлівасці. У іх часта дарадчыкамі ў выбары пары выступаюць не толькі бацькі, але браты і сёстры.

Песні-роздумы аб будучым замужжы і жаніцьбе адлюстроўваюць глыбокія інтымныя пачуцці маладых людзей. Яны жывуць надзеяй на лепшую долю і трывожацца з-за магчымых няшчасцяў у будучым сямейным жыцці.

Больш дэталёва сямейныя калізіі раскрываюцца ў вялікай тэматычнай групе песень замужняй жанчыны аб жыцці ў народнай сям'і. Тут яскрава вылучаюцца матывы ўдумлівага разважання замужніцы над сваёй доляй, радзімай старонкай у нялюбым чужым краі, дзе «трудно жыці, трудно быці, з чужым гаварыці», а таксама з вялікім драматызмам раскрываюцца адносіны родзічаў мужа да нявесткі.

493. Ой, белая бярозачка, бялей майго цела...



Ой, белая бярозачка, бялей майго цела**,
Не 'ддаў мяне мой татачка, за каго хацела..
Не 'ддаў мяне мой татачка, каб я гаравала,
Аддаў мяне мой татачка, каб я гаравала.
Не 'ддаў мяне мой татачка, каб бела хадзіла,
Аддаў мяне татачка, каб дзела служыла.
Ні я пела, ні я ела, ні бела хадзіла,
Я за сваім за мужайкам леты патраціла.
Запражыце-залажыце коні вараныя,
Паеду я даганяці годы маладыя.
Даганяю я свае годы ў калінавым мосце:
— Вярніцеся, мае годы, хаця ка мне ў госці.
— Ня вернемся, ня вернемся, бо няма да каго.
Трэба табе шанаваці здароўейка сваё.
Ня вернемся, ня вернемся — было не спяшацца,
Такой табе маладзенькай замуж не 'ддаваццa.

** Другая палова кожнага радка паўтараецца.

494. Ой, жураўка, жураўка...



— Ой, жураўка, жураўка,
Чаго грачаш так жалка?
— Ой, як жа мне не гракаць,
Трэба высока лятаць.

Ой, высока, высако
Ад радзімы даляко.
Адбілася ад роду,
Нібы камень у воду.

Упаў камень да й ляжыць,
На чужбіне гора жыць.
Не дай Божа забалець —
Няма й каму пажалець.

Не дай Божа паміраць —
Няма й каму пахаваць.
Пахавае чужына,
Знаць не будзе радзіма.

495. Ой, жураўка, жураўка...



Ой, жураўка, жураўка**,
Што й крачыш ты на ранка?

— Ой, як жа мне не крачыць? —
Трэба высако лятаць.

Шчэ й высока-высако,
Шчэ й да дому далеко.

Не дай Божа забалець,
Нема каму пажалець.

Есць на свеце людзі, есць,
Яны будуць шчэ й жалець.

Кіну камень у ваду, —
Адбілася ад раду.

Не дай Божа паміраць,
Нема каму пахаваць.

Пахавае мяне поп,
Возьме грошай восем коп.

Пахавае мяне дзяк,
Пахавае ён за так.

Пахавае чужына,
Не узнае радзіна.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

496. Сулавейка маленькі...





Сулавейка маленькі**,
Ў яго голас тоненькі.

Не садзіся на вакне,
Не задавай жалю мне.

Не задавай жалю мне —
Я й на чужой старане.

Я й на чужой старане
Без братачкі, без сястры.

Самі слёзы коцяцца,
Мне к радзіне хочацца.

Запражы, мілы, каня,
Я й паеду хоць адна.

Я й паеду хоць адна
Цераз поля і ляса,

Цераз быстраю раку,
Падай, мілянькі, руку.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

497. Ой, ляцела, не даляцела...



Ой, ляцела, не даляцела
Й і к мамучцы сваёй,
Ой, села я, ой, пала
У вішнёвенькім саду.

Ці ня выйдзя татачка пытаць,
Й а мамачка слухаці:
— Скажы, донюшка мая,
Як чужая старана?

— Ой, чужая старана
Гарчыцаю сеяна,
Гарчыцаю сеяна,
А кукалём саджана.

Вот расцвёў жа той куколь,
Ой, рознымі цвятамі,
Ой, рознымі цвятамі —
Сінімі васілямі.

Нема цвету сінейшого,
Як сіні васілёк;
Нема друга любейшого,
Як мой мілянькі дружок.

498. Была я ў мамачкі на выгодзя...



Была я у мамачкі на выгодзя,
Садзіла арэшанькі у гародзя.

Расціце, арэшанькі, вышэй плоту,
Аддаў мяне татачка за блазноту.

Аддаў мяне татачка за блазноту
У ліхую хатачку на работу.

Чужыя малодачкі п'юць, гуляюць,
А мяне мой блазнотачка не пускаець.

А мяне мой блазнотачка не пускаець,
Толькі да работачкі прыціскаець.

А свёкар на вуліцы абгаворыць,
Радзіначка хату абыходзіць.

А пайду, пайду да татачкі папрашуся,
Калі прыміць татачка — я вярнуся.

А татачка родненькі не прымаець,
Мяне да блазнотачкі адпраўляець.

А я да блазнотачкі не вярнуся,
Пайду ў быстру рэчаньку да ўтаплюся.

Як да быстрай рэчачкі падхадзіла,
А на мяне сонейка засвяціла.

А на мяне сонейка засвяціла,
А там мая мамачка падскачыла.

А там мая мамачка падскачыла,
Яна мяне за ручачку падхваціла.

Яна мяне з рэчачкі ратавала
І маё замужжачка праклінала:

— Лепей ты, мая дочанька, састарэла,
Хоць бы маё сэрдзенька не балела!

499. Аддаў мяне бацюшка вельмі замуж маладу...



Аддаў мяне бацюшка вельмі замуж маладу,
Вельмі замуж маладу у вялікую сям'ю.

А ўжо ж мае сям'ецо вячэраці садзіцца,
А мяне, маладзіцу, выправілі па вадзіцу.

А ночанька цёмная, а дарожанька ціская,
І калодзяж даляко, і вадзіца глыбако.

Пакуль вады прынясла, ўся вячэра адышла,
Ўся вячэра адышла, сям'я спаці лягла.

Я й вадзіцы нагрэла да лыжэчкі памыла,
Сені, хату замяла, тады спаці лягла.

Заўтра ўстала раненько, умылася беленько,
Уцерлася палатном, паслухала пад акном.

Што сям'іца гаворыць да мілога навучыць:
— Чаму жонкі не б'еш, чаму не караеш?

— За што ж маю жонку біць? Яна ўмее ўсё рабіць:
І ў печы паліць, і са мною добра жыць.

Калі яна лянівая — навучайце яе,
Калі яна санлівая — прабуджайце яе.

500. Па саду я хажу, сама сабе гавару...



Па саду я хажу, сама сабе гавару:
«Аддала мене маць у чужую старану»**

У чужую старану да ў вялікаю сям'ю,
Ой, вяліка сям'я ўся вячэраць пасела.

Ох, мяне, маладу, пасылаюць па ваду.
Я й па воду пашла, нідзе вады не нашла.

Толькі нашла крынічаньку, начарпнула поўвядра,
Пакуль дадому дашла, ўсё слёзамі даліла.

А дадому прыйшла, паставіла ля сяней,
Паставіла ля сяней, сама стала ля дзвярэй.

Да паслухаю я, што гаворыць сям'я.
Ой, вяліка сям'я навучая мужыка:

— Чаму жонку ня б'еш, чаму волю ёй даеш?
— Ой, за што яе біць? Яна ўмее ўсё рабіць:

І варыць да й паліць, і са мною гаварыць,
І чытаць, і пісаць да й па садзіку гуляць.

** Першы радок кожнай страфы выконваецца адной спявачкай, а другі — гуртам. Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

501. Да я ўчора п'яна была...





Да я ўчора п'яна была**,
А сягоння цвярозая.

Хацеў мяне свёкар пабіць,
Свякровушка вяліць набіць.

Свякровушка вяліць набіць,
А дзеверка п'янчуг дзяржыць.

А міленькі каня поіць,
Каня поіць, татку просіць:

— А татачка мой родненькі,
Ня бі жану п'яненькаю!

А бі жану цвярозаю,
Ой, белаю бярозаю.

Бярозачка шумець будзя,
Ёй, маладзе, балець будзя.

** Кожны радок паўтараецца.

502. У бару калыска высока, не нізка...



У бару калыска высока, не нізка**,
Калышуцца дзеўкі, слічныя паненкі.
І мне, маладзенькай, туда захацелась.
Праз цёмную ночку туда заляцела.
Набіў мяне свёкар дратаванай пужкай.
А я з таго бою нядзелю хварэла,
Нядзелю хварэла: ні піла, ні ела.
У бару калыска высока, не нізка,
Калышуцца дзеўкі, слічныя паненкі.
І мне, маладзенькай, туда захацелась.
Праз цёмную ночку туда заляцела.
Набіў мяне мілы шоўкавай істужкай.
А я з таго бою ні дня ні хварэла,
Ні дня ні хварэла, усё піла да ела.

** Кожны радок паўтараецца.

503. Там, у дуброве, зязюля кукавала...



Там, у дуброве, зязюля кукавала,
Там, у зялёнай, зязюля кукавала.

Пакінь-пірастань, зязюля, кукаваці,
Пакінь-пірастань, татачка, бедаваці.

Па ваду іду босенькамі ножкамі,
На зару гляджу ясненькімі вочкамі.

А я думала, што зара перагарая,
Ажно мая мамка вялікі банкет мая.

504. Туды-сюды дзве дарожачкі...



Туды-сюды дзве дарожачкі,
А трэцяя ў сад**,

А там браты мае родныя
Шчыплюць вінаград.

Запіліся, загуляліся,
Забыліся на мяне,

Адна мая мамка родная
Ўспамянула мяне:

— А дзе ж мая ды дачушачка
На чужой старане?

Глядзіць яна ў вакошачка,
Слёзкі горкія лье.

** Кожная страфа паўтараецца.

505. Вот і сонейка за бор коціцца...



Вот і сонейка за бор коціцца,
Мне да мамачкі ў госці хочацца**.

Зраблюсь ззюлькай — туды палячу,
Ці не ўбачу татку, коні пасучы,

Родную сястрыцу, воду несучы,
Сваю мамачку, кароў доячы.

Дзе ж мяне мамка сустракаць будзе,
Чым мяне мамка частаваць будзе?

Сустракаць будзе за новым дваром,
Частаваць будзе мёдам і віном.

Частаваць будзе, да й пытаць будзе:
— Як табе, дачка, у мужа за сталом?

— Як есці, мамка, рэдзьку з палыном,
Так жа мне, мамка, ў мужа за сталом.

Я ў канцы стала настаялася,
Дробных слёзачак назлівалася.

Вот і сонейка закацілася,
З сваёй мамкаю павідалася.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

506. А я ў горы не радзілася...



А я ў горы не радзілася,
Ка мне гора прыключылася.

Ка мне гора прыключылася:
Ад мамачкі адлучылася**.

К свякроўцы прылучылася,
Свякровачка да не мамачка.

А я яе не дзіцятка,
Самі селі да вячэраці.

Мяне, млода, шлюць у Дунай па ваду,
За Дунаем стаіць хатачка.

А ў тэй хатцы мая мамачка
Кліча мяне да вячэраці.

— Дзякуй, мамка, дзякуй, родная,
Я із дому не галодная.

Я не ела сухама хлеба,
А я ела і з малінкаю.

Запівала ўсё вадзіцаю,
Начавала с чужаніцаю.

** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

507. Нядоля мая, няшчасця маё...



Нядоля мая, няшчасця маё,
Пракляла свякроўка іменя маё**,

Мяне, маладу, пашлець па ваду:
— Схадзі, нявестачка, ў Дунай па ваду.

Ой, стукну я, грукну, ў Дунай ідучы,
Каб пачуў мой мілы, коні пасучы.

Набраў, набраў ён з Дунаю вады:
— Нясі, мая мілая, паціхонечку.

Каб твая вада не ўлякнулася,
Каб твая свякроўка не прачнулася.

— Ўставай, свякроўка, з Дунаю вада,
Сагніся, напіся з поўнага вядра.

— Я цябе, навестка, не з вадой ждала,
Я цябе, нявестка, з свету збаўляла.

— Каб ты, свякроўка, з ноўшчы ляжала,
Як жа ты мне, маладой, свет завязала!

— Каб ты, нявестачка, дзяцей не мела,
Я ж цябе за сына браць не хацела!

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

508. Вот у роўным полі стаяла карчомка...





Вот у роўным полі стаяла карчомка,
А у тэй карчомца ўся мая радзімка.

Ўся мая радзімка; п'юць яны, гуляюць,
П'юць яны, гуляюць, мяне ўспамінаюць.

— Ці наша сястрыца коніка ні мае,
Ці наша сястрыца дарожкі ні знае?

— Я й коніка маю, і дарожку знаю,
Я ад свайго мужа волячкі не маю.

Я ад свайго мужа волячкі не маю:
Каня запрагаю, а ён выпрагая.

Каня запрагаю, а ён выпрагая,
Да маёй радзімкі ў госці не пуская.

— Пусці, пусці, мілы, ў госці да радзімы.
— Не пушчу, не пушчу і сам не паеду.

Вот не пушчу, не пушчу і сам не паеду,
Як ты свайму роду раскажыш прыгоду.

Як ты свайму роду раскажыш прыгоду.
— Не буду казаці, а буду маўчаці.

Не буду казаці, а буду маўчаці,
Як агорнуць слёзкі, я выступлю з хаты.

Ніхто не пазнае, толькі родна маці,
Будзя даганяці, праўдачкі пытаці.

509. Ой ты, мілы мой, дружына мая



— Ой ты, мілы мой, дружына мая,
Ізвёў ты мене, дзе роду нема.

Ні раджонаго, ні суджонаго,
Не к каму выцці, пагаворыці.

— Мілая мая, няпраўда твая,
Цераз вуліцу там кума мая.

А ў таей кумы стаяць два дубы,
А на тых дубах сядзяць галубы.

І цалуюцца, і мілуюцца,
З нашага жыцейка ўсе дзівуюцца.

510. Ой, вярба, вярба кудравая...



— Ой, вярба, вярба кудравая,
Ой, жана, жана маладая!

Хто ж табе, вярба, кудры развіў,
Хто ж табе, жана, слёзы разліў?

— Развілі кудры буйны ветры,
Разлілі слёзы ліхі людзі.

Ой, людзі кажуць — мой муж ні п'е,
А ён п'е да п'е, з карчмы ні йдзе.

Прапіў каня варанога,
Прыйшоў дадому па другога.

— Ой, жана, жана, выкуп каня,
Як ні выкупіш — заб'ю цебя.

Як ні выкупіш — заб'ю цебя,
А як выкупіш — люблю цебя.

— Ой, ні раз, ні два выкупляла,
Пад акенчыкам начавала.

Пад акенчыкам начавала,
З ціхім салаўём размаўляла.

Салавеячко: «Чу-чу, чу-чу»,
А я й, малада, плачу, плачу.

511. Каб я знала ж, каб я ведала...



Каб я знала, каб я ведала
Свае горкае замуж'ейко.

Свае горкае замуж'ейко,
А ліхое да й падруж'ейко.

То б я замуж да й навек не пашла,
Я б у маткі як жыла, так была.

Я б у маткі красавалася,
Штосуботунькі ўмывалася.

Штосуботунькі ўмывалася,
Штонядзелькі — расчасаласа,

Штонядзелькі — расчасаласа,
Касе сваей дзіваваласа:

— Ой ты коска ж мая русянькая,
Каму, коска, ты дасталася?

Дасталася горкай п'яніцы,
От п'яніца напіваецца.

От п'яніца напіваецца,
З маім родам настыраецца,

З маім родам настыраецца,
Перад сваім выхваляецца.

512. Ох, і соняйка ты маё ясная...



Ох, і соняйка ты маё ясная,
Да мая долюшка няшчасная!

Да мая долюшка няшчасная:
Ў мамкі была, гора відзяла.

Ў мамкі была, гора відзяла,
Замуж ішла — не таго ждала.

Замуж ішла — не таго ждала.
Работушкі мне пабольшала.

Работушкі мне пабольшала,
Сілушкі ў мяне паменьшала.

Сілушкі ў мяне паменьшала,
Да за каго ж ты мяне замуж аддала!

Да за каго ж ты мяне замуж аддала,
Да за такую горку пьяніцу!

Да за такую горку пьяніцу,
Да за такую за недбайніцу!

Да за такую за недбайніцу,
Ох, і пьяніца ў кабак ідзёт.

Ох, і пьяніца ў кабак ідзёт,
У кабак ідзёт, напіваецца.

У кабак ідзёт, напіваецца,
З кабака ідзёт, ругаецца.

513. Як пайду я ў сад-вінаград...



Як пайду я ў сад-вінаград,
Наламлю хмелю ярога.

Наламлю хмелю ярога,
Навару піва п'янога,

Навару піва п'янога,
Напаю мужа ліхога.

Напаю мужа ліхога,
Палажу спаць на караваць.

Абкладу я й пярынаю,
Па'блію кірасінаю.

Аблію кірасінаю,
Падпалю я й лучынаю.

Сама выду на вулачку,
Крыкну-гойкну ратуначку:

— Вы, людзі, суседзі мае,
Вы спіце да не чуеце,

Што ўначы грымота была,
Маланнёй двор запаліла!

Маланнёй двор запаліла,
А стралой мужа забіла!

514. Дзякуй Богу за добрага мужа...



Дзякуй Богу за добрага мужа**,
Што ён мяне не б'ець, ні караіць,
Што ён мяне на вулку пускаіць.
— Гуляй, гуляй, мая чарнаброўка,
Пакуль мая здарова галоўка.
Як мая галоўка здрыгнецца,
Як мая галоўка здрыгнецца,
Тады тваё гулянне мінецца.

** Кожны радок паўтараецца.

515. Чаго ты, кветка, на вадзе звяла...



— Чаго ты, кветка, на вадзе звяла**,
Ці ты, сястрыца, сем год ляжала?
— Я не ляжала а ні нядзелькі,
Высушыў мяне муж маладзенькі.
Муж маладзенькі ходзіць да дзеўкі,
Ходзіць да дзеўкі, дзеўку кахаіць,
А мне ён сэрца пераядаіць.

** Кожны радок паўтараецца.

516. Выйду я на горачку...



Выйду я на горачку, эй**,
Пасматру ў пазорачку.

Мой мілы з вайны едзя,
Коніка ў руках вядзе.

Я ж яму рада стала,
Я ж яго піраймала:

Коніка за 'бротачку,
Мілага за ручачку;

Коніка ў стаіньку,
Мілага ў спаленку;

Коніку — аўса-сена,
З міленькім сама села.

А конік ня п'е, ня есць,
Міленькі ні гавора.

А конік — па коніках,
Міленькі — па дзевачках.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

517. А на гарэ соўнюшка, ў даліне туман...



А на гарэ соўнюшка, ў даліне туман, о,
А мне, маладзюсенькой, жалюшка й пячаль.

А мне, маладзюсенькой, жалюшка й пячаль,
Што за пячалюшка? — дружка ў доме нет.

Што за пячалюшка? — дружка ў доме нет.
Да паехаў мой дружок ў новы гарадок.

Да паехаў мой дружок ў новы гарадок,
А я, маладзюсенька, за ім у слядок.

А я, маладзюсенька, за ім у слядок:
— Вярніся, мой міленькі, вярніся дамой.

Вярніся, мой міленькі, вярніся дамой,
А калі ня вернешся, я сама вярнусь.

Да пайду на стайняйку, выберу каня,
Да выберу коніка вараненькага.

Запрагу калясачку маляваную,
Да паеду вулачкай брукаванаю.

Да паеду вулачкай брукаванаю,
Да па етай вулушке мой мілай ідзе.

Да па етай вулушке мой мілай ідзе
Да чужую шэльмачку пад ручкі вядзе.

Да чужую шэльмачку пад ручкі вядзе,
А я, маладзюсенька, здагадалася.

А я, маладзюсенька, здагадалася,
Да ў нову каморачку захавалася.

Да ў нову каморачку захавалася,
Пакуль маё сердушка наігралася.

518. Ўжэ на дварэ дзень бяленькі...



Ўжэ на дварэ дзень бяленькі**,
Да прысніўся мой міленькі.

— Дзе ты, мілы, валачыўся,
Што па пояс умачыўся?

— Па гародам, па пшаніцам,
Па харошых маладзіцах.

— Чаму чужа жонка гожа?
— На ёй хустачка хароша,

Рубашачка паркалёва,
Сама бела, чарнаброва.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

519. Дзе ты, мілы, валачыўся...



Дзе ты, мілы, валачыўся**,
Што па пояс абмачыўся?

— Валачыўся за начною,
За чужою ўсё й жаною.

— А чым чужа жонка ладна?
— Да на ёй хустэчка вабна,

А кашуля паркалёва,
Сама бела, чорнаброва.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

520. А ў гародзе хмяліначка...



А ў гародзе хмяліначка,
Не сцеліцца, ўецца,
Усе жонкі з мужыкамі,
А мой не хінецца.

Як пайду я, як пайду я
Вузкай даліною,
Сядзіць мілы за гарою
З чужою жаною.

Каля яго я прайшла,
Слоўца не сказала,
Толькі сэрцу цяжка стала,
Слёзкі пралівала.

521. Усіх коні па лугах ходзюць...



Усіх коні па лугах ходзюць, —
Маі — к боражочку[1],
Усіх коні асаку ядуць,
Маі — муражочку.

Усіх коні асаку ядуць,
Маі — муражочку,
Усіх мужы п'юць-гуляюць,
А мой не гавора.

Усіх мужы п'юць-гуляюць,
А мой не гавора,
Ляжыць жа ён да на белай ложы,
Маё сэрца кроя.

Ляжыць жа ён жа на белай ложы,
Маё сэрца кроя,
Паламайцеся тыя столікі,
А дзе я сядзела.

Паламайцеся тыя столікі,
А дзе я сядзела,
Да пабудзіцеся тыя шкляначкі,
Што я піла-ела.

Да пабудзіцеся тыя шкляначкі,
Што я піла-ела,
Пазасыпайцеся тыя дарожкі,
Да дзе я хадзіла.

Пазасыпайцеся тыя дарожкі,
Да дзе я хадзіла,
Што ўхадзіла, да што я гуляла,
С сваім мілым ўпіўшы.

Што ўхадзіла, да што я гуляла,
С сваім мілым ўпіўшы,
Што я ўела, да што я ўгуляла,
За столікам сеўшы.

[1] «К боражочку» — тут зн. «к беражочку».

522. Стаіць студня шчэ й новая...





Стаіць студня шчэ й новая,
А ў ёй вада зімовая.

А ў ёй вада зімовая.
Зімовая, бегучая**,

Бегучая, кіпучая,
Закіпела сэрца ва мне.

Ні на кога на чужога,
Як на свайго все мілога.

Мілы ў доме не бывая,
Па дарогах паезжая,

С паўдарожкі ён вярнуўся,
Лёг жа спаці, не разуўся.

Я такая дагадліва,
Я разула, распранула.

Я разула, распранула,
З сабой спаці палажыла.

З сабой спаці палажыла —
К сцяне гачмі, к сабе плячмі.

— Адхінайся, нялюбая,
У мяне ёсць і другая.

— Няхай сабе тры-чатыры,
Я старшая над усімі.

Я ў цэркаўцы пабывала,
На ручнечку пастаяла.

Верна Богу прысягала,
Каб с табою векавала.

** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

523. Чаму, мілы, ляжыш, ня арэш...





— Чаму, мілы, ляжыш, ня арэш
Да парою дамоў ня йдзеш?
— А я ляжу да й думаю,
Што ўзяў жану нялюбую.
Ні прадаць яе, ні змяняць яе!
— Ці табе ж чорт вочы драў —
Ты ж мяне не ўночы браў!
Да браў мяне шэрай гадзінаю
Да с усяею радзінаю.

524. Пад ялінаю, пад зяляною...



Пад ялінаю, пад зяляною,
Люлі, люлі, пад зяляною**.
Расла кветачка ўсё баравая.
Вышла дзеўчына чэрнабровая,
Вывяла каня да й асядлала.
Вынясла сурдут да камязэльку.
— Куды паедзеш, Ясю міленькі?
Калі да дзеўкі — жыві са мною,
Калі да жонкі — едзь дарогаю.
Праехаў Ясю чатыры мілы:
— Прыстаў мой конік, Божа мой мілы.
Каб ня жоначка, ня дробны дзеці,
Добра думаці, добра сядзеці.
Жоначка жура, дзетачкі плачуць,
Што яны ў вочы хлеба не бачуць.
Ешце вы, дзеткі, ляннаю кашу,
Я для вас хлеба не прызапашу.

** «Люлі, люлі» і другая палова кожнага радка ўтвараюць прыпеў да кожнай страфы.

525. Ой, палын, палын...



Ой, палын, палын, ой палын, палын, трава горкая,
Мая долечка, мая долечка за ўсіх горшая.
Цёмна ноч была, цёмна ноч была ды нявідная,
Жонка проч пашла, жонка проч пашла, мяне кінула.
Я не ўтрываю, я не ўтрываю, я папытаю:
— Дзе ж ты, мілая, дзе ж ты, мілая, начаваць будзеш?
З кім ты, мілая, з кім ты, мілая, размаўляць будзеш?
— Начаваць буду, начаваць буду я ў татулечкі,
Размаўляць буду, размаўляць буду і з мамулечкай.

526. Ой, пайду я гарой, даліною...



Ой, пайду я гарой, даліною**,
Спаткаў мяне казак маладой.

Стаў ён мяне дарожкі пытацца,
Я не ўмела яму адказаць.

— Дзяўчыначка, дзяўчыначка росла,
Куды гэта дарожачка пошла,

Ці ў луг, ці ў бор, ці ў роўнае поле?
А ў роўным полі пшанічка стаяла.

— У пшанічкі ліповы кусточак,
На кусточку шырокі лісточак.

На лісточку салавейка свішчыць,
Мяне свёкар да хатачкі клічыць.

Хоць кліч, ня кліч — я не адклікнуся,
Без мілога дамоў не вярнуся.

А мой мілы дома не начуець,
Ночку ў ночку на кані гарцуець.

Скакаў, гарцаў пад гай зеляненькі:
— Адкуль едзеш, мілы, маладзенькі?

** Кожны радок паўтараецца.

527. Закукуй, закукуй, ды зязюленька, ў леся...



Закукуй, закукуй, ды зязюленька ў леся,
Можа, мяне пан Бог ды адгэтуль вынеся.

Закукуй, закукуй, ды вясёлая пташка,
На чужой старонцы, як жыці ж мне цяжка.

Выйду ж я на вулку, ды кугічка кугіча,
Матка дачушку да дадомачку кліча:

— Ідзі, мая, ідзі, ты, дачушка, дадому,
Я табе пашыю ды сукенку дадолу.

— Не хачу я, мамка, ды сукенкі дадолу,
Не пайду я, мамка, ды з табою дадому.

Дуб ды да дуба да галоўкі ня склоніць,
Цёшча да зяця ды слаўца не прамовіць.

— Не люблю я зяця і паходачку яго,
Ой, заглумляла ж ды дзіцятачка маё.

528. Ой, зяцько, зяцько, ты маё дзіця...





Ой, зяцько, зяцько, ты маё дзіця,
Ўзяў дачку маю, як кветіначку.

Ўзяў дачку маю, як кветіначку,
Ой, ссушыў-змарыў, як лучыначку.

— Ой, ня я ссушыў — ссушыла кросна,
Ўсё мая весна, як стаіць красна.

Бёрда бёрдзіцца, а ніць ніціцца,
Мая мамачка да ўсё сердзіцца.

529. Ой, мой бацюшка, ой, мой родненькі...



Ой, мой бацюшка, ой, мой родненькі,
Ня рубай дрэва, куды ня хінецца.

Ня рубай дрэва, куды ня хінецца,
Не аддай мяне, куды не хочацца.

Ні за старага, ні за малага,
А аддай мяне за паромнічка.

А аддай мяне за паромнічка,
За паромнічка-палюбоўнічка.

Бо я старага на лажы спалю,
Бо я малага у Дунай пушчу.

Бо я малага у Дунай пушчу,
А з паромнічкам часта ў госці прыду.

А з паромнічкам часта ў госці прыду,
Да й прыду я ў госці да й сярод нядзелі.

Ой, пайду я ў госці сярод нядзелі,
Да й сярод нядзелі, да й у сераду.

Да й у сераду ўсёй папераду.
У варот стаіць да й мой бацюхна.

У варот стаіць да й мой бацюхна,
— Добры дзень табе, ты мой бацюхна!

Добры дзень табе, ты мой бацюхна!
— Ой, здароў, здароў, ты мой зяцюхна!

Ой, узяў дачку, як маліначку,
Ой, ссушыў яе у лучыначку.

— Ой, не я ссушыў, а ссушыла вясна,
А ссушыла вясна, ой, ткучы кросна.

Ніці ніцяцца, бёрдо бердзіцца,
А мая малада усё сердзіцца.

А мая малада усё сердзіцца,
А й бёрда б'юцца, а ніткі рвуцца.

А й бёрда б'юцца, а ніткі рвуцца,
У мае лёлі усё слёзкі рвуцца.

530. Ой, ліха доля злучыла...



Ой, ліха доля злучыла,
Рана замуж выскачыла.
Ух я, бедная, бедна галоўка мая!**

А за тыдзень па вяселлю
Прыносі мілы кудзелю.

Прыносі ён і прасніцу:
— То для цябе, няшчасніца.

Прыносі і верацёны:
— То для цябе, мая жона.

Здзявай, жонка, запатылкі,
Гані ў поле чорны свінкі.

Чорны свінкі ў поле гнала
І да мамкі лісты слала.

А як мамка дазналася,
Шасцьмі коньмі прыехала:

— Дзе ты, дочка, падзявала,
Што я табе надавала?

— Сукні-маты прадавала,
Гора з хаты выганяла.

Як прадала пасцель нову,
Дык купіла лысую крову.

— А ты, дурны, нашто хадзіў,
Маю дачку зводзіў?

Гаварыў, хата муравана,
Аж каламі падпірана.

Гаварыў, вокны крышталовы,
Аж саломай затыкнёны.

Гаварыў, сталы цісовыя,
Аж старыя сасновыя.

Гаварыў, печы кахляныя,
Аж благія, гліняныя.

** Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы.

531. А зяць да цешчы ды галовачку клоніць...



А зяць да цешчы ды галовачку клоніць**,
Цешча да зяця адным вокам не гляніць:
— Аддала да табе да дачушачку добра,
У цябе стала мізарнюсенька, дробна,
У мяне была як чырвоная ружа,
А у цябе стала ды як бела бяроза.
А ў лузе да каліначка жарка,
Кожнай маці сваёй дзіцяці жалка.
А ў лузе, лузе ды каліна жарэіць,
Кожная маці да дзіцяці жалеіць.

** Кожны радок паўтараецца.

532. Сястра ходзіць па вуліцы...



Сястра ходзіць па вуліцы,
А брат па садочку,
Брат у сястры пытаецца:
«А ці аднога мы роду?»

— Мой браціца, мой родненькі,
Аднога мы роду,
Адна мамка нас радзіла,
Адна гадавала.

Адна мамка нас радзіла,
Адна гадавала,
Няроўнаю нам долечку,
Долю нам давала.

Табе дала, мой браціца,
Долю купцавую,
А мне дала, мой браціца,
Долю слезавую.

Усе людзі жыта сеюць,
А я свае гора.
Людзі просюць пана-Бога,
Каб жыта ўрадзіла.

Людзі просюць пана-Бога,
Каб жыта ўрадзіла,
А я прашу пана-Бога,
Каб доля не ўсхадзіла.

Як узышло мае гора
Густымі кустамі,
Усе кусты пустацветы,
Адзін — васілечык.

Усе кусты пустацветы,
Адзін — высілечык,
— Прыедзь, прыедзь, мой татулька,
Хоць на адзін вечарочэк.

Я й думала-разумела —
Саколік сакоча,
Ажно ж, ажно майго таткі
Сівы конь рагоча.

Я й думала-разумела —
Сонца ў аконца ўходзя.
Ажно, ажно мой татулька
Ка мне ў хатку ўходзя.

— Пераначуй, мой татулька,
Хаця адну ночку,
А я табе, татулечка,
Вячэрку згатую.

А я табе, татулечка,
Вячэрку згатую,
А я табе, мой татулька,
Пасцельку пасцялю.

А я табе, мой татулька,
Пасцельку пасцялю.
— Не пераначую, дачушка,
Не адной жа я ночкі.

533. А ў гародзе дзве яблонкі...



А ў гародзе дзве яблонкі,
Трэцяя мяжа,
Ішлі-прайшлі два брацейкі,
Трэцяя сястра.

— Ой, брацяйкі, вы родныя,
Госцікі мае,
Як пойдзеця ў вішнёвы сад,
Вазьміце і мяне.

Як будзеця рваць яблычкі,
Нарвіце і мне,
Штоб не была галодная
Ў чужой старане.

Як будзеця піці-есці,
Ўспомніця й мяне:
А дзе ж наша гаротніца
Ў чужой старане?

Ці гаруець, ці пануець,
Ці мёд-віно п'ець?
Ці горкія, гарачыя
Слёзачкі ліець?

Не гаруець, не пануець,
Мёд-віно не п'ець,
А горкія, гарачыя
Слёзачкі ліець.

534. Выйду я на вулачку...



Выйду я на вулачку**,
Паляджу пад ручачку.

Да лятуць два конікі,
Два конікі годныя.

Да едуць два брацяткі,
Два брацяткі родныя.

Прыехалі ў падвор'ейка:
— Здраствуй, наша сястрыца.

— Здраствуй, мае брацяткі,
Здраствуй, мае родныя.

— Ці дома твой п'яніца?
— Ці дома нідбайліца?

— Дома, дома, брацяткі,
Дома, мае брацеткі.

Спіць, ляжыць у каморачцы
На маёй пасцелечцы.

Пайду памаленячку,
Будзіць паціхоненьку.

— Устань, устань, міленькі,
Устань, чарнабрывенькі,

Прыехалі два госціка,
Два госціка годныя.

Два госцікі годныя,
Два брацяткі родныя,

— Адступісь, нямілая,
Твае браты пастылыя.

Я млада адхінулася,
Слёзкамі аблілася.

— Едзьця, мае брацяткі,
Едзьця, мае родныя,

Ні кажыце мамачцы,
Што былі ў хатачцы.

Скажыце — не даехалі,
Конікі не дабеглі.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

535. О, с-пад лесу, лесу цёмнага...



О, с-пад лесу, лесу цёмнага,
С-пад бярэзнічку зялёнага.

С-пад бярэзнічку зялёнага
Выляталі да два конікі.

Выляталі да два конікі,
Два конікі, да два модныя.

Два конікі, да два модныя,
Выязжалі да два брацяйкі.

Выязжалі да два брацяйкі,
Два брацейкі, да два родныя.

Два брацейкі, да два родныя
Прыехалі да сястры ў госці.

Прыехалі да сястры ў госці:
— Кланям, кланям, наша сястрыца

— Кланям, кланям, наша сястрыца
А ці ў дому ж тая п'яніца?

А ці ў дому ж тая п'яніца?
— Ў дому, ў дому, у пярыня спіць.

Ў дому, ў дому, у пярыне спіць.
— Трэба ж нам яго пабудзіці.

Трэба ж нам яго пабудзіці,
Трэба ж нам яго навучыці.

— Браткі мае, браткі родныя,
А вы ж яго не пабудзіця.

А вы ж яго не пабудзіця
Да вы ж яго не навучыця.

Вот пайду ж я да сама будзіць,
Каб дзвярымі а не скрыпнуці.

Каб дзвярымі а не скрыпнуці,
Каб ножкаю а не топнуці.

— Устань, устань, ты, мой міленькій.
Уставай жа чарнабрывенькій.

Уставай жа, чарнабрывенькій,
Прыехалі да нас госційкі.

Прыехалі да нас госційкі,
Твае швагры, а мае браты.

— Аступ, аступ, мая мілая,
Твае браты табе родныя!

Твае браты табе родныя,
А мне швагры апастылыя.

А я ўстала да заплакала,
Вышла, браткам да адказала:

— Едзьця, браткі, да вы дадому,
Не кажыця нашай мамачца.

Не кажыця нашай мамачца,
Што упала ваша сястрыца.

Што упала ваша сястрыца,
А нам яе да ня выкупіць.

А нам яе да ня выкупіць,
А нам яе да ня выручыць.

536. Эй, стукі-грукі па памосце...





Эй, стукі-грукі па памосце,
Едзя к брату сястра ў госці.

— Эй, хавай, жонка, хлеб і соль с стала:
Едзя ў госці сястра мая.

Эй, сястра гэта як зачула,
Назад коні завярнула.

— Эй, я ж, братка, не еду абедаць,
Я ж еду цябе адведаць.

Эй, да не так жа цябе,
Як жа дзетак тваіх.

Эй, як жа дзетак тваіх,
Няма ж дома ў мяне сваіх.

Эй, ты, братка, не ўлякайся,
З хлебам-соллю не хавайся!

Эй, ў мяне есць абед, ой, у возе,
Па'бедаю ў дарозе.

Эй, а ці тута гуду-гуду
Я, братка, абедаць не буду,

Эй, я ж пайду пажабрую,
Цябе, братка, угастую.

537. Ў чужым двару ваду бяру...





Ў чужым двару ваду бяру,
Вада не бярэцца;
Радня мая багатая
Ка мне не хінецца**.

Сястра к брату, сястра к брату
Ідзець начаваці,
А брат сястру, а брат сястру
Ня хочыць пускаці.

Стаіць сястра у подвара,
А брат у подгароду:
— Хадзі, сястра-гаротніца,
Нап'емся мы мёду.

— Пі, брацятка, пі, родненькі,
Калі табе п'ецца,
А мне, беднай гаротніцы,
Няма дзе падзецца.

Адна мамка нас радзіла,
Адна гадавала,
Няроўную долю-шчасце
Яна падавала.

Табе дала, мой брацейка,
Долю медавую,
А мне, беднай гаротніцы,
Долю слезавую.

** Другі і чацвёрты радкі кожнай страфы паўтараюцца.

538. А ў лужэ калінка стаяла...



А ў лужэ калінка стаяла**,
Там я, маладзенька, гуляла.
Я з яе ветачкі ламала,
Я іх у пучочкі вязала,

Праз рэчку масточкі масціла,
Да брацяткі ў госці хадзіла.
Аж чую, там братоўка гаворыць:
«Нямілая госця к нам ходзіць».

Аж чую, мой брацятка ўступіўся:
«Ой, пагоніш, жонка, пагоніш —
Ня прыйдзе сястрыца ніколі.

Я выкачу бочку мядочку,
Я сяду з сястрыцай ў радочку.
Я выкачу бочку гарэлкі
Для мілай госці швагеркі».

** Кожны радок паўтараецца.

539. Наварылі браткі піва...



Наварылі браткі піва,
Пазвалі сясцёр ў госці**.

Па багатую сястру
Па тры паслы пасылаюць,

Па беднаю, худую —
На людзей наказаюць.

Багатую сястру
Ў чыстым полі сустракаюць,

А бедную, худую —
У хаця на парозя.

Багатую сястру
На пакуця саджаюць,

А бедную, худую —
Проціў печы ў куточку.

Багатую сястру
Мёдам-віном частуюць,

А бедную, худую —
Горкаю гарэлкаю.

Заплакала ж бедная
І пайшла яна з хаты:

— Сабірайцеся, зверы,
Сабірайцеся, воўкі!

Сабірайцеся, воўкі,
З'есця мяне у полі!

Адна нас мамка раджала,
Ня 'дну долю давала.

Пачула ж тая сястра,
На пакуцця седзючы.

— Браткі мае родные,
Запражыця конікі!

Запражыця конікі
Да мае вараныя.

Даганіця вы яе,
Пасадзіця ля мяне.

Пасадзіця ля мяне,
Частуйця тым, чым мяне.

Адна нас мамка раджала,
Ня 'дну долю давала.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

540. Ох ты, сонца, да сонца ясная...



Ох ты, сонца, да сонца ясная,
Да чаго ты ранянька ўвасходзіла?

Да чаго рана ўвасходзіла
Да й пузнянька закацілася?

Да й пузнянька закацілася,
Да на мяне матушка бранілася.

— Не браніся, да родная матушка,
Ўчора ў мене любай госцік быў.

Любай госцік, роднай брацяйка,
Вот я ж яго ўсе й праводзіла.

Вот я ж яго ўсе праводзіла,
Да за тыя лясы, лясы цёмныя.

Да за тыя лясы, лясы цёмныя,
Да за тыя садзікі вішнёвыя.

Дзе палын-траўка совіваяцца:
Брат з сястрою распрашчаяцца:

— Прашчай, прашчай родная сёструшка,
Нас немножка — толька двоюшка.

Нас немножка — толька двоюшка,
Разлучая нас няволюшка.

541. Ой, Выйду за вароцейка...



Ой! Выйду за вароцейка,
Зірну, гляну на балоцейка.

Ой! Як трава з травой с'ідзіняцца,
Як братка сястры выракаяцца.

— Ой! Да братачка мой родненькай,
І жывіма мы харашэнячка!

Ой! Каб з нас людзі не смяяліся,
Варожачкі не ўцяшаліся.

542. Ой, шуміць-гудзе зелена дубровушка...





Ой, шуміць-гудзе зелена дубровушка,
Плача-рыдае маладая ўдовушка.

Плача-рыдае маладая ўдовушка,
Што не кошана зелена дубровушка.

Вой, найму касцоў шэсцьдзесят і чатыры,
Штоб пакасілі ўсе лугі і даліны.

Касяры косяць, ветрычок павевае,
А мой міленькой на кані паязджае.

— Годзе, міленькой, на кані паязжаці:
Бяры грабелькі да йдзі сено грэбаці.

— Ой, грабі, міла, калі ты накасіла,
Я пайду да дзеўчыны, бо мне дзеўчына й міла.

543. Святі, святі, месяц, ясная зара...





Святі, святі, месяц, ясная зара,
Прасвяці дарожачку, дзе жыла ўдава**.

А у тае ўдовушкі дочка хараша,
Па святліцы ходзіць, чэша валаса.

Яна чэша, чэша, расчэсавая,
Галубою лентаю перавязвая.

Дзевачкам-падружачкам пераказвая:
— Дзевачкі-падружачкі, кайцясь на мяне.

Дзевачкі-падружачкі кайцясь на мяне,
Не хадзіць па вуліцы ў чужой старане.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

544. Сядзем, сядзем, пабяседаім...



Сядзем, сядзем, пабяседаім**,
А нам людзі пазавідаваюць.

А нам людзі пазавідаваюць,
Што с суседзьмі харашэнька жывём.

Мы не б'емся, мы не сварымся,
Як сайдзёмся, дак вітаемся.

Як сайдзёмся, дак вітаемся,
Расходзімся, дак прашчаемся.

** Кожны радок паўтараецца.

545. Ах ты, белая бяроза...



— Ах ты, белая бяроза,
Ці баішся ты мароза?

— Я й марозу не баюся —
У лісцікі абаўюся.

— Ах ты, Маня маладая,
Ці баішся свайго мужа?

— А я й мужа не баюся,
Лягу спаці — абнімуся.

СІРОЦКІЯ ПЕСНІ

Запісаныя ў Мінскай вобласці сіроцкія песні сведчаць аб тым, што гэты даўні жанр не знікае. Яны зафіксаваны ва ўсіх раёнах вобласці. Некаторыя сюжэты сіроцкіх песень надзвычай пашыраны і ў розных варыянтах сустракаюцца на ўсёй тэрыторыі Міншчыны («Ой, а хто ж гэта паціхусеньку гукае», «Ці ўсе лугі пакошаны»). Аднак ёсць і арыгінальныя песні, абмежаваныя пэўным рэгіёнам («Ці я ў полі не калінка»).

Вызначальная асаблівасць сіроцкіх песень — іх сацыяльны змест; амаль заўсёды тут прысутнічаюць вобразы бяды, пакут, бязмернага гора. Агульная тана льнасць песень — шчымліва журботныя, поўныя болю, крыўды. Няма каму заступіцца за сірату, абараніць, пашкадаваць. Нават калі радня ёсць, дык падтрымкі ад яе няма, таму што сірата нічога не мае. Таксама, як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, у Мінскай вобласці пашыраны матыў гукання, пошукаў бацькі і маці (найбольш часта — маці). Да іх звяртаецца сірата, яна наракае на сваю долю, нярэдка расказвае пра мачыху, ад якой не ведае ні ласкі, ні цеплыні.

Шырока выкарыстоўваюцца ў такіх песнях разгорнутыя дыялогі — размова сіраты і маці на могілках.

У сіроцкіх песнях Міншчыны асабліва пашыраны вобраз сіраты-дзяўчынкі, дзяўчыны (не сталай жанчыны), а вобраза сіраты-хлопца няма. Сірата звяртаецца да маці, просіць памыць кашулю, расчасаць валасы, нават узяць да сябе, бо гэты свет поўны для яе пакут і безвыходнасці.

Надзвычай распаўсюджаны звароты сіраты да жывёл, птушак, раслін. Напрыклад, салавей, журавы, гусі, каліна заўсёды спачуваюць сіраце.

У адрозненне ад іншых рэгіёнаў, у сіроцкіх песнях Міншчыны сустракаем звароты сіраты да анёлаў, Бога, размову з імі. І Бог, і анёлы спачуваюць, але дапамагчы не могуць, адно радзяць — цярпець.

Нельга не адзначыць наяўнасць ў мове сіроцкіх песень вялікай колькасці назоўнікаў з ласкальна-памяншальнымі суфіксамі: *каплічанька, вярбінка, мамачка, галовачка, дарожачка, ручкі, ножкі* і г. д. Назоўнік «сірата» ўжываецца ў такіх варыянтах: сіротачка, сіротанька, сіраціначка. Насычанасць мовы сіроцкіх песень такімі назоўнікамі ўзмацняе іх эмацыянальнасць, іх шчырую пранікнёнасць і пачуцці спачування сіраце.

546. Пыліць, дыміць дарожачка...



Пыліць, дыміць дарожачка,
Тудэю ідзе сіротачка.

Тудэю ідзе сіротачка.
— Куды бяжыш, маленькая?**

— Куды бяжыш, маленькая?
— То я бягу, мамку ішчу.

Прыбяжала к царскім дзвярам:
— Адчыніся, мамка мая!

Дай жа ты мне сарочачку,
Расчашы русу косачку!

Умый жа маё ты лічайка!
Умый жа маё ты лічайка!

— Есце ў цябе ліха мамачка,
Няхай табе сарочку дае,

Няхай табе коску чэша,
Няхай табе лічайка ўмыя.

— Коску часала — валасы рвала,
Лічайка мыла — скрывавіла.

Сарочку давала — праклінала:
«Каб ты яе не знасіла!

Каб ты яе не знасіла,
Да каб болей не прасіла!»

** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

547. З суботы на нядзельку...



З суботы на нядзельку**
Захварэла мачыха,

Выправіла сіротку
Ў крыніцу па вадзіцу.

І сіротка ня йдзець
І вадзіцы не нясець.

Назаўтра ранюсенька
Пайшоў татачка іскаць:

— Дачушка-сіротачка,
Дзе ж ты падзелася?

Каб цябе воўкі з'елі —
Ўсё поле скрывавілі,

Да каб ты заблудзіла —
Ўсе бары пасушыла

Да каб ты ўтанула —
Ўсе б мары ўскалыхнула.

А ў полі быліначка,
Пад былінкай магілачка.

Там сіротка сядзіць,
Сваю мамачку будзіць:

— Устань, устань, мамачка,
Устань, устань, родная.

Да ўстань ранюсенька,

Да ўчашы слізюсенька.

— Дачушка-сіротачка,
Есць у цябе мачыха.

— Як мачыха мыець,
Дык маё сэрца ныець,

Як мачыха чэшыць,
Аж мае косткі трашчаць,

Як дае сукеначку, кажэць:
«Каб не знасіла і другой
не прасіла»

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

548. Кукавала зязюлячка...





Кукавала зязюлячка,
У сад летучы.
Ой, плакала сіротачка,
На службу ідучы**.

Ёй соўняйка, ёй ясная
З высокага неба:
— Не плач, не плач, сіротачка,
Табе гэтак трэба.

Ёсць у цябе ручкі, ножкі
І ясныя вочкі,
Рабі, рабі работачку
Аж да цёмнай ночкі.

— Ай, Божа мой мілюсенькі,
Ці я не рабіла?
Цяпер мая работачка
Нікому ня міла.

** Другі і чацвёрты радок кожнай страфы паўтараюцца.

549. Салавейко маленёк...



Салавейко маленёк**,
Твой галасок таненёк.

Ні садзіся на вакне,
Ні задавай жалю мне.

Што я ў чужой старане,
Німа роду пры мне.

Ой, пайду я гуляці,
Свайго роду шукаці.

Ні найшла я радзімы,
А найшла я магілу.

На магіле камянёк,
На камені каласок.

На камені каласок —
Ета ж мамкі галасок.

— Устань, мамка, ні ляжы,
Мне дарогу пакажы.

Мне дарогу пакажы,
Куда ехаць, куда йці.

Куда ехаць, куда йці,
Дзе радзіму шукаці.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

550. Усе горы зялянеюць...



Усе горы зелянеюць**,
Толькі й адна гора чорна.

Толькі й адна гора чорна,
Дзе сеяла бедна ўдова.

Дзе сеяла, пасявала,
Свайго братку й намаўляла:

— Ой, ты братка, й сакалочку,
Прымі мяне й на зімачку!

— Сястра ж мая, пярапёлку,
Ў цябе дзетак толька троя.

— Мой брацяйка, ня ўлякайся,
Маех дзетак не пужайся.

Сядзяш, братка, й абедаці,
Пойдуць дзеці ў сад гуляці.

Пойдуць дзеці ў сад гуляці,
Свайго таткі гукаючы.

Нашлі ў полі быліначку —
Свайго таткі магілачку:

— Устань, устань, татка, з гробу,
Трудна жыць нам каля роду.

Устань, устань, татка, з ямы.
Трудна жыць нам каля мамы.

** Першы радок кожнай страфы паўтараецца.

551. Ляцеў голаб цераз мора...





Ляцеў голаб цераз мора,
Падаў ў мора піці,
Ой, як цяжка сіротунцы
Да на свеце жыці.

Даў Бог ручкі, даў Бог ножкі
І светлыя вочкі,—
Гаруй, працуй, сіротунька,
Аж да цёмнай ночкі!

— Да гарую, сіротунька,
Гарую, маладая,
Што аб маём няшчасцейку
Ніхто не спагадае.

А Божа ж мой мілюсенькі,
Ці я не рабіла?
Чаму мая работанька
Нікому не міла?

Ой, сяду ж я, падумаю,
Пайду за варота,
Да хто ж едзе, да пытая:
— Што плача сірота?

— Да я плачу, сіротунька,
Плачу, маладая,
Што аб маём няшчасцейку
Ніхто не спагадае.

552. Як памёрла матулька...



Як памёрла матулька,
Ды замеўся татулька,
Ды забралі сіраціну
У сыр-бор па маліну.

Ужэ сонца заходзя,
Сірата ні прыходзя.
— Ідзі, бацька, паглядзі
Сваяго ты дзіцяці.

Ў чыстым полі, у раўніне,
Там стаяла каліна,
Там сіротка хадзіла,
Сваю мамку будзіла:

— Устань, мамка, мамка,
Твая плача дзіцятка.
Пашкадуй ты сіротку,
Пачашы ёй галоўку.

553. Ці я ў полі не калінка...



Ці я ў полі не калінка,
Ці я ў свае мамкі не дзяцінка?

Памёр айцец-маці, ўся радзінка,
Асталася бедна сіраціна.

Да каго ж я, бедна, прыхінуся,
Да каго ж я, бедна, прыгарнуся?

Ой, пайду ў садочак, заблуджуся.
Хадзіла, хадзіла да й заснула.

Прыехаў мой мілы, я й не чула...
— Спіш, душа Маруся, спіш, не чуеш,

Што ўсе людзі ходзяць грамадою,
Што цяпер гавораць нам з табою.

— Няхай сабе судзяць, не баюся,
Каго верна люблю, з тым ажанюся.

ЖАРТОЎНЫЯ ПЕСНІ

У вялікім і разнастайным рэпертуары песеннай лірыкі Міншчыны прыкметнае месца займаюць песні вясёлага зместу. Існуе багата жартоўных і сатырычных песень, якія не былі заключаны ў рамкі пэўных рытуалаў, а бытавалі незалежна ад іх існавання. Смехавая палітра ў жартоўных песнях надзвычай неаднародная: ад з'едлівай сатыры і да мяккага, бяскрыўднага гумару, у залежнасці ад характару паэтычнага зместу.

Невычарпальнае мноства ўзораў народна-песеннага гумару, багацце іх самых разнастайных варыянтаў з'яўляюцца сведчаннем таго, што жартоўныя песні — адны з самых любімых і жыццяздольных у народзе. З цыкла сямейна-бытавых значная колькасць жартоўных песень выконвалася моладдзю. Нярэдка жартоў-



«На вуліцы дудка йграе...» (майстар з Мінска У. Пузыня). Фота В. Харчанкі.

ныя песні высмейвалі палахлівага нерашучага кавалера ці, наадварот, — якога-небудзь пераборлівага валацугу, што ніяк не ўпадабае сабе жонку.

Не менш цікавымі і рознабаковымі ў жартоўным рэпертуары Міншчыны выступаюць жаночыя вобразы. Папрокі дзяўчат у гультайстве, няўмельстве, вольных паводзінах гучаць у песнях, бадай, яшчэ больш сурова, чым калі гаворка ідзе пра хлопцаў. Сюжэт пра тое, як дзяўчына прыносіць дадому ў прыполе дзіця, надзвычай распаўсюджаны ў беларускім фальклоры. У іранічнай форме тэкст выразна паказваў непажаданыя для маладой дзяўчыны вынікі яе блізкіх адносін з хлопцам. У гумарыстычных песнях, як і ў народнай лірыцы наогул, даволі часта ўзнікае тэма замужжа. Калі ў жыцці рашэнне ўзяць шлюб ішло ў першую чаргу ад хлопца і ад бацькоў, то ў песнях дзяўчына сама імкнулася выбраць сабе мужа, які ёй быў даспадобы. Немалаважнае значэнне для стварэння камічнай асновы набывае ў песнях і ўзрост жаніха, бо ведама ж — стары муж не роўня маладой жонцы.

Народны смех умеў добра весяліць, але не ў меншай ступені караць. Высмейваючы людскія заганы, песня тым самым несла ў сабе надзейна выхаваўчы зарад. Годнасць чалавека ў адпаведнасці з сялянскай мараллю вымяраецца перш за ўсё яго адносінамі да працы. Вось чаму ў жартоўных песнях часта высмейваюцца безгаспадарлівы муж і гультаяватая жонка.

У большасці жартоўных песень галоўнай віноўніцай усіх сямейных бедаў выстаўляецца жонка. Яна — гуляка, п'яніца, пра сям'ю і гаспадарку не дбае, а значыць — заслугоўвае самага знішчальнага смеху. У падобных сітуацыях



Майстар музычных інструментаў з в. Калодзішчы Мінскага раёна В. Пратасевіч. Фота Я. Казюлі.

«збавіцелем» жончыных нядугаў з'яўляецца звычайна муж, які «вылечвае» яе далёка не самымі вытанчанымі сродкамі: запрагае яе замест кабылы. Здараецца, што гэтакім жа чынам распраўляецца з мужам і жонка.

Значнае месца сярод жартоўных песень займаюць песні пра старых. Дзед і баба — героі выключна гумарыстычных песень. Сітуацыі, у якія яны трапляюць, у большасці сваёй немагчымыя ў жыцці. Парадаксальнасць абставін і дзеянняў персанажаў складае аснову камізму гэтых песень. Іх сюжэты не закранаюць вострых сямейна-бытавых праблем, а толькі паказваюць дзівацтвы старых. Таму, натуральна, гэтыя вобразы выклікаюць у нас добразычлівую ўсмешку. Дастаткова папулярныя ў жартоўных песнях Міншчыны таксама канфлікты між свекрывёй і нявесткай, зяцем і цешчай.

Да разраду выключна пацешлівых можна аднесці песні, пазбаўленыя крытычнага патэнцыялу, дзе ў якасці дзеючых асоб выступаюць прадстаўнікі жывёльнага свету. Кола вобразаў жывёл у гумарыстычных песнях ахоплівае, бадай, усіх асноўных прадстаўнікоў фауны, што жывуць у нашым краі. Характэрныя асаблівасці іх паводзін, суаднесеныя з пэўнымі ўласцівасцямі чалавека, дапамагалі ствараць у фальклоры непаўторныя па сваёй абаяльнасці вобразы. Фантастычны свет заўсёды прываблівaў чалавечы розум. Гэта яскрава відаць і на прыкладах цэлага шэрагу гумарыстычных песень. Жыццё жывёл, паказанае ў іх, нібы змадэліравана па ўзору чалавечага існавання.

У групе фантастычных можна выдзеліць таксама алагічныя песні, у якіх выдуманы свет намаляваны зусім супрацьлеглымі сродкамі. Калі ў творах пра жывёл, птушак і насякомых мы сутыкаемся са спробай пранікнуць у невядомы свет і надзяліць яго чалавечымі ўласцівасцямі, то тут назіраецца адваротная з'ява: у цэнтры песні чалавек і быт, што акружае яго, але паказ карціны свядома скажае рэальнасць. Алагічныя песні дзякуючы сваёй забаўляль-

най функцыі дапамагалі чалавеку забыцца на цяжкія думкі. Песня раскрывала перад ім ідылічную карціну, поўную нябачных цудаў, дзе цалкам адсутнічала немагчымае.

Сёння мы з'яўляемся сведкамі вялікай папулярнасці традыцыйнай жартоўнай песні, што здаўна бытавала на Беларусі. Прывабная для шырокага кола слухачоў сваім жыццярадасным зместам, гэта песня не ведала межаў і моўных бар'ераў, арганічна пераходзіла ад аднаго народа ў моўную стыхію другога. Таму так многа цяпер назіраецца агульнага ў тэмах, сюжэтах жартоўных песень усіх славянскіх народаў.

554. Як на рэчке, на масце...



Як на рэчке, на масце
Насця платок мыла.
Чувер, мой чувер,
Чувер, на-вер-вер-вер-вер,
Яшчэ чуда-первачуда,
Чуда родзіна мая**.

Яна мыла й паласкала,
Й на ваду яго пускала.

З-пад гарушачкі крутой
Шол Ванюшка маладой.

Шол Ванюшка маладой,
Нёс вуселькі пад палой.

Нёс вуселькі пад палой,
А гітару пад другой.

Стал Ванюшачка іграць,
Стала Насця танцаваць.

Стала Насця танцаваць,
Увідала её маць.

Ох, ты, маменька мая,
Не ругайся на меня.

Было меня тагда ўчыць,
Як я маленька была.

А цяпер я веліка,
Старайцеся жаніха.

Ні старога, ні малога —
Парнішачку маладога.

** Прыпеў спяваецца пасля кожнай страфы.

555. Там на горца, каморка стаяла...



Там, на горца, каморка стаяла**,
А ў тэй каморцы кравацька стаяла.

Шурбалка-бурбалка, набівалка-стукалка,
Сама б'ець-буркаець, набіваець-стукаець***.

А ў тэй краваццы Маруська ляжала,
Да тэй Маруські тры парні хадзілі.

Адзін кажа: «Я Марусю люблю»,
Другі кажа: «Я Марусю вазьму».

А трэці кажа: «Я Марусю згублю»,
А трэці кажа: «Я Марусю згублю».

** Кожны радок паўтараецца.
*** Прыпеў паўтараецца пасля кожнай страфы.

556. Ехаў бацька па лучыну...





Ехаў бацька па лучыну,
О-ха, о-ха-ха!
Ехаў бацька па лучыну,
Ох, ох, о-ха-ха!
А сын ехаў па дзяўчыну,
О-ха-ха!**

Бацька мае, чым рубаці,
А сын мае, што сказаці.

Бацька ў лесе работае,
Сын з дзяўчынаю гуляе.

Бацька едзе з лучыною,
А сын едзе з дзяўчыною.

Пытаецца бацька ў сына:
— Што каштуе та дзяўчына?

— Табе, бацька, не пытаці,
Што каштуе — трэба даці.

Што каштуе — трэба даці:
Гаспадыня будзе ў хаце.

** Паўтор першага радка і прыпевы захоўваюцца ў кожнай страфе.

557. Ой, у сенях, сенях за кадушачкаю...



Ой, у сенях, сенях за кадушачкаю
Стаяла ложа із падушачкаю**.

А на том на ложы кавалер прыгожы,
Чорныя вусы, сам ён харошы.

Вусікамі свісня, плячукамі сцісня,
На дзяўчыну гляня — яго сэрца ўяня.

— Дзяўчыначка гожа, прыхадзі да ложа,
Дам табе яблык, дам табе грушак.

Дам табе яблык, дам табе грушак
Да й насыплю повен фартушак.

Па расе хадзіла, бо раса была,
Хлопцаў любіла — хароша была.

Хлопцы любілі, спадніцу купілі,
Спадніца мая гранатовая.

Спадніца мая гранатовая,
Сама я чарнабровая.

Спадніцу насіла, хлопцаў кляла,
Бадай жа вас, хлопцы, трасца трасла.

Бадай на вас, хлопцы, трасца напала,
Як мая спадніца кароценька стала.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

558. Як пайду я, малада...



Як пайду я, малада,
Ў ціхі Дунай па ваду,

Ах я, малада,
Ў ціхі Дунай па ваду**.

А сустрэну, малада,
Старых мужаў грамаду.

А я стану, малада,
Разгавараваці.

А у печы чэгунок
Разгараецца.

Сядзіць свёкар на печы,
Як ня лопня, крычучы!

А свякроўка на палу,
Памагаючы яму.

А залоўкі-калатоўкі
Падкалачываюць.

А дзевяр'ё як звяр'ё,
Бокам паглядаюць.

** Прыпеў «Ах я, малада» спяваецца з другім радком кожнай страфы.

559. Як паедзем, дык паедзем...



Як паедзем, дык паедзем:
Мой муж к цёшчы,
Я, молада, к мамца,
Дзеткі к бабца.
Як паедзем, дык паедзем!

Як нап'ёмся, дык нап'ёмся:
Мой муж вінца,
Я, молада, піўца,
Дзеткі гарэлкі.
Як нап'ёмся, дык нап'ёмся!

Як засядзем, дык засядзем:
Мой муж на куце,
Я, молада, дле яго,
Дзеткі па лаўкам.
Як засядзем, дык засядзем!

Як зайграем, дык зайграем:
Мой муж на дуду,
Я, молада, праз дуду,
Дзеткі ў жалейкі.
Як зайграем, дык зайграем!

Як запляшэм, дык запляшэм:
Мой муж крыжачка,
Я, молада, трэпачка,
Дзеткі ўпрысядкі.
Як запляшэм, дык запляшэм!

560. Жана мужа прадала...



Жана мужа прадала**,
Прадала, прадала,
Прада.., прада.., прадала, прадала***.

Йна купіла пітуха
Да й купіла два пыля.
Пасеяла грэчыху,
Не ўрадзіла грэчуха.
А ўрадзіла лібіда
Да й вярнула мужука.

** Першы радок паўтараецца.

*** Такія ж паўторы апошняга слова кожнага радка ўтвараюць і ўсе астатнія куплеты.

561. Ой, як была у папа...



Ой, як была у папа
Сярдзітая пападдзя.

Эх, самадзёрка,
Эх, маладая!**

Пасылала папа
Ды ў лес па драва.

Да й дала яна папу,
Да й сякеру тупую.

Да й сякеру тупую,
Да й кабылу храмую.

Ой, да поп тарахціць,
На сабе драва ташчыць.

А пападдзя рагоча,
Як поп драва валоча.

** Прыпеў спяваецца пасля кожнай страфы.

562. Да й разлілася па вуліцы лужа...





Да й разлілася па вуліцы лужа,
Загневалася жонка на мужа.

Да міленькі ходзіць, да ручачкі ломіць,
А міла на печы ніц не гаворыць.

— Устань, устань, міла, прынясу я піва!
— Ой, не ўстану, ня буду я жыва!

Да міленькі ходзіць, да ручачкі ломіць,
А міла на печы ніц не гаворыць.

— Устань, устань, міла, прынясу гарэлкі!
— Ой, не ўстану, шукай сабе дзеўкі!

Да міленькі ходзіць, да ручачкі ломіць,
А міла на печы ніц не гаворыць.

— Устань, устань, міла, прынясу я мёду!
— Ой, не ўстану, шукай сабе роду!

Да міленькі ходзіць, да ручачкі ломіць,
А міла на печы ніц не гаворыць.

— Устань, устань, міла, прынясу дубінку
На твае косці, на тваю спінку!

Да мілая ўстала, як бы не ляжала,
Абняла мужа да й пацалавала.

— Дзякуй табе, мілы, за тваё бяздолля,
Што ты натрапіў на маё здароўя.

Не балелі мае ні рукі, ні косці,
Гэта я ляжала з вялікае злосці.

563. Баба Еўка, дзед Тумаш...





Баба Еўка, дзед Тумаш, го-го-го,
Паехалі на кірмаш, го-го-го!
Што павезлі прадаваць? Го-го-го!
Гэта трудна угадаць, о-ха-ха-ха-ха!**

Што павезлі прадаваць?
Гэта трудна угадаць:
Дзве курачкі, петушка
І малога парсючка.

Як прадалі ўвесь тавар,
І паехалі у бар,
Напіўшыся і наеўшыся ўраспрох,
Ледзь пралезлі яны праз парог.

Дзед сеў за пана,
А баба за фурмана.
Пакуль бабка не спала,
Дык кабылка трапятала.

А як бабка заснула,
Дык кабылка нацягнула.
Як прачнецца той дзед,
Глядзь, — кабылкі ўжо нет.

Еўка села вярхом
І паехала дамоў,
Як вярнулася без дзеда,
Пазвала к сабе суседа.

Як вярнулася без дзеда,
Пазвала к сабе суседа,
Пілі, елі і гулялі
І Тумаша ўспаміналі.

** «Го-го-го!» паўтараецца ў кожнай страфе пасля першага, другога і трэцяга радкоў; «о-ха-ха-ха-ха!» — пасля чацвёртага.

564. Ой ты, стары старычышча...



Ой ты, стары старычышча**,
Ні пускае маладую мяне на ігрышча.
Я й старога да й прыспала,
А сама ж я, маладая, на ігрышча ўдрала.
Ляжыць стары, ні варушыцца,
Я ж думала, маладая, што задушыцца.

** Кожны радок паўтараецца.

565. Дзе ты бываеш, чорны баране?



— Дзе ты бываеш, чорны баране?
— У бліне, у млыне, мой добры пане**.

— Што ж ты там робіш, чорны баране?
— Муку млю, муку млю, мой добры пане.

— Чым цябе білі, чорны баране?
— Бічыкам, коньчыкам, мой добры пане.

— Як жэ ты крычаў, чорны баране?
— Ме-ге-ге, ме-ге-ге, мой добры пане.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

566. Ой, ляцеў камар па полі...



Ой, ляцеў камар па полі,
Ён, лятучы, прытаміўся.

Та-дры-та, Ванюша, ура-ура!
Ён, лятучы, прытаміўся**.

Ён, лятучы прытаміўся,
Сеў на дубе, сапачыўся.

Сеў на дубе на вяршочку,
Скланіў сваю галовачку.

Схадзіліся шуры-буры,
Камарэйка з дуба здулі.

Да й упаў камар на мосцік,
Пабіў свае рэбры й косці.

Прыляцела муха-маці
Камарэйка ратаваці.

Узялі яго пад ручкі
Да й павялі і ў падушкі.

Да й павялі і ў падушкі,
Да й глядзелі яго дружкі:

Ці маёр да ці палкоўнік,
Ці камарычак-пакойнік?

Ні маёр да ні палкоўнік,
А камарычак-пакойнік.

** Прыпеў з другім радком паўтараецца ў кожным куплеце.

567. Я цяцерку пасу...



Я цяцерку пасу,
Ух я!**

На зялёным лугу.
А цяцерка за куст,

Я цяцерку за хвост,
Ды як вырву перыну́,
Як пашыю дуду́!
Ах ты, дудка мая,
Весялушка мая,
Весяліла ты мяне
На чужой старане.
Як звалілася дуда
Із зялёнага дуба,
Як пабіла бакі
Аб дубовыя сукі!
Запрагу я вала, —
Мой і вол не вязе,
Нехай яго раздуе!

Запрагу я каня, —
Мой і конь не вязе,
Нехай яго распражэ!
Запрагу я камара, —
Мой камар маладзец:
Ён і воз павязе!
Як узлез на хлявец:
І хлявец абвярнуў,
І цялятак пабіў,
І цяляткі равуць,
Гаспадынькі бягуць.
Гаспадынька з ложку,
Як пабіла ножку!
Гаспадар з печы,
Як пабіў плечы!

** Прыпеў «Ух я!» паўтараецца пасля кожнага радка.

568. Мая мамачка-пераборачка...



Мая мамачка-пераборачка:
Выбрала зяця — неработнічка.

Выбрала зяця-неработнічка:
Араць ня ўмея, касіць ня смея.

Араць ня ўмея, касіць ня смея, —
Хто мне, маладой, поля засея?

Засею поля хоць пшаніцаю
Да ўбараную хоць курыцаю.

Курачка мала гужы парвала.
Да мне, маладой, так жалка стала!

569. Была ў мужа шчаслівая жонка...



Была ў мужа шчаслівая жонка**,
Ды ня мела ва што прыбірацца.
— Прадай, мілы, каня да й кароўку,
Купі, мілы, шубу ды шнуроўку.
Прадаў мілы каня да й кароўку,
Купіў мілы шубу да шнуроўку.
Як не стала ні дроў, ні лучыны,
Запрог мілы шчасліваю жонку
Да й паехаў у лес за дрывамі.
— Прадай, мілы, шубу да шнуроўку,
Купі, мілы, хаця жарабётка.
Буду слухаць, буду шанаваці,
Каб на плечках дроўцы не цягаці.

** Кожны радок паўтараецца.

570. Парадзіла Чачотачка сямёра дзяцей...



Парадзіла Чачотачка сямёра дзяцей,
Парадзіла невялікіх сямёра малых:
Яўгеню, Аксеню
І Таццюху й Натуху,
І Рыпеню й Макрэню,
Сёмую Хімку**.

Парадзіўшы і зрасціўшы, замуж аддала,
Бадай сама Чачотачка здарова была!
Яўгеню за Мірона,
А Аксеню за Сапрона,
А Таццюху за Дзяміда,
А Натуху за Свірыда,
Радзівону — Рыпеню,
Харытону — Макрэню,
Хімку за Кузьму.

Як начала Чачотачка пасагу даваць,
Як начала невялікіх да ўсіх надараць:
Яўгені — паясок,
А Аксені — кажушок,
А Таццюсе — рукавічкі,
А Натусе — чаравічкі,
А Рыпені — пасцельку,
А Макрэні — калыбельку,
Хімцы — стужкі ўсе.

Паззывала Чачотачка брацяйкаў сваіх,
Паззывала Чачотачка брацяйкаў усіх:
Адзін быў Савасцей,
Другі быў Цялямней,
Быў Барыс і Дзямёд,
І дудар, і ўдавец,
І слуга Карпец.

Былі дзеўкі на вяселлі і малодкі,
Яшчэ былі стары бабкі і ўдоўкі:
Кася, Яся, Барбуся,
Ды Хвядора, Настуся
І суседкі ўсе.

А Чачотачка не гуляла — варыла блаху,
Тры дні госці блаху елі, пакуль з'елі ўсю.
А на трэцюю нядзелю
Госці дамой захацелі,
Дзенкавалі за вяселле,
Ехалі дамой.

** Апошні радок кожнай страфы паўтараецца.

КАРАГОДНЫЯ, ГУЛЬНЁВЫЯ І ТАНЦАВАЛЬНЫЯ ПЕСНІ

У Мінскай вобласці карагодныя традыцыі з'яўляюцца менш распаўсюджанымі, чым, напрыклад, у Магілёўскай або Гомельскай. Але і тут збіральнікі знайшлі прыгожыя тэксты веснавых карагодных песень, якія гучаць часцей за ўсё на Вялікдзень («Заярылася пчолачка...», «У першум таночку дзевачкі...» і інш.).

Танцавальна-гульнёвая стыхія карагода на Беларусі пранізвае і зімовы, і летне-асенні каляндарныя цыклы. Але большасць карагодаў выконваецца ў час абуджэння і абнаўлення прыроды, з'явы якой для чалавека спакон веку мелі магічны сэнс, — у час веснавога каляндарнага перыяду. І гэта не здзіўляе, таму што менавіта веснавое сонца з'яўляецца асновай узнікнення такога жанру народнага мастацтва, як карагод. Аб старажытных вытоках карагода гаворыць ужо тое, што яго ўдзельнікі рухаюцца, як правіла, па крузе. Гэта і сімвалізуе сонца, якому заўжды чалавек пакланяўся як крыніцы ўсяго жывога.

Танцавальныя, гульнёвыя элементы, якія дайшлі да нас з глыбіні вякоў, суправаджалі многія падзеі ў жыцці людзей, былі часткай каляндарных і сямейных абрадаў. Але першыя збіральнікі фальклору часта запісвалі толькі тэксты песень і не апісвалі самыя абрады, дзеянні, якія суправаджаліся гэтымі песнямі. Таму мы сёння не ведаем многія старажытныя карагоды ў тым выглядзе, у якім яны выконваліся ў народзе калісьці.

У залежнасці ад структуры ўмоўна можна вылучыць сярод існуючых карагодаў наступныя групы: карагод-гульня, карагод-танец, карагод-песня. У кара-



Танец «Грачанікі» выконвае фальклорны калектыў в Маркава Маладзечанскага раёна. Фота В. Харчанкі.

годзе-песні менавіта тэкст з'яўляецца галоўным сярод кампанентаў, а мелодыя, простыя рухі ўдзельнікаў робяць такі карагод больш выразным.

Тэксты карагодных песень насычаны паралелізмамі, эпітэтамі, зваротамі-сімваламі, паўторамі. Галоўная рыса карагодных тэкстаў — іх рытміка, яны цесна звязаны з музыкай інтанацыяй і эмацыянальнай афарбоўкай. Адны з песень гэтага жанру маюць сацыяльна-бытавую тэматыку, прадстаўляюць выбар нявесты («У караводзе мы былі...»), у другіх апісваецца веснавы працоўны працэс («А мы проса сеялі, сеялі...»).

У Мінскай вобласці зафіксаваны цікавы варыянт веснавой карагоднай гульні з песняй «А мы вішню пасадзілі..», у якой праявілася імкненне людзей заставіць дрэва пладаносіць. Дарэчы, падобная гульня існуе і ў іншых абласцях Беларусі, і ў цэнтры гульні часцей за ўсё не вішня, а груша, ролю якой выконвае дзяўчына. Выканаўца імітуе тое, аб чым спявае агульны хор: вось вішню (грушу) пасадзілі, а вось яна прымаецца, расце і г. д.

Такія састаўныя часткі карагода, як дзеянне, а таксама рухі, якія выконваюць удзельнікі карагода ў суправаджэнні песні (так званыя «вароты», «вуж», «смоўж», «ручаёк» і г. д.), робяць карагод яшчэ больш цікавым.

Песенна-гульнёвая прырода, сінкрэтычнае адзінства элементаў карагода вылучае яго на асобнае месца сярод жанраў народнай творчасці, паказвае на яго унікальнасць.

Рухі і дзеянні салістаў карагодаў з цягам часу вылучаюцца ў самастойныя танцы, дзе на першае месца выходзіць знешні малюнак рухаў. Жанр танца сфарміраваўся на аснове танцавальных карагодаў. Многія з тых кароткіх песень або прыпевак, якімі ўдзельнікі танцаў суправаджаюць свае рухі, калісьці былі карагоднымі песнямі.

Песні да танцаў могуць быць рознымі па тэматыцы — лірычнымі, сямейна-бытавымі. Але часцей за ўсё гэта песні жартоўныя, такія як «Цераз гай, цераз гай, цераз Бандароўку...», «Ой, сад-вінаград, зялёная вішня...», «Я хадзіла беражком, беражком...» і інш.

Карагодныя, гульнёвыя і танцавальныя песні аб'ядноўвае гісторыя паходжання, жанравага развіцця, асаблівасці ўжывання ў народным жыцці.

571. Ў караводзе мы былі...



Ў караводзе мы былі**,
Эй, люлі, мы былі,
Люлі-люлі, мы былі!***
А што мы там відзялі?

Мы відзялі парачку —
Кавалера, дамачку.
Стань, дамачка, прытанцуй,
Каго любіш — пацалуй.

** Кожны радок паўтараецца.
*** Прыпеў спяваецца з падхопам апошняга слова кожнага радка.

572. Ў першум таночку дзевачкі...



Ў першум таночку дзевачкі,
А ў другім таночку жоначкі.

У трэцім таночку Ціхоня,
Там наша Ціхоня гуляла.

Там наша Ціхоня гуляла,
Залаты каралік згубіла.

Залаты каралік згубіла,
Залаты пярсцёнак зламіла.

Ніхто ж таго дзела не бачыў,
Толькі чуў-бачыў большы брат.

Да й на стаянцы стоячы,
Варанога коніка поячы.

Прыйшоў у хату, скланіўся,
Ён і сваёй мамцы хваліўся:

— Ой, мамачка мая родная,
Што ж наша Ціхоня ўчыніла!

Што наша Ціхоня ўчыніла:
Залаты каралік згубіла.

Залаты каралік згубіла,
Залаты пярсцёнак зламіла.

573. Заярылася пчолачка...



Заярылася пчолачка,
Пчолачка, пчолачка.

Да й у вяршочку сосанка,
Сосанка, сосанка.

Да прыехаў бацька с Ноўгарада,
С Ноўгарада, с Ноўгарада.

А я, маладзенька, й учула,
Й учула, й учула.

Я й завяла каня ў стаўніцу,
Ў стаўніцу, ў стаўніцу.

Свайго бацюхну — ў святліцу,
Ў святліцу, ў святліцу.

Дала, дала коню аброку,
Аброку, аброку.

Свайму бацюхну збан м'ёду,
Збан м'ёду, збан м'ёду.

574. А ў варот верба калыхалася...



А ў варот верба калыхалася,
Ой, рано й рано, калыхалася**.
Дачка да таткі прабіралася[1].
І сама ідзе, і мужа заве.
Муж і сам не ідзе, і каня не дае.
— Прападзі ты, муж, з вараным канём,
З вараным канём, з залатым сядлом.
Я к свайму татку і пяшком зайду,
І пяшком зайду, і пяхотаю,
І пяхотаю, і з ахотаю.
Ішла я поле, ішла другое,
А на трэцяе узыходзіла,
Бліжэй да татачкі падыходзіла.
Аж мой татачка ў варотах стаіць,
Ў варотах стаіць, пад ручкі глядзіць:
— Ветка — ня ветка, ці ж маё дзіцятка?
Ці ж маё дзіцятка, сем год лятала?
— Да душы, татачка, я ж лятала.
Доля такая, доля такая:
Свякроў ліхая, мужык п'яніца,
Пойдзе ў карчомку — распіваецца,
А прыйдзе з карчомкі — разараецца.

** «Ой, рано й рано» і другая палова кожнага радка ўтвараюць прыпеў.
[1] «Прабіралася» — тут «прыбіралася».

575. Як садзілі дзеўкі кветнік...



Як садзілі дзеўкі кветнік,
Садзячы гаварылі.

Садзячы гаварылі:
— Расці, расці, хмелю!

Расці, расці, хмелю,
Кораням караніся!

Кораням караніся
Да шырочэнькім лістам.

А што жэ мовіў хмелю?
— Калі мяне не ўпарыця,

Калі мяне не ўпарыця,
Вы ж мяне не ўтрымаеця.

Вы ж мяне не ўтрымаеця
Ні ў дубовай бочаццы,

Ні ў дубовай бочаццы,
Ні ў жалезных абручыках.

Я з бочкі дно выб'ю,
Зялёнае віно вып'ю.

Зялёнае віно вып'ю.
Па двару расіцаю,

Па двару расіцаю,
За варота — крыніцаю.

Як мовіў сужонка:
— Калі мяне ня жэніця,

Калі мяне ня жэніця,
Вы ж мяне не ўдзержыця

Ні на вараным коніку,
Ні на залатым сядзелцы.

Я паеду на Ўкраіначку,
Вазьму сабе валыначку.

Вазьму сабе валыначку,
Краснаю дзяўчыначку.

576. Жана мужа шанавала...



Жана мужа шанавала,
Люлі-люлі, шанавала**.
На папары праважала.
Кіту сена палажыла,

Цэбар вады паставіла.
На трэцці дзень адведала:
Кіта сена цалюсенька,
Цэбар вады паўнюсенькі,
Мой мілы сыцюсенькі!

** Прыпеў спяваецца з падхопам апошняга слова кожнага радка.

577. Ва лугах, ва лугах...



Ва лугах, ва лугах,
Уж ва этых ва зеленых лугах**

Вырастала, вырастала,
Вырастала трава шолкавая.

Расцвялі, расцвялі,
Расцвялі цвяты узорлівыя.

Врозь пашлі, врозь пашлі,
Врозь пашлі духі малінавыя.

Вот я эту, вот я эту,
Вот я эту траву выкашу касой.

Выкашу, выкашу,
Вот я выкашу, высушу её.

Выкармлю, выкармлю,
Выкармлю ворана каня.

Павяду, павяду,
Павяду я каня к бацюшке,
Павяду я каня к роднаму:

— Бацюшка, бацюшка,
Ох ты, бацюшка, сударь мой,
Ох ты, бацюшка, прыяцель дарагой,

Ты прымі, ты прымі,
Ты прымі-ка слова ласкавая,
Ты прымі слова прыятная:

Ты не 'ддай, ты не 'ддай,
Ты не 'ддай мяне за старага замуж,
Ты аддай мяне за роўніцу.

Старага, старага,
Ой, я старага смерць не люблю,
Ой, я з роўніцай плясаць пайду!

** Першыя сем куплетаў спяваюцца з паўторам другога радка.

578. Наляцелі, наляцелі шэры гусі і з расы...





Наляцелі наляцелі,
Наляцелі шэры гусі і з расы**.

Селі-палі, да селі-палі, да
Селі-палі й у ўдовушкі на двары.

Крылушкамі, крылушкамі,
Крылушкамі й увесь дворык укрылі.

Лапачкамі, лапачкамі,
Лапачкамі й увесь дворык ўслядзелі.

Вочачкамі, вочачкамі,
Вочачкамі свяцёлушку й усвяцілі.

Галасочкам, галасочкам,
Галасочкам й удовушку й будзілі:

— Й устань, устань, й устань, устань,
Й устань, устань, удовушка малада.

Ўстань да паслушай, ўстань да паслушай,
Ўстань да паслушай, што суседзі гавараць.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

579. На уліцы бабы сядзелі, сядзелі...



На уліцы бабы сядзелі, сядзелі,
Аб нявестках судзілі, судзілі.
Адна нявестка шэльма была, шэльма была:
Запаліла печ, ў клець пайшла, у клець пайшла.
А ў той печы мяса было, мяса было,
А ўсё ж яно згарэла, згарэла.
Каб мая нявестка згалела, згалела!

580. А мы проса сеялі, сеялі...



— А мы проса сеялі, сеялі,
Пойдзім, лада, сеялі, сеялі.

— А мы проса вытапчым, вытапчым,
Пойдзім, лада, вытапчым, вытапчым.

— А чым жа вам вытаптаць, вытаптаць?
Пойдзім, лада, вытаптаць, вытаптаць?

— А мы коней выпусцім, выпусцім,
Пойдзім, лада, выпусцім, выпусцім.

— А мы дадзім сто рублей, сто рублей,
Пойдзім, лада, сто рублей, сто рублей.

— Нам не нада тысячы, тысячы,
Пойдзім, лада, тысячы, тысячы.

— А чаго ж вам надабна, надабна?
Пойдзім, лада, надабна, надабна?

— А нам нада дзевіцу, дзевіцу,
Пойдзім, лада, дзевіцу, дзевіцу.

581. Летаў голуб, летаў шызы...





Летаў голуб, летаў шызы,
Летаў шэры галубочак.

Летаў шэры галубочак
Чыраз цёмненькі лясочак.

Дзеўкі голуба звязалі,
Дзеўкі голуба пыталі:

— Скажы, голуб, скажы, шызы,
Скажы, шэры галубочак:

Каму шчасця й каму доля,
Каму шчасця шчасліваё?

— Дзеўкам шчасця, дзеўкам доля,
Дзеўкам шчасця шчасліваё!

582. Пад яліною, пад зяляною...



Пад яліною, пад зяляною,
Люлі-люлі, пад зяляною**

Расла кветачка ўсе й баравая.
Вышла дзеўчына чэрнабровая,
Вывяла каня да й асядлала,

Вынясла сурду да й камязэльку.
— Куды паедзеш, Ясю міленькі?
Калі да дзеўкі — жыві са мною,
Калі да жоны — едзь дарогаю.
Праехаў Ясю чатыры мілі.
— Прыстаў мой конік, Божа мой мілы.
Каб ня жоначка, ня дробны дзеці,
Добра духаці, добра сядзеці.
Жоначка жура, дзетачкі плачуць,
Што яны ў вочы хлеба не бачуць.
— Ешце ж вы, дзеткі, маннаю кашу,
Я для вас хлеба не прызапашу.

** «Люлі-люлі» і другая палова кожнага радка ўтвараюць прыпеў.

583. Пасаджу ігрушку ў садзе, ў садзе...



Пасаджу ігрушку ў садзе, ў садзе,
Няхай мая грушка расце, расце,
А я, маладзенька, скачу, скачу,
Я гэтай ігрушкі хачу, хачу.

584. Сядзі, сядзі, яшчар...

Сядзі, сядзі, яшчар,
Гэй, нам, гэй!*
На залатым крэслі,
На шчаслівым месцы.
Бяры сабе пані,
Каторую хочыш,
Каторую любіш,
За белаю ручку,
За русаю коску.

585. Служыў я у пана першая лета...





Служаў я у пана першая лета,
Выслужыў я ў пана курачку за гэта.

Мая курка-злотапюрка
Па дзядзінцу хадзіла,
Пылянятак вадзіла
І ў хахол надзімала,
Свайго пана пацяшала.
Курка, кудах!

Служыў я у пана другоя лета,
Выслужыў я ў пана пятушка за гэта.
Мой пятух-ракатух...**

Служыў я у пана трэцяя лета,
Выслужыў я ў пана вутачку за гэта
Мая вутка: вуці-вуці...

Служыў я у пана чацвёртая лета,
Выслужыў я ў пана гусачку за гэта.
Мая гуска: гагі-гагі...

Служыў я у пана пятая лета,
Выслужыў я ў пана свіначку за гэта.
Мая свінка: кві-кві-квікі...

Служыў я у пана шостая лета,
Выслужыў я ў пана кароўку за гэта.
Мая кароўка: мукі-мукі...

** Далей — з трэцяга радка папярэдняй страфы; і гэтак да канца песні: працяг — з трэцяга радка кожнай папярэдняй страфы.

586. Ой, пайду я на мяста, на мяста...



Ой, пайду я на мяста, на мяста,
Куплю сабе курачку, курачку.
А курачка ходзячы: ту-ру-ру!
А курачка ходзячы: ту-ру-ру, ту-ру-ру!

Ой, пайду я на мяста, на мяста,
Куплю сабе качачку, качачку.
А ў качкі ножкі плоскі**,
А курачка ходзячы: ту-ру-ру!
А курачка ходзячы: ту-ру-ру, ту-ру-ру!

Ой, пайду я на мяста, на мяста,
Куплю сабе 'вечачку, 'вечачку.
Авечачка: гер-гер-гер...***

Ой, пайду я на мяста, на мяста,
Куплю сабе козаньку, козаньку.
А козанька: скіку-брыку...

Ой пайду я на мяста, на мяста,
Куплю сабе кароўку, кароўку,
А кароўка: рыку-рыку...

Ой, пайду на мяста, на мяста,
Куплю сабе коніка, коніка.
А конічак: тупу-тупу...

Ой, пайду я на мяста, на мяста,
Куплю сабе возічак, возічак.
А возічак: та-ра-ра...

Ой, пайду я на мяста, на мяста,
Куплю сабе бабачку, бабачку.
Тая баба — баба-драба...

** Пашыраная кампазіцыя: новыя словы ў другой — сёмай строфах спяваюцца за кошт паўтору напеўкі, адзначанай знакам**.

*** Далей трэба паўтараць з трэцяга радка кожнай папярэдняй страфы, павялічваючы працягласць наступных строфаў.

587. А на небе зорка ясна...



А на небе зорка ясна,
А ў суседа дзеўка красна.

Хоць жа я ў нуду ўпаду,
А ў суседа дзеўку ўкраду.

Хоць жа я невялічанька,
Абы маё бела лічанька.

Хоць жа я на лічанька дробна,
Абы мая работачка добра.

Чым я й не пазорна —
Кашулячка чорна.

Бяры мяне смела,
Я й вымаю бела.

Е ў мяне бялізны,
Чатыры падушкі,
Спадніца у кружкі.
Пятая — пярына,
Сама — як маліна.

Шостая маленька,
Сама маладзенька!

588. А Лявоніха-Сымоніха была...



А Лявоніха-Сымоніха была,
А Лявону хлеба-солі не дала.

А Лявона ды ні чорт не бярэ —
Несалёную капусту жарэ.

Несалёную, неваранаю,
Толькі трошэчкі паджаранаю.

589. А Лявон ды Лявоніху любіў...



А Лявон ды Лявоніху любіў,
Ён ёй чаравічкі купіў.

Лявоніха, душа ласкавая,
Чаравічкамі паляскавая.

— А дзевяр-дзевярусенька,
Вядзі мяне памалюсенька.

Не вядзі мяне па пожаньцы,
Вядзі мяне па дарожаньцы.

Па пожаньцы мае ножкі ня йдуць,
Па дарожцы яны самі бягуць.

Па пожаньцы яны колюцца,
Па дарожцы самі коцюцца.

А мой мілы адурачыўся.
Чо ты ка мне не атварачыўся?

Я, молада, лі цябе спала,
Рукі-ногі на цябе клала.

Я ж думала, ты ў Сібір пабяжыш,
А ты кала боку ляжыш.

А мой мілы ды віно, віно п'е,
Ён мяне, маладзеньку, б'е.

Пакінь, мілы, ды віно піці,
Пакінь мяне, маладзеньку, біці.

Пірожычкамі закусаваць,
Мяне, моладу, пакутаваць.

Мае ручкі ды бяленькія,
Пярсцёначкі залаценькія.

Мае ручкі памараюцца,
Пярсцёначкі паламаюцца.

590. Машу, машу караватачку...



Машу, машу караватачку,
Пушчу, пушчу дзівіратачку.

— Ой, дзевяр-дзевярусенька,
Вядзі мяне памалюсенька!

Не вядзі мяне ні ў лес, ні ў сад,
Завядзі мяне к татульку назад.

Не вядзі мяне ні ў лес, ні ў бор,
Завядзі мяне к татульку на двор.

591. Цячэ рэчка невялічачка...



Цячэ рэчка невялічачка,
А за рэчачкай бярэзнічак.

А за рэчачкай бярэзнічак.
Там плавалі шэры гусачкі.

Шэры гусі не наплаваліся,
А я, молада, наплакалася.

Што мой мілы горкі п'яніца,
У карчомцы распіваецца.

У карчомцы распіваецца,
Прыдзець дамоў, разбіваецца.

Вядзець мяне маладзюсеньку
Разуваць-раздзяваць яго.

Разуваць-раздзяваць яго,
Дробны гузічкі расшпіліваць.

А мне, моладзе, ня хочацца
Каля п'яніцы варочацца.

Мае ручачкі бяленькія,
Пярсцёначкі залаценькія.

Мае ручкі памараліся,
Пярсцёначкі пагубляліся.

Гыля, гыля, шэры гусачкі,
Мне вас трэба накарміць і загнаць.

Мне вас трэба накарміць і загнаць
І з п'яніцай ў адным ложку легчы спаць.

* * *

592. Ў дробным ельнічку-бярэзнічку...

Ў дробным ельнічку-бярэзнічку,
У зялёненькім асіннічку,
У зялёненькім асіннічку,
Ды ў калючынькім шыпшыннічку,

Дзе я молада пахажавала,
Шэры гусачкі папасывала.

— Гылю, гылю, мае гусачкі,
Гылю, гылю, мае шэранькія,

Ці вы яшчэ не наплаваліся?
А я, молада, наплакалася.

Папалася злому духу мужыку,
Ссушыў мяне, як ліпіначку ў духу.

Ссушыў мяне, як ліпіначку,
Маладзенькаю дзяўчыначку.

У карчомцы распіваецца,
Прыйдзе дамоў, разбіваецца.

Загадаіць разуваць, раздзяваць,
Дробны гузічкі расшпіляваць.

А мне, моладзе, ня хочыцца
Каля п'яніцы варочацца.

Белы ручкі памараюцца,
А пярсцёначкі пасціраюцца.

А Божа мой, а мілюсенькі,
Вязі мяне да татусенькі,

Вязі мяне цераз бор, цераз сад,
Вязі мяне да татусенькі назад,

Дзе я, молада, пахажывала,
Шэры гусачкі папасывала.

593. Я хадзіла беражком, беражком...





Я хадзіла беражком, беражком
Да ганіла качурка ланцужком.

— Ідзі, ідзі, качур, дадому**,
Прадам цябе жыду рудому!

За тры капейкі качура прадала,
А за грошы дударыка наняла.

— Іграй, іграй, дударына, на лугу,
Я сваю бедуньку забуду.

— Ой, якую бедуньку ты мела?
— Да дзвярыма курачку прыбіла.

Запытаюся, суседункі, у вас,
Да ці бродзіць мая курачка да вас?

Ў мае куркі жолта шыячка й чубок,
Ды яшчэ на правай ножке ланцужок.

** Пачынаючы з другой страфы, кожны радок паўтараецца.

594. Ішла, ішла дзевачка беражком, беражком.



Ішла, ішла дзевачка беражком, беражком,
Падманюла качура піражком, піражком:
— Ідзі, ідзі, качур, дадому, дадому,
Прадам цебе жыдуньку рудому, рудому.
За качура шэляга узяла, узяла,
За шэляга дудачку наняла, наняла:
— Іграй, іграй, дудачка, на дуду, на дуду,
Пакуль сваю ўсю бедуньку забуду, забуду.
Невяліку шкодачку зрабіла, зрабіла:
Ў агародзе курачку забіла, забіла.
Да пастаўлю хатуньку з лебеды, з лебеды,
А ўсе к таму сенячкі прыпляту, прыпляту
З высокага дзерава — з асату, з асату.
Будуць ка мне купчыкі заязжаць, заязжаць,
Будуць майго пеўніка таргаваць, таргаваць.
Я пеўніка не прадам, не прадам,
Ў мене певень гаспадар, гаспадар,
Ён мене раненько пабудзіць, пабудзіць,
Да ён мене разуму давучыць, давучыць:
— Устань, устань, дзевачка, годзі спаць, годзі спаць,
Ужо паюць пеўнікі: пара ўстаць, пара ўстаць!

595. А дзе тыя чобаты, што дзед даў...



А дзе тыя чобаты, што дзед даў,
А за тыя чобаты дачку ўзяў?

Чобаты, чобаты вы мае,
Чом дзела не робіце за мяне?

Я павешу чобаты на кручку.
Сама пайду рабіці за дачку.

Чобаты, чобаты вы мае,
Чом дзела не робіце за мяне?

Як на рэчку шла — чобаты рыпелі,
А як з рэчкі шла — чобаты хлюпелі.

Чобаты, чобаты вы мае,
Нарабілі хлопату да й вы мне!

596. Цераз гай, цераз гай, цераз Бандароўку...



Цераз гай, цераз гай, цераз Бандароўку
Вёз, вёз стары дзед маладую жонку**.

Вёз, вёз, не давёз да стаў яе біці,
Пытаецца у людзей, ці ўмее рабіці.

А ні рабіць, ні прыбіць, жаці не сагнецца,
Як угледзіць кавалера, — мала, не спражэцца.

А пацёрак поўна шыя, а каўнера не зашыя,
А рубчыка не зарубіць, — кавалераў добра любіць.

А ты стары, барадаты, бараду валочыш,
А сам, стары небарака, маладую хочыш.

597. Ой, сад-вінаград, зялёная вішня...

Ой, сад-вінаград, зялёная вішня,
Стаіць хлопец пад акном, каб дзяўчына вышла**.

На вішаньцы белы цвет на дол аблятае,
Стаіць хлопец пад акном, з жалю ўмірае.

Ня стой пад акном, не таройкайся,
Прыйдзі ў хату, знімі шапку, паздароўкайся.

Ня стой пад акном, а заходзь у хату,
Мы сягоння хлеб пяклі, абліжы лапату.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

598. Усе людзі вячэраюць...



Усе людзі вячэраюць, а я спаць пайшла**,
А мой стары заснуў — я гуляць пайшла.
Я ж там доўга не бавілася,
Вячэрняя зорка закацілася.
Іду дадому — развідняецца,
А мой стары ўмываецца.
А мой стары ўмываецца
Да й на мяне, маладую, прызіраецца.
А я, маладзенька, дагадалася:
За пярыну да й на гору да й прабралася.
А мой стары ўслед за мною
Да й звaліўся з гары з драбіною.
Я ж думала, што задушыцца,
Прызіраюся я — ён варушыцца.

** Кожны радок паўтараецца.

САЦЫЯЛЬНА-БЫТАВЫЯ ПЕСНІ

Найбольш блізкія да нашага часу сацыяльна-бытавыя песні шырока распаўсюджаны на тэрыторыі цэнтральнай Беларусі і маюць тут багатую сюжэтную, мастацкую і рэгіянальную разнастайнасць. Адносна непрацяглы перыяд іх бытавання не даў магчмасці давесці да належнага ўзроўню іх мастацкасць, у іх адчуваецца дастаткова інтэнсіўнае ўзаемадзеянне з адпаведнікамі ў фальклоры суседніх народаў. Але ў гэтай позняй песеннасці істотна адчуваецца голас народа, яго імкненне да нацыянальнай незалежнасці, трагізм паўсядзённага жыцця. Багата прадстаўлены тут рэаліі гісторыі, прыроды, побыту народа, таму перадача ўнутраных пачуццяў лірычных герояў у сацыяльна-бытавых песнях значна дапаўняецца багатым інфармацыйным матэрыялам.

Лакальныя адметнасці Міншчыны ў сацыяльнай лірыцы больш разнастайныя, чым у другіх рэгіёнах. Усход, поўнач і захад пры гэтым багаты на песні, звязаныя з войнамі, паходамі, аднак калі ў першых двух рэгіёнах спяваецца пра салдат, рэкрутаў, то на захадзе яны замяняюцца, у тым ліку ў варыянтах адных і тых жа сюжэтаў, на мазураў, уланаў, жаўнераў.

Лірыка, звязаная з адыходніцтвам (чумацтвам, батрацтвам), больш бытуе на поўдні Міншчыны, але па колькасці сюжэтаў яна значна ўступае багатай у гэтых адносінах палескай традыцыі.

З вялікай колькасці сучасных запісаў сацыяльна-бытавых песень на Міншчыне

(усіх іх з варыянтамі больш паўтысячы) тут вылучаны разбойніцкія, казацкія, рэкруцкія, салдацкія, чумацкія, батрацкія і прымацкія.

Разбойніцкія песні, сюжэты якіх вельмі рэдкія ў беларускай песеннасці, прадстаўлены трыма цікавымі творамі. Калі ў апошнім з іх, значна перароблены у стылі беларускай традыцыі, адчуваецца першааснова — украінская песня пра Кармалюка, то першыя два сюжэты самабытна беларускія.

Казацкія песні на Міншчыне, шырока зафіксаваныя ў паўднёвых раёнах, — самабытная і дасканалая ў мастацкіх адносінах з'ява. Асабліва многа запісаў са Случчыны, дзе ў першай палавіне XVII ст. у час нацыянальна-вызваленчай барацьбы дзейнічалі значныя казацкія злучэнні пад кіраўніцтвам Севярына Налівайкі, на дапамогу якім у 1649 г. Багдан Хмяльніцкі паслаў трохтысячны атрад. Ён хутка перарос у трыццацітысячны.

Не выключана, што сюжэт вядомай на Беларусі песні «Ой, сабралася бедна галота, мёд-гарэлку п'е» ўзнік пад уплывам прозвішча кіраўніка гэтага атрада І. Галоты.

Сярод беларускіх казацкіх песень вылучаюцца паходныя, рытмізаваныя, задорныя песні саміх казакоў і лірычныя, бытавыя, часта трагічныя з баладнымі элементамі песні іх родных: маці, сястры, жонкі. У зафіксаваных на Міншчыне сюжэтах пераважаюць апошнія. Апавядальнасцю, выдатнымі мастацкімі гіпербалічна-метафарычнымі іншасказаннямі адрозніваецца сюжэт аб гібелі казака ў паходзе, на вайне. На пытанне маці, калі ён вернецца дамоў, казак часцей за ўсё адказвае: «Вазьмі, маці, пяску жменю, Пасей яго на каменю. Як пясок той жытам зыйдзе — Твой сыночак з войска прыйдзе».

З матывам сіроцкіх песень пераклікаюцца казацкія аб гібелі героя на вайне. Калі маці просіць яго падаць з магілы руку, ён адказвае: «Не магу ж, мамка, устаці ды рукі падаці: Сасновыя дошкі прыціснулі ножкі, А сырая маць-зямля на грудзь белу налягла».

Маляўнічыя мастацкія сродкі, якімі ствараецца вобраз каня ў казацкіх песнях (часцей за ўсё герой пасылае яго да родных як вестуна смерці). Вестка аб смерці ўяўляе сабой у такім сюжэце скарыстаную яшчэ ў «Слове пра паход Ігаравы» метафару. Вось толькі адзін прыклад такога дыялога маці з канём сына:

— А мой конік, мой вараненькі,
Дзе ж сынок мой мілюсенькі?
— Твой сыночак ажаніўшыся,
У край мары пасяліўшыся:
Былі сваты — зялёны дубы,
Былі свaханькі — белы бярозанькі,
Прыпявала шэра зязюлька,
З белага бору вылятаючы,
Казачэньку паклікуючы.
Узяў жонку ён Марыначку,
У сырой зямлі магілачку.

Многа казацкіх песень-трагедый, дзе на магілу прылятаюць і садзяцца на сэрца, у галоўцы і ножачках тры зязюлі: маці, сястра, жонка.

Рэкруцкія і салдацкія песні, найбольш багата зафіксаваныя сярод сацыяльна-бытавых на Міншчыне, як бы развіваюць тэму набору і службы ў войску. Развязваюць гэтыя сюжэты часцей за ўсё, як і ў казацкіх песнях, метафарычныя апісанні смерці як вяселля.

На другім месцы сярод сучасных запісаў стаяць бадзёрыя, маршава-паходныя песні салдат, якія пабудаваны ў дакладным рытме. Частыя ў іх гіпербалізавана-трагічныя малюнкі баявых сцэн, гістарычныя дэталі, казачныя элементы: «Ляжаць туркі ранены, пабіты, Нам праходу з-за іх нет...»

Мясцовым каларытам адрозніваецца сюжэт песні «І-ой, сюды-туды тры дарожанькі», па якіх ідуць тры салдацікі:

І што к мамцэ ідзе — песеньку пяе,
І што к жане ідзе — на скрыпачку грае,
І што к мачысе ідзе — сільненька плача.

Маршавы рытм мае і адзін з найбольш папулярных сюжэтаў аб арлах, сакалах-салаўях і іншых «пташачках», якіх «крылеччкам двор шырокі, змяталі, галаскамі ўдовушку збудзілі». Багата распрацаваны салдацкі баладны сюжэт, дзе «ў трэцім войску... брат брата ўбіў». У лісце да маці ён тлумачыць гэта тым, што яны любілі адну дзяўчыну: «А ён да мне, меншаму, з ложы не ўступіў, А я жа яму, большаму, галоўку зрубіў...» Павучальную канцоўку мае сюжэт, дзе салдат, які вярнуўся з вайны, «здымае галаву» жонцы за тое, што «закон змяніла, ад чужога мужа сына радзіла». Маці асуджае жорсткасць сына.

Элементамі закляцця, якія арганічна спалучаюцца з замоўна-трагедыйнымі інтанацыямі ў мелодыі, вылучаецца песня-плач маці над магілай «Трава палягае, віхура галосіць».

Чумацкія песні добра вядомы і шырока распаўсюджаны на Міншчыне, асабліва ў Слуцкім, Старадарожскім, Салігорскім і Любанскім раёнах. Яны маюць і агульнавядомыя, і самабытныя сюжэты з мноствам мясцовых прыкмет і адлюстроўваюць асноўныя этапы паходаў чумакоў за соллю: зборы, доўгі шлях у Крым і назад на валах, продаж солі, цяжкую зімоўку. Але асабліва многа сюжэтаў, у якіх чумак гуляе дзе-небудзь «у Слуцку на рыначку», часам прапівае «ўсё чумацкае дабро».

Папулярны на Міншчыне таксама сюжэт аб адмене прыгоннага права і цяжкай долі батракоў і прымакоў.

На прыкладзе надзвычай папулярнай па ўсёй Беларусі прымацкай песні «Ў саду, ў саду чарэмшына» можна прасачыць трансфармацыю традыцыйнай песеннай лірыкі, асабліва ў яе позніх плынях. Названы сюжэт апавядае аб горкай долі прымака, лёс якога быў яшчэ больш трагічны, чым батрака, бо гэта была кабала ў доме багатай жонкі на ўсё жыццё. У наш час, у сувязі са знікненнем гістарычных абставін патрыярхальнай сям'і таго часу, песня-трагедыя набыла жартоўна-забаўляльны характар у тэксце, а трагедыйнасць гучання ў мелодыі заменена скокавымі інтанацыямі. Гэты працэс вельмі інтэнсіўны ў традыцыйнай лірыцы ў наш час.

599. За Сібірам сонца ўсходзіць...





За Сібірам сонца ўсходзіць,
А вы, хлопцы, знайце,
Да й на мене, Кармалюгу,
Ўсе надзею майце.

Кармалюга, добры хлопец,
Ён па свету ходзіць,
Не й адну ён чарнявую
Шчэ й з розуму зводзіць.

Чарнявыя, белявыя —
Да ўсе белаліцы,
Чарнявыя, белявыя —
Да ўсе маладзіцы.

Ма́ю жонку, маю дзетак,
Я ж іх і не бачу,
Як уздумаю пра іх долю —
Сам горка заплачу.

600. Паехаў малойчык у чыстае поле...

Паехаў малойчык у чыстае поле,
Спаткала малойца няшчасная доля.
Спаткала, спаткала, гаворыць стала:
— А дзе будзеш, малойчык, ночку начаваці?
— Начаваў бы я ночку ў зялёным лужочку,
Прывязаў я коніка к белай бярозе,
І прашу бярозу, каб яна не шумела,
Залатое лісцейка на Дунай не ляцела.
Выспаўся ў белай бярозе на лісточку,
Як у роднай мамкі ў жываточку.
Выспаўся ў белай бярозы на карэннях,
Як у роднай мамачкі на каленях.

601. Ой, на моры, на сінюсенькім...

Ой, на моры, на сінюсенькім,
Ой, люлі, люлі**.
Купаліся два брацікі, трэці — чужазем.
Адзін кажа: «Загубім яго».
Другі кажа: «Мы спытаем яго —
А ці есць у яго айцец, матушка,
Айцец, матушка, брат з сястрой».
— Брат з сястрой — уся родзіна,
Мой ацец радной — сіняе мора,

Мая матушка — сырая зямля,
Мой брацейка — у садзе салавей,
А сястрыца — у бару зязюля.
Сіняе мора, скалыхні мяне,
Уся родзіна, дробны пташачкі,
У бару зязюлька, пакукуй па мне,
Дробны птушачкі, пашчабячыце па мне.

** Прыпеў «Ой, люлі, люлі» паўтараецца пасля кожнага радка.

602. А ў нядзельку раненька, рана на зару...



А ў нядзельку раненька, рана на зару**
Выпраўляла мамачка сына на вайну.
А старшая сястрыца коніка вядзець,
Сярэдня сястрыца сідзельца нясець,
А меншая сястрыца брата пытаець:
— А, брацятка, брацятка, брацятка радной,
А ці скора вернешся са службы дамой?
— А тады я вярнуся са службы дамой,
Як белы камушак наверх усплывець,
Як трусіна пер'яйка на мора падзець.
А старшая сястрыца да мора глядзець:
Як белы камушак наверх усплывець,
Як трусіна пер'яйка на мора падзець.
А па тым камушку тры казакі йдуць.
— Казакі, маладыя, брацяткі мае,
Ці відзелі брацятку майго на вайне?
— Ці не твой брацятка, што тры войскі біў,
А на трэцім войску ён галоўку скланіў?
А заржалі конікі, яго вязучы,
Застагнала зямелька, яго беручы,
Заплакалі жаўнерыкі, за нім ідучы.

** Кожны радок паўтараецца.

603. Ой, на гарэ ячмень, а ў даліне жыто...



Ой, на гарэ ячмень, а ў даліне жыто,
Прышлі слыхі да мілое, што мілы убіты**.

Ой, убіты, убіты, заброшаны ў жыто,
Чырвонаю кітайкаю лічэнько накрыто.

Прылетала пава, серод двара ўпала,
Крыльечкамі ўстрапенула да й зашчабетала:

— Ці ты, мілы ўпіўся, ці з каня звалiўся,
Ці на мене, маладзеньку, сільно зажурыўся?

— Ой, да я ж не ўпіўся, ні з каня звалiўся,
А я на цебе, маладзеньку, сільно зажурыўся.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

604. Павей, вецер-вецерочак...



— Павей, вецер-вецерочак,
Іс поля, із гаю,
Прыедзь, прыедзь, мой міленькі,
З далёкаго краю!

— Не падуну й не павею, —
Я й не перакіну.
— Не прыбуду к табе, дзеўка,
Бо я й там загіну.

605. Із-за леса, леса цёмнага...



Із-за леса, леса цёмнага,
Із-пад гая, з-пад зялёнага.

Цекла рэчка, цекла быстрая рака,
На той рэчке да й калінавы масток.

На той рэчке да й калінавы масток,
На том мосце да й тры войскі стаяла.

У першым войску сівы конічак заржаў,
У другім войску красны малойчык засвістаў.

У другім войску красны малойчык засвістаў,
А з трэцяга — сіза пташачка ляціць.

А з трэцяга — сіза пташачка ляціць,
Па ўсяму свету ўсе указы разнасіць.

Дзе адзін братко — там ні нада яго браць,
Дзе два браткі — там ні нада разлучаць.

Дзе два браткі — там ні нада разлучаць,
Дзе тры браткі — там аднаго нада ўзяць.

Самы большы — адмаўляецца,
А сярэдні — адкупляецца.

606. Дарагая мая мамка...





Дарагая мая мамка,
Вары кашу і з алеем,

Вары кашу і з алеем,
Пасьледні год мяне жалей!

Пасьледні год, пасьледні раз,
Йду ў салдацікі січас.

Не скучай, мая мамаша,
Я нідзе не прападу!

Большэ грамаце наўчуся,
Ў ахвіцэры пападу.

607. Із-за лесу, лесу цёмнянькаго...



Із-за лесу, лесу цёмнянькаго,
Із-за садзіку зялёненькаго

Прылятае чудны пташачак да нас,
Гасударствяны прыносіць наказ.

Слышна, відна, будуць набор набіраць,
Яшчэ будуць у салдаты забіраць.

Ці старшаго, сялядоршаго,
Ці самаго наймалодшаго.

У старэйшаго дзяцей чарада,
Ў сялядоршаго жана малада.

Ў сялядоршаго жана малада,
А ў малодшаго нікога німа.

Сялядоршы выкупляяцца,
Самы младшы субіраяцца.

Самы младшы субіраяцца,
З атцам, з маткай распрашчаяцца.

З атцам, з маткай распрашчаяцца,
А з сястрою ні расстаняцца.

— Пастой, пастой, родны брацяйка ты мой,
Пастой, пастой, я табе кудры расчашу.

— Ох, расчэша буйны вецер, ідучы,
У чыстым полі пры аруддзях стоячы.

608. Ішлі хлопцы дарогаю...



Ішлі хлопцы дарогаю,
Запыліліся глаза, эй!**

Запыліліся глаза —
Зірнуць-глянуць хоць нільзя.

Азірнуліся назад —
Тры красавіцы стаяць.

Тры красавіцы стаяць,
Самі з сабой гавораць.

— Вы, дзяўчата, маладыя,
Ні хадзіце вы да нас.

Ні хадзіце вы да нас,
Ні ўлюбляйцеся вы ў нас.

Ні ўлюбляйцеся вы ў нас,
Бо нам цяпер ні да вас.

Бо нам цепер ні да вас,
Беруць у салдаты нас.

Беруць у салдаты нас
Да й на дваццаць пяць гадоў.

Да й на дваццаць пяць гадоў,
Ні вароцімся дамоў.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца з воклічам «эй!».

609. Матка свайго сына ў салдаты аддала...



Матка свайго сына ў салдаты аддала,
Ў салдаты аддала да па гай правяла.

Нада мною, гаям, да і пастаяла,
Слёзкамі карэння пападмывала.

Слёзкамі карэння пападмывала,
Галаском вяршэчкі павысушвала.

Капайце канавы ўсе й глыбокіе,
Станавыя ўсе сталбочкі, ўсе й высокіе.

Штоб свайго сыночка з войска не вяла,
Штоб свайму сыночку ручку падала.

610. Зялёная дубровачка, зялёная...



Зялёная дубровачка, зялёная,
Там плакала удовачка маладая.

Там плакала удовачка маладая,
Што паехаў бел малойчык жаніціся**.

Недалёка ён паехаў — у Варшаву,
А ў Варшаве слічны горад закупілі,

Каторыя з добрая воляй — прыступілі,
Каторыя паняволе — сільно плачуць.

Жана мужа праважала,
Ў роўным полі пад крушынай начавала.

Ў роўным полі пад крушынай начавала,
Яна тую крушыначку выклінала.

Бадай цябе, крушыначка, высушыла,
Як ты мяне з добрым, мілым разлучыла.

Забылася я ў мілога папытаці,
Ці пазволя мне міленькі пагуляці?

— Гуляй, гуляй, мая мілка, як гуляла,
Абы мае родны дзеткі гадавала.

** Ланцужковая страфа вытрымліваецца і далей.

611. З-пад нароту ўсё й туман да ўсё й туман...



З-пад нароту ўсё й туман да ўсё й туман,
З-пад туману да ўсё й уланы ідуць, усё ідуць.

А па-перша сам парушнік маладой
Вядзе войска за сабой, за сабой, за сабой.

— Вы, рабята, не ўстрашыс, не ўстрашыс,
Прама к бою да станавіс, станавіс, станавіс!

— Мы пасталі, як сцяна, як сцяна,
Мяне куля раніла, раніла, раніла.

Палілася кроў з мяне, кроў з мяне,
Да й на чужой да старане, старане, старане.

612. У прыграніччы мы, браццы, стаялі...

У прыграніччы мы, браццы, стаялі
І ня думалі аб чом**.

Толькі думалі, браццы, гадалі
Снарадзіцца харашо.

Мы ж ня ўспелі, браццы, снарадзіцца,
Нам прыказаў сем прышло.

Прыйшлі, прыйшлі нам, браццы, прыказы
Усе з турэцкай стараны.

Дзень і з ноччу мы, браццы, не спалі,
У паходзе маршам шлі.

Падыходзім мы, браццы, к Дунаю
Турак бераг занімаў.

Турак бераг, браццы, занімаў
Да нам праходу не даваў.

Ляцяць кулі, кулі і карцечы,
Рассыпаюцца падрад.

Ляжаць туркі ранены, пабіты,
Нам праходу з-за іх нет.

Туман з мора, ой, туман падняўся,
Тры дні, тры дні дождж ішоў.

Генярал Скобеляў у паход снараджаўся,
За аблакамі па гарах пайшоў.

** Кожнае двухрадкоўе спяваецца двойчы.

613. Ой, паслухайце, рэбята, я вам песеньку спяю...





Ой, паслухайце, рэбята, я вам песеньку спяю,
Ой лі, ой да люлі, я вам песеньку спяю**.
Я вам песеньку спяю пра службіцу пра сваю.
Мы тры гады праслужылі, ні аб чым мы не тужылі.
Стаў чацвёрты наступаць, сталі думаць і гадаць.
Сталі думаць і гадаць, як нам дома пабываць,
Як нам дома пабываць, з маладой жаной паспаць.
— Здраствуй, жонка маладая, як ты без мене жыла?
— Ой, жылось мне харашо, пайдзі паслужы яшчо!

** Прыпеў «Ой лі, ой да люлі» і другая палова кожнага радка паўтараюцца.

614. Збіраяцца мой мілянькі...



Збіраяцца мой мілянькі
Ў вялікую дарогу, ў дарогу.

Параначуй, мой мілянькі,
Хаці ночку са мною, мною.

— Да рад бы я, ты мая міла,
Тры-чатыры й начаваць, начаваць.

Баюсь, баюсь, ты мая міла,
Каб пахода не ўцяраць, не ўцяраць.

— Да й не буйся, муй мілянькі,
Я ж малада — чутка сплю, чутка сплю.

Як запяюць раннія пеўні,
Та цябе пабуджу, пабуджу:

«Да й устань, мой мілянькі,
Ужэ ж над намі світ-зара, світ-зара.

Да ўжэ ж табе, мой міланькі,
Йці на воянку пара, ой, пара.

Да ўжэ тваі коні вараныя
Запражоныя стаяць, ой, стаяць.

Да ўжэ тваі слугі вірныя
Прыбіроныя сядзяць».

615. І-ой, сюды-туды тры дарожанькі...

І-ой, сюды-туды тры дарожанькі,
Э-э-эй, тры дарожанькі**.
Ой, тудой ішло тры салдацечкі.
І што к мамачцэ йдзе — песеньку пяе,
І што к жане ідзе — на скрыпачку грае,
І што к мачысе ідзе — сільненька плача.
І сустрэла мамачка ў поўдарожанькі
Із хлебам, з соллю, із шчасцем, з доляю.
І сустрэла жана ў вароцечках
Із белым сырам, з маленькім сынам.
І сустрэла мачыха на парожачку
Із горкім пылам, з дубовым кіям:
— І чаму цябе, сыну, куля не забіла?
— Мамачка мая, хоць няродная,
Каля мяне кулі, як пчолкі, гулі,
Каля мяне братцы,як мост, ляжалі,
А мяне, сірату, кулі ўсё міналі.

** Такім жа чынам прыпеў ствараецца з кожнага радка.

616. У роўным полі ні дым, ні туман...



У роўным полі ні дым, ні туман,
Эю-эй, ні дым, ні туман**.
Ні дым, ні туман і тры войскі там:
У адным палку малойцы пяюць,
У другім войску конікі ірзуць,
У трэцім войску навіны чуваць.
Навіны чуваць, шабелькі брашчаць,
Брат брата убіў, галоўку зрубіў.
Сеў ліста пісаць да матулі слаць:
«Матуля мая, харані сына!
Матуля мая, харані сына!»
— Мой жа ты сыночак, а што ж ты зрабіў?
Большаму брацітку галоўку зрубіў!
— Служылі, матуля, аднаму цару,
Пабілі, матуля, адну гадзіну,
Любілі, матуля, адну дзяўчыну.
А ён жа мне, меншаму, з ложы не ўступіў,
Ірзалі конікі, яго везучы,
Плакала радзінка, за ім ідучы,
Стагнала зямелька, труну беручы.
Вазьмі, матуля, калішок вады,
Палі, матуля,па жоўтым пяску.
З жоўтага пяску вады не сабраць,
Большага брацейку з гробу не падняць.

** Прыпеў «Эю-эй» і другая палова кожнага радка паўтараюцца.

617. Ў канцы грэблі стаяць вербы...



Ў канцы грэблі,
Ў канцы грэблі стаяць вербы,
Усе ж вербы пашумелі.

Адна верба,
Адна верба не шумела,
Яна сабе госцю мела.

Мела госцю,
Мела госцю с Украіны —
Маладога жаўнярыны.

Ляжыць жаўнер,
Ляжыць жаўнер пад вярбою,
На купіну галавою.

Да ў даліну,
Да ў даліну ножачкамі
Й абліўшыся слёзачкамі.

618. А з-пад лесу цёмна хмарка стала...



А з-пад лесу цёмна хмарка стала,
З тое хмаркі дробны дожджык хвошча.

З тое хмаркі дробны дожджык хвошча,
Нам, салдатам, галоўкі спалошча.

Вышла маці да і воду браці,
Як набрала, сыночка пазнала:

— Хадзем, сынку, са мною й дадому,
Змыю табе беленька галоўку.

— Нада ж, маці, ды і нас ўсіх клікаць,
Змый і нам беленька галоўку!

619. Усе мужы да з вайны ідуць...



Усе мужы да з вайны ідуць,
А мой мілы да убіт ляжыць.

Ў правай руке да каня дзяржыць,
А леваю да расу бярэць.

Расу бярэ да на сэрца л'е:
— Раса ж мая да красушчая,
Раса ж мая да жывушчая.

Ой, вы, хлопцы, да мае братцы,
Накажыце да маёй жонцы:

Няхай яна да мяне не жджэ,
Няхай яна да замуж ідзе.

Калі пойдзе да па лепш мяне —
Будзе мяне да праклінаці.

Калі пойдзе да па горш мяне —
Будзе мяне да памінаці:

За тым была, як калінушка,
А за гэтым, як былінушка.

620. Малады жаніўся, на войну ішоў...



Малады жаніўся, на войну ішоў, эх!
Ідучы на вайну, прашчаўся с сям'ёй, прашчаўся с сям'ёй:

— Прашчай, прашчай, сям'я, жана малада, эх!
Жана малада, ці будзеш вярна, ці будзяш вярна?

Жана маладая, ці будзеш вярна? Эх!
Жана атвячала: «Да гроба й адна! Да гроба й адна!»

Сеў мілы, уехаў ў чужой, дальняй край, эх!
Ды біўся ён, драўся сваею крывёй, сваею крывёй.

Пабіўшыць-падраўшыць, дадому пайшоў, эх!
На пуці-дарозе радзіцель ішоў, радзіцель ішоў.

— Ой, то не радзіцель — ацец мой радной, эх!
Ой, ацец мой роднай, як дома сям'я? Як дома сям'я?

— Сям'я, слава Богу, даўно прыбыла, эх!
Жана маладая закон змяніла, закон змяніла.

Жана маладая закон змяніла, эх!
Ад чужога мужа сына радзіла, сына радзіла.

Ой, аб етам слове садзіцца на каня, эх!
Садзіцца на каня, едзя да двара, едзя да двара.

Матка пяраймая з іконай святой, эх!
Жана пяраймая, эх, з гарачай слязой, з гарачай слязой.

Маці сына просіць: «Прасці, сын, жане». Эх!
— Табе, маці прашчаю, жане нікагда, жане нікагда!

Закіпела сэрца, эх, ў салдацкай грудзі, эх!
Забляшчала сабля ў правуй руцэ, у правуй руцэ.

Зляцела галоўка няверную жаны, эх!
— Ох, сынок мой, сынок, што ж ты нарабіў, што ж ты нарабіў?

Жану ты лішыў, эх, сабе ты згубіў, эх!
Малую малютку навек ссіраціў, навек ссіраціў!

621. Трава палягае, віхура галосіць



Трава палягае, віхура галосіць,
На свежыя раны пясочку наносіць**.

Нясіце вы, ветры, жалобу матулі,
Скасілі сыночка варожыя кулі.

Ой, ночка праходзіць, другая мінае,
А маці над сынам нямцоў праклінае:

— Бадай вам, нямцове, спазнацца з труною,
Як вы разлучылі сыночка са мною.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

622. Ох, я ўстану раненько...



Ох, я ўстану раненько,
Й умыюся беленько,
Ой, я сяду над акном
Й уватруся рушнічком.

Месяц, зоры высако,
Атец, маці далеко,
А братішэк на вайне,
Не думае аба мне.

І-ох, пайду я ў вішнёў сад,
Стаяць вішэнькі у рад.
Вішня к вішне хіліцца,
Лісце к лісту ліпнецца.

Вішня к вішне хіліцца,
Лісце к лісту ліпнецца,
А мне, беднай сіраце,
Не к каму прыхіліцца.

623. Ішоў салдат с пахода...



Ішоў салдат с пахода,
Зайшоў сабе ў кабак.
Сеў салдат на лаўку,
Давай курыць табак.

Трай-рай-ра,
Трай-тар, у-ха-ха!
Сеў салдат на лаўку,
Давай курыць табак**.

— Здароў-ка, брат служывы,
Мы курым табачок.
Трубачка на дзіва,
Давай курнём разок.

Якая пазалота
З разбоем па краях!
Дзіўная работа, —
Прадай-ка трубку нам.

— Трубка непрадажна,
Прадаць не ў сілах я:
Ў памяць камандзіра
Засталася яна.

** Прыпеў з паўторам двух апошніх радкоў утвараецца пасля кожнай страфы.

624. Жылі чумакі чатыры гады...



Жылі чумакі чатыры гады,
Да не зналі чумакі гора, ні бяды.

Да прыйшоў к яму чумак маладой
Да пытае ў чумака: «Што, што ў табе баліць?»

— Баліць у мяне сільна галава,
Да прыдзецца паміраць у чужой старане.

625. Ляцела зязюля чэраз новы сёлы...



Ляцела зязюля чэраз новы сёлы:
— Ой, чаму ж вы, мужыкі, хмурны, невясёлы?**

Ляцела другая, стала кукаваці:
— Паслухайце, мужычкі, што буду казаці.

Во буду казаці, буду гаварыці —
Пакінеце, мужычкі, паншчыну служыці.

Во пайшла жа паншчына за крутыя горы,
А за ёю аканом, за ёю ў пагоні.

— Во вярніся, паншчына, будзем шанаваці,
— Было табе мужычкоў так не катаваці.

Во пайшоў жа стары пан пшаніцу касіці,
А за ім жа стара пані пракосы вязаці.

Ні звязала стара пані ні 'днаго пракоса,
Баціначкі патаптала, пайшла дамоў боса.

Во хацела стара пані мужычкоў наняці,
Цапу-лапу да кішэні — недзе грошай ўзяці.

** Другі радок кожнай страфы паўтараецца.

626. Арэ прымак, арэ прымак...



Арэ прымак, арэ прымак,
На свет паглядае,
Усе жонкі нясуць есці,
А маей немае**.

— Я прынесла, прымачэнька,
Боршча з лебядою,
Не хоч боршча з лебядою —
Еш хлеб із вадою.

Не хоч боршча з лебядою —
Еш хлеб із вадою.
Запрагай жа сівы валы,
Т'яжджай дадому.

Едзе прымак, едзе прымак
І ў дудачку грае,
Як зачула чоща зяця,
Абед налівае.

Да не ўспеў жа прымачэнько
З воза ізлезці,
Яму чоща загадала:
— Нясі свінням есці!

Бадай свінні паздыхалі,
А хата згарэла!
Як жа мне гэта прымацкая
Жызня надаела!

** Апошнія два радкі кожнай страфы паўтараюцца.

627. Ў саду, ў саду чэрэмшына...



Ў саду, ў саду чэрэмшына
Да й вішэнь не мае,
Й а хто ў прымах не бываў жэ,
Той гора не знае.

А я ў прымах пабываў жэ,
То й горайко знаю,
Белы ручкі пад галоўку
Дый лажуся спаці.

І прыйшла міла чернобрыва,
Пачала будзіці:
— І уставай, мілы, чернобрывы,
Будзе табе спаці.

І ўставай, мілы, чернобрывы,
Будзе табе спаці,
І запрагай жэ сівы волы
І едзь поле араці.

ПРЫПЕЎКІ

Самую шматлікую групу прыпевак, што спяваюць на Міншчыне, складаюць л ю б о ў н ы я прыпеўкі. Надзвычай разнастайныя па эмацыянальнай афарбоўцы, яны перадаюць усе адценні пачуццяў закаханых дзяўчыны або юнака. Светлыя і пяшчотныя — калі дзяўчына і хлопец кахаюць адзін аднаго. А вось калі каханне засмучаецца здрадай — з'яўляюцца ноты няўцешнага смутку, а часам і крыўды. Але часцей за ўсё прыродны аптымізм, гарэзлівасць, часам добрая песня або «прыпевачка» дапамагае дзяўчыне перанесці ўсе гэтыя выпрабаванні: «Стала песенькі спяваць і на гора забываць».

Важнейшай падзеяй у жыцці кожнага юнака і дзяўчыны з'яўляўся і з'яўляецца шлюб. А які ж ён будзе? Ці не прыйдзецца аблівацца «горкімі слёзкамі»? Ці не будзе «свякроў злая» здзеквацца з яе? Усе гэтыя пытанні паўстаюць перад маладой дзяўчынай і яе бацькамі перад шлюбам. Таму ў прыпеўках, якія тэматычна далучаюцца да в я с е л ь н ы х, перш за ўсё адчуваецца занепакоенасць гераіні сваім будучым лёсам, няўпэўненасць у добрых адносінах да яе будучага мужа. Дарэчы, і на гэтыя творы наклаў адбітак той факт, што маладая выключна рэдка ўступала ў шлюб па ўзаемнаму каханню. Часцей за ўсё хлопцу нявесту выбіралі яго бацькі.

Змест с я м е й н а-б ы т а в ы х прыпевак таксама, як і песень, абумоўлены бясправным становішчам беларускай жанчыны ў даўнейшыя часы: «бацькоўская воля» на шлюб, дэспатызм свякрухі, жорсткія адносіны мужыка-п'яніцы да жонкі. Таму прыпеўкі гэтай тэматычнай групы маюць у асноўным мінорную афарбоўку. І толькі зрэдку сустракаюцца асобныя тэксты, у якіх гаворыцца, іншы раз і з гумарам, аб шчаслівым сямейным жыцці.

Калі гаварыць пра с а ц ы я л ь н а-б ы т а в ы я прыпеўкі, то трэба зазначыць факт больш шырокага, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Беларусі, бытавання іх на Міншчыне, і асабліва прыпевак с а л д а ц к і х і р э к р у ц к і х. Па-



«Не глядзіце на мяне, Што я худаватая, Мужык сала не дае, Я не вінаватая». Фота А. Нікалаева.

колькі служба ў царскай арміі заўсёды была няшчасцем для рэкрута, яго сям'і і яго дзяўчыны, гэтыя творы вызначаюцца глыбокім сумам. У некаторых з іх нават гучаць зняважлівыя, пагардлівыя адносіны да рэкрутаў: «Маім міленькім не будзеш, Бо ў салдацікі пайдзеш». Але асноўным лейтматывам салдацкіх і рэкруцкіх прыпевак з'яўляецца тэма «Мілы (або сынок) пойдзе ў салдаты, Дамоў не вароціцца».

Лепшыя якасці беларускага нацыянальнага характару выяўляюцца ў змесце сатырычных і жартоўных прыпевак. Працавітасць і добрасумленнасць чалавека пададзены ў гэтых творах як рэзкае асуджэнне гультайства, дэмагогіі, безгаловасці, п'янства і іншых адмоўных рыс грамадства. Таму дзякуючы ўдаламу камічнаму перабольшванню, іроніі, а часам і гратэску некаторыя прыпеўкі гэтай групы маюць сацыяльную накіраванасць. Асноўную ж частку гэтых твораў складаюць прыпеўкі-кпіны з няўдалага ўхажора з «крывымі нагамі», задавастых хлопцаў, у якіх «парваныя штаны», або «харошых дзевачак, здольных да прыпевачак», а «на работу хворых». Іншы раз сустракаюцца прыпеўкі-дыялогі з незвычайнай камічнай сітуацыяй: «— Мілы мой, мілы мой, А чаму ж ты не прыйшоў? — Муха лямпачку разбіла, Чаравікаў не знайшоў».

Асобную групу традыцыйных прыпевак Міншчыны складаюць прыпеукі танцавальныя і да скокаў. Часцей за ўсё гэтыя творы выконваюцца пад музычны акампанемент — гармонь, скрыпку, бубен. Разам з тым можна заўважыць, што танцавальныя прыпеўкі распадаюцца на некаторыя асобныя тэматычныя падгрупы: зварот дзяўчыны да гарманіста; зварот гарманіста да гармоні (або скрыпача да скрыпачкі): Зварот дзяўчыны да чаравічак («замуж выйду — бабай буду, — вам пад лавачкай стаяць»); Удалы танцор — дрэнны работнік; уласна танцавальныя («сербіяначка», «полечка» і г. д.). Многія з названых твораў маюць сатырычную афарбоўку. Асабліва гэта датычыцца апошняй падгрупы: «Хто полечку дробна скачыць, За кроснамі сядзіць — плачыць. Хто полечку дробна йдзе, У берда нітку не ўвядзе».

Такім чынам, прыпеўкі, гэтыя маленькія песенькі, па шырыні ахопу жыццёвых з'яў, выразнасці перадачы імгненных чалавечых пачуццяў, багаццю і разнастайнасці мастацкіх сродкаў не ўступаюць лепшым узорам беларускай народнай лірыкі і дзякуючы сваёй жанравай мабільнасці былі і зараз застаюцца адным з самых папулярных і любімых у народзе жанраў народнай творчасці.

628. Ой, іграй, іграй, гармонь...



Ой, іграй, іграй, гармонь,
Ой, іграй павесялей,
Штобы гэта скучна врэмя
Прахадзіла весялей.

Я адзену плацця бела,
Замараю й вымаю,
А хто з маім мілым сядзе,
Я за ручку выведу.

Ой, падружка верная,
Саперніца первая,
Нечаму няўстоіла,
Усю любов(ь) расстроіла.

Завівалісь мае кудры
Ад вясны да восені,
Як услышалі «Разлуку»,
Завівацца бросілі.

Маменька бранілася,
Каб я не любілася,
Ты ж, мамка, забылася,
Як сама любілася.

Я любіла па пяці,
Любіла па пяцёрачке,
Я любіла пагуляць
З мілым на вячорачке.

629. Дзяўчыначка, чыя ты?





— Дзяўчыначка, чыя ты,
Ці ня пойдзеш гуляці?
— Не пытайся, чыя я,
Пойдуць людзі, пайду я.

Мяне мама нарадзіла
І у полачкі павіла,
Туга ножанькі сціскала,
Каб танцорачкаю была.

630. Ох ты, дзедка мой...



Ох ты, дзедка мой,
А я бабка твая.
Ох, ня бі ж ты мяне,
Каб я гладка была.

Ох, ня бі ж мяне ўдзень,
Не смяшы ж ты людзей.
Ой, бі ж мяне з паўначы,
Каб дзе была уначы.

631. Хоць я мала, хоць я мала...



Хоць я мала, хоць я мала,
Хоць я недаросла,
А выткала я, выпрала
Шаўковыя кросна.

Нітачка парвалася,
Аж я надвязала,
Прыехалі ка мне сваты,
Вот я адказала.

Што ж мяне чапаеш,
Калі хаты не маеш!
Пастаў хату, пастаў клець,
Тады ў сваты ка мне едзь!

632. Ду-ду-ду, ду-ду-ду!



Ду-ду-ду, ду-ду-ду!
Добра будзе на лугу
С сваім статкам пагуляць,
Краснай траўкі пашчыпаць.

Як павесіў я дуду
На зялёным дубу,
Дуда з дуба звалілася,
На трэсачкі пабілася.

Ох, і дудка была,
Весялушка была,
Весяліла меня!

633. Ой, ня йдзіця, дзеўкі, замуж...



Ой, ня йдзіця, дзеўкі, замуж —
Замужам нявесела,
Я й, молада, замуж зайшла,
Калыску павесіла.

А ў замужжы трэба знаць:
Позна легчы, рана ўстаць:
Ў печы палю, дзяжу мяшу,
Дзіця плача — пакалышу.

Пакуль дзяжу замясіла,
Свіння цеста адна з'ела
Ды паваліла карыта,
Будзя, будзя свіння біта!

634. Прыпеўкі

Ой, Васілю, Васілю,
Баравое зелле!
Яшчэ замуж не пайду,
Не спраўляй вяселля.

Месячыку, месячыку,
Не свяці нікому.
Толькі майму міленькаму,
Як ідзе дадому.

Ой, ты, гора, маё гора,
Як не бачыла Рыгора.
Як убачыла Рыгора —
Нету боле таго гора.

Руту-мяту пакашу,
Вярхі пасцінаю.
Яшчэ замуж не пайду —
Трохі пагуляю.

Я па верасу хадзіла,
Верас — колкая трава.
Пакуль мілага не знала,
Як каліначка цвіла.

А на небе зорак многа,
Адна ясненька гарыць.
А на свеце хлопцаў многа —
Па адным душа баліць.

Баляць ручкі, баляць ножкі,
Баліць сэрца й галава,
Каб мілога не любіла —
Здаравёшанька б была.

Ходзе бусел па балоце —
Чырвоная дзюбачка.
Прыйдзе мілы — пацалуе,
Скажа: «Мая любачка».

Хутка будзя Троіца,
Зялёны лес укроіцца.
Хутка мілая прыдзе —
Сэрца супакоіцца.

Каля рэчкі дзьве парэчкі,
Каля возера — адна.
Каля мілага дзяўчаты,
А я, бедная, адна.

Як пайду я у лясок
Па сухія дроўцы.
А мой міленькі прыгожы —
Чорненькія броўцы.

Дзевачкі, на Яна, Яна
Ягадкі зялёныя.
Ягадкі зялёныя,
Дзяўчаткі ўлюблёныя.

Вецер вее, вецер вее,
Я на ганачку стаю.
Пацалую не чужую,
А каханачку сваю.

На балоце, на купіне
Журавінка спее.
Адзін хлопец пацалуе,
А чатыры млеюць.

Ляцеў кот цераз плот,
Паламаў каліну.
Цалаваў, мілаваў
Хлопец дзяўчыну.

Мяне маменька будзіла,
Ня будзіла — плакала:
— Уставай, маё дзіцятка,
Ты ўжо засватана.

Хоць якое жыта рэдка,
Трэба бабачку нажаць.
Хоць якая свякроў злая,
Трэба мамачкай назваць.

Ды чаму ж мы ўсё танцуем,
Ды чаму ж мы ўсё пяём?
А таму, што Ваню жэнім,
Ганну замуж аддаём.

На гары на хутары
Хлопцы коней путалі.
Путалі, стараліся,
У сваты збіраліся.

Йдуць кароўкі із дуброўкі,
Авечачкі з поля.
Плача маці па дзіцяці,
Што ліхая доля.

Не ідзіце, дзеўкі, замуж,
Замужам нядобра жыць.
Адна дзеўка выйшла замуж
І штодзень дамоў бяжыць.

А каб я ні сірата,
А маць мая ні ўдовачка,
Не была б мая такая
Задумана галовачка.

Камарыкі мае,
Не кусайце мяне.
А ляціце дамоў —
Укусіце свякроў.

Мая косачка не косіць
І брусочак не бярэць,
Мяне мамачка не жэніць
І парады не даець.

Камары, камары!
Не кусайце мяне,
А кусайце паноў,
Каб пусцілі дамоў.

Вы, палякі, вы, палякі,
За што вы ваюеце?
Усіх рэкруцікаў пабралі,
Голадам марнуеце.

Здалі брата ў салдаты,
А мілога на вайну.
Я за брата плакаць буду,
А за міленькім пайду.

Ох ты, маць, мая маць,
Нашто мяне жэніш:
Аддадуць мяне ў салдаты,
Куды жонку дзенеш?

Ах ты, міленькі ты мой,
Мы апошні год з табой:
Цябе ў салдацікі здадуць,
Мяне замуж аддадуць.

Вечарынка ў новай хаце,
Стаяць хлопцы ля сцяны.
— Чаму яны не танцуюць?
— У іх парваныя штаны.

Мяне сваты сваталі,
Сваталі багатыя.
Кажуць, што скаціны многа:
Два каты махнатыя.

Няхай мышы пражу трубяць,
Няхай хлопцы мяне любяць.
Мышы пражу патрубілі,
Мяне хлопцы палюбілі.

Дзе мы з міленькім стаялі,
Быў вясёлы вугалок.
А цяпер на гэта месца
Бусел жабу прывалок.

Хадзіў Зэлік па балоту,
Рабіў трасцу — не работу:
Касіў сена, жыта жаў,
Дзевак любіў — бабу ўзяў.

Гумно з хатаю,
А світка з латаю.
Уцякайця, дзеўкі,
Бо пасватаю.

А ў нашае Алёны
Завушніцы зялёны.
Па чатыры ды па пяць,
За вушамі бразгацяць.

Не хачу я жаці,
Не хачу вязаці.
Зрабі, мілы, халадок,
Я буду ляжаці.

Каля рэчкі я хадзіла,
Дзе шумеў зялёны гай.
Я Міколу палюбіла
Ды не знала, што гультай.

— Куды ідзеш, Ульяначка?
— У агарод, Іваначка.
— Па што? — Па цыбулю.
— Пастой, пацалую.

Мяне мама нарадзіла,
Чорным шоўкам спавіла.
Ручак-ножак не сціскала,
Каб танцорачка была.

Ой, іграйце, музыкі,
Ў мяне лапці вялікі.
А мне бацька наплёў,
Каб было да Пакроў.

Ой, танцуйце, чаравічкі,
Вам не доўга танцаваць:
Замуж выйду, бабай буду, —
Вам пад лавачкай стаяць.

Цераз сад-вінаград
Гнала я качата.
Туды рвецца маё сэрца,
Дзе пяюць дзяўчата.

Цераз сад-вінаград
Ганіла індыкі.
Рвецца, рвецца маё сэрца,
Як чую музыкі.

Пасадзіла стара бабка
На тры яйкі гусака.
Сама выйшла на вуліцу
Й ўдарыла гапака.

Ой, цяпер пагуляць,
Як новая скрыпка,
Ручкі-ножкі не баляць,
Сярэдзінка гібка.

Хто полечку дробна скачыць,
За кроснамі сядзіць — плачыць.
Хто полечку дробна йдзе,
Ў берда нітку не ўвядзе.

Я полечку дробна вытну,
За дзень цэвачкі не вытку,
Насукаю цэвак пяць
Й буду цэлы тыдзень ткаць.

ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР

У жанравым складзе дзіцячага фальклору Міншчыны асобнае месца займаюць калыханкі. Запісаныя ў наш час, яны маюць традыцыйныя сюжэты, вобразы, тэматыку. Змест іх абумоўлены функцыяй, прызначэннем — навеяць добры, спакойны сон. Гучаць матывы лагоднасці, бязмежнай мацярынскай любві і спрадвечнага жадання зберагчы сваё дзіця ад хваробы, нядолі.

Найбольш папулярны персанаж — коцік. У адных калыханках расказваецца, што ён «носіць Свеце сон у хусце», прычым сон падаецца як нейкі прадмет. У другіх жа — яго запрашаюць калыхаць дзіця, абяцаючы за гэта ўзнагароду. У трэціх жа — коцік добры, ён прыносіць дзецям гасцінцы. Сюжэт некаторых калыханак трымаецца на займальных прыгодах, што адбываюцца з катком. Як не пашкадаваць коціка, калі той палез па дулі, памарозіў лапкі або зваліўся ў крапіўку і папёк свае лапкі!

Сустракаюцца ў калыханках і такія персанажы, як гулі. Гэта, як вядома, персаніфікаваныя вобразы галубоў. Аднак можна меркаваць, што гулямі называюць і курэй, якім «пасыпалі грэчкі, яны знеслі два яечкі». Як і коцік, куры дапамагаюць гадаваць дзіця, клапоцяцца пра яго здароўе.



«Антон з Антоніхай» (батлейка А. Лозя). Фота Я. Казюлі.

Паэтызуюцца свойскія жывёлы, звяры, птушкі, калыска, хлеб. Цэнтральнае месца адводзіцца дзіцяці, якому і спяваецца песня. Некаторыя калыханкі нагадваюць звычайныя дзіцячыя песенькі («Баю-баю-баінькі, Прыбяжалі заінькі», «Расце ў полі сасёнка, люлі-люлі-люлі»).

Большасць калыханак мае маналагічную форму. Тэкст песень у асноўным складаецца з назоўнікаў і дзеясловаў. Кожны радок — новая дынамічная карціна.

З а б а ў к і — песенькі рэчытатыўнага гучання, якімі суправаджаюць гульню з пальчыкамі, ручкамі, ножкамі, гушканне на руках і назе. Найбольш папулярныя — «ладу-ладу-ладкі», «кую-кую ножку», «ідзе каза рагатая», «ласачка», «чыкі-чыкі, сарока». Большасць з іх жартоўна-гумарыстычнага зместу, маюць дыялагічную форму.

Асноўную групу дзіцячых песень складаюць творы пра ж ы в ё л ь н ы с в е т. Яны маюць фантастычна-гумарыстычны сюжэт. Папулярнымі з'яўляюцца песні «Камар з дуба звалiўся», «Чы-чы, чы-чы, верабей», «Чыжык-чыжык, дзе ты быў?». Галоўнымі персанажамі выступаюць камар, верабей, зязюлька.

Шырока распаўсюджаны на Міншчыне заклічкі і прыгаворы. З а к л і ч к і — вершаваныя звароты да прыроды (дажджу, сонца). Галоўная просьба — паспрыяць добраму ўраджаю. П р ы г а в о р ы — звароты да жывых істот (божай кароўкі, слімака). Ёсць прыгаворы, якімі суправаджаюць збіранне ягад («Сунічкі, сунічкі, гарлачык невялічкі. Сыпцеся роўна, каб было поўна»). Заклічкам і прыгаворам характэрна імператыўная форма звароту.

Вызначыць чарговасць у гульні, выбраць вядучага, самаарганізавацца дзецям дапамагаюць кароткія рыфмаваныя вершы — л і ч ы л к і. Сярод іх ёсць сюжэтныя («Шлі бараны па дарозе»), бессюжэтныя («Эны-бэны»). Некаторыя пачынаюцца з адліку (1...5...10). Гульнёвае прызначэнне не выключае іх этычнай (выхаванне справядлівасці, сумленнасці) і эстэтычнай (выхаванне пачуцця рытму) каштоўнасці.

Матывы д р а ж н і л а к узяты з навакольнай рэчаіснасці і звязаны са знешнім выглядам і маральным воблікам чалавека. Некаторыя з іх могуць прыкладацца да любой асобы, якую трэба пакрыўдзіць. Сатырычную накіраванасць маюць створаныя дзецьмі рыфмаваныя прозвішчы і імёны.

635. Люлі, люлі, ўсе дзеткі паснулі...



Люлі, люлі, ўсе дзеткі паснулі.
Адзін наш каточак ні спіць, ні гуляя,
Ні спіць, ні гуляя, с каткамі размаўляя.

Да я ж яго, маленькаго, пакалышу,
За яго Бога папрашу:
— Ой, дай ж, Божа, яму сон добры!
Ой, дай жа, Божа, яму век доўгі!

636. Люлі, люлі, люлі...



Люлі, люлі, люлі,
А ўсе дзеткі паснулі.
Адзін Сірожачка ня спіць,
Трэба Сірожачку набіць.
Люлі, люлі, люляю,
Я коціка б'ю-лаю.

Каб ён ночку не хадзіў,
Каб ён дзетак не будзіў.
Пайшоў каток, пайшоў вон!
А дзіцятку добры сон.
А дзіцятка будзе спаць,
А я буду калыхаць.

637. Люлі, люлі, люлі...



Люлі, люлі, люлі,
Ўсе дзеткі паснулі.

Толька адна Юлячка
Ня спіць, ні гуляіць.

Ня спіць, ні гуляіць,
З катком размаўляіць.
А псік, каток, не вурчы,
А Юлячка — спі-маўчы!
А псік, каток, рыбку рваць,
А Юлячка — ў люльку спаць!

638. А псік, а псік, мой каток...

А псік, а псік, мой каток,
Паеў, папіў ўвесь мядок.
Патэльнічку аблізаў
І на котачку сказаў.
А котачка плачыць,
Верабейчык скачыць.

639. А псік, каток, па плоця...



А псік, каток, па плоця,
Шукаючы драмоця.
Ён драмоця не нашоў,
Сам ў арэшкі не пашоў.
А псік, каток, а псік, вон!
А хлопчыку — крэпкі сон.

640. Пайшоў каток пад масток...



Пайшоў каток пад масток,
Злавіў рыбку за хвасток.
А рыбка слізкая,
З лапак уцікая.

* * *

641. Хадзіў каток па платку...

Хадзіў каток па платку,
Уваліўся ў крапіўку.
Папёк коцік лапкі,
Палез на палаткі.

Палез бы вышэй,
Ды баюся мышэй.
Палез бы далоў,
Ды баюся валоў.

642. Люлі, люлі, люлі...



Люлі, люлі, люлі,
Да пайшоў кот па дулі.
Памарозіў лапкі,
Палез на палаткі.

Сталі лапкі грэцца,
Недзе коціку дзецца.
Люлі, люлі, люлі, спаць!

643. Люлі, люлі, люлі, палез кот на дулі...



Люлі, люлі, люлі, палез кот на дулі,
Памарозіў лапкі, узлез на палаткі.
Сталі лапкі грэцца, недзе катку дзецца.
Палез ба на вышкі, дык баюся мышкі,
А палез ба далоў, дык баюся кароў.

644. На дварэ цямным-цямно...



На дварэ цямным-цямно,
Тры звязды глядзяць ў вакно.
Тры сяброўкі яны,
А ты, донечка, засні.
Першая — красівая,
Другая — праўдзівая,
Трэцяя — шчаслівая.
Каб расла красівая,
Каб расла шчаслівая,
Малая мая донька.

645. А-а, люлі, паляцелі гулі...



А-а, люлі, паляцелі гулі,
Селі на варотах да у красных ботах.
Сталі ж яны сакатаць: што дзіцяці есці даць?
Даці, даці млечка, а ў ручку яечка?

А ў прыпалок піражок,
А хлопчыку паясок,
Дзіцяці малому,
Каню вараному!

646. А-а, люлі, прыляцелі куры...



А-а, люлі, прыляцелі куры,
Селі на вароцех у чырвоных боцех,
Сталі сакатаці. Чаго курам даці?
Ці ячменьку жменьку,
Ці гарошку трошку?
А-а, люлі, спаць,
А я буду калыхаць.

647. Гушкі, гушкі, гушкі...

Гушкі, гушкі, гушкі,
Прыляцелі птушкі.
Селі на варотах
У чырвоных ботах.
Сталі шчабятаці,
Нельга Дзімку спаці.

648. Зыбаю, пазыбаю...





Зыбаю, пазыбаю,
Ўшоў ацец за рыбаю.
Маць ушла пялёнкі мыць,
Дзедушка — драва рубіць.
А-а-а!
Дзедушка — драва рубіць,
Бабушка — уху варыць.
А-а, люлі, ўсе дзеткі паснулі,
Спі і ты, малышка, спі!

649. Люлі, люлі, спацькі...



Люлі, люлі, спацькі,
Німа дома бацькі.
Пашоў на работу,
Прыдзя у суботу.
Прывязе гасцінца
Поўную хусцінку.
Мы з табою будзем браць
Будзем татку цалаваць.

650. Ладкі-ладкі,

Каб кароўкі гладкі
Малачко давалі,
Дзетак гадавалі.

651. Ладу-ладу-ладкі,

Пабіліся бабкі
Пасярод рынку
За сівую свінку,
Пасярод места
За камок цеста.

652. Ладкі-ладкі,

Дзе былі? — У бабкі!
— А што елі? — Кашку!
Кашка з алеем,
Есці не ўмеем.

653. Чыкі-чыкі, сарока!

Прыляцела далёка,
Села ў пана на таку,
А пан кажа: — Засяку!
— А паночку, не сячы,
Буду табе служыці,
Дзеткам кашу варыці,
На прыпечку дзяліці.
Гэтаму дала, гэтаму дала.
А гэтаму — не дала:
— Ты ж, маленькі, круп не драў,
Вады не насіў, дзяжы не мясіў.
Ідзі, малы, па ваду,
Табе кашка на ляду,
А місачка на паліцы,
А лыжачка ў дайніцы.

654. Кую-кую ножку,

Паеду ў дарожку,
Дарожка крывенька,
Кабылка сляпенька.
Кую-кую пятку,
Паеду к братку.
У майго братка
На гарэ хатка,
І стажок, і млынок,
І моркаўкі градка.

655. Кую-кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Зарэжу барана,
Завязу да пана.
Пан дасць гасцінца
У белай хусцінцы.
Да ножкі прывяжам,
Нікому не скажам.

656. Кую-кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Сам на кабыле,
Сама на карове,
Дзеці на цялятах,
Слугі на сабаках.
Дарожка крывая,
Кабылка храмая.

657. — Мышачка, ласачка,
Дзе была?
— У млыне была!
— Што рабіла?
— Крупкі драла!
— Што садрала?
— Кусок сала!
— Дзе ж тое сала?
— Мышка з'ела!
— Чым пан біў?
— Палосачкай.
— Кудой уцякала?
— Дарожачкай! Сюдою, сюдою, сюдою!

658. — Ласачка, ласачка!
Дзе была?
— У Бога.
— Што рабіла?
— Кросны ткала.
— Што зарабіла?
— Кусочак сала.
— Дзе ж тое сала?
— Кошка ўкрала.
— А дзе тая кошка?
— Пад печ пайшла.
— А дзе тая печ?
— Агонь спаліў.
— А дзе той агонь?
— Вада заліла.

— А дзе тая вада?
— Вол папіў.
— А дзе той вол?
— Доўбня ўбіла.
— А дзе тая доўбня?
— Шашукі паелі.
— А дзе тыя шашукі?
— Куры паклявалі.
— А дзе тыя куры?
— На мора паляцелі.
— А дзе тое мора?
— Красачкамі зарасло.
— А дзе ты красачкі?
— Дзеўкі парвалі.
— А дзе ж тыя дзеўкі?
— Хлопцы пабралі.
— А дзе тыя хлопцы?
— На вайну пайшлі.

659. Ідзе каза рагатая,
Бадзе дзіця пузатае,
Закалю цябе рагамі,
Затапчу цябе нагамі,
Хвосцікам замяту,
Закалю, закалю, закалю.

660. Сунічкі, сунічкі,
Гарлачык невялічкі
Сыпцеся роўна,
Каб было поўна.

661. Сонейка, сонца,
Выгляні ў аконца,
Дам табе мёду,
Памыю калоду.

662. Дожджык, дожджык секані!
Я паеду на кані
Богу маліцца,
Цару хваліцца:
Ключыкам-замочкам,
Шоўкавым платочкам.
А ў Бога сірата
Адкрывала варата.

663. Раз, два, тры, чатыры,
Воўка грамаце вучылі:
Не чытаць, не пісаць,
Сабе сябра выбіраць.

664. Адзін, два, тры, чатыры, пяць,
Шэсць, сем, восем, дзевяць, дзесяць,
Выплывае белы месяц,
А за месяцам — луна,
Мальчык дзевачке — слуга.
Ты падай мне карэту,
А я сяду і паеду.
Я паеду ў Ленінград
Пакупаць сабе нарад:
Красны, сіні, галубы —
Выбірай сабе любы.

665. Бег сабака цераз мост,
Чаптыры лапы, пяты — хвост,
А шостая — галава,
Выходзь, хто на літару «А».

666. Ішла кукушка міма сада,
Наступіла на расаду.
Кук-мак, апусці адзін кулак.

667. Саломінка,
Яромінка,
Прэла,
Гарэла,
На мора ляцела.
Касцюк,
Масцюк,
Радзівон,
Пайдзі вон.

668. Пятро, Пятро,
Падай вядро.
Карове піць —
Табе жмурыць.

669. Кацілася торба
З вялікага горба.
А ў тое торбе
Хлеб, пшаніца.
З кім ты хочаш падзяліцца?

670. Андрэй-верабей,
Як паехаў да ракі,
То заелі чарвякі.

671. Андрэй, не дурэй,
Не дзяры сарочкі,
Не ты ткаў, не ты праў,
Не твае і дочкі.

672. Надзя-карадзя,
Свіней крадзе,
У падпечак хавае,
Хвартухом закрывае.

673. Кацярына-Кацька,
Не слухала бацьку,
Пайшла ў даліну —
Знайшла Акуліну.
Пайшла ў другую —
Знайшла рагуліну.

674. Іван-балван,
Качарыжкі каваў,
Цыганам прадаваў.
Цыгане не купілі,
Івана аблупілі.

675. Сівы-сівы, па колькі слівы?
Як па пяць, то буду браць.
Як па дваццаць пяць,
То няхай табе згараць.

676. Юзік-пузік,
Барабан,
Тры качулкі.
Адзін збан.

677. Віця, Віця, Віцяля,
З'еў карову і цяля,
А тады яшчэ падрад
З'еў дванаццаць парасят.

ЗМЕСТ-ПАКАЗАЛЬНІК

Ад укладальнікаў 5

АБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ

ВЕСНАВЫЯ ПЕСНІ

1. У нас сягоння масленіца, масленіца 13
Зап. Баско Н. у 1985 г. у в. Лошніца Барысаўскага раёна ад Занямонец М. І. (1909).

2. На святую масляніцу . . . 13
Зап. Гром У. у 1982 г. ад нар. Лагойскага раёна Грыб Е. І. (1907). Натацыя напеву Грома У.

3. Каля горада вада йшла . . . 14
Зап. Паўловіч Г. у 1988 г. у в. Лаўніца Барысаўскага раёна ад Чарнухі М. А. (1900).

4. Яблань мая, яблань мая садавая! 14
Зап. Канашэвіч Ж. у 1988 г. у в. Жыцькава Барысаўскага раёна ад Ясяновіч В. А. (1909).

5. У гародзе, ў гародзе бяроза . 15
Гл. № 4.

6. А ехаў, а ехаў Толічак . . . .
Гл. № 4. 16

7. Яблан мая, яблан мая садавая!
Гл. № 3. 16

8. На гарэ бабы сядзелі, сядзелі . 16
Зап. Макарэвіч Ж., Маціхвейчык А. у 1988 г. у в. Лаўніца Барысаўскага раёна ад Шклоўчык З. Я. (1915), Лучыны З. Д. (1922), Херавец Г. П. (1929).

9. На вуліцы дзеўкі гулялі, гулялі 17
Зап. Кунчэўская Г. у 1988 г. у в. Уцеха Барысаўскага раёна ад Сыцік А. Я. (1928).

10. Стаяла, стаяла бяроза — вецейка дадолу 17
Гл. № 1.

11. І варота скрыпяць 18
Зап. Кутырова Г. у 1988 г. у г. Мінску ад нар. в. Азярыцкая Слабада Смалявіцкага раёна Бакуновіч К. В. (1903).

12. Калышыця, малойцы, калышыця 18
Зап. Кутырова Г., Астрэйка В. у в. Стругалапы Мядзельскага раёна ад Ліпніцкай С. М. (1912).

13. Каля студні карыта 19
Зап. Кутырова Г., Назіна І у 1988 г. у г. Мінску ад нар. в. Азярыцкая Слабада Смалявіцкага раёна Бакуновіч К. В. (1903).

14. У нас сягоння масленіца . . 19
Гл. № 13.

15. Вясна красна 20
Зап. Місько М. у 1987 г. у в. Дубнікі Любанскага раёна ад Лютовіч В. Р. (1912). Натацыя напеву Раговіча У.

16. Да й ужэ весна красна . . . 20
зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Мялежкі Слуцкага раёна ад Шыловіч А. І. (1913).

17. Верба кудравая 21
Гл. № 12.

18. Вол бушуя, вясну чуя . . . 21
Зап. Кутырова Г., Зайцава А., Шыбко А. у 1984 г. у в. Кармазы Старадарожскага раёна ад Гутнік В. В. (1915), Вілюхі Г. К. (1923).

19. Плыла вутка ракой, ракой . 23
Зап. Кутырова Г. у 1984 г. у в. Лешніца Бярэзінскага раёна ад Піскун В. Я. (1925).

20. Цераз пень, цераз пень, цераз калоду 23
Гл. № 12.

21. А у гародчыку, на прасотнічку 24
Зап. Сухая В. у 1987 г. у в. Фалькі Вілейскага раёна ад Крывашэі Я. С. (1927), Сухой А. П. (1937). Натацыя напеву Раговіча У.
22. Цераз рэчачку гібка кладачка 24
Зап. Кутырова Г. у 1984 г. у в. Лешніца Бярэзінскага раёна ад Жукоўскай Г. Д. (1903).
23. Паедзем, мілы, і к татку ў госці 25
Зап. Кутырова Г. у 1984 г. у в. Лешніца Бярэзінскага раёна ад Піскун М. М. (1908).
24. Была ў мамкі адна дачка . . 26
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Паўстынь Слуцкага раёна ад Дамарад Г П. (1922).
25. Была ў мамкі адна дачка . . 26
Гл. № 15.
26. Было ў мамкі дзевяць сынкоў 27
Гл. № 16.
27. Ішоў Госпад лесам-борам . 27
Зап. Крыловіч С. у 1990 г. у в. Залужжа Старадарожскага раёна ад Гланыш В. А. (1920).
28. У нядзельку па абедзя . . . 28
Гл. № 24.
29. Весна красна наставала . . 28
Гл. № 3.
30. Да на Вялікдзень, да на першы дзень 29
Зап. Кутырова Г. у 1984 г. у в. Чурылы Дзяржынскага раёна ад Новікавай В. І. (1916), Позняк С. В. (1921).
31. Ай, ішлі-пайшлі добры молайцы 30
Гл. № 9.
32. А была у бабкі курка-рабка . 31
Гл. № 9.
33. А на моры гібка кладка . . 32
Гл. № 12.
34. Во, ці ў дому, ў дому пан-хазяін? 32
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Даўгінава Уздзенскага раёна ад Барэйшы С. П. (1914), Трухан А. В. (1918), Пасюк Н. І. (1930).
35. На Вялікадня, да на первы дзень 33
Гл. № 12.
36. Чэраз канапельку чорная сцежка 33
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у г. Мінску ад нар. в. Баброва Лагойскага раёна Яцэвіч М. В. (1910).
37. Лятала пава па саду, па саду . 34
Гл. № 9.
38. Дзень добры таму, да хто ў гэтым даму 35
Гл. № 11.
39. Ой, рана, рана да сонца іграла 38
Гл. № 11.
40. Добры вечар, пане гаспадару 39
Гл. № 21.
41. Гаспадынька-бабка, павярніся крутка 39
Гл. № 21.
42. Гаспадынечка, як маліначка . 40
Гл. № 21.
43. Валачэнікі валачыліся . . . 40
Зап. Кутырова Г. у 1986 г. у в. Новая Рудзіца Дзяржынскага раёна ад Янушкевіч С. П. (1910), Янушкевіч В. А. (1915), Юховіч К. А. (1920).
44. А ты, Юр'я, Мікола 41
Зап. Паўлоўскі С. у 1988 г. у в. Запруддзе Валожынскага раёна ад Лявіцкай В. С. (1915).
45. Раз'юраўся Юр'яў конь . . 42
Зап. Чэрвень А. у 1984 г. у в. Люташ Валожынскага раёна ад Краскоўскай Я. С. (1914).
46. Юрай, падай ключы! . . . 42
Зап. Трайкоўская В. у 1988 г. у в. Варанцы Мядзельскага раёна ад Лапцік В. П. (1990). Натацыя напеву Раговіча У.
47. Божа мой! О Юр'я, Юр'я, адамкні зямлю, Божа мой! 43
Зап. Сутулава В. у 1989 г. у г. Маладзечна ад Супруновай Л. Г. (1916).
48. Калінушка... Калінушка-малінушка 43
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Каралеўцы Вілейскага раёна ад Занкавіч С. Д. (1910).
49. Кумушкі да галубушкі . . . 45
Зап. Кутырова Г. у 1984 г. у в. Кармазы Старадарожскага раёна ад Жалдак А. М. (1922).
50. Ой, баравая зеўзюлячка . . 46
Зап. Кутырова Г., Красоўскі А., Пазняк А. у 1987 г. у в. Мал. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Слівец Р. К. (1926).
51. Ой, ябланка наша 46
Зап. Кутырова Г., Сутулава С. у 1987 г. у в. Мал. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Шэўчык Т. О. (1910), Цішкі В. К. (1913), Слівец Р. К. (1926).
52. А на вясну красну 48
Гл. № 51.
53. Ой, у агародзе ж на холадзе . 48
Зап. Кутырова Г., Зайцава А., Шыбко А. у 1984 г. у в. Кармазы Старадарожскага раёна ад Гутнік В. В. (1915).
54. Пахілястае дуб'е 49

Гл. № 51.
55. Ляцелі галубкі сівенькі . . 49
Зап. Кутырова Г., Рубіна Е., Сак Ж. у 1987 г. у в. Вял. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Лапцік А. Ц. (1907).
56. Ой, була тройца, не бувала . 50
Зап. Кутырова Г., Гаўрык В. у 1987 г. у в. Мал. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Вішнеўскай С. М. (1922).
57. Зацвіла у гародзе ружа . . 51
Зап. Віршыч В. у 1987 г. у в. Вял. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад нар. в. Фаставічы Петрыкаўскага раёна Зубец Л. (1927).
58. Ой, тройца, тройца, прасвятая багародзіца 51
Зап. Місцюк Г. у 1988 г. у в. Аталезь Стаўбцоўскага раёна ад Яўсенчык З. (1892).
59. Прывяду русалачку да бору . 51
Зап. Віршыч В. у 1987 г. у в. Вял. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Чаркас Я. (1900).
60. Русалачка, купалачка . . . 51
Зап. Беразоўская Л. у 1987 г. у в. Мал. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Цішко Г. . . . . .

КУПАЛЬСКІЯ І ПЯТРОЎСКІЯ ПЕСНІ

61. Ідзіця людзі, дзівіцеся . . . 57
Зап. Бабіцкая М. у 1986 г. у в. Старынкі Барысаўскага раёна ад Ванкевіч М. О. (1910).
62. Ішла Купалка сялом, сялом . 57
Гл. № 61.
63. Купала на Йвана! 57
Зап. Кутырова Г. у 1986 г. у в. Лешніца Бярэзінскага раёна ад Хвясун Г. М. (1901), Піскун М. М. (1918).
64. Сягоння Купалле, на Яна . . 58
Гл. № 2.
65. А на Купалле, на Яна . . . 58
Зап. Гараніна І. у 1988 г. у в. Вял. Сяло Маладзечанскага раёна ад Гаранінай К. М. (1929). Натацыя напеву Раговіча У.
66. Ой, у нядзельку, на Яна . . 59
Зап. Кулаковіч Т. у 1983 г. т у в. Хмелеўка Мінкага раёна ад Унук Я. А. (1893). Натацыя напеву Раговіча У.
67. Дэ Купалка купалася . . . 59
Зап. Клеванец А. у 1981 г. у в. Лежні Чэрвеньскага раёна ад Вяргейчык Г. Д. (1913) і жаночага гурта.
68. Сягоння Купалья, заўтра Ян . 59
Гл. № 43.
69. Сягоння ў нас Купальнічак, заўтра Ян 60
Гл. № 12.
70. Ой, рано, рано, на Яна . . . 60
Зап. Каладзінскі В. у 1987 г. у в. Рудкі Клецкага раёна ад скакоўскай В. Ф. (1925), Вятрэйчык З. М. (1940), Касцюковіч З. Н. (1922).
71. Ой, дай жа, Божа, Пятра прыждаць 61
Зап. Кутырова Г., Маскаленка І. у 1990 г. у в. Лысая Гара Чэрвеньскага раёна ад Калтовіч М. Р. (1916).
72. У агародзе гурдовіна 62
Зап. Кутырова Г., Красоўскі А., Пазняк А. у 1987 г. у в. Мал. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Слівец Р. К. (1926).
73. Каліна! Ды за гарою, за далiною, каліна! 62
Зап. Мялежка С. у 1990 г. у в. Ізбішча Лагойскага раёна ад Кізіны Н. М. (1927).
74. Каліна! А ў цянёчку, ў халадочку, каліна! 62
Зап. Голубеў А. у 1990 г. у в. Гайна Лагойскага раёна ад Каладзінскай Г. С. (1914).
75. Каліна! Во за гарою, за крамяною, каліна! 63
Гл. № 74.
76. Каліна, возерная зялёная, каліна! 63
Зап. Ліцвінка В. у 1988 г. у в. Гайна Лагойскага раёна ад Крывіцкай І. Г. (1896). Натацыя напеву Раговіча У.
77. А хто у нас да дзевак лас? . 64
Гл. № 11.
78. Каліна! Ў чужой старане дажджы ідуць, каліна! 65
Зап. Няборская А. у 1986 г. у в. Нова-Ганцавічы Лагойскага раёна ад Няборскай М. І. (1930) . . .
79. Купалья! Каціўся туман па санажаці, Купалья! 65
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Галімцы Валожынскага раёна ад Дзярыбы Н. Р. (1910).
80. Купалья! Да пайшлі мае да два брацяйкі. Купалья! 65
Гл. № 79.
81. Божа мой! На санажаці мядуначка, Божа мой! 66
Зап. Максімовіч В. у 1985 г. у в. Траянец Лагойскага раёна ад Мосар М. В. (1914).
82. Божа наш! На сенажаці мядуначка, Божа наш! 66
Зап. Раговіч У. у 1987 г. у в. Будслаў Мядзельскага раёна ад Усцьянцовай А. І. (1907). Натацыя напеву Раговіча У.
83. Дзевачкі, ні сядзіця, рана-рана 67
Зап. Абрагімовіч М. у 1984 г. у в. Харошая Лагойскага раёна ад Аб-

рагімовіч А. А. (1905). Натацыя на певу Раговіча У.
84. Бор гарыць, дым курыць . . 67
Гл. № 66.
85. Ой, у полі дымна да пыльна . 68
Зап. Празецкая А. у 1988 г. у в. Павуссе Дзяржынскага раёна ад Каложнік А. І. (1921). Натацыя напеву Раговіча У.
86. Ой, рабоя поле, рабоя . . . 68
Гл. № 85.
87. Да ехаў Іванька на кані . . 68
Зап. Кутырова Г. у 1986 г. у в. Кавалевічы Пухавіцкага раёна ад Пархімчык Е. І. (1925).
88. Ой, бела, бела бярозка . . . 69
Гл. № 47.
89. Ой, тонка, тонка сасонка . . 70
Зап. Паўлоўскі С. у 1988 г. у в. Вял. Запруддзе Валожынскага раёна ад Гнілазуб Я. А. (1925).
90. Ой, тонка, тонка сасонка . . 70
Зап. Гярко М. у 1984 г. у в. Каралеўцы Вілейскага раёна ад Рагач А. (1926), Рагач М. (1917), Дурэйкі В. (1915), Кабак В. (1912).
91. Каліна! Чыя рута за ракою? Каліна! 71
Гл. № 36.
92. Вой, над ракою каліна . . . 71
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Даўгінава Уздзенскага раёна ад Палішук А. І. (1913).
93. А баравая цяцера 72
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Любкі Вілейскага раёна ад Кабак А. (1916).

ЖНІЎНЫЯ ПЕСНІ

94. Пара, маці, жыта жаці . . . 73
Зап. Буткевіч у 1990 г. у в. Вуглы Капыльскага раёна ад Юсючэні Л. Я (1923), Дзяміжчык Г. Я. (1928), Жгун Г. М. (1945).
95. А што ў поле бялеецца? . . 74
Гл. № 94.
96. Ой, саколе, мой саколе. . . 74
Гл. № 94.
97. Чорна мая смародачка! . . 74
Зап. Паўловіч Г. у 1988 г. у в. Лаўніца Барысаўскага раёна ад Шклоўчык З. Я. (1915), Херавец Г. П. (1929).
98. Лугавая перапёлка 75
Гл. № 89.
99. Паўднёвачкі ідуць, ідуць . . 75
Гл. № 87.
100. Ой, пайду дарогаю 76
Зап. Сазановіч А., Сачанка С., Семенчукова А. у 1986 г. у в. Мал. Укропавічы Лагойскага раёна ад
101. Ах, дамоў, дамоў пара . . 76
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Калодкі Вілейскага раёна ад Путырскай В. Л. (1917).
102. Да за бор, сонца за дуброўку 77
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Пральнікі Валожынскага раёна ад Папкевіч В. К. (1916).
103. Пара жнейкі дамоў, пара . . . 77
Гл. № 102.
104. Сакатала соўнейка 78
Гл. № 12.
105. Згубіла зара ключы 78
Гл. № 104.
106. Чыя гэта павалока, эй! . . . 79
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Даўгінава Уздзенскага раёна ад Барэйшы С. П. (1914)
107. На лузя касец косіць . . . 79
Гл. № 93.
108. Я ў бару жыта жала . . . 80
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Іжа Вілейскага раёна ад Дзямід Г. М. (1910).
109. Я, молада, борам ішла . . 80
Зап. Сазановіч А., Сачанка С., Семенчукова А. у в. Мал. Укропавічы Лагойскага раёна ад Малішэўскай М. А. (1907).
110. Я сеіла руту-мяту 81
Зап. Мыслівец Н. у 1985 г. у в. Рэбрышча Лагойскага раёна ад Дрозд А. С. (1908).
111. Й а на бару ягад многа . . 81
Зап. Шылак С. у 1984 г. у в. Навасёлкі Барысаўскага раёна ад Дубінінай Т. К. (1918).
112. Мамка мая чарэшанька . . 82
Зап. Аўдзюк В., Каляда Л. у 1988 г. у в. Ляхі Нясвіжскага раёна ад Фальтар В. І. (1916).
113. Да за лесам, лесам-борам . 82
Зап. Аўдзюк В., Каляда Л. у 1988 г. у в. Казловічы Слуцкага раёна ад Голец В. К. (1911).
114. Бедна мая галовачка . . . 83
Гл. № 22.
115. А я, млода, расту, расту . . 83
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Доўкінды Нясвіжскага раёна ад Зенкевіч М. І. (1914).
116. На зялёненькум месця . . 84
Гл. № 16.
117. А ў леся на верася . . . 85
Зап. Астрэйка В., Кутырова Г. у 1989 г. у в. Хмелеўка Мінскага раёна ад Войцік М. А. (1896). . . .
118. Цераз гай зялёненькі . . . 85
Гл. № 109.
119. Ў полі жыта палавее . . . 86
Зап. Рамашка М. у 1987 г. у в. Морач Клецкага раёна ад Палагавай М. Ц. (1925).

120. А я жала, не ляжала 87
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Блонь Пухавіцкага раёна ад Цапляевай Т. П. (1909).
121. Ай, ці поўна арэхава чаша? . 87
Зап. Бабіцкая М. у 1986 г. у в. Мядзьведзеўка Барысаўскага раёна ад Заяц А. П. (1920).
122. Рада пірапёлка, рада . . . 88
Гл. № 88.
123. Наша жыта ўжо паспела . 88
Гл. № 67.
124. Ой, зялён наш бор, зялён . 89
Зап. у 1986 г. у в. Зарэчча Лагойскага раёна ад Маладой Н. Р. (1912)

ВОСЕНЬСКІЯ ПЕСНІ

125. Досіць каліне, досіць маліне 90
Зап. Гярко М. у 1984 г. у в. Путрычы Вілейскага раёна ад Смолік М. С. (1928).
126. Ты калапенька, ты зялёная . 91
Зап. Шымановіч А. у 1988 г. у в. Іжа Вілейскага раёна ад Казановіч Л. М. (1930).
127. Мае хмарачкі, мае цёмныя . 92
Зап. Гярко М. у 1984 г. у в. Куляшы Вілейскага раёна ад Гярко В. І. (1943).
128. Чаго, зімачка маразлівая . 94
Гл. № 73.
129. Плыла вутачка з вуцянатамі за мора зімуваці 94
Зап. Мялежка С. у 1990 г. у в. Ізбішча Лагойскага раёна ад Судніковіч А. П. (1924).
130. А ў цёмным леся 95
Зап. Лагутка Э. у 1984 г. у в. Будслаў Мядзельскага раёна ад Усцьянавай А. І. (1907). Натацыя напеву Раговіча У.
131. Ходзя галубка па галубятнічку 95
Гл. № 66.
132. Зялёны дубок, зелянюсенькі 96
Гл. № 131.
133. Ой, сарву, сарву з ружы кветачку 97
Гл. № 89.
134. Журавы лятуць, палудзянь нясуць 97
Гл. № 44.
135. Цераз мой двор зялёненькі . 98
Гл. № 44.
136. Да чыраз шыр бор . . . 98
Зап. Кутырова Г. у 1984 г. у в. Чурылы Дзяржынскага раёна ад Досен А. С. (1903), Новікавай В. І. (1916).
137. Ляцела сава з бора ў дуброву 99
Гл. № 79.
138. Ой ты, рыбачка-пераплывачка 100
Гл. № 137.
139. А ўжо позненька, ды не раненька 101
Гл. № 126.
140. А чаго ласёк, чаго, сівенькі 101
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Іжа Вілейскага раёна ад Ахрэм В. В. (1932).
141. Сячыце лясы, масціце масты 102
Гл. № 125.
142. Пад лесам-ляском 103
Гл. № 36.
143. Вот там, пад ляском бярозка з лістком 104
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Галабурды Валожынскага раёна ад Южык В. І. (1913), Грыбкоўскай Н. А. (1915).
144. Ой, заржы, заржы, конік вараны 105
Зап. Кутырова Г., Астрэйка В. у 1989 г. у в. Хмелеўка Мінскага раёна ад Войцік М. А. (1896), Бажок В. М. (1926).
145. Чэрвоная калінушка . . . 106
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Доўкінды Нясвіжскага раёна ад Каласоўскай Я. І. (1912).
146. Ой, кракала да шэрая вутка 106
Зап. Кутырова Г. у 1984 г. у в. Кармазы Старадарожскага раёна ад Гутнік В. В. (1915).
147. Ой, пайду я на талоку . . 107
Зап. Кутырова Г. у 1987 г. у в. Мал. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Цішко В. К. (1913), Слівец Р. К. (1926).
148. Паляцелі журавелькі . . . 108
Гл. № 147.

КАЛЯДКІ І ШЧАДРОЎКІ

149. Едуць, едуць калядкі . . . 113
Гл. № 13.
150. І ў дубнічку стрынаткі . . 113
Зап. Кутырова Г. у 1986 г. у в. Новая Рудзіца Дзяржынскага раёна ад Янушкевіч Э. А. (1910). . . . .
151. У дубнічку стрынаткі . . . 113
Гл. № 79.
152. А калядачкі, бліны-ладачкі . 114
Зап. Кутырова Г. у 1989 г. у в. Новыя Крупкі Крупскага раёна ад Казловай Х. В. (1918).
153. Ідзе каляда калядуючы . . 114
Гл. № 2.

154. Прыехала каляда ўвечара, ўвечара 115
Гл. № 27.
155. Прыехала каляда ўвечара, ўвечара 115
Зап. Кутырова Г. у 1984 г. у в. Чурылы Дзяржынскага раёна ад Досен А. С. (1903).
156. Прыехала каляда ўвечара, ўвечара 116
Зап. Ваўчок А. у 1985 г. у в. Цясова Салігорскага раёна ад Прыгодзіч В. С. (1901).
157. А калядачкі, бліны-ладачкі . 117
Зап. Кутырова Г. у 1989 г. у в. Новыя Крупкі Крупскага раёна ад Кажэмякі А. М. (1918).
158. Ой, у ляску, ў ляску, на жоўтым пяску 117
Зап. Раговіч У. у 1984 г. у в. Мелкавічы Салігорскага раёна ад Тройніч В. М. (1914). Натацыя напеву Раговіча У.
159. Добры вечар добрым людзям! 118
Зап. Кутырова Г. у 1984 г. у в. Лешніца Бярэзінскага раёна ад Піскун В. В. (1900).
160. Ой, учоры з вечоры . . . 119
Зап. Ніканоўіч І., Чальцова Н. у 1987 г. у в. Морач Клецкага раёна ад Рамашкі М. Я. (1911).
161. Добры вечар табе, пане-гаспадару! 120
Г. № 119.
162. Ой, над ракою, над глыбокаю 120
Гл. № 51.
163. Ой, у мароза стаяла бяроза . 121
Зап. Аўдзюк В., Каляда М. у 1987 г. у в. Вял. Рожан Салігорскага раёна ад Жогла А. П. (1935).
164. Ой, у Кіяве на перавозе . . 122
Гл. № 55.
165. А ў канцы села стаяла верба 123
Зап. Рабко С. у 1986 г. у в. Студзёнкі Нясвіжскага раёна ад Стрыч Г. К. (1928).
166. Закруцілася крутая гара . 123
Зап. Кутырова Г. у 1984 г. у в. Дарасіно Любанскага раёна ад Радкевіч Т. С. (1912).
167. Да там на гарэ вінаград стаіць 124
Гл. № 156.
168. Паляцеў каршун, каляда! . 125
Гл. № 12.
169. Ясь коні пасе, арэхі трасе . 125
Зап. Рак Г., Сапнёва Ж. у 1987 г. у в. Гусакі Нясвіжскага раёна ад Бобік Г. У. (1928). Натацыя напеву Раговіча У.
170. Коляд, коляд, калядніца . . 126
Зап. Аўдзюк В., Каляда Л. у пас. Спаскім Слуцкага раёна ад Кракасевіч К. К. (1910).
171. Ну-ну-ну, казёл, ну-ну-ну, нябож 127
Зап. Аўдзюк В., Каляда Л. у в. Омгавічы Слуцкага раёна ад Ажэўскай К. Я. (1930).
172. Ну-ну-ну, каза 128
Гл. № 16.
173. Ну-ну-ну, казёл, ну-ну-ну, нябож 128
Гл. № 166.
174. Ой, ну-ну, казёл, паварочайся 129
Зап. Раговіч У. у 1987 г. у в. Мелкавічы Салігорскага раёна ад Герасімені Л. І. (1928). Натацыя напеву Раговіча У.
175. Ай, ну-ну, казёл 129
Гл. № 158.
176. Ну-ну-ну, каза 130
Гл. № 27.
177. Ой, ну-ну, каза, ой, ну, нібога 130
Зап. Раговіч У. у 1988 г. у в. Лявонавічы Нясвіжскага раёна ад фальклорна-этнаграфічнага ансамбля. Натацыя напеву Раговіча У.
178. Ой, ну-ну, каза, ой, ну, небога 131
Гл. № 177.
179. Го-го, козачка, го-го, серая . 132
Зап. Бокач Н. у 1988 г. у в. Студзёнкі Нясвіжскага раёна ад Стрыч М. К. (1928) і групы жанчын.
180. Сядзі, сядзі, яшчар . . . 133
Гл. № 46.
181. Яшчар, яшчар, паночак . . 133
Зап. Протас Я. у в. Навапольцы Стаўбцоўскага раёна ад Протас Г. Н.
182. Як пайду Цярэшку жаніць . 133
Гл. № 83.
183. Цярэжка-цярэжачка 134
Гл. № 9.
184. Дзед бабу тапіць вядзець . 134
Гл. № 183.
185. Божа мой, галоўка баліць . . 135
Зап. Івашка А. у 1979 г. у в. Даўгінава Вілейскага раёна ад Казак В. Д.
186. Цярэжка-Цярэжухна . . . 135
Гл. № 12.
187. Цярэшка, Цярэшачка . . . 135
Гл. № 46.
188. Цярэшка валочыцца 136
Гл. № 73.
189. Казалі, мой дзед нічога . . 137
Гл. № 73.
190. На вакне ружа цвіцела . . 137
Зап. Гумен Т., Дашко А. у в. Кілія Барысаўскага раёна ад Хацкевіч В.
191. Пайду я ў садочак . . . 137
Зап. Яновіч В. у 1976 г. у в. Кузь-

мічы Мядзельскага раёна ад Дзікай (1890). 137
192. Дзядульку заву, заву . . . Зап. Яновіч В. у 1976 г. у в. Кузьмічы Мядзельскага раёна ад Бярняк З. (1890). 137
193. Як пайду на ток, на ток . . Гл. № 78. 138
194. Цярэшка-Цярэшанька . . Зап. Слівец А. у в. Талуць Вілейскага раёна ад Сялюн У., Гіль М. 138
195. П'яна бабулька была . . . Зап. Міхаленка Л., Кацюшына В. у в. Скуплена Барысаўскага раёна ад Тэклі Данілаўны.

ПАЭЗІЯ РАДЗІН

196. Да дзякуй Богу да за дар Божы 141
Зап. Кутырова Г., Маскаленка І. у 1990 г. у в. Лысая Гара Чэрвеньскага раёна ад Забаўскай М. І. (1922), Чэлядзінскай Т. І. (1924).
197. Паздароў, Божа, каваля . . Гл. № 12. 142
198. Ой, устань, устань, парадзішачка 142
Зап. Кунчэўская Г. у 1988 г. у в. Уцеха Барысаўскага раёна ад Якімёнак Г. М. (1926).
199. Па двару куніца пахадзіла . Гл. № 9. 143
200. Наша бабулька-малімонка . Зап. Хацяновіч А., Навіцкая Ю. у 1991 г. у в. Сэрвач Вілейскага раёна ад Лыкі В. Т. (1894). 143
201. Прывязіця, запражыця каня варанога 144
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Іжа Вілейскага раёна ад Міхась Г. П. (1916).
202. Запрагайце да дванаццаць сабак 144
Гл. № 92.
203. Запражыця, запражыця . . Гл. № 11. 145
204. Тут жа, тут а радзіначкі жывуць 145
Гл. № 78.
205. Бабка унучкі 146
Зап. Кутырова Г. у в. Новыя Крупкі Крупскага раёна ад Мельнікавай Т. П. (1917).
206. Цераз гару сцежачка лежала 146
Зап. Клеванец А. у 1981 г. у в. Лежні Чэрвеньскага раёна ад Вяргейчык Г. Д. (1913).
207. Пяркуха, бабка, пяркуха . . Зап. Мыслівец Н. у 1988 г. у в. Рэбрышча Лагойскага раёна ад Мурашкі Х. Я. (1913). 147
208. Бабулячка-кузурачка . . Гл. № 65. 148
стаіць 148
Гл. № 111.
210. Сядзіць бабка на куце . . Гл. № 198. 148
211. Бабуля, а таўчы, малоць — ня дужа 149
Зап. Бабіцкая М. у 1986 г. у в. Поўпрышчы Барысаўскага раёна ад Заяц С. О. (1927).
212. Чаго, бабка, чаго, любка . . Гл. № 198. 149
213. Ў нашага Віцечкі вінаград на дварэ 150
Гл. № 198.
214. Ой, запала, ой, запала . . Гл. № 8. 150
215. Кланілася кума куму . . . 151
Зап. Жызнеўская М. у 1987 г. у в. Балашы Вілейскага раёна ад Жызнеўскай А. Я. (1904). Натацыя напеву Раговіча У.
216. Як кум куме рад 152
Зап. Мыслівец Н. у 1988 г. у в. Рэбрышча Лагойскага раёна ад Баранчык Г. Я. (1914).
217. Кум да кумы заліцаўся . . Гл. № 214. 152
218. А дзе кум-верабей? . . 153
Зап. Кутырова Г. у 1990 г. у в. Салтанаўшчына Нясвіжскага раёна ад жаночага гурта.
219. Ой, сасна к сасне да пахілілася 154
Гл. № 49.
220. Ў нас сягоння імяніны . . Гл. № 36. 155
221. Ой, чуць, чуць, дзе гарэлачку п'юць 155
Гл. № 117.
222. Ох, вы столікі мае да пазасціланые 156
Гл. № 49.
223. Прабачайце, госцікі, да на маю чэсць 157
Гл. № 72.
224. Чаго, госці, сядзеце, хлеба-солі не ясце? 157
Гл. № 223.
225. Мы учора су вячора . . . 158
Зап. Мыслівец Н. у 1988 г. у в. Рэбрышча Лагойскага раёна ад Дрозд К. С. (1908), Баранчык Г. Я. (1914).
226. Па бару я й хадзіла . . . 159
Зап. Шалак С. у 1984 г. у в. Лешніца Барысаўскага раёна ад Плявакі Л. Б. (1909).
227. Ў бару сасонка зашумела . 159
Гл. № 204.
228. Ой, да была я на рыначку . 160
Гл. № 16.
229. А ў гародзе ярыначка . . 160

Гл. № 199.
230. А ты брацец мой, я сестра твая 161
Гл. № 199.
231. Ой, люба, люба ў той бок глядзеці 161
Гл. № 43.
232. На кірмашы й усе нашы, а вы, людзі, чуйця 162
Гл. № 71.
233. Піця, людзі, да гарэліцу . . 163
Гл. № 87.

ВЯСЕЛЬНЫ АБРАД І ПЕСНІ

Сватанне, запоіны, заручыны

234. Кукавала зяўзюлька 166
Зап. Раговіч У. у 1987 г. у в. Бондары Слуцкага раёна. Натацыя напеву Раговіча У.
235. Чаго, сваты, ву прыехалі . 166
Гл. № 51.
236. Прапілі дзевачку на мяду 167
Зап. Кутырова Г. у 1989 г. у в. Новыя Крупкі Крупскага раёна ад Мельнікавай Т. П. (1917), Казловай Х. В. (1918), Кажэмякі А. М. (1918).
237. Ды на заповіны пазвалі . . 167
Зап. Кутырова Г., Маскаленка І. у 1990 г. у в. Лысая Гара Чэрвеньскага раёна ад Забаўскай В. К. (1922).
238. Ляцела сарока далёка . . 168
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Вугалец Пухавіцкага раёна ад Карнейчык У. П. (1903).

Каравай

239. Малодачкі каравай маюць . 170
Гл. № 15.
240. Каравайная цеста 170
Гл. № 12.

Зборная субота

241. Суборная суботачка настала 172
Гл. № 108.
242. А у каморы Леначка заснула 173
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Слабада Вілейскага раёна ад Сяргей С. І. (1915).
243. Да сядзім мы да ні сяк, ні так. 173
Зап. Кутырова Г., Зайцава А., Шыбко А. у 1984 г. у в. Кармазы Старадарожскага раёна ад Вілюхі Г. К. (1923), Вілюхі Н. К. (1925).
244. Млода Зоячка судзіць, плануіць 174
Гл. № 127.
245. Ты каліна-маліна 174
Гл. № 155.
246. Маладзенька дзевачка . . 175
Гл. № 117.
247. Шэрая зязюлячка 175
Гл. № 117.
248. Па вуліцы, да па шырокай рассыпалісь трэскі 176
Зап. Кутырова Г. у 1987 г. у в. Мал. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Слівец М. П. (1925).
249. Ідуць, ідуць кавалеры . . 177
Гл. № 117.

Вяселле ў маладой

250. Над варотамі месяц . . . 181
Зап. Кутырова Г., Кузьміна С. у 1983 г. у пас. Ракавічы Валожынскага раёна ад Стульвы М. М. (1914).
251. Каля жоўтага броду . . . 182
Гл. № 158.
252. У дарожку, сваткі, у дарожку 182
Гл. № 22.
253. *Не сядзі, малойчык, не сядзі 183
Гл. № 66.
254. Із-пад дуба, із-пад корэня . 184
Зап. Раговіч У. у 1987 г. у в. Зах. Морач Салігорскага раёна ад Міхнавец Л. А. (1923), Міхнавец В. Ф. (1925), Яфімовіч Н. П. (1930), Міхнавец Е. П. (1933). Натацыя напеву Раговіча У.
255. Із-пад саду, вінаграду . . 184
Гл. № 117.
256. Ой, борам, борам, як звонам 185
Зап. Кутырова Г., Замула Л. у 1987 г. у г. п. Бараўляны ад нар. в. Звіняты Барысаўскага раёна Ліцвіновай Г. М. (1925).
257. Хто ў гэтым лесе, хто ў гэтым цёмным гукае? 185
Зап. Нікановіч І., Чальцова Н. у 1987 г. у в. Колкі Клецкага раёна ад Рудзінскай У. А. (1923), Рамашкі Т. О. (1926), Рамашкі С. Н. (1936).
258. Да а хто гэтай цёмнай ночачкі не даспаў 186
Зап. Галавастая Н. у 1988 г. у в. Каралеўцы Вілейскага раёна ад Рагач М. А. (1917).
259. Сягоння у нас ад пана Бога скрасэлле 186
Зап. Гур'ева Н. у 1988 г. у в. Ка-

лодкі Вілейскага раёна ад Путырскай В. Л. (1917).
260. Ня стой, Божа, у парозя . . . 187
Гл. № 246.
261. Ой, чаго сядзіш да што думаіш, Манечка? 188
Зап. Абрагімовіч М. у 1984 г. у в. Плешчаніцы Лагойскага раёна ад Первушовай Н. І. (1922). Натацыя напеву Раговіча У.
262. Да ты, чарнесенькі мачок . . 188
Зап. Каладзінскі В. у 1987 г. у в. Семежава Капыльскага раёна ад Навіцкай М. Ц. (1903). Натацыя напеву Раговіча У.
263. Яснае сонца калясом ідзе, раненько 189
Гл. № 239.
264. Наша Людачка на пасад ідзець 189
Гл. № 12.
265. Пакаціласо перо 190
Зап. Рамашка М. у 1988 г. у в. Колкі Клецкага раёна ад Рамашкі Т. О. (1926).
266. Божа, Божа! Павучок па сценцы йдзе 190
Зап. Шыдлўская С. у 1988 г. у в. Іжа Вілейскага раёна ад Казановіч Л. У. (1930).
267. Ой, горна, горна на зязюлячку 191
Гл. № 49.
268. Да застукалі кованы вазы на дварэ 192
Гл. № 51.
269. Чаго ты, малойчык, прыехаў 192
Гл. № 117.
270. Пушна, цешча, пушна . . . 193
Гл. № 254.
271. Як казалі, так і ёсць . . . 193
Гл. № 108.
272. Ня гніся, сватка, ня гніся, ня гніся 194
Гл. № 85.
273. Да звязалі свата, звязалі . 194
Гл. № 237.
274. Ой, ці гэта Манечко-сірата . 195
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Паўстань Слуцкага раёна ад Дамарад Г. П. (1922), Дубовік В. Ф. (1922).
275. Вылятала ластаўка . . . 196
Гл. № 113.
276. Ой ці рад, ці рад, малойчык 196
Гл. № 117.
277. Не ругай мяне, мая матачко 197
Зап. Чальцова Н., Нікановіч І. у 1987 г. у в. Морач Клецкага раёна ад Сцэпуры К. А. (1925).
278. Папытай, мамка, ў дочкі . . 197
Гл. № 274.
279. Прыкракнула шэра вуціца пры бары 198
Зап. Празецкая А. у 1988 г. у в. Павуссе Дзяржынскага раёна ад гарэлік Т. Л. (1906). Натацыя напеву Раговіча У.
280. Ой, саколя, саколя 198
Гл. № 250.
281. Пад вішэнькаю, пад нізенькаю 199
Гл. № 274.
282. Вінная да яблынка 199
Гл. № 113.
283. Маладзенькі малойчык . . 200
Гл. № 117.
284. Сядзіць дзевачка за сталом 201
Зап. Кутырова Г., Кузьміна С. у 1983 г. у в. Хатляны Уздзенскага раёна ад Шаўчук М. П. (1912), Селівончык С. М. (1918), Ламака М. А. (1922), Селівончык С. І. (1925).
285. Ягада з ягадай пры бару раслі 201
Гл. № 279.
286. І маладзенька дзевачка . . 202
Гл. № 117.
287. Старшы сватка Яўхімка . . 202
Гл. № 79.
288. Крамяная мая печачка . . 203
Гл. № 158.
289. І субірайцеся, людзі . . . 203
290. Нясу, нясу каравай з клеці . 203
Гл. № 170.
291. Баславі, татачка, як хлеб закрояць! 204
Гл. № 12.
292. Сватка Мікалаю 204
Гл. № 117.
293. А ўжэ соўняйка, а ўжэ ясная 204
Гл. № 49.
294. А ці чуеш, мая мамачка, ці чуеш 205
Зап. Воўк Т. у 1988 г. у в. Каладзі Вілейскага раёна ад Дзевяцень М. Ф. (1919).
295. Садзіся, татка, разам вячэраць са мною 206
Гл. № 36.
296. Дождж ідзець, дождж ідзець, пераганяючы 206
Зап. Дубай А. у 1988 г. у в. Іжа Вілейскага раёна ад Дзямід Г. М. (1910).
297. Чаго сядзіш, што ты думаеш, дзевачка? 207
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Пухавічы ад нар. в. Пестун Пухавіцкага раёна Свірыдовіч М. П. (1912).
298. Не вечарыся, вечарок . . 208
Зап. Кутырова Г., Зайцава А., Шыбко А. у 1984 г. у в. Лешніца Бя-

рэзінскага раена ад Бурай Т. С. (1914), Піскун В. Я. (1925).
299. На дварэ папялішча . . . 208
Гл. № 13.

Вяселле ў маладога. Пярэзвы.

300. Ой, цёмная да нявідная ночачка 210
Гл. № 117.
301. Да свякроў нявехну да жадом жадала 211
Гл. № 284.
302. Да прыехаў дзяцінко . . . 211
Зап. Рамашка М. у 1988 г. у в. Морач Клецкага раёна ад Абабуркі А. В. (1910).
303. Ой, знаці, знаці, што чужая маці 212
Гл. № 262.
304. Просім цябе, наша Анечка, ні тужыць 212
Зап. Гярко М. у 1984 г. у в. Куляшы Вілейскага раёна ад Томкавіч А. К. (1917).
305. Ой, слаўна, слаўна, дзевачка 213
Гл. № 15.
306. Штоб табе, Васілік, да Бог даў 213
Гл. № 66.
307. Пышан шафер, пышан . . 214
Гл. № 85.
308. А суседачкі нашы 214
Гл. № 85.
309. Дайце свахні пірага . . . 214
Гл. № 158.
310. Старшы сватка Ванячка . 215
Гл. № 79.
311. Сваціцы, нашы ластаўкі . . 216
Зап. Ваўчок Н., Бажкова М. у 1986 г. у в. Макасічы Валожынскага раёна ад Багдановіч В. О. (1913).
312. Наўчылася сваці ілгаці . . 217
Гл. № 34.
313. А ў нашага свата 217
Гл. № 279.
314. Як прыйшлі сваткі ў хату . 217
Зап. Кутырова Г. у в. Кублішчы Слуцкага раёна ад Жданені А. С. (1912), Расік С. Р. (1918).
315. Ой, скакаў зайка да чэраз гайка ў ярыцу 218
Гл. № 261.
316. Няшчасце тваё, нядоля твая, Іванька 218
Гл. № 140.
317. Казалі людзі, казалі людзі . 219
Гл. № 140.
318. Едзьця, сваткі, дадому . . 220
Зап. Кутырова Г. у 1984 г. у в. Чурылы Дзяржынскага раёна ад Досен А. С. (1903), Новікавай В. І. (1916), Пазняк С. В. (1928).
319. Ой, сваціцы, вы мае сястрыцы, просім вас 220
Гл. № 85.
320. Ой, свацця свацці да пакарылася 220
Гл. № 297.
321. Брацятка родненькі, паедзем дамоў! 221
Зап. Гярко М. у 1984 г. у в. Куляшы Вілейскага раёна ад Сіняк Ю. О. (1912).
322. Да брат сястрыцу харошанька просіць . . . . . .
Зап. Аўдзюк В., Каляда Л., у 1988 г. у в. Баранавічы Слуцкага раёна ад Крывадубскай З. Б. (1925).
323. Мы паедзім горы-даліны раўнаваць 222
Гл. № 36
324. Ехалі перазвяне 223
Гл. № 3.
325. А йшоў піразоў лёдам . . 223
Гл. № 3.
326. З віннага да калодзезя . . . 223
Гл. № 85.
327. Прыехала маці ў госці к дзіцяці 224
Гл. № 158.

ПАХАВАЛЬНЫЯ ГАЛАШЭННІ

328. Па маці 225
Зап. Кутырова Г., Раговіч У. у 1988 г. у г. Мінску ад нар. в. Мал. Гарадзяцічы Любанскага раёна Слівец Р. К. (1926) 226
329. Па маці . . . . . .
Зап. Яновіч А. у 1978 г. у в. Кузьмічы Мядзельскага раёна ад Давідовіч М. В. (1913).
330. Па маці 226
Зап. Жаўняровіч Н. у 1986 г. у в. Гусакі Нясвіжскага раёна ад Чурак А. С. (1910).
331. Па бацьку 227
Зап. Яновіч А. у 1978 г. у в. Кузьмічы Мядзельскага раёна ад Яновіч Т. К. (1921).
332. Па бацьку 227
Зап. Васілевіч Г. у 1988 г. у в. Гарадзішча Слуцкага раёна ад Камінскай Г. П. (1889).
333. Па мужу 228
Зап. Яновіч А. у 1978 г. у в. Кузьмічы Мядзельскага раёна ад Далядуткі П. А. (1902).
334. Па мужу 228
Гл. № 333.
335. Па дачцэ 229
Гл. № 331.
336. Па сыну 229
Зап. Яновіч А. у 1978 г. у в. Кузьмічы Мядзельскага раёна ад Яновіч А. Л. (1889).

337. Па сыну 229
Зап. Комар Л., Іванкевіч Н. у 1970 г. у в. Паляны Барысаўскага раёна ад Сахневіч А. П. (1904).
338. Па сястры 229
Зап. Чашко Я. у 1979 г. у г. п. Гарадзея Нясвіжскага раёна ад Чапко М. (1935).
339. Па брату 230
Гл. № 331.
340. Па брату 230
Зап. Цітавец Р. у 1989 г. у в. Татары Валожынскага раёна ад Сабалеўскай К. М. (1922).
341. Саміх паміраючых 230
Гл. № 329.
342. Саміх паміраючых 230
Гл. № 329.

Замовы

343. Ад пчалінага ўкусу . . . 232
Зап. Хадатовіч С. у 1981 г. у в. Надбярэзце Крупскага раёна ад Харатовіч М. П. (1910).
344. На сцаленне малака ў каровы 232
Зап. Ліхічэўская Т. у 1986 г. у в. Селішчы Барысаўскага раёна ад Касцюковіч М. Р. (1928).
345. На сцаленне малака ў каровы 232
Зап. Осіпава Н. у 1982 г. у в. Вял. Лагі Бярэзінскага раёна ад Заяц Р. (1926).
346. На сцаленне малака ў каровы 232
Зап. Заруба В. у 1971 г. у в. Верасанка Крупскага раёна ад Буйвідовіч М. В. (1916).
347. Ад лесуна 232
Зап. Жэльвіс Г. у 1983 г. у г. Жодзіна Смалявіцкага раёна ад Смольскай Н.
348. Ад змяінага ўкусу і вужа . 232
Зап. Осіпава Н. у 1982 г. у в. Наўлаўка Бярэзінскага раёна ад Хаткевіч Г. (1940).
349. Ад зубнога болю 233
Зап. Жэльвіс Г7 у 1983 г. у г. Жодзіна Смалявіцкага раёна ад Пузанкевіч В. (1893).
350. Ад рожы 233
Гл. № 348.
351. Ад рожы 233
Гл. № 344.
352. Ад рожы 233
Зап. Прахарчук С. у 1986 г. у в. Навасёлкі Бярэзінскага раёна ад Фясун Г. А. (1903).
353. Ад скулы 233
Зап. Міська Т., Падворная Г. у 1971 г. у в. Ігрушка Крупскага раёна ад Шкленскай А. Р. (1906).
354. Ад звіху (вывіху) 234
Гл. № 352.
355. Ад звіху 234
Гл. № 343.
356. Ад касталому 234
Гл. № 348.
357. Пры родах 234
Гл. № 352.
358. Ад залатніка 234
Гл. № 352.
359. Ад залатніка 234
Гл. № 348.
360. Ад спалоху 235
Зап. Осіпава Н. у 1982 г. у в. Вял. Лагі Бярэзінскага раёна ад Юн В. (1920)
361. Ад спалоху 235
Гл. № 360.
362. Ад спалоху 235
Гл. № 348.
363. Ад жабы 235
Зап. Верабей Т. у 1984 г. у в. Ратань Крупскага раёна ад Казловаи В. А. (1930).
364. Ад каўтуна 235
Гл. № 352.
365. Ад лішая 235
Гл. № 347.
366. Ад уроку 236
Зап. Трус Г. у 1972 г. у в. Знаменка Крупскага раёна ад Трус М. М. (86 гадоў).
367. Ад уроку 236
Зап. Пыж А. у 1990 г. у в. Рэчкі Чэрвеньскага раёна ад Лузгін М. І. (1922).
368. Ад начніц (крыксы, плаксы) 236
Гл. № 347.
369. На лепшы сон 236
Зап. Осіпава Н. у 1982 г. у в. Вял. Лагі Бярэзінскага раёна ад Спарыж Х. (1904).
370. Прысушка 236
Гл. № 369.

ПРЫКАЗКІ, ПРЫМАЎКІ, ВЫСЛОЎІ

371. Прыказкі, прымаўкі, выслоўі 237
Зап. у 1966—1991 гг. у Мінскай вобласці.

ЗАГАДКІ

372. Загадкі 343
Гл. № 371.

КАЗКІ

373. Кот, пеўнічык і лісіца . . . 248
Зап. Сівіцкі У. у 1990 г. у в. Шклянікава Мядзельскага раёна ад Чарняўскай В. І. (1906).
374. Пра гусака 249
Зап. Крылова С. у 1984 г. у в. Сцяцкі Стаўбцоўскага раёна ад Калошы В. П. (1915).
375. Піражок 250
Зап. у 1981 г. у в. Скаушын Салігорскага раёна ад Крывальцэвіч Г. С. (1906).
376. Дзед і воўк 251
Гл. № 373.
377. Каляда 252
Гл. № 373.
378. Дзве дачкі 253
Зап. Каконь А. у 1985 г. у в. Завостравеч'е Клецкага раёна ад Каконь Н. І. (1925).
379. Пра кароўку 255
Гл. № 373.
380. Дзве сястры і брацік 256
Зап. Гярко М. у 1984 г. у п. в. Куляшы Вілейскага раёна ад Сіняк І. М.
381. Пра невялікага хлопчыка . 257
Гл. № 373.
382. Ярынка і Раманька . . . 258
Гл. № 373.
383. Разумная дачка 259
Зап. Роўда І. у 1987 г. у в. Таль Любанскага раёна ад Барысавай Е. А. (1916).
384. Лёс чалавека 260
Зап. Садыкава А. у 1987 г. у в. Альхоўка Нясвіжскага раёна ад Кузьміч Д. М. (1906).
385. Тры браты 261
Зап. у 1987 г. у в. Вал Барысаўскага раёна ад Фоміча Антона (1920).
386. Поп і браты 261
Зап. Лятун С., Махаўчык А., Несцяровіч І. у 1981 г. у в. Брусы Мядзельскага раёна ад Багуцкай В. М. (1918).
387. Гора 262
Зап. Ворса Т., Вярцінская Г. у 1982 г. у в. Мал. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Дзяшковіч Н. (вуч. 7 кл.).
388. Муж-вуж 263
Зап. Дземянкова Р., Смірнова Р. у 1978 г. у в. Грэск Слуцкага раёна ад Дзячок К. І.

ПАДАННІ, ЛЕГЕНДЫ, БЫЛІЧКІ, АНЕКДОТЫ

389. Браніслава 265
Зап. у в. Нарач Мядзельскага раёна ад Субач І. І. (1920).
390. Лукаш 265
Зап. у в. Куцькі Мядзельскага раёна ад Драўніцкага І. П. (1902).
391. Беніца 266
Зап. Грыб А. у в. Парэчча Маладзечанскага раёна ад Бубен С. Д.
392. Пра пана 266
Зап. Маняда Е. у в. Ракаў Валожынскага раёна ад Рагойшы Н. І.
393. Мамчына горка 267
Зап. Мордас Т. у в. Лукавец Вілейскага раёна ад Шахрай К. (1914)
394. Святы калодзежак 267
Зап. Вайцяховіч І. у в. Нёман Уздзенскага раёна ад Цыбульскай Л. М. (1927).
395. Плямы на Месяцы 267
Зап. Наумовіч Г. у в. Каўшова Дзяржынскага раёна ад Жмачынскай Я. Б. (1923).
396. Рынкава балота 267
Зап. Рагойша У. у в. Ракаў Валожынскага раёна ад Рагойшы П. І. (1914).
397. Замак 268
Гл. № 389.
398. Пра русалку 268
Гл. № 389.
399. Завод 269
Зап. Матусевіч С. у 1988 г. у в. Лаўніца Барысаўскага раёна ад Шарко У. І. (1912).
400. Сабачая горка 269
Зап. Галецкая П. у в. Чырвоная Зорка Клецкага раёна ад Лятун А. І. (1916).
401. Панна 270
Зап. Ліцвіненка Д. у в. Цітва Пухавіцкага раёна ад Стралец М. І. (1915).
402. Сямернікі 270
Зап. Бажкова М. у в. Падневічы Валожынскага раёна ад Гуд С. І. (1899).
403. Івянец 270
Зап. Ярмак М. у г. п. Івянец Валожынскага раёна ад Юхневіч С. Б. (1924).
404. Колкі 270
Зап. Круглік А. у в. Колкі Клецкага раёна ад Каляіны Т. Е. (1905).
405. Какорычы 270
Зап. Акулаў П. у в. Какорычы Капыльскага раёна ад Мялешкі З. П. (1914).
406. Прозвішчы 270
Зап. Шапілаў С. у в. Языль Старадарожскага раёна ад Шпілені Ф. І. (1924).
407. Крычын 271
Зап. Шапілаў С. у в. Крычын Старадарожскага раёна ад Кошкі Е. В. (1911).
408. Назвы 271

Зап. Няхаева Т. у в. Паськавы Горкі Старадарожскага раёна ад Бернацкага М. М. (1940).
409. Верхуціна 271
Зап. Лозка А. у в. Языль Старадарожскага раёна ад Шпілені Ф. У. (1924).
410. Галавачы, Галоўні 271
Зап. Вайцяховіч І. у в. Літва Уздзенскага раёна ад Вуса А. Л. (1914).
411. Чэрнеўка 271
Зап. Крэміс В. у 1988 г. у в. Лаўніца Барысаўскага раёна ад Казловай Г. М. (1934).
412. Лаўніца 271
Зап. Матусевіч С. у 1988 г. у в. Лаўніца Барысаўскага раёна ад Казловай Г. М. (1934).
413. Чараўкі 272
Зап. Сідаровіч Л. у в. Чараўкі Мядзельскага раёна ад Абломы А. П. (1914).
414. Раманаўка 272
Зап. Адзярыха В. у в. Раманаўка Салігорскага раёна ад Бруй А. М. (1909).
415. Гудзялі 272
Зап. Ламака А. у в. Гудзялі Стаўбцоўскага раёна ад Каляды Я. Ф. (1904).
416. Каўшова 272
Зап. Навумовіч Г. у в. Каўшова Дзяржынскага раёна ад Петрашэўскай М. І. (1916).
417. Пра смерць 272
Зап. Бажкова М. у в. Падневічы Валожынскага раёна ад Гуд С. І. (1899).
418. Пра бусла 272
Зап. Жук Д. у в. Цітва Пухавіцкага раёна ад Стралец М. І. (1915)
419. Самалёт 273
Гл. № 417.
420. У панах 273
Зап. Ваўчок Н. у в. Падневічы Валожынскага раёна ад Гуд С. І. (1899).
421. Паўдурак 273
Зап. Рагойша У. у в. Ракаў Валожынскага раёна ад Рагойшы В. А. (1917).
422. Паляўнічы 273
Гл. № 396.
423. Чараўніца 274
Зап. Няхаева Т. у в. Языль Старадарожскага раёна ад Шпілені Ф. У. (1924).
424. Галубы 274
Зап. Баброўская М. у в. Бычын Бярэзінскага раёна ад Аляшкевіч М. К. (1910).
425. Бабулі 274
Гл. № 423.
426. Сваты 275
Зап. Шрэйтар А. у в. Чарнаград ад Канапелькі Гэлі.
427. Насаліў 275
Гл. № 396.
428. Хабар 275
Гл. № 421.
429. Пані 275
Гл. № 421.
430. Сябры 276
Гл. № 421 .
431. Пан 276
Гл. № 421.
432. Амерыка 276
Зап. Валасевіч І. у в. Скірмантава Дзяржынскага раёна ад Ждановіч Н. Б.
433. Аддзячыў 276
Зап. Мордас Т. у в. Лукавец Вілейскага раёна ад Пятровіч Е. (1914).

ПАЭАБРАДАВАЯ ЛІРЫКА

БАЛАДЫ

434. У лузе каліначка рана зацвіла 278
Гл. № 65.
435. Да й у полю-полюшку каліна цвіла 279
Гл. № 27.
436. Шумлівая дубровушка, шумлівая 280
Гл. № 238.
437. Пэклівая крапівушка, пэклівая 281
Гл. № 302.
438. Свякроў нявехну біла-карала 282
Гл. № 92.
439. Быў у бацькі адзін сын . . 283
Гл. № 66.
440. Паехаў Марусь, Марусь на вайну 284
Зап. Сцяпко Т. у 1987 г. у в. Сівіца Валожынскага раёна ад Равякі Ю. (1903), Бібік М. (1907), Кушаль А. (1920). Натацыя напеву Раговіча У.
441. Сын у матулі ночку начаваў 285
Гл. № 108.
442. Да сын у мамкі ночку начаваў 286
Зап. Гярко М. у 1984 г. у в. Кулягшы Вілейскага раёна ад Сіняк І. О. (1930).
443. Сын у матулі ночку начаваў . 288
Гл. № 12.
444. Жыла ўдава у канцы сяла . 288
Зап. Астрэйка Т. у 1988 г. у в. Пацейкі Капыльскага раёна ад Скрыган Т. Я.

445. Вот жыў-пражываў дай багаты купец 290
Гл. № 156.
446. У саду-саду пад яблынкаю . 290
Зап. Нікановіч І., Чальцова Н. у 1987 г. у в. Морач Клецкага раёна ад Полагавай М. Ц. (1935).
447. Ой, там, на гарэ, ой, там, на крутой 291
Зап. Ліцвінка В. у 1988 г. у в. Гайна Лагойскага раёна ад Грынкевіч Г. М. (1920). Натацыя напеву Раговіча У.
448. Ой, з-пад горы, з-пад крутое 292
Зап. Харчанка М. у в. Сарачы Любанскага раёна ад Шмялёвай П. М. (1923), Лаўрыенкі М. І. (1930). Натацыя напеву Раговіча У.
449. Ой, там, пры дарозе бяроза стаяла 293
Зап. Гараніна І., Варанішча Т., Шлак Т., Ждановіч Т., Занько Л. у 1988 г. у в. Скарабагатаўшчына Дзяржынскага раёна ад Мінько М. А. (1931).
450. Паехаў сынок на Русь жаніцца 294
Гл. № 321.
451. Удава сына ды парадзіла . 295
Зап. Ліцвінка В. у 1987 г. у в. Дзямідкі Вілейскага раёна ад Апанасевіч М. М. (1925). Натацыя напеву Раговіча У.
452. Ой, да наша Марусячка сына радзіла 296
Гл. № 66.

453. Ой, ты, каваль, каваль, каваленьку 297
Зап. Раговіч У. у 1987 г. у в. Мелкавічы Салігорскага раёна ад Тройніч Н. С. (1918), Герасіменкі Л. І. (1928), Тройніч М. В. (1937). Натацыя напеву Раговіча У.
454. Свеця месяц і зара 298
Зап. Астрэйка В., Кутырова Г. у 1989 г. у в. Хмелеўка Мінскага раёна ад Войцік М. А. (1896), Шылак Л. М. (1923), Бажок В. М.

455. Вот што гэта за вярба . . . 298
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Паўстынь Слуцкага раёна ад Дубовік В. Ф. (1922).
456. А у полі бяроза стаяла . . 299
Гл. № 454.
457. Калі тая нядзелячка будзя 300
Зап. Гярко М. у 1984 г. у в. Кулягшы Вілейскага раёна ад Клімовіч М. В. (1913), Томкавіч Э. К. (1917).
458. Ой, паехаў сын Ванюша . . 301
Зап. Ліцвінка В. у 1987 г. у в. Гусакі Нясвіжскага раёна ад Мазур К. В. (1918). Натацыя напеву Раговіча У.
459. Малада дзяўчына па саду хадзіла 302
Зап. Каладзінскі В. у 1987 г. у в. Семежава Капыльскага раёна ад Стасевіч П. П. (1914). Натацыя напеву Раговіча У.
460. Ой, у полі, полі карчомка стаяла 303
Зап. Каладзінскі В. у 1987 г. у в. Семежава Капыльскага раёна ад Харковіч А. І. (1905). Натацыя напеву Раговіча У.
461. Ой,, жана мужа знінавідзіла 304
Зап. Абрагімовіч М. у 1984 г. у в. Харошая Лагойскага раёна ад Маркель М. О. (1905). Натацыя напеву Раговіча У.
462. Ой, у полі, полі стаяла бяроза 305
Гл. № 302.
463. Ляцела зязюля цераз сад, кукучы 305
Зап. Філіповіч Т. у 1990 г. у в. Сіняўка Клецкага раёна ад Ільюкевіч Г. Я. (1926).
464. Мальчышачка-бедняжачка . . 306
Гл. № 27.
465. Зялёны дубочак на бор пахіліўся 307
Гл. № 453.
466. А ў нядзелю ранюсенька . . 308
Гл. № 87.
467. А што ж гэта за свет настаў . 309
Гл. № 461.
468. Цёмна хмарка наступае . . 309
Зап. Ліцвінка В. у в. Яскавічы Салігорскага раёна ад Круковіч П. (1920), Навумовіч Т. (1924). Натацыя напеву Раговіча У.
469. Ой, ляцелі жураўлі . . . 310
Гл. № 254.

ЛЮБОЎНЫЯ ПЕСНІ

470. Зарадзілі чорныя ягады ў бары 313
Гл. № 106.
471. Ой, бяроза мая раскудравая 314
Гл. № 297.
472. Із-пад гор-гары едуць мазуры 314
Зап. Раговіч У. у 1987 г. у в. Мелкавічы Салігорскага раёна ад Герасімені Л. Р. (1911), Баранчык Н. І. (1924), Герасімені Н. П. (1926). Натацыя напеву Раговіча У.
473. У полі вярба, пад вярбой вада 316

Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Іжа Вілейскага раёна ад Казановіч Л. У. (1927).
474. Ой, у бары сосна тонкая выросла 316
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Юшэвічы Нясвіжскага раёна ад Янцэвіч Г. А. (1912), Жук Л. А. (1916).
475. А ішлі, ішлі да валы палавыя 317
Гл. № 49.
476. Я учора су вячора весялюсянька была 318
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Каралеўцы Вілейскага раёна ад Казановіч Ю. Р. (1910).
477. Усе боры пагарэлі 319
Зап. Маскаленка І., Кутырова Г. у 1990 г. у в. Лысая Гара Чэрвеньскага раёна ад жаночага гурта, запявае Калтовіч М. Р. (1916).
478. Ты, ранняя кукулячка . . 319
Гл. № 27.
479. Па садочку я хадзіла . . . 320
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Каралеўцы Вілейскага раёна ад Кабак В. А. (1912), Рагач М. А. (1917), Рагач А. А. (1921).
480. Зялёны дубочак, куды пахіліўся? 320
Гл. № 27.
481. У полі бераза кудрава стаяла 321
Зап. Нікановіч І., Чальцова Н. у 1988 г. у в. Морач Клецкага раёна ад Полагавай М. Ц. (1935), Ахрымені Т. М. (1948).
482. Ой, я хаджу да пахаджаю . 322
Зап. Кутырова Г. у 1984 г. у в. Кармазы Старадарожскага раёна ад Гутнік В. І. (1915); Вілюхі Г. К. (1923), Вілюхі Н. К. (1925).
483. Гневаецца маці ды ўсё хоча біць 323
Зап. Круглік А. у 1988 г. у в. Цапра Клецкага раёна ад Жукоўскай В. Л. (1919).
484. Ды ў зялёнай дуброве, эх! . 324
Гл. № 481.
485. Ой, гуляла дзеўчына, ой, па садочку, э-гэй! 325
Гл. № 481.
486. Цекла рэчка з-пад млынэчка 326
Гл. № 36.
487. А на гарэ сухі дуб 327
Гл. № 254.
488. Да куды ляціш, да куды й атлятаяш 327
Гл. № 156.
489. Гэй! Да ў полі цёмна ды дымна 328
Гл. № 256.
490. Ой, борам, борам, борам парою 329
Гл. № 111.
491. А я выду на даліну 330
Гл. № 87.
492. А ў канцы сяла там стаяла вярба 330
Гл. № 87.

СЯМЕЙНА-БЫТАВЫЯ ПЕСНІ

493. Ой, белая бярозачка, бялей майго цела 334
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Іжа Вілейскага раёна ад Більдзюк Л. Ф. (1927).
494. Ой, жураўка, жураўка . . 334
Гл. № 279.
495. Ой, жураўка, жураўка . . 335
Зап. Рудзінская С. у 1990 г. у в. Доўгая Салігорскага раёна ад Стасевіч П. П. (1914). Натацыя напеву Раговіча У.
496. Сулавейка маленькі . . . 335
Гл. № 237.
497. Ой, ляцела, не даляцела . . 336
Гл. № 237.
498. Была я ў мамачкі на выгодзя 337
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Каралеўцы Вілейскага раёна ад Казановіч Ю. Р. (1910).
499. Аддаў мяне бацюшка вельмі замуж маладу 338
Зап. Працэнка А. у 1987 г. у в. Казлы Нясвіжскага раёна ад Марулевіч А. С. (1912). Натацыя напеву Раговіча У.
500. Па саду я хаджу, сама сабе гавару 339
Зап. Кутырова Г., Маскаленка І. у 1990 г. у в. Лысая Гара Чэрвеньскага раёна ад Сушы К. М. (1935) і жаночага гурта.
501. Да я ўчора п'яна была . . 339
Зап. Кутырова Г., Маскаленка І. у 1990 г. у в. Лысая Гара Чэрвеньскага раёна ад Калтовіч М. Р. (1916), Забаўскай В. К. (1922) і жаночага гурта.
502. У бару калыска высока не нізка 340
Гл. № 279.
503. Там, у дуброве, зязюля кукавала 341
Гл. № 110.
504. Туды-сюды дзве дарожачкі . 341
Гл. № 256.
505. Вот і сонейка за бор коціцца 342
Зап. Каладзінскі В. у 1986 г. у в. Юркавічы Дзяржынскага раёна ад Шчаблоўскай С. М. (1917), Вары-

водскай Л. А. (1928), Шыкуль А. В. (1930), Гурскай Г. А. (1940). Натацыя напеву Раговіча У.

506. А я ў горы не радзілася . . 343
Гл. № 106.
507. Нядоля мая, няшчасця маё 344
Гл. № 498.
508. Вот у роўным полі стаяла карчомка 344
Гл. № 117.
509. Ой ты, мілы мой, дружына мая 345
Гл. № 237.
510. Ой, вярба, вярба кудравая . 346
Зап. Каладзінскі В. у 1987 г. у в. Рудкі Клецкага раёна ад Скакоўскай Н. Ф. (1925), Вяргейчык З. М. (1940). Натацыя напеву Раговіча У.
511. Каб я знала ж, каб я ведала 347
Гл. № 156.
512. Ох, і соняйка ты маё ясная . 348
Гл. № 49.
513. Як пайду я ў сад-вінаград . 349
Гл. № 256.
514. Дзякуй Богу за добрага мужа 349
Гл. № 125.
515. Чаго ты, кветка, на вадзе звяла 350
Гл. № 125.
516. Выйду я на горачку . . . 350
Гл. № 3.
517. А на гарэ соўнюшка, у далі-не туман 351
Гл. № 87.
518. Ўжэ на дварэ дзень бялень-кі 352
Гл. № 459.
519. Дзе ты, мілы, валачыўся . . 353
Гл. № 145.
520. А ў гародзе хмяліначка . . 353
Гл. № 256.
521. Усіх коні па лугах ходзюць . 354
Гл. № 117.
522. Стаіць студня шчэ й новая . 354
Гл. № 87.
523. Чаму, мілы, ляжыш ня арэш 355
Гл. № 297.
524. Пад яліною, пад зяляною . 356
Гл. № 117.
525. Ой, палын, палын 357
Гл. № 90.
526. Ой, пайду я гарой, даліною . 357
Гл. № 90.
527. Закукуй, закукуй, ды зязюленька, ў лесяа 358
Гл. № 85.
528. Ой, зяцько, зяцько, ты маё дзіця 358
Гл. № 71.
529. Ой, мой бацюшка, ой, мой родненькі 359
Гл. № 27.
530. Ой, ліха доля злучыла . . 360
Гл. № 321.
531. А зяць да цешчы ды галоўачку клоніць 361
Гл. № 242.
532. Сястра ходзіць па вуліцы . 362
Зап. Мыслівец Н. у 1988 г. у в. Цеpакі Лагойскага раёна ад Акуліч Г. Ф. (1919).
533. А ў гародзе дзве ябланкі . . 363
Зап. Шыдлоўская С. у 1988 г. у в. Калодкі Вілейскага раёна ад Дзевяцень М. Ф. (1919).
534. Выйду я на вулачку . . . 364
Зап. Жызнеўская М. у 1987 г. у в. Усцінавічы Вілейскага раёна ад Міцкевіч Н. В. (1922). Натацыя напеву Раговіча У.
535. О, с-пад лесу, лесу цёмнага 365
Гл. № 117.
536. Эй, стукі-грукі па памосце . 366
Гл. № 34.
537. У чужым двару ваду бяру . 367
Гл. № 127.
538. А у лужэ калінка стаяла . . 368
Гл. № 12.
539. Наварылі браткі піва . . . 369
Гл. № 22.
540. Ох ты, сонца, да сонца ясная 370
Гл. № 113.
541. Ой! Выйду за варацейка . . 371
Зап. Кутырова Г., Маскаленка І. у 1990 г. у в. Лысая Гара Чэрвеньскага раёна ад Сушы К. М. (1935).
542. Ой, шуміць-гудзе зелена дубровушка 371
Гл. № 147.
543. Свяці, свяці, месяц, ясная зара 372
Гл. № 87.
544. Сядзем, сядзем, пабясе-даім 373
Гл. № 1.
545. Ах ты, белая бяроза . . . 374

СІРОЦКІЯ ПЕСНІ

546. Пыліць, дыміць дарожачка . 375
Гл. № 87.
547. З суботы на нядзельку . . 376
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Слабада Вілейскага раёна ад Сяргей Т. І. (1924), Кісель Г. І. (1930).
548. Кукавала зязюлячка . . . 376
Гл. № 36.
549. Салавейко маленёк . . . 377
Гл. № 254.
550. Усе горы зялянеюць . . . 378
Гл. № 474.
551. Ляцеў голаб цераз мора . . 378

Зап. Асадчая В., Букач Н., Василькова Ж. у 1988 г. у в. Ляхі Нясвіжскага раёна ад Лях М. П. (1913).
552. Як памёрла матулька . . . 379
Гл. № 65. Натацыя напеву Раговіча У.
553. Ці я ў полі не калінка . . . 380
Гл. № 440.

ЖАРТОЎНЫЯ ПЕСНІ

554. Як на рэчке, на масце . . . 383
Гл. № 1.
555. Там, на горца, каморка стаяла 384
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Іжа Вілейскага раёна ад Місюн К. П. (1916).
556. Ехаў бацька па лучыну . . 384
Гл. № 70.
557. Ой, у сенях, сенях, за кадушачкаю 385
Зап. Патапенка Ю. у 1987 г. у в. Гусакі Нясвіжскага раёна ад Шурак З. У. (1921), Гнесь Я. Д. (1922). Натацыя напеву Раговіча У.
558. Як пайду я, малада . . . 386
Гл. № 3.
559. Як паедзем, дык паедзем . . 387
Гл. № 532.
560. Жана мужа прадала . . . 387
Гл. № 279.
561. Ой, як была у папа 388
Гл. № 279.
562. Да й разлілася па вуліцы лужа 388
Гл. № 250.
563. Баба Еўка, дзед Тумаш . . 389
Зап. Гярко М. С. у 1984 г. у в. Куляшы Вілейскага раёна ад Сіняк І. О. (1930).
564. Ой, ты стары старычышча . . 391
Зап. Патапенка Ю. у 1987 г. у в. Гусакі Нясвіжскага раёна ад Мазур К. В. (1918). Натацыя напеву Раговіча У.
565. Дзе ты бываеш, чорны баране? 391
Гл. № 262.
566. Ой, ляцеў камар па полі . . 392
Гл. № 277.
567. Я цяцерку пасу 392
Зап. Багавец М. у 1984 г. у в. Баяры Мядзельскага раёна ад Багавец М. І.
568. Мая мамачка пераборачка . 393
Гл. № 71.
569. Была ў мужа шчаслівая жонка 394
Гл. № 541.
570. Парадзіла Чачотачка сямёра дзяцей 394
Зап. Філіповіч Т. у 1990 г. у в. Сіняўка Клецкага раёна ад Рэвякі А. М. (1920).

КАРАГОДНЫЯ, ГУЛЬНЁВЫЯ І ТАНЦАВАЛЬНЫЯ ПЕСНІ

571. Ў караводзе мы былі . . . 397
Гл. № 89.
572. У першум таночку дзевачкі 398
Гл. № 455.
573. Заярылася пчолачка . . . 399
Гл. № 113.
574. А ў варот верба калыхалася 399
Зап. Паўловіч Г. у 1988 г. у в. Лаўніца Барысаўскага раёна ад Херавец Г. П. (1920).
575. Як садзілі дзеўкі кветнік . . 400
Гл. № 216.
576. Жана мужа шанавала . . 401
Зап. Ліцвіновіч А. у 1988 г. у в. Іжа Вілейскага раёна ад Путырскай А. М. (1910).
577. Ва лугах, ва лугах 401
Зап. Мыслівец М. у 1988 г. у в. Мал. Укропавічы Лагойскага раёна ад Жызнеўскай К. С. (1911).
578. Наляцелі, наляцелі шэры гусі із расы 402
Гл. № 71.
579. На уліцы бабы сядзелі, сядзелі 403
Гл. № 236.
580. А мы проса сеялі, сеялі . . 404
Зап. Паўлоўскі С. у 1988 г. у в. Вял. Запруддзе Валожынскага раёна ад Лявіцкай В. С. (1915), Гнілазуб Я. А. (1925).
581. Летаў голуб, летаў шызы . 404
Гл. № 3.
582. Пад яліною, пад зяляною . 405
Гл. № 454.
583. Пасаджу ігрушку ў садзе, ў садзе 406
Гл. № 46.
584. Сядзі, сядзі, яшчар . . . 406
Гл. № 46.
585. Служыў я ў пана першая лета 406
Гл. № 108.
586. Ой, пайду я на мяста, на мяста 408
Зап. Празецкая А. у 1988 г. у в. Павуссе Дзяржынскага раёна ад Гарэлік (1906), Калоднік А. І. (1921).
587. А на небе зорка ясна . . . 409
Зап. Макарэвіч Ж., Маціхвейчык А. у 1988 г. у в. Лаўніца Барысаўскага раёна ад Херавец В. А. (1914).
588. А Лявоніха-Сымоніха была 409

Зап. Паўловіч Г. у 1988 г. у в. Лаўніца Барысаўскага раёна ад Капыльскай К. П. (1926), Капыльскай Л. М. (1929).
589. А Лявон ды Лявоніху любіў 410
Гл. № 588.
590. Машу, машу караватачку . 410
Гл. № 587.
591. Цячэ рэчка невялічачка . . 411
Гл. № 90.
592. Ў дробным ельнічку-бярэзнічку 411
Гл. № 90.
593. Я хадзіла беражком, беражком 412
Гл. № 274.
594. Ішла, ішла дзевачка беражком, беражком 413
Гл. № 156.
595. А дзе тыя чобаты, што дзед даў 414
Гл. № 586.
596. Цераз гай, цераз гай, цераз Бандароўку 415
Гл. № 256.
597. Ой, сад-вінаград, зялёная вішня 415
Гл. № 256.
598. Усе людзі вячэраюць . . . 416
Гл. № 169.

САЦЫЯЛЬНА-БЫТАВЫЯ ПЕСНІ

599. За Сібірам сонца ўсходзіць . 418
Зап. Ліцвінка В., Татур Л. у 1989 г. у в. Грэск Слуцкага раёна ад Давідоўскай Л. Я. (1910).
600. Паехаў малойчык у чыстае поле 419
Зап. Ліцвінка В., Кушнер І. у 1990 г. у г. Валожыне ад Русіновіч М. І. (1899).
601. Ой, на моры, на сінюсенькім 419
Зап. Гулецкі М., Камароўскі М. у 1968 г. на хут. Верацейка Вілейскага раёна ад Адамовіч А. С. (1902).
602. А ў нядзельку раненька, рана на зару 420
Гл. № 108.
603. Ой, на гарэ ячмень, а ў далі не жыто 421
Зап. Раговіч У. у 1987 г. у в. Мелкавічы Салігорскага раёна ад Мілеўскай З. Ф. (1937). Натацыя напеву Раговіча У.
604. Павей вецер, вецерочак . . 421
Зап. Кутырова Г., Сутулава С. у 1987 г. у в. Мал. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Сірко М. І. (1937)
605. Із-за леса, леса цёмнага . . 422
Зап. Каладзінскі В. у 1987 г. у в. Семежава Капыльскага раёна ад Харкевіч А. І. (1905), Стасевіч П. П. (1914). Натацыя напеву Раговіча У.
606. Дарагая мая мамка . . . 422
Гл. № 22.
607. Із-за лесу, лесу цёмнянькаго 423
Гл. № 570.
608. Ішлі хлопцы дарогаю . . . 424
Зап. Раговіч У. у 1987 г. у в. Мелкавічы Салігорскага раёна ад Герасімені Л. І. (1926), Тройніч Н. С. (1918), Натацыя напеву Раговіча У.
609. Матка свайго сына ў салдаты аддала 425
Зап. Каладзінскі В. у 1987 г. у в. Семежава Капыльскага раёна ад Харкевіч А. І. (1905). Натацыя на«-певу Раговіча У.
610. Зялёная дубровачка, зялёная 425
Гл. № 117.
611. З-пад няроду ўсё й туман да ўсёй туман 426
Гл. № 570.
612. У прыграніччы мы, браццы, стаялі 427
Зап. Калека Ж. у 1988 г. у в. Забароддзе Смалявіцкага раёна ад Калекі В. А. (1910).
613. Ой, паслухайце, рэбята, я вам песеньку спяю 427
Гл. № 603.
614. Збіраяцца мой міляньки . . 428
Гл. № 27.
615. І-ой, сюды-туды тры дарожанькі 429
Гл. № 612.
616. У роўным полі ні дым, ні туман 429
Гл. № 321.
617. У канцы грэблі стаяць вербы 430
Гл. № 71.
618. А з-пад лесу цёмна хмарка стала 431
Зап. Кутырова Г. у 1983 г. у в. Юшэвічы Нясвіжскага раёна ад Жук Л. А. (1916).
619. Усе мужы да з вайны ідуць . 431
Гл. № 70.
620. Малады жаніўся, на войну ішоў 432
Гл. № 27.
621. Трава палягае, віхура галосіць 433
Гл. № 586.
622. Ох, я ўстану раненько . . 433
Гл. № 277.
623. Ішоў салдат с пахода . . . 434
Зап. Сабяшчук І. у 1987 г. у в. Гусакі Нясвіжскага раёна ад Гапановіча П. В. (1915).

624. Жылі чумакі чатыры гады . 435
Зап. Нікановіч І., Чальцова Н. у 1987 г. у в. Морач Клецкага раёна ад Грамыкі У. (1915).
625. Ляцела зязюля цераз новы сёлы 435
Зап. Каладзінскі В. у 1979 г. у в. Рэдзькавічы Лагойскага раёна ад Жардзецкай П. Ф. (1894). Натацыя напеву Раговіча У.
626. Арэ прымак, арэ прымак . . 436
Гл. № 580.
627. Ў саду, ў саду чэрэмшына . 437
Гл. № 277.

ПРЫПЕЎКІ

628. Ой, іграй, іграй, гармонь . . 439
Гл. № 36.
629. Дзяўчыначка, чыя ты? . . 439
Зап. Хацяновіч А., Навіцкая Ю. у 1991 г. у в. Сервеч Вілейскага раёна ад Лыкі В. Т. (1894).
630. Ох, ты дзедка мой 440
Гл. № 629.
631. Хоць я мала, хоць я мала . 440
Гл. № 629.
632. Ду-ду-ду, ду-ду-ду! . . . 441
Зап. Кутырова Г. у 1987 г. у в. Мал. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Цішкі В. К. (1913).
633. Ой, ня йдзіця, дзеўкі, замуж 441
Гл. № 3.
634. Прыпеўкі 442
Гл. № 371.

ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР

635. Люлі, люлі, ўсе дзеткі паснулі 446
Гл. № 24.
636. Люлі, люлі, люлі 447
Гл. № 78.
637. Люлі, люлі, люлі 447
Гл. № 12.
638. А псік, а псік, мой каток . . . 448
Гл. № 12.
639. А псік, каток, па плоця . . 448
Гл. № 532.
640. Пайшоў каток пад масток . 448
Гл. № 78.
641. Хадзіў каток па платку . . 449
Гл. № 78.
642. Люлі, люлі, люлі 449
Гл. № 49.
643. Люлі, люлі, люлі, палез кот на дулі 449
Гл. № 19.
644. На дварэ цямным-цямно . . 450
Гл. № 205.
645. А-а, люлі, паляцелі гулі . . 450
Гл. № 532.
646. А-а, люлі, прыляцелі куры . 451
Гл. № 78.
647. Гушкі, гушкі, гушкі . . . 451
Гл. № 78.
648. Зыбаю-пазыбаю 451
Гл. № 119.
649. Люлі, люлі, спацькі 452
Гл. № 78.
650. Ладкі-ладкі 452
Зап. Міська М. у 1987 г. у в. Таль Любанскага раёна ад Грышкевіч В. П. (1935).
651. Ладу-ладу-ладкі 453
Зап. Зяновіч І. у 1977 г. у в. Лебедзява Маладзечанскага раёна ад Корсак (1952).
652. Ладкі-ладкі 453
Зап. Матыліцкая Н. у 1987 г. у в. Таль Любанскага раёна ад Грышкевіч В. П. (1935).
653. Чыкі-чыкі, сарока! 453
Зап. Зяновіч І. у 1977 г. у в. Лебедзява Маладзечанскага раёна ад Шымак В. П. (1929).
654. Кую-кую ножку 453
Зап. Каўчарэня Н. у 1984 г. у в. Сінегава Старадарожскага раёна ад Саланец Г. А. (1910).
655. Кую-кую ножку 454
Зап. Юшкевіч С. у 1968 г. у в. Дубаносы Мядзельскага раёна ад Локцік М. П. (1921).
656. Кую-кую ножку 454
Гл. № 652.
657. Мышачка, ласачка . . . 454
Зап. Кокань А. у 1985 г. у в. Якшыцы Клецкага раёна ад Хілімон Р. П.
658. Ласачка, ласачка . . . 454
Зап. Мілеўская А., Гаўрык В., Харытончык Л. у 1987 г. у в. Мал. Гарадзяцічы ад Вашкевіч Л. М. (1913).
659. Ідзе каза рагатая 455
Зап. Зяновіч І. у 1977 г. у в. Лебедзява Маладзечанскага раёна ад Харужык Н. (1962).
660. Сунічкі, сунічкі 455
Зап. Лятун С., Макаўчык А., Несцяровіч І у 1981 г. у в. Малы Рожан Салігорскага раёна ад Паўлюкевіча С. (1968).
661. Сонейка, сонца 455
Зап. Рамашкевіч Н. у 1978 г. у в. Любушаны Бярэзінскага раёна ад Рудзені Ж. (1965).
662. Дожджык, дожджык, секані! 455
Зап. Каўчарэня Н. у 1984 г. у в. Вялікі Рожан Салігорскага раёна ад Каўчарэні О. П. (1932).
663. Раз, два, тры, чатыры . . . 455
Зап. Субат К. у 1981 г. у в. Паўстынь Слуцкага раёна ад Альховік В. (1970).

664. Адзін, два, тры, чатыры, пяць 456
Зап. Лапо Г., Кахно П., Курневіч С. у 1979 г. у в. Міхеды Лагойскага раёна ад Мароз Н. (1968).
665. Бег сабака цераз мост . . 456
Зап. Гайдукова Д. у 1985 г. у в. Хальнявічы Крупскага раёна ад Гайдукова А. (1973).
666. Ішла кукушка міма сада . . 456
Гл. № 664.
667. Саломінка, яромінка . . . 456
Зап. Рамашкевіч Н. у 19[illegible] г. у в. Любушаны Бярэзінскага раёна ад Шкудровай І. (1966).
668. Пятро, Пятро 456
Зап. Кобель І. у 1981 г. у в. Скаўшын Салігорскага раёна ад Хаміцэвіч А. (1968).
669. Кацілася торба 456
Зап. Касько А. у 1987 г. у в. Рачэнь Любанскага раёна ад Кукраш Е. (1922).
670. Андрэй-верабей 456
Зап. Дасько А., Дубянецкая І. у 1982 г. у в. Мал. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Гадун Г. (1973), Лагун Н. (1974).
671. Андрэй, не дурэй 456
Зап. Кляніцкая Н. у 1982 г. у в. Кузьмічы Любанскага раёна ад Палазнік Г. Р. (1925).
672. Надзя-карадзя 457
Зап. Афанасьева Л., Балтушкіна Р. у 1982 г. у в. Мал. Гарадзяцічы Любанскага раёна ад Слівец С. (1972).
673. Кацярына-Кацька 457
Гл. № 671.
674. Іван-балван 457
Зап. Рамашкевіч Н. у 1978 г. у в. Быкавічы Бярэзінскага раёна ад Нецяровіча В. (1965).
675. Сівы-сівы, па колькі слівы? . 457
Зап. Ермаковіч Ж. у в. Гацк Салігорскага раёна ад Новік С.
676. Юзік-пузік 457
Гл. № 661.
677. Віця, Віця, Віцяля 457
Зап. у 1979 г. у в. Швабы Лагойскага раёна ад Яцкевіч Ш. (1967).

Навукова-папулярнае выданне

БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР У СУЧАСНЫХ ЗАПІСАХ

Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць

Укладальнік
Ліцвінка Васіль Дзмітрыевіч

Укладальнік музычнай часткі
Кутырова Галіна Рыгораўна

На пераплёце і форзацах слуцкія паясы

На фронціспісе ліра, дудка, жалейка і трашчотка
(майстар У. Пузыня)

Рэдактар *Л. М. Самасейка.* Мастак *Р. У. Кондрад.*
Мастацкі рэдактар *Р. У. Кондрад.*
Тэхнічны рэдактар *В. П. Безбародава*
Карэктары *З. М. Машкевіч, Л. В. Лебедзева, Н. А. Саціна*

Здадзена ў набор 11.10.94. Падпісана да друку 10.08.95. Фармат 60×84 1/16. Папера друкарская № 2. Гарнітура літаратурная. Ум. друк. арк. 27,90. Ум.-фарб. адб. 28,36. Ул.-выд. арк. 27,74. Тыраж 3800 экз. Заказ 979.

Выдавецтва «Універсітэцкае» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 9. 220048, Мінск, пр. Машэрава, 11.

Друкарня «Перамога». 222310. Маладзечна, вул. Таўлая, 11.

У выдавецтве «Універсітэцкае» рыхтуецца да выдання вучэбны дапаможнік:

Аляхновіч А. М., Рахчэеў М. В., Каструлёў У. Дз. **Беларускі музычны фальклор** — аб'ём 30 арк.

Сабраны лепшыя здабыткі музычнай і вусна-паэтычнай творчасці беларускага народа, апрацаваны народныя мелодыі для дзіцячых аркестраў і інструментальных ансамбляў, багата прадстаўлена песенная творчасць, запісаны народныя танцы, да кожнага жанру пададзены навуковыя і метадычныя каментарыі і рэкамендацыі настаўнікам музыкі.

Для настаўнікаў музыкі агульнаадукацыйных школ, навучэнцаў педагагічных вучылішч, студэнтаў універсітэтаў, педагагічных інстытутаў, кіраўнікоў мастацкіх калектываў, усіх, хто цікавіцца вуснай народнай творчасцю.

Б43 **Беларускі** фальклор у сучасных запісах: Традыц. жанры: Мінск. вобл. / Уклад. В. Д. Ліцвінка; Уклад. муз. часткі Г. Р. Кутырова. — Мн.: Універсітэцкае, 1995. — 477 с.: іл., нот. іл.

ISBN 985-09-0013-X.

Кніга з'яўляецца першым сістэматызаваным зборам беларускіх традыцыйных вусна-паэтычных твораў, запісаных на Міншчыне ў наш час. Забяспечана нотнымі прыкладамі, каментарыем, ілюстравана фотаздымкамі, арнаментамі.

Для фалькларыстаў, студэнтаў-філолагаў, кіраўнікоў мастацкіх калектываў.

Б $\frac{8820600000—034}{М317(03)—95}$ **39—95**

ББК 82.3Бел-6.



БЕЛАРУСКІ ФАЛЬКЛОР У СУЧАСНЫХ ЗАПІСАХ

Традыцыйныя жанры
Мінская вобласць